НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

DEPARTMENT FOR ARCHIVES AND RECORDS KEEPING
OF THE MINISTRY OF JUSTICE OF THE REPUBLIC OF BELARUS

NATIONAL HISTORICAL ARCHIVES OF BELARUS

*Series*
*«History, archeography, source studies»*

# Archivaryus

*Collection of scientific papers and articles*

*Founded in 2001*

## Volume 11

Minsk
NHAN
2013

ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

*Серыя*
*«Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства»*

# Архіварыус

*Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў*

*Выходзіць з 2001 года*

## Выпуск 11

Мінск
НГАБ
2013

УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]
ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41
А87

*Серыя заснавана ў 1998 г.*

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Рэдакцыйная калегія:
*У. І. Адамушка, Ю. М. Бохан* (галоўны рэдактар), *Г. Я. Галенчанка, У. М. Дзянісаў, М. М. Забаўскі, А. М. Люты, А. Я. Рыбакоў, І. В. Саверчанка, М. Ф. Шумейка, З. В. Шыбека, З. Л. Яцкевіч* (адказны рэдактар), *Д. У. Яцэвіч*

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук *А. І. Мальдзіс,*
кандыдат гістарычных навук *С. У. Жумар*

У адпаведнасці з загадам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2012 года № 21 зборнік навуковых прац «Архіварыус» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках.

**ISSN 2225-4412**

© Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі», 2013

# Архіваэнаўства

*В. В. Гарбачова*

## Архіў Янушкевіча ў зборах Музея літаратуры імя Адама Міцкевіча ў Варшаве

Фарміраванне так званага Архіва Янушкевіча [1] ў Музеі літаратуры імя Адама Міцкевіча ў Варшаве распачалося з 90-х гг. XX ст. У 1993 г. у нашчадкаў роду Янушкевічаў, Яніны Попель, была закуплена першая частка калекцыі, якая ў асноўным складалася з карэспандэнцыі сям'і Ларыш, у тым ліку і жонкі Яўстафія Янушкевіча Яўгеніі [2]. Гэта былі разрозненыя лісты, апрацоўку якіх не паспелі завяршыць да 1996 г., моманту выхаду каталога музея з апісаннем збораў XIX ст. [28], па гэтай прычыне яны засталіся па-за межамі даследчыцкай увагі. Другі перыяд распачаўся ў 2010 г., калі на кракаўскім аўкцыёне «Rara Avis» былі набыты лісты і карэспандэнцыя Я. Янушкевіча, датаваныя 1930–1970-мі гг. У гэты збор акрамя прыватных дакументаў уваходзяць лісты генерала Юзафа Двярніцкага, публіцыста Яна Непамуцэна Яноўскага, грамадскага дзеяча, паўстанца Маўрыцыя Махнацкага, ваяводы, стваральніка Версальска-Віленскай бібліятэкі Антонія Астроўскага, аўтограф А. Міцкевіча і інш. Імя прадаўца засталося невядомым, што не адмаўляе адзінага паходжання прадстаўленых дакументаў. Аб'яднанне згаданых набыткаў дазволіла музею сфарміраваць справу пад назвай

---

[1] Дадзеная назва прысвоена Музеем літаратуры імя Адама Міцкевіча ў Варшаве.

[2] Яўгенія Янушкевіч (каля 1814–5.06.1892) — дачка барона Караля Ларыша і Караліны Велапольскай з роду Грабоўскіх, сястра Эдмунда Караля Максіміліяна (н. 16.11.1816, Осек), Адэлі (1824–1890), жонкі графа Станіслава Дунін-Баркоўскага (1818–1884), і Караля (каля 1827–1853). 5 жніўня 1851 г. узяла шлюб з Яўстафіем Янушкевічам, ад якога 19 чэрвеня 1853 г. нарадзілася дачка Марыя. Пасля 1870 г. Яўгенія пераехала разам з мужам у Кракаў, дзе і памерла [3, с. 101–102; 20, s. 219; 40, s. 47–48; Інф. Вяславы Кардачук].

«Лісты Яўгеніі Янушкевіч да мужа, Яўстафія Янушкевіча», храналагічныя межы якой ахопліваюць 1832–1880 гг. [3]

Па нашаму меркаванню, названыя рукапісныя дакументы паходзяць са збору Попеляў з Вялікіх Чапляў (Келецкае ваяводства). Дачка Яўстафія Янушкевіча Марыя ў 1872 г. узяла шлюб з Канстанцінам Попелем, які з 1862 г. становіцца ўладальнікам спадчыннага маёнтка Вялікія Чаплі [37, s. 88]. Канстанцін Попель адначасова з гаспадарскай працай займаўся калекцыяніраваннем кніг і рукапісаў. З цягам часу ў яго назапасіўся каштоўнейшы збор польскамоўных і замежных выданняў, да якога далучылася і калекцыя, якая засталася пасля смерці ў 1892 г. Яўгеніі Янушкевіч.

Пасля пераезду на сталае жыхарства Канстанціна і Марыі Попеляў у Кракаў калекцыя рукапісаў і кнігазбор засталіся ў Вялікіх Чаплях у аднаго з сыноў, а менавіта Яўстафія Попеля. У далейшым іх спадчыннікам стаў унук Канстанціна Попеля, сын Яўстафія — Канстанцін Попель [37, s. 90], які ўтрымліваў усё гэта да 1939 г.

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны частка рукапісаў збору трапіла ў дэпазіт Ягелонскай бібліятэкі. У 1969 г. бібліятэка выкупіла шэраг матэрыялаў Попеляў [41, s. 87, 90], сярод якіх апынуліся ўспаміны Яўстафія Янушкевіча [22; 23] і яго жонкі Яўгеніі Ларыш [24; 25], шматлікая карэспандэнцыя Янушкевіча з генераламі Юзафам Хлапіцкім, Генрыкам Дэмбінскім, Самуэлем Рожыцкім, Юзафам Скшынецкім, перапіска з Адамам Міцкевічам, Іаахімам Лялевелем, Юл'янам Нямцэвічам, Феліксам Вратноўскім, Браніславам Залескім, Леанардам Ходзькам, Валяр'янам Калінкай, Юл'янам Клячкай і інш. [5–21] [4], а таксама ў бібліятэку трапіў каштоўны збор прыватных дакументаў Яўстафія Янушкевіча [4]. Акрамя Ягелонскай бібліятэкі частка рукапісаў са збору Попеляў трапіла ў Гданьскую бібліятэку Польскай акадэміі навук (30 адз. зах.) і бібліятэку Польскай акадэміі навук у Кракаве (40 адз. зах.). Разам з тым невядомая колькасць дакументаў яшчэ застаецца ў прыватным карыстанні, што пацвярджаецца прыкладам з кракаўскім аўкцыёнам.

На сённяшні момант Архіў Янушкевіча ў Музеі літаратуры ў Варшаве складаецца з 7 спраў. У 2011–2012 гг. галоўным кусташам рукапіснага аддзела музея Вяславай Кардачук было зроблена іх папярэдняе

---

[3] Справа складаецца з трох тамоў. Першы том уключае 59 лістоў Яўгеніі Ларыш за 1832–1838 гг. (122 аркушы), другі том — 55 лістоў за кастрычнік 1838–1840 гг. (126 аркушаў). Трэці том храналагічна разрознены. Туды трапілі дакументы за 1841–1842 гг. і за перыяд 1852–1880 гг. (48 лістоў, 115 аркушаў). Ліставанне з мужам ахоплівае перыяд 1831–1871 гг. [33].

[4] З пералічанай карэспандэнцыі апублікаваны толькі лісты І. Лялевеля да Я. Янушкевіча і яго жонкі Я. Ларыш [29].

апісанне, абумоўленае падрыхтоўкай новага каталога, прысвечанага дакументам XIX ст. Акрамя згаданай вышэй справы з лістамі Яўгеніі Ларыш, збор уключае карэспандэнцыю Янушкевіча (1833–1856 гг., 31 ліст, 56 аркушаў), дзе асаблівую цікавасць выклікае яго ліст да Антонія Гарэцкага; лісты Караліны Марыі Ларыш [5] да Яўстафія Янушкевіча (1831–1842 г., 52 лісты, 101 аркуш); лісты Яўгеніі Янушкевіч да брата Караля Ларыша [6] (1852–1853 гг., 31 ліст, 78 аркушаў); карэспандэнцыя Яўгеніі Янушкевіч, а таксама яе бацькоў Караля Юзафа Ларыша [7] і Караліны Марыі Ларыш (1836–1869 гг., 35 лістоў, 65 аркушаў); лісты Караліны Марыі Ларыш з Грабоўскіх да дачкі Яўгеніі Янушкевіч (1851–1852 гг., 34 лісты, 90 аркушаў).

Акрамя гэтых лістоў у дадзены збор уваходзіць яшчэ адна каштоўная справа — «Лісты Яўстафія Янушкевіча да жонкі, Яўгеніі Янушкевіч з дому Ларыш» [34]. Справа ўтрымлівае 26 лістоў (большая частка з іх напісана на паперы памерам 13,5x1 см), датаваных 1835–1870 гг.

Трэба адразу адзначыць, што ў справу трапіла толькі невялікая частка эпісталярыя Я. Янушкевіча, адрасаваная жонцы Яўгеніі. Дадзеная выснова робіцца на падставе аналізу рукапісу Янушкевіча з бібліятэкі

---

[5] Караліна Марыя Ларыш (каля 1780–11.02.1852) — дачка ваўкавыскага старосты, дэпутата на чатырохгадовы сойм Паўла Грабоўскага і Веранікі Сцыпіёнаўны (п. 3.02.1851), 1 v. Велапольская, жонка Андрэя Велапольскага, дзядзькі графа Аляксандра Велапольскага, 2 v. Ларыш, жонка Караля Ларыша, маці Эдмунда Караля Максіміліяна (н. 16.11.1816, Осек), Яўгеніі (каля 1814–5.06.1892), Адэлі (1824–1890), жонкі графа Станіслава Дунін-Баркоўскага (1818–1884), і Караля (каля 1827–1853) [3, с. 102; 40, s. 29–50].

[6] Караль Ларыш (каля 1827–1853) — малодшы сын барона Караля Ларыша і Караліны Велапольскай з роду Грабоўскіх, брат Эдмунда Караля Максіміліяна, Яўгеніі і Адэлі. У карэспандэнцыі ў дачыненні да яго выкарыстоўваецца зменшанае імя Лоло. Памёр бяздзетным [Інф. Вяславы Кардачук].

[7] Юзаф Яўгеніўш Караль Ларыш герба Ларыш (10.02.1788–19.03.1869) — спадчыннік маёнтка Осек, сын Караля Вацлава (каля 1751–19.11.1803) і Алаізы Збароўскай (п. 11.01.1847), брат Людвікі (Луізы) (п. 1849), спадчынніцы Слупна, жонкі ардыната бельскага, князя Яна Сулкоўскага, і Максіміліяны (каля 1792–20.03.1815). У перыяд напалеонаўскіх войн Караль Ларыш служыў у французскай арміі, уваходзіў у склад атрада, утворанага яго шваграм Янам Сулкоўскім, які ўваходзіў у корпус Ю. Панятоўскага. 4 сакавіка 1807 г. атрымаў чын падпалкоўніка, пасля чаго хутка мабілізаваўся з войска. У 1809 г. пасля навучання ў Вене вярнуўся да маці ў Осек, дзе асеў і заняўся гаспадаркай. Каля 1813 г. уступіў у шлюб з Каралінай Велапольскай. Ад гэтага шлюбу нарадзіліся Эдмунд Караль Максіміліян, Яўгенія, Адэль, Караль. Напрыканцы жыцця Караль Ларыш пераехаў у Кракаў, дзе паводзе праекта архітэктара П. Бараньскага ў 1857–1861 гг. ім быў адбудаваны палац (сучасн. вул. Усіх Святых, 6), дзе ён і памёр [3, с. 102; 26, s. 352; 36, s. 298; 39, s. 278–279; 40, s. 29–50; Інф. Вяславы Кардачук].

тэкі Ягелонаў, крыніцай для напісання якога ў 1871 г. сталі яго лісты да жонкі за перыяд 1831–1851 гг. [22]. Гэты рукапіс са збораў Ягелонскай бібліятэкі, які ў пэўнай ступені магчыма аднесці да ўспамінаў, прадстаўляе сабой вытрымкі з лістоў Янушкевіча да сваёй нарачонай Яўгеніі, дачкі барона Караля Ларыша з маёнтка Осек на Галіцыі ад моманту іх знаёмства ў лістападзе 1831 г. да шлюбу ў жніўні 1851 г. Першы ліст датуецца 29 лістапада 1831 г., а апошні 28 ліпеня 1851 г. Дадзены рукапіс быў напісаны ў 1871 г. напрыканцы жыцця Янушкевіча і складаўся з апісання найбольш істотных, на погляд аўтара, падзей асабістага, эміграцыйнага і еўрапейскага жыцця насычанага на разнастайныя падзеі дваццацігоддзя. Фрагменты за пэўныя даты адрозніваюцца паміж сабой і памерам, і інфармацыйнай вартасцю. На наш погляд, у многім гэта абумоўліваецца тымі мэтамі, якія ставіліся аўтарам рукапісу. Гэта перш за ўсё спроба атаесамлення эміграцыйных падзей на фоне уласных жыццёвых пакут. Рукапіс напісаны для народжанай у Парыжы ў 1853 г. дачкі Марыі, для якой Янушкевіч імкнуўся пакінуць свой жыццяпіс эпісталярнага кшталту. Гэтыя абставіны падштурхоўвалі аўтара да адлюстравання свайго месца ў гісторыі эміграцыі, сваіх сувязяў з такімі знакамітымі асобамі, як А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, М. Махнацкі, Ф. Шапэн, польскімі генераламі паўстання 1830–1831 гг. (Л. Пацам, Ю. Двярніцкім, Г. Дэмбінскім і інш.), а таксама еўрапейскай інтэлектуальнай элітай.

Параўнанне дадзенага рукапісу і яго эпісталярыя з варшаўскага Музея літаратуры паказвае, што да 2 снежня 1835 г., даты першага ліста да Яўгеніі Ларыш з музейнага збору, Янушкевічам было напісана больш за 42 лісты да сваёй нарачонай. А ўвогуле, агульная іх колькасць за перыяд 1831–1871 гг., час ліставання паміж нарачонымі, можа налічваць каля 162 лістоў [33].

Рэканструяваць адсутныя лісты Янушкевіча можна толькі ў пэўнай ступені. Справа ў тым, што яго эпісталярый з адлюстраваннем эміграцкага жыцця ў Парыжы прыцягнуў да сябе ўвагу даследчыкаў яшчэ ў XIX ст. Адным з першых ёй скарыстаўся Уладзіслаў Міцкевіч пры напісанні жыццяпісу свайго бацькі. Можна выказаць нават меркаванне, што Яўгенія Янушкевіч, якая на момант падрыхтоўкі рукапісу У. Міцкевічам, што прыпадае на канец 80-х гг. XIX ст., жыла ў Кракаве і сама дала дазвол на карыстанне прыватным эпісталярыем свайго мужа. Трэба адзначыць, што згаданы вышэй рукапіс Янушкевіча і яго лісты становяцца для У. Міцкевіча дастаткова важнай крыніцай. Яны шырока цытуюцца, а ў некаторых выпадках выкарыстоўваюцца для аднаўлення важных падзей з жыцця А. Міцкевіча. У гэтым сэнсе перш за ўсё трэба згадаць ліст Я. Янушкевіча ад 28 снежня 1840 г., у якім ён апісвае Яўгеніі Ларыш святкаванне імянін А. Міцкевіча, якія адбыліся 25 снежня 1840 г.

У справе рэканструкцыі прыватнага эпісталярыя Янушкевіча за 1831–1851 гг. не менш каштоўнымі з'яўляюцца матэрыялы Юзафа Каленбаха, які таксама скарыстаўся поўным зборам лістоў эмігранта, прадстаўленых яму ў даследчыцкіх мэтах дачкой Янушкевіча Марыяй і яе мужам Канстанцінам Попелем [27, s. 443]. У выніку Ю. Каленбахам у 1909 г. у часопісе «Lamus» былі надрукаваны ўрыўкі з лістоў Янушкевіча да жонкі за 1833–1841 гг., якія да сённяшняга часу выклікаюць зацікаўленасць у даследчыцкім асяроддзі.

Адносна збору прыватнага эпісталярыя Я. Янушкевіча ў фондах варшаўскага Музея літаратуры варта заўважыць, што яго 26 лістоў амаль невядомы сучасным даследчыкам [34]. Першыя 10 лістоў датуюцца 1835–1851 гг., астатнія паходзяць з канца 60-х – пачатку 70-х гг. XIX ст., часу, калі муж і жонка расставаліся на кароткі час. Толькі адзін ліст з гэтай справы быў скарыстаны самім Я. Янушкевічам пры напісанні ўспамінаў. Менавіта гэты ліст ад 28 ліпеня 1851 г. з апісаннем падрыхтоўкі да шлюбу, які адкладаўся паміж Яўгеніяй і Яўстафіем Янушкевічамі па розных суб'ектыўных прычынах на працягу дваццаці гадоў, падрыхтаваны намі да друку.

## Дадатак

**28.07.1851. — Ліст Яўстафія Янушкевіча, напісаны ў замку Сайн [8] і адрасаваны нарачонай Яўгеніі Ларыш у Осек [9].**

*[k. 19]* 28 lipca 1851 [roku]. Sayn

Dziś rano o god[zinie] 7$^{mej}$ wpadam do Sayn zostawiwszy Kozuchowskich w Cologne i z nadzieją że jutro z niemi w Coblentz się zjadę. Dziś tedy cały dzień pracuję z księciem nad Minami i wyprawiamy metallurjistę na Litwę, jutro interes leśny skończym i wyszlemy do Londynu Arndta, a 30 o god[zinie] 9$^{tej}$ rano ruszam przez z Sayn do Kolonii. Odprowadzę księcią do Bonn a o 10$^{tej}$ wieczorem puszczam się do Drezna. 31 jestem w Dresnie. 1 sierpnia o god[zinie] 6 wyjezdzam do Wrocławia gdzie nocuję bo taki zmęczony że musze dwie jedną noc

[8] Сайн — замак прадстаўнікоў роду Сайн-Вітгенштэйнаў, размешчаны каля горада Кобленц у графстве Сайн і Вітгенштэйн на паўночным захадзе Прусіі.

[9] Осек — маёнтак у Галіцыі, размешчаны ў ваколіцах Асвенцыма. Каля 1799 г. Караль Вацлаў Ларыш набыў яго ў Валерыі Браніцкай з роду Шэмбекаў, жонкі кашталяна рацлаўскага. Затым маёнтак перайшоў у спадчыну яго сына Караля, бацькі Яўгеніі, будучай жонкі Яўстафія Янушкевіча. Пасля смерці Караля ў 1869 г. маёнтак перайшоў праз дачку Адэль да Станіслава Дунін-Баркоўскага. У 1884 г. Осек набыў Оскар Рудзінскі [38].

przespać, aby ciebie nie przestraszyć upiorem [10]. 2 rano wyjadę z Wrocławia i będe u Was podobnie jak w roku 1849 o godzinie 8 wieczorem. Jeśli chcesz suknie swe zabrać do Osieka to przyjedźcie po mnie do Berania, inaczej zostawię je w Karymie u Polaka. 3[go] bawię z wami, 4[go] jadę i wracam z Krakowa. 5go ślub i wyjazd.

Pojedziemy do Drezna i Berlina i gdzie zechcesz. *[k. 19 v.]* Widzisz tedy kochana Żenio że twój list z 22 lipca ktory mi xiąże dziś oddał przydał pospiechu. Ślub musi się odbyć 5[go] koniecznie, bo w Paryżu wszyscy xięża Polscy ogromne nabożeństwo na naszą intencyą odprawiają. Tow[arzystwo] historyczne tegoż dnia ma posiedzenie i Prezes Czart[oryski] o mnie nieobecnym a gorliwym członku ma donieść publicznie kolegom powod mej nieobecności. Xiąże są tu z całym dworem w Kaplicy za nas się modli. Romuald jedzie do Einsideln [11] do Matki Boskiej. Jednem [12] słowem wielki by zawod był w życzeniach i modłach.

Nie przyjade w poniedziałek jak życzysz, ale w sobote. W poned[iałek] będziemy w Krakowie, a we wtorek chciałbym się spowiadać i kommunikować [13] razem z tobą podczas mszy ślubnej.

Piękny prezent kupiłem dla x[iędza] proboszcza za 10 f[ranków]. Pieczątka srebrna pozłacana z figurą Matki Boskiej i dzieciątka Jezus przeslicznej roboty. Może to się mu podoba.

*[k. 20]* Mój paszport jest dla interesow familii — niepozwoliłem aby kładli że jadę się żenić, bo coby to miało za minę żeby policya wszystkie wiedziały dla czego jadę. W Prussię nikt cię o paszport nie zapyta, przynajmniej tu na granicy Pruskiej kobiet niepytają. Z resztą formalność sama jest małą rzeczą — czy jak Larisz czy jak P[ani] Eust[achowa] przejedziesz. A na przyszłość otrzymamy co zechcemy. Jesli Papa zechce to kupiemy sobie za 10 funt[ów] sterl[ingów] obyw[atelstwo] Angielskie.

Kochana Eugenio i ja zakończę mój list tem samem życzeniem ktorem ty swoj zakończyłaś, abyś nigdy nie żałowała końca naszej 20sto letniej korrespondencyi. Już do Panny Eugenii więcej pisać niebędę. Przyjacólkę, Kochankę żegnam. A odtąd powitam ją jak żonę i wiecznie kochać nieprzestanne.

Tak mi Panie Boże dopomóż.
Eustachy

*Крыніца:* Muzeum Literatury imienia Adama Mickiewicza, inw. 5965, k. 19–20.

---

[10] У сучаснай польскай мове выкарыстоўваецца варыянт напісання слова *Upiór*.
[11] Дакладнае напісанне горада *Einsiedeln.*
[12] У сучаснай польскай мове выкарыстоўваецца варыянт напісання слова *Jednym*.
[13] У сучаснай польскай мове выкарыстоўваецца варыянт напісання слова *Komunikować*.

## Пераклад

*[арк. 19]* 28 ліпеня 1851 [года]. Сайн [14]

Сёння рана а 7 гадзіне, пакінуўшы Кажухоўскіх у Кёльне з надзеяй сустрэцца з імі заўтра ў Кобленцы [15], прыбуду ў Сайн. Сёння тады цэлы дзень буду працаваць з князем [16] над Minami [17] і адправім металурга [18] ў Літву, заўтра разбярэмся з ляснымі справамі і адашлем у Лондан Арнта, а 30 [ліпеня] а 9ай гад[зіне] рана выеду з Сайн у Кёльн. Адпраўлю князя ў Бон і а 10ай увечары з’еду ў Дрэздэн. 31-га я буду ў Дрэздэне. 1 жніўня а 6 гад[зіне] выязджаю да Уроцлава, дзе пераначую, бо такі стомлены, што вымушаны адну-дзве ночы паспаць, каб ты не прыняла мяне за прывід. 2-га [жніўня] рана выеду з Уроцлава і буду ў Вас а 8 гадзіне ўвечары, падобна , як ў 1849 [годзе]. Калі жадаеш свае сукенкі забраць у Осек, то прыязджайце па мяне ў Беры [19], інакш пакіну іх у Карыме ў паляка. 3га [жніўня] правяду з вамі, 4га еду ў Кракаў і ў гэты ж дзень вяртаюся. 5га шлюб і выезд.

---

[14] Ва ўспамінах Я. Янушкевіча згаданыя падзеі апісаныя наступным чынам: «30 [ліпеня] выязджаю ў Кёльн, 31 [ліпеня] буду ў Дрэздэне. 1 жніўня спынюся на начлег ва Уроцлаве, 2-га выязджаю рана і, напэўна, буду ў Осеку каля 8 гадзіны ўвечары, як у 1849 г[одзе]. 3 [жніўня] пабуду з вамі, 4 [жніўня] еду да Кракава, 5 — шлюб. Абавязкова 5-га, таму што ў гэты дзень усе польскія святары ў Парыжы правядуць набажэнства, прысвечанае нашаму намеру, і на пасяджэнні Гістарычнага таварыства ў гэты дзень мая адсутнасць будзе апраўдана аб’явай аб маім шлюбе. Нават Рамуальд паабяцаў у гэты дзень быць у Айнзідэльне. [...], а для каплана, які будзе праводзіць цырымонію, маю прыгожую срэбную фігурку Божай маці з маленькім Ісусам. Заканчваю ліст тым самым пажаданнем, якім і ты свой апошні ліст: каб ты ніколі не шкадавала з заканчэння нашага дваццацігадовага ліставання. Да пані Яўгеніі болей пісаць не буду, з ёй развітваюся назаўжды, а вітаю Каханую жонку. Правядзем у Сайн найболей 2 тыдні. 18-га жніўня там будзе прускі кароль». Цыт. па: [22, s. 217–218].

[15] Кобленц — горад на паўночным захадзе Прусіі.

[16] Аўтарам ліста, хутчэй за ўсё, згадваецца святлейшы князь Людвік Вітгенштэйн (7.06.1799–8.06.1866), які пасля смерці ў 1832 г. сваёй першай жонкі Стэфаніі Радзівіл (1809–1832), хворай на сухоты, у 1834 г. ажаніўся з Леанілай Баратынскай і з’ехаў у Францыю. Пасля французскай рэвалюцыі 1848 г. яны перабраліся з Парыжа ў ваколіцы Франкфурта-на-Майне, дзе набылі замак Сайн, былы радавы маёнтак Сайн-Вітгенштэйнаў, і перабудавалі яго ў неагатычным стылі. Кантакт, які паўстаў у 1828 г. паміж Я. Янушкевічам і Людвікам Вітгенштэйнам падчас падрыхтоўкі справаздачы аб стане маёмаснай спадчыны, працягваўся і пасля эміграцыі Янушкевіча ў Францыю. У 1833 г. прадстаўнікі роду Радзівілаў нават заклікалі апошняга прыняць амністыю і заняцца ўпарадкаваннем іх спадчыны [22, s. 20].

[17] *Mine* (фр.) — руднікі, капальні, шахты.

[18] Размова, магчыма, ідзе аб адпраўцы спецыяліста па здабычы торфу ці руды.

[19] Беры (Biery, Berau) — вёска ў Бельскім павеце Шлёнскага ваяводства.

Паедзем у Дрэздэн і Берлін і куды яшчэ пажадаеш. *[арк. 19 адв.]* Бачыш, каханая Жэня [20], што твой ліст ад 22 ліпеня, які аддаў князь, прыспешыў мяне. Шлюб павінен адбыцца менавіта 5-га [жніўня], таму што ў Парыжы ўсе польскія ксяндзы арганізуюць вялікае набажэнства ў наш гонар. У той жа самы дзень адбудзецца пасяджэнне ў Гістарычным тав[арыстве] [21], і старшыня Чарт[арыйскі] [22] пра мяне, як адсутнага, але чыннага сябра, публічна абвесціць калегам, з якой нагоды я адсутнічаю. Ксяндзы тут усе разам у капліцы будуць маліцца за нас. Рамуальд [23] едзе ў Айнзідэльн [24] да Божай Маці. Адным словам, значная прычына была б для віншаванняў і малітваў.

---

[20] Яўгенія Ларыш.

[21] Польскае гістарычнае таварыства пачаткова з'яўлялася структурнай часткай утворанага 29 красавіка 1832 г. у Парыжы Польскага літаратурнага таварыства (ПЛТ), якое праіснавала да 1854 г. Заснавальнікамі ПЛТ былі Юзаф Бем, Людвік Плятэр, Тэадор Мараўскі і інш., старшынёй з'яўляўся А. Чартарыйскі. У якасці галоўнай мэты таварыства абрала распаўсюджванне інфармацыі па польскаму пытанню ў Заходняй Еўропе. У 1836 г. у межах таварыства адчыняецца гістарычны аддзел, сябрамі якога праводзіліся архіўныя даследаванні па гісторыі Рэчы Паспалітай у еўрапейскіх сховішчах (старшыня Ю. У. Нямцэвіч). У 1851 г. з ПЛТ у якасці самастойнай структуры вылучаецца Гістарычны аддзел, які ўтварае самастойнае Гістарычнае таварыства. У 1854 г. гэтыя дзве арганізацыі аб'ядналіся і ўтварылі Польскае гісторыка-літаратурнае таварыства.

[22] Адам Ежы Чартарыйскі (14.1.1770–15.7.1861) — польскі і расійскі дзяржаўны дзеяч. З 1801 г. адзін з бліжэйшых дарадцаў імператара Аляксандра І, у 1804–1806 гг. міністр замежных спраў, у 1803–1824 гг. куратар Віленскай навучальнай акругі. З 1825 г. адзін з лідэраў легальнай кансерватыўнай апазіцыі супраць антыпольскай палітыкі Мікалая І. У 1830–1831 гг. узначальваў сенат і Нацыянальны ўрад. Пасля паўстання эмігрыраваў, спачатку знаходзіўся ў Англіі, затым у Францыі. Узначальваў кансерватыўна-манархічную плынь, яго парыжская рэзідэнцыя "Гатэль Ламбер" стала цэнтрам польскай палітычнай эміграцыі. Арганізатар шэрагу эмігранцкіх таварыстваў, мецэнат у галіне культуры і навукі [2, с. 149–150].

[23] Рамуальд Янушкевіч (31.3.1808–31.3.1865, Нантэр) — сярэдні брат Яўстафія Янушкевіча, які нарадзіўся ў фальварку Вусава Слуцкага павета. Пачаткова ён вучыўся ў Нясвіжскай школе, дзе скончыў 3 класы, з 1821 г. у Слуцкай гімназіі, перад паўстаннем вывучаў права ў Віленскім універсітэце, пасля заканчэння якога працаваў у канцылярыі М. Навасільцава. У сакавіку 1831 г. далучыўся да паўстання, з 13 чэрвеня 1831 г. паручнік у штабе Антонія Гелгуда. 13 ліпеня 1831 г. перайшоў з яго корпусам межы Прусіі. Па рашэнні Мінскай губернскай следчай камісіі ад 31 жніўня 1833 г. аднесены да 2-га разраду злачынцаў. У студзені 1832 г. эмігрыраваў у Францыю. Спачатку знаходзіўся ў закладзе ў Авіньёне, затым перабраўся ў Парыж. У 1833 г. падчас высылкі брата Яўстафія з Парыжа займаўся справамі кнігарні. З 1841 г. з'яўляўся адным з прыбліжаных Андрэя Тавянскага. 25 ліпеня 1857 г. ажаніўся, меў сына Тадэвуша і дачку Караліну (н. 1858). Памёр і пахаваны ў Нантэры [1, с. 381–382; 3, с. 172–173].

[24] Айнзідэльн — горад у Швейцарыі, які з XIV ст. вядомы як паломніцкі цэнтр пакланення Дзеве Марыі.

Я не прыеду ў панядзелак, як жадаеш ты, а буду ў суботу. У панядз[елак] будзем у Кракаве і ў аўторак хацеў бы прычасціцца і спавядацца разам з табой падчас шлюбнай імшы.

Я набыў прыгожы прэзент для к[сяндза] пробашча за 10 ф[ранкаў]. Выдатнай работы срэбная пячатка з пазалотай, з выявай Божай Маці і маленькага Ісуса. Можа, яна яму спадабаецца.

*[арк. 20]* Мой пашпарт выданы па справах Фаміліі [25] — таму я не дапусціў, каб у яго ставілі пячатку, што я еду жаніцца, бо як бы гэта выглядала, калі б уся паліцыя ведала, па якой справе я еду. У Прусіі ніхто ў цябе пашпарт не спытае, ва ўсякім выпадку ў жанчын на прускай мяжы яго не патрабуюць. З астатніх фармальнасцеў самая дробная, як хочаш прыехаць — ці як Ларыш, ці як п[ані] Яўст[ахава]. На будучыню атрымаем тое, што пажадаем. Калі тата [26] захоча, то набудзем сабе за 10 фунт[аў] сцерл[інгаў] ангельскае грам[адзянства].

Каханая Яўгенія, і я заканчваю свой ліст тым жа самым пажаданнем, якое ты змясціла ў сваім. Каб ты ніколі не шкадавала аб заканчэнні нашага 20-гадовага ліставання. Я не буду больш пісаць да панны Яўгеніі. Я развітваюся з сяброўкай, каханкай. І з гэтай хвіліны вітаю цябе, як жонку, і ніколі кахаць не перастану.

Дапамажы мне ў гэтым, Божа.
Яўстафій

*Крыніца:* Музей літаратуры імя Адама Міцкевіча, інвентарны нумар 5965, арк. 19–20.

## Крыніцы і літаратура


1. Гарбачова, В. В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гадоў на Беларусі: біябібліяграфічны слоўнік. Другое выданне. — Мн.: БДУ, 2006. — 400 с.
2. Ерашэвіч, А. Чартарыйскі Адам Ежы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 6. — Кн. 2. — Мн.: БелЭн, 2003. — С. 149–150.
3. Янушкевіч, Я. Успаміны (1805–1831) / Яўстафій Янушкевіч; уклад., пер. з польск. мовы, уступ. арт., камент., паказ. В. В. Гарбачовай. — Мн.: Лімарыус, 2011. — 256 с.
4. Biblioteka Jagiellońska (BJ), przyb. 33/62. Teka papierów osobistych i korespondencji Eustachego Januszkiewicza (1805–1874).
5. BJ, przyb. rkps 158/74. List do Eustachego Januszkiewicza Bronisława Zaleskiego.
6. BJ, przyb. rkps 205/69. Listy Józefa Chłopickiego z lat 1837–1838.


[25] Маецца на ўвазе сям'я Вітгенштэйнаў, да якой перайшла спадчына Радзівілаў пасля смерці спадкаемцы Стэфаніі Радзівіл.

[26] Згадваецца бацька Яўгеніі Ларыш барон Караль Ларыш.

7. BJ, przyb. rkps 206/69. Listy Henryka Dembińskiego z 1843.
8. BJ, przyb. rkps 207/69. Listy Waleriana Kalinki z 1863, 1867–1870.
9. BJ, przyb. rkps 208/69. Listy Alberta Kazimierskiego z lat 1850, 1856, 1871.
10. BJ, przyb. rkps 209/69. Listy Juliana Klaczki do Eustachego Januszkiewicza z lat 1860–1872 i żony z lat 1870–1888.
11. BJ, przyb. rkps 210/69. Listy Samuela Różeckiego do Karola Larysza z 1831–1832.
12. BJ, przyb. rkps 211/69. Listy gen. Józefa Skrzynieckiego.
13. BJ, przyb. rkps 217/69. Listy z Syberii Adolfa Januszkiewicza do Eugenii Larysz 1832, 1836, 1843.
14. BJ, przyb. rkps 219/69. Listy J. Lelewela do Eustachego Januszkiewicza 1838–1855 oraz do Eugenii Januszkiewiczowej z lat 1853–1856.
15. BJ, przyb. rkps 221/69. Listy F. Wrotnowskiego z lat 1838–1867.
16. BJ, przyb. rkps 222/69. Listy Bronisława Zaleskiego z lat 1842, 1850, 1868.
17. BJ, przyb. rkps 223/69. Listy Bronisława Zaleskiego z lat 1861, 1870, 1871.
18. BJ, przyb. rkps 225/69–231/69. Listy Adama Mickiewicza 1836, 1846, 1847.
19. BJ, przyb. rkps 234/69. Listy Leonarda Chodźki z lat 1841, 1855, 1856.
20. BJ, przyb. rkps 235/69. Listy Juliana Niemcewicza z 1839.
21. BJ, przyb. rkps 237/69. Listy Bronisława Trentowskiego z 1842.
22. BJ, przyb. rkps 256/69. Eustachy Januszkiewicz. Wyjątki z korespondencii z lat 1831–1871.
23. BJ, przyb. rkps 257/69. Eustachy Januszkiewicz. Pamiętnik.
24. BJ, przyb. rkps 258/69. Eugenia z Laryszów Januszkiewicz. Pamiętnik.
25. BJ, przyb. rkps 259/69. Eugenia z Laryszów Januszkiewicz. Pamiętnik. Ciąg dalszy.
26. Boniecki, A. Herbarz polski. T. 13: Krzemieniowscy — Lasoccy. — Warszawa: Księgarnia Gebethnera i Wolffa, 1909. — 400 s.
27. Kallenbach, J. Z epoki emigracyjnej (1833–1841) // Lamus. Lwów, 1909. — Z. 3. — S. 440–470.
28. Katalog rękopisów Muzeum Literatury im. Adama Mickiewicza w Warszawie. T. 1: Sygnatura 1–500. Literatura Polska XIX w. Mickiewiczana / oprac. T. Januszewski, W. Kordaczuk, G. Nieduszyńska, M. Polakowska. — Warszawa: Drukarnia Naukowo-Techniczna, 1996. — 346 s.
29. Lelewel, J. Listy emigracyjne / Wyd. H. Więckowska. — T. 5. — Wrocław -Kraków: Zakład im Ossolińskich, 1956. — 266 s.
30. Manteufflowa, M. Plater Ludwik August // Polski słownik biograficzny. — T. 26. — Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdańsk-Łódź: Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1981. — S. 679–683.
31. Mickiewicz, A. Dzieła wszystkie. Wydanie sejmowe / oprac. s. Pigoń. — T. XVI. Rozmowy z Adamem Mickiewiczem. — Warszawa: Nakładem Skarbu Rzeczypospolitej Polskiej, 1933. — 560 s.
32. Mickiewicz, Wł. Żywot Adama Mickiewicza. — T. III. — Poznań: Drukarnia Dziennika Poznańskiego, 1894. — 564 s.

33. Muzeum Literatury imienia Adama Mickiewicza (Muz. Lit.), inw. 4443, 5965. Archiwum Januszkiewicza. Listy Eugenii Januszkiewicz do męża, Eustachego Januszkiewicza.
34. Muz. Lit. inw. 5965. Archiwum Januszkiewicza. Listy Eustachego Januszkiewicza do żony, Eugenii Januszkiewicz z d. Larisch.
35. N. O. Improwizatorowie//DziennikLiterackiz22.02.1841.—№ 8.—s. 60–61.
36. Ostrowski, J. Księga herbowa rodów polskich. — Cz. 1. — Warszawa: Druk Józefa Sikorskiego, 1897. — 620 s.
37. Popiel, P. Rodzina Popielów herbu Sulima z przydomkiem Chościak. Rys historyczny. — Kraków: Druk W.L. Anczyca i Spółki, 1936. — 132 s.
38. Szyposz, J. Z historii rodu Larisch. [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://larisch-larysz.eu/aktualnoci/139-z-historii-rodu?lang=. — Дата доступа: 20.01.2013.
39. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. — T. 8. — Warszawa: Księgarnia Gebethnera i Wolffa, 1911. — 379 s.
40. Wawel-Louis, J. Okruszyny historyczne zbierane po dawnych aktach, archiwach i dziennikach. — Serya 1. — Kraków: Drukarnia „Czasu", 1898. — 115 s.
41. Zbiory rękopisów w bibliotekach i muzeach w Polsce / Oprac. D. Kamołowa przy współudziale K. Muszyńskiej. — Warszawa: Biblioteka Narodowa, 1988. — 492 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 25.01.2013

*С. А. Чукіла*

## Матэрыялы архіва Пустынскага Успенскага мужчынскага манастыра ў НГАБ

Настаўнікі… 

Паводле вядомага сцвярджэння, гісторыю пішуць пераможцы, і яны вызначаюць неабходнасць захоўвання тых ці іншых дакументаў. Канфесійныя архівы доўгі час заставаліся незапатрабаванымі ў навуковых даследаваннях, чаму спрыяла негатыўнае стаўленне дзяржавы да рэлігіі. Аднак менавіта ў праваслаўных і каталіцкіх архівах зберагліся найбольш унікальныя дакументы, якія з'явіліся падмуркам не толькі пры рэканструкцыі гісторыі, але і пры аднаўленні культурнай спадчыны Беларусі. Руплівае вывучэнне канфесійных архіўных матэрыялаў ставіць сваёй мэтай ажыццяўленне згаданых задач. Захаваныя дагэтуль звесткі аб станаўленні і развіцці канфесій на тэрыторыі сучаснай Беларусі на сённяшні дзень цяжкадаступныя для беларускіх навукоўцаў, бо асноўная маса іх лакалізавана ў гістарычных архівах Польшчы, Літвы, Украіны, Расіі, у рукапісных аддзелах бібліятэк, у іншых архівах і

прыватных зборах краін блізкага і далёкага замежжа [4]. Такая сітуацыя ў поўнай меры датычыцца і дакументальнай спадчыны Пустынскага Успенскага мужчынскага манастыра, які знаходзіцца ў Мсціслаўскім раёне Магілёўскай вобласці.

Адным з першых даследчыкаў гісторыі Пустынскага манастыра з'яўляўся гісторык, археограф і архівіст Іван Іванавіч Грыгаровіч, які ў пачатку XIX ст. абследаваў архіў гэтага манастыра і выявіў там прывілеі вялікіх князёў літоўскіх Жыгімонта I Старога і Жыгімонта III Вазы, а таксама мсціслаўскага князя Міхаіла Іванавіча [3, с. 97]. Самым дасціпным даследчыкам мінулага дадзенага манастыра можа лічыцца сучасны гісторык уніяцкай царквы Сяргей Міхайлавіч Клімаў. Яго праца «Пустынскі хранограф» цалкам прысвечана гісторыі манастыра, а навуковы твор «Базыльяне» закранае гісторыю яго архіва.

Пустынскі Успенскі мужчынскі манастыр заснаваны ў 1380 г. родапачынальнікам мсціслаўскіх князёў Сямёнам-Лынгвенем — сынам вялікага князя літоўскага Альгерда і зяцем маскоўскага князя Дзмітрыя Данскога — недалёка ад горада Мсціслава, на правым беразе ракі Аслянка, дзе згодна з паданнем з'явіўся цудадзейны абраз, а з-пад зямлі пачала біць крыніца з гаючай вадой [38, с. 54–56]. Акрамя Пустынскага Лынгвень Альгердавіч пабудаваў і Ануфрыеўскі мужчынскі манастыр.

Невялікі манастыр, дзякуючы шчодрым ахвяраванням, ужо ў XV ст. валодаў даволі значнай маёмасцю. Напачатку XVI ст. яму належалі вёскі Аўдзейкава, Радзівонаўка, Слабада, Рацукоўская, Перасадзіна, сенажаці за рэкамі Віхра і Сож, пожня Горабская, двор і прысядзібны ўчастак у Мсціславе, вялікая колькасць сялян. Акрамя таго, манастыр меў правы на бортніцтва, лоўлю рыбы, баброў, звяроў, свабодную пабудову млыноў на рацэ Віхры, самастойны суд над манастырскімі сялянамі [38, с. 55].

Са смерцю Івана Юр'евіча, унука Сямёна Лынгвеня, згасла мужчынская лінія роду князёў Мсціслаўскіх, і ў 1527 г. манастыр разам з удзельным княствам перайшоў пад кіраўніцтва каралеўскай канцылярыі. Падчас другой Лівонскай вайны Івана Грознага з Жыгімонтам II Аўгустам, якая пачалася ў 1563 г., адны манахі Пустынскага манастыра былі забіты, другія пакінулі манастыр у пошуках больш бяспечнага месца. Збудаванні засталіся пад аховай аднаго-двух манахаў. Пустынскі манастыр у 1601 г. перададзены ўніятам і заселены манахамі базыльянскага ордэна [36].

Пасля ўваходжання тэрыторыі Рэчы Паспалітай у склад Расійскай імперыі Пустынскі манастыр некаторы час заставаўся ўніяцкім. Толькі ў 1839 г. ён быў зноў перададзены праваслаўным манахам. Але, згодна з кліравай ведамасцю манастыра за 1844 г., базыльянскія манахі працягвалі знаходзіцца ў ліку брацііі праваслаўнага манастыра (напрыклад,

«забаронены святар Іаан Гаўрылаў Раяновіч») [16, арк. 3]. З 1842 г. Пустынскі манастыр быў прылічаны да III класа расійскіх манастыроў [6, с. 43]. Паколькі забеспячэнне трэццякласнага манастыра сродкамі дзяржавы было нездавальняючым (770 рублёў на паўгода, з якіх 480 рублёў ішло на ўтрыманне настаяцеля, брацii i манахаў), то да 1860 г. манастыр апынуўся ў цяжкім становішчы [26, арк. 1–1 адв.]. Дзякуючы актыўнай дзейнасці ігумена Анатолія на адраджэнне абіцелі было сабрана 10 442 рублі 82 ½ кап. [33, арк. 55 адв.]. Пазней быў створаны будаўнічы камітэт, які да 1870 г. цалкам аднавіў манастыр і пабудаваў вакол усяго манастырскага комплексу цагляную сцяну. У 1869 г. пры манастыры заснавана праваслаўнае брацтва, і ў 1870 г. у новым двухпавярховым цагляным корпусе адкрыта царкоўна-настаўніцкая земляробчая школа.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў 1919 г. з мэтай захавання манастыра манахі стварылі земляробчую камуну, якая праіснавала непрацяглы час. У 1925 г. насельнікі былі канчаткова выселены з абіцелі. У манастыры размясціўся дзіцячы дом, ён знаходзіўся там у час і пасля Вялікай Айчыннай вайны [37]. Пазней у манастырскіх будынках размяшчалася школа для дзяцей з навакольных вёсак. У 1970-я гг. школу пры манастыры зачынілі. У цяперашні час адбываецца маштабная рэканструкцыя манастыра. Але ў аднойленай каплічцы каля крынічкі і купелі ўжо праводзяцца службы. З кожным годам павялічваецца колькасць наведвальнікаў манастыра як турыстычнага аб’екта Мсціслаўшчыны, мясцовай святыні і духоўнага цэнтра.

Архіўных дакументаў з апісаннем падзей з гісторыі Пустынскага манастыра захавалася вельмі мала, асабліва тых, што адносяцца да перыяду яго адкрыцця і станаўлення. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі знойдзена толькі некаторая частка справаводных і статыстычных дакументаў, якія датычацца больш позняй гісторыі манастыра.

Як сведчаць гістарычныя даследаванні, з самага пачатку найбольш каштоўныя актавыя дакументы (прывілеі, граматы, фундушы) захоўваліся не толькі ў манастырскім архіве. Яны шмат разоў капіраваліся і зберагаліся як ва ўласнікаў падараванай маёмасці, так і ў розных іншых установах.

У вопісе Пустынскага манастырскага архіва за 1841 г. указваецца, што пад № 1 у ім знаходзіўся «дакумент 7008 года (1500 г. — *С. Ч.*) ад стварэння свету, верасня 14 дня, індыкта III, зацверджаны каралямі польскімі Аляксандрам, Жыгімонтам [1] і Уладзіславам IV у 1644 годзе, сакавіка 3, на першапачатковае зацвярджэнне фундушовай зямлі на карысць Пустынскага манастыра, ахвяраванай сакратаром польскага караля Аляксандра Богушам Багатовічам... » (С. М. Клімаў слушна лічыць,

[1] Які Жыгімонт маецца на ўвазе — з дакумента не зразумела.

што, верагодней за ўсё, Богуш Багатовіч пацвердзіў манастыру раней нададзены ад караля зямельны фундуш) [14, арк. 17].

З моманту пераходу тэрыторыі Мсціслаўскага княства ў разрад каралеўскіх зямель сацыяльны статус дабрадзеяў манастыра знізіўся. Згодна з дакументамі, апублікаванымі ў «Беларускім архіве старажытных актаў», і даследаваннямі С. М. Клімава, «па распараджэнні караля Жыгімонта I на манастыр пералічвалася частка грашовай дані (сярэбшчызны) з даходаў Крычаўскага замка, але зямельных «ахвяраванняў» вярхоўныя ўлады ўжо не рабілі. Новым дабрадзеем манастыра выступае мясцовая шляхта» [6, с. 19].

Кароль Жыгімонт III у 1601 г. прызначыў ігуменам Пустынскага манастыра Афанасія Валчанскага, каб той перавёў манастыр у падпарадкаванне ўніятаў [6, с. 33]. У 30–40-я гг. XIX ст., калі расійскія ўлады на сваёй тэрыторыі распусцілі ордэн і раздалі яго нерухомасць розным ведамствам, архіў Пустынскага манастыра ўніятаў ордэна святога Васіля Вялікага, т. зв. базыльян, быў страчаны.

Актуальнасць дадзенага артыкула звязана з разуменнем выключнай ролі дакументаў з манастырскіх архіваў для даследавання канфесійнай гісторыі краіны. Мэта працы — характарыстыка асобных блокаў дакументаў Пустынскага манастыра, якія захоўваюцца ў аднайменным фондзе Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) «Пустынскі Успенскі мужчынскі манастыр». Усяго фонд змяшчае 69 спраў з архіва манастыра, пачынаючы з 1841 г., калі ён зноў стаў праваслаўным. Некаторыя матэрыялы аб яго дзейнасці захоўваюцца ў фондзе «Магілёўская духоўная праваслаўная кансісторыя». Акрамя НГАБ асобныя дакументальныя матэрыялы Пустынскага архіва зберагаюцца ў фондах «Духоўная кансісторыя епіскапства літоўскіх уніятаў» Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы [2, с. 48], «Канцылярыя мітрапаліта грэка-ўніяцкіх цэркваў у Расіі» Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Санкт-Пецярбургу [1, с. 308].

За назапашванне і зберажэнне манастырскіх дакументаў адказвалі спецыяльныя манахі, працай якіх кіраваў ігумен на падставе інструкцый, распрацаваных вышэйстаячымі органамі епархіяльнай улады. Паколькі Пустынскі манастыр быў невялікім па колькасці насельнікаў, то наўрад ці склад работнікаў яго архіва быў большым чым адзін манах. Менавіта ён адказваў за захаванне і павелічэнне дакументаў манастырскага архіва і наогул за вядзенне справаводства ў манастыры.

Найбольш важнымі дакументамі архіва лічыліся публічна-прававыя акты (прывілеі і фундушы), гаспадарчыя апісанні (інвентары), наратыўныя матэрыялы (перапіска і дзённікі). Яны змяшчалі даволі падрабязную інфармацыю аб маёмасці манастыра (вёсках, млынах, друкарнях, манастырскіх сялянах і інш.). З 1841 г. архіў захоўваў апісанні маёмасці

самога манастыра, яго манастырскай школы і бібліятэкі, падрабязную інфармацыю аб выглядзе і паходжанні рэчаў, а таксама перапіску з духоўнымі і свецкімі асобамі і штодзённыя запісы, якія вялі самі ігумены [13].

Адным з абавязковых аддзелаў манастырскага архіва быў аддзел дакументаў па асабістым складзе. Ва ўніяцкіх манастырах рэгулярна складаліся «Кнігі памерлых братоў» (Księgi zmarłych braci), якія змяшчалі біяграфічныя даныя аб памерлых базыльянах [5, с. 24]. З 1841 г. рапарты аб смерці манахаў накіроўваліся ў Магілёўскую духоўную кансісторыю.

Ігумены займаліся складаннем кліравых ведамасцяў, пазначаючы пры гэтым час, калі манахі паступілі ў ордэн ці ў дадзены манастыр, месца іх апошняга знаходжання, узровень прафесійнай падрыхтоўкі [16]. У згаданай крыніцы змяшчаліся нават запісы аб адзенні, якое манахі атрымлівалі пры паступленні ў манастыр. Сюды можна аднесці рэвізскія сказкі, пераліковыя рэвізскія ведамасці, рапарты манахаў ці іераманахаў аб іх пераводах у гэты або іншыя манастыры [35, арк. 3–6].

У архіве Пустынскага манастыра захоўваліся не толькі дакументы, якія датычыліся яго гісторыі і маёмасці, але і дакументы па гісторыі іншых канфесійных мясцовых устаноў. У 1776 г. да ігумена Пустынскага манастыра звярнуўся праваслаўны епіскап Георгій Каніскі, які варожа ставіўся да ўніятаў, з просьбай знайсці ў манастырскім архіве і даць на кароткі час фундушавыя запісы XVI ст., якія датычыліся дзвюх праваслаўных цэркваў [5, с. 20].

Наяўнасць архіваў у манастырскіх будынках фіксавалі інвентары. Яны ўдакладнялі месца знаходжання архіваў, умовы захоўвання дакументаў і іх стан, змяшчалі рэестры важнейшых з іх. Поўныя рэестры з выкладаннем кароткага зместу дакументаў звычайна складаліся асобна і былі даволі значнымі па памеры [36, с. 149].

Дакументы архіва Пустынскага манастыра, якія захоўваліся ў ім у сярэдзіне XIX ст. і часткова адклаліся ў аднайменным фондзе НГАБ, можна падзяліць на наступныя відавыя групы: 1) прыватна-прававая актавая дакументацыя (фундушы); 2) справаводная дакументацыя — арганізацыйна-распарадчая (указы Магілёўскай духоўнай кансісторыі (далей — МДК)), улікова-кантрольная (рахунковыя кнігі, кніга выходных і ўваходных дакументаў, рэвізіі, плацёжныя дакументы і распіскі), справаздачная (гадавыя справаздачы) і судовая (скаргі манастыра і скаргі на манастыр); 3) статыстычная дакументацыя — рэвізскія сказкі (адміністрацыйна-паліцэйскі ўлік), кліравыя ведамасці (царкоўны ўлік), інвентары манастырскай уласнасці (гаспадарчае апісанне); 4) афіцыйная перапіска манастыра з вышэйстаячымі, роўнымі і ніжэйшымі па статусе ўстановамі па розных пытаннях; 5) картаграфічныя

матэрыялы — планы манастыра і зямельных уладанняў за 1842 і 1847 гг., выдадзеныя Палатай дзяржмаёмасці (аб іх ёсць запісы ў вопісе царкоўнай маёмасці манастыра за 1849 г.) [20, арк. 28 адв. – 29].

У большай сваёй масе захаваныя да сённяшняга дня манастырскія дакументы — гэта маёмасныя і фінансавыя справы (акты дарэнняў, завяшчанняў, прывілеі, матэрыялы судовых працэсаў), радзей крыніцы, якія апавядаюць аб дзейнасці манастыра на ніве культуры. Ніжэй звернемся да асобных відаў дакументаў з прыведзеных груп дакументацыі архіва.

Дамоўныя прыватна-прававыя адносіны знаходзілі адбітак у актах дарэння — фундушовых запісах. Дарэнні Пустынскаму манастыру рабілі як прадстаўнікі дваранскага і мяшчанскага саслоўяў, так і сяляне, у тым ліку з іншых губерняў Расійскай імперыі. Напрыклад, напачатку XX ст. селянін Ягор Яфімавіч Зімін, які пражываў у сяле Дзяднова Зарайскага павета Разанскай губерні, падараваў манастыру свой зямельны ўчастак і прапанаваў пабудаваць там падвор'е [9, арк. 19 адв.].

Арганізацыйна-распарадчая дакументацыя прадстаўлена ўказамі Магілёўскай духоўнай кансісторыі за 1842–1843 гг., сярод іх неабходна адзначыць наступныя: аб вызваленні манастыра ад рэвізіі палаты Дзяржаўнага кантролю, аб справаздачнасці духоўных месцаў і асоб Магілёўскай епархіі, аб вядзенні «белавых кніг паступлення і выдаткавання сум па новых штатах» і штогадовым прадстаўленні настаяцелем справаздач па гэтым пытанні ў асабістым парадку. У дадатак да ўказаў трапілі іншыя дакументы аб арганізацыі манастырскага жыцця, якія склалі разам з імі асобную справу, напрыклад: выпіскі з дамоваў аб сумах, асігнаваных у 1843 г. на штатнае ўтрыманне і іншыя выдаткі духоўных асоб Магілёўскай епархіі; ведамасці аб арэндзе карчмы, млына, рапарты іераманахаў аб пераводзе іх у Пустынскі манастыр і рашэнні кансісторыі па гэтым пытанні, дакументы і суправаджальныя лісты да іх [10].

Паколькі ў 1863–1870 гг. у манастыры праходзілі вялікія аднаўленчыя работы, то дакументы аб іх былі сабраны ў справе «Указы Магілёўскай Духоўнай кансісторыі, дакументы будаўнічага камітэта па аднаўленні манастыра за 1863–1870 гг.» [11]. На падставе аднаго з прадстаўленых указаў настаяцелю (ініцыятару збору ахвяраванняў на гэтыя мэты) з сумы ахвяраванага былі выдадзены грошы ў 10 тыс. рублёў для «выплаты мулярам, пячнікам, страхарам і іншым майстравым за працы па ўзнаўленні манастыра» [11, арк. 2]. Акрамя гэтага, быў створаны будаўнічы камітэт па аднаўленні манастыра. У гэтай справе таксама захоўваюцца распіскі на атрыманне грошай, кантракты на пабудову новых будынкаў (у тым ліку цёплай каменнай царквы, званіцы і манаскіх келляў, каменнай царквы на крыніцы), дамовы аб пастаўках будаўнічых матэрыялаў, каштарысы на пабудову іканастаса і па выкананні цяслярскіх

работ. Асобныя справы складаюць «Рахункі за набытыя манастыром тавары за 1866 г.» [21], «Рахункі за набытыя манастыром тавары і распіскі розных асоб аб атрыманні грошай за 1867 і 1869 гг.» [22–23].

Да дакументаў улікова-кантрольнай справаводнай дакументацыі адносяцца рахунковыя кнігі па паступленні і выдаткаванні грошай манастыра за 1855–1862, 1882–1883, 1905–1913 гг. і Пустынскай царкоўна-настаўніцкай земляробчай школы за 1895 г. [27–30], кніга паступлення ахвяраванняў за 1863–1864 гг. [33], кружкавага і кашальковага збору за 1861 г. [32], з пазначэннем тавараў, набытых манастыром і Пустынскай царкоўна-настаўніцкай земляробчай школай, пералікам работ па манастыры, а таксама распіска розных асоб аб атрыманні па рахунках грошай. Да гэтай групы крыніц адносяцца таксама кнігі выходных за 1850 г. і ўваходных дакументаў за 1840–1841 гг. [24–25]. Форма фіксацыі звестак у іх адпавядае форме сучасных журналаў аналагічнай рэгістрацыі. У кнізе выходных дакументаў за 1850 г. змяшчаюцца рапарты ў МДК «аб з'яўленні ў тутэйшым манастыры забароненага святара Іаана Петрашэня з копіяй выдадзенага яму з Духоўнай кансісторыі квітка» (24.01.1850), «аб выкананні ўказа адносна адпраўлення малебствія з нагоды нараджэння вялікага князя Аляксея Аляксандравіча» (30.01.1850), «аб аб'яўленні паслушніку Галынцу рашэння пакінуць яго ў манастыры для далейшай адукацыі» (07.02.1850), «аб смерці паслушніка Васіля Бабушкіна і прадстаўленні вопісу яго маёмасці» (10.10.1850), «аб атрыманні і абвяшчэнні брацііі і паслушнікам указа аб наглядзе за іх паводзінамі» (20.11.1850) [24, арк. 1, 3, 4].

Сярод дакументаў судовага справаводства адзначым судовыя справы манастыра з мсціслаўскімі езуітамі, памешчыкамі суседніх уладанняў, арандатарамі манастырскай нерухомасці [14, арк. 17 адв. – 18]. Справы падобнага характару згадваюцца ў кнізе рэгістрацыі выходных дакументаў за 1850 г. Напрыклад, пад № 28 ад 11 мая 1850 г. зарэгістравана «Адносіна ў Мсціслаўскую гарадскую паліцыю з патрабаваннем хуткэйшага спагнання арэндных грошай за млын з яўрэя Лейбы Адаскіна» [24, арк. 2].

Статыстычныя дакументы адміністрацыйна-паліцэйскага ўліку прадстаўлены ў архіве манастыра рэвізскай сказкай на асоб духоўнага звання (манахаў, бельцаў, паслушнікаў) за 1850 г. [35]. У 1850 г. прыняты імператарскі ўказ «Аб правядзенні 9-га народнага перапісу па Духоўным ведамстве» (на падставе Маніфеста ад 11.01.1850) і зацверджана новая форма рэвізскай сказкі. Рэвізская сказка афармлялася ў выглядзе табліцы, дзе фіксаваліся даныя аб кожным насельніку манастыра. Згодна з рэвізскай сказкай за 30 верасня 1850 г. у Пустынскім Успенскім трэццякласным мужчынскім манастыры было 12 насельнікаў, у тым ліку восем паслушнікаў [35, арк. 15–16].

Да статыстычных дакументаў царкоўнага ўліку адносіцца кліравая ведамасць, якая складалася з трох частак: гістарычнай даведкі, ведамасці аб настаяцелю, ведамасці аб брацii [16–19]. У гістарычнай даведцы фіксаваліся імя фундатара і дата заснавання манастыра, пералічвалася манастырская маёмасць (будынкі, царкоўныя рэчы, склад зямель, штат манастыра і гаспадарчыя пабудовы), пададзена адлегласць ад манастыра да Духоўнай кансісторыі (100 вёрст) і да благачыннага праўлення (7 вёрст), згаданы бліжэйшыя манастыры, прыведзена інфармацыя аб вопісах царкоўнай і эканамічнай маёмасці (з датай іх складання) і рахункавых кнігах. Ведамасць аб настаяцелю змяшчае звесткі біяграфічнага характару: імя, узрост, адукацыю, паслушанні, дату пасвячэння ў сан святара, узнагароды, судзімасці і штрафы, асабістыя якасці, здольнасці да паслушэнства. Ведамасць аб брацii ўключала наступныя звесткі аб манахах і паслушніках: званне манастырствуючых, геаграфічнае і саслоўнае паходжанне, узровень адукацыі, час і месца пастрыжэння ў манаства, дата залічэння ў манастыр і пералік папярэдніх манастыроў, паслушанні, узрост, паводзіны, здольнасці да паслушэнства.

Гаспадарчыя апісанні (інвентары) манастырскай уласнасці захаваліся ў НГАБ за 1841, 1842, 1849, 1853–1861, 1882–1883 гг. [13–15]. Яны прадстаўляюць сабой вопісы ўсёй нерухомай і рухомай маёмасці манастыра, рахункаў, перапісы залежнага насельніцтва і прадстаўнікоў духавенства. Інвентары перыядычна складаліся спецыяльна ўпаўнаважанымі на гэта асобамі шляхам агляду і апытання з мэтай уліку ўласнасці, каштоўных рэчаў, прыбыткаў, кантролю за спраўнай выплатай падаткаў і г.д. Гаспадарчыя апісанні прадстаўлялі сабой не толькі ўлікова-гаспадарчыя, але і юрыдычныя дакументы, якія абгрунтоўвалі ўладальніцкія правы манастыроў [36]. У якасці прыкладу інвентара прывядзём «Вопіс эканамічнага набытку Пустынскага манастыра» за 1841 г. [13], дзе апісаны пабудовы манастыра, дадзена іх характарыстыка, пералічаны мэбля, абразы, карціны, гадзіннікі, посуд. У дадатку да інвентара прымацавана ведамасць аб колькасці рознага збожжа, хатняй жывёлы і птаства, што належалі манастыру.

Апісанне манастырскай гаспадаркі прыводзіцца ў страхавой дакументацыі (страхавыя ацэнкі і карткі) за 1910 і 1913 гг. [7; 8]. Пры гэтым асабліва інфарматыўнай з'яўляецца страхавая ацэнка з апісаннем цэркваў, званіц, жылых і гаспадарчых пабудоў з пазначэннем ацэначнай сумы ў рублях [7, арк. 1–3].

Эпісталярная спадчына манастыра прадстаўлена яго ліставаннем з роўнай па статусе ўстановай, а менавіта Мсціслаўскім акружным упраўленнем дзяржаўнай маёмасці, у якой асвятляецца працэс перамяшчэння і прызначэння штатных служыцеляў з ліку казённых сялян вёсак Пустынкі, Пераседзенне, Буда на розныя гаспадарчыя пасады

пры манастыры за перыяд з 03.04.1847 па 22.08.1855 г. [12]. У фондзе захаваліся дзве справы, дзе знайшла адбітак службовая перапіска архімандрыта Анатоля, настаяцеля Пустынскага Успенскага манастыра, з мсціслаўскім павятовым спраўнікам і ўпраўленнем Магілёўскай духоўнай кансісторыі, з нагоды прашэння 18-гадовага хаславіцкага яўрэя Мардуха Аграната да епіскапа магілёўскага і мсціслаўскага Сергія аб дазволе перайсці ў праваслаўную веру. Імператарскім указам яўрэю дазволілі здзейсніць абрад хрышчэння, які быў праведзены 26 красавіка 1888 г. у Мсціслаўскай Мікалаеўскай царкве з наданнем хрышчанаму імя Аляксандр [34].

Напрыканцы заўважым, што дакументы з манастырскага архіва мелі разнастайны характар. Разам са старажытнымі фаліянтамі ў ім адкладаліся матэрыялы бягучага справаводства. У цэлым, дакументы канфесійных установ садзейнічаюць высвятленню абставін штодзённага жыцця за манастырскай і царкоўнай агароджай, вызначэнню ўзаемаадносін канфесійнай супольнасці з дзяржавай, спрыяюць лепшаму разуменню поглядаў яе прадстаўнікоў, раскрыццю духоўнага патэнцыялу канфесіі для асобы і грамадства.

Кожны з канонікаў меў сваю бенефіцыю, дзе з’яўляўся плябанам і з якой атрымліваў даход. Вікенцій Вейтка атрымаў «Letterae Pridae» [2] пасля вызвалення Заслаўскай плябані па прадстаўленні калятара (апекуна касцёла) Людвіка Прушынскага. Пры прыняцці канчатковага рашэння па пытанні прадстаўлення бенефіцыі біскуп М. Ліпскі з асцярожнасцю паставіўся да згаданай прапановы, «ведаючы яго (В. Вейткі. — *Аўт.*) умыслівыя пакуты і схільнасць да моцных напояў, якія павялічваюць пакуты, а адсюль няздольнасць да выканання абавязкаў плябана». Нягледзячы на гэта, бенефіцыя была прадстаўлена ксяндзу пад паручыцельства яго малодшага брата — Юстына Вейткі, які ад моманту прыняцця духоўнага сану ў 1834 г. меў добрую рэпутацыю на пасадзе вікарыя Мінскага катэдральнага касцёла і «мог бы стаць яму (В. Вейтку. — *Аўт.*) дапамогай і нават абаронцам» [5, арк. 300 адв. – 305]. Акрамя гэтага, Ю. Вейтка быў прызначаны на пасаду заслаўскага вікарыя. Аднак станоўчых змен у паводзінах В. Вейткі не назіралася, а пра Юстына дакументы пачынаюць сведчыць негатыўна. Па рапарце мінскага дэкана Матэвуша Янчэўскага Ю. Вейтка пачаў разам з братам

[2] «Letterae Pridae» (лац.) — даравальны ліст.

часта ўжываць «моцныя напоі», а таксама пабіў аднаго з сялян пана Л. Прушынскага, які вырашыў адпомсціць. Селянін разам з кухарам падсачылі ноччу святара і яго брата Бенядзікта Вейтку, які не з'яўляўся прадстаўніком духавенства, і бязлітасна іх збілі [8, арк. 7–7 адв.]. У выніку высвятлення ўсіх абставін 6 чэрвеня 1836 г. біскуп папярэдзіў В. Вейтку, што адхіліць яго ад бенефіцыі, бо ён не адпавядае пасадзе кіраўніка парафіі. Апошняй кропляй у цярпенні канфесіянальнага кіраўніцтва стаў выпадак, адлюстраваны ў справаздачы мінскага дэкана Лыжыкевіча біскупу М. Ліпскаму. У ёй пазначана, што 14 ліпеня 1836 г. ксёндз В. Вейтка апоўдні ўвайшоў у «шынок, дзе пражывалі блудніцы, і там упіўшыся мог зрабіць неадпавядаючы сану ўчынак, таму што блудніца прыбегла разам з жыдамі, у якіх пражывала на кватэры, да пристава В. Чарняўскага і яму паказала дыстынкторыум [3] Вейтка». Прафесар семінарыі ксёндз Васількоўскі, даведаўшыся пра гэта, пайшоў да Чарняўскага, каб забраць дыстынкторыум, і вымушаны быў аплаціць жыдам за напоі па рахунку В. Вейткі тры срэбныя рублі [8, арк. 5]. Улічваючы яго ўчынкі і што «ўсё радзей святар не прыходзіў у цвярозы стан», ён быў высланы па загадзе біскупа ад 13 ліпеня 1836 г. у Гарадзішчанскі кляштар бенедыкцінцаў «як няздольны для кіраўніцтва плябаніяй» [8, арк. 1–2 адв]. Невыпадкова, што месцам часовага знаходжання В. Вейткі быў вызначаны менавіта гэты кляштар, бо па свайму статуту бенедыкцінцы асаблівую ўвагу надаюць набажэнствам, інтэлектуальным і фізічным заняткам (у тым ліку рамёствам), рэлігійнаму мастацтву, а таксама місіянерскай і пастырскай працы, што давала магчымасць В. Вейтку выправіцца, не пакідаючы грамадскай дзейнасці [3].

Аналагічныя праблемы назіраліся і з ксяндзом Юстынам Вейтка пасля высылкі брата ў кляштар, а асабліва напрыканцы 1837 г., калі ён «з-за ўжывання моцных напояў стаў падобны да пакутуючых на розум». Канфесіянальныя ўлады паспрабавалі кантраляваць яго больш жорстка, для чаго перавялі зноў на пасаду вікарыя ў катэдральны касцёл. Аднак гэтая мера не дала жаданых вынікаў. У дакументах прыводзяцца наступныя прыклады яго паводзін. Прыбыўшы 1 сакавіка 1838 г. у Мінск, ксёндз Ю. Вейтка выбраўся ў горад пад выглядам візіту да паноў Прушынскіх. Там ён прайграў некалькі соцень рублёў і падраў пальчатку, «таму што дамская пальчатка на яго руку не налезла». Затым паехаў у карчму, дзе напіўся, а пасля нагаду аб аплаце пабіў шклянкі, келіхі і жыдоў, якія і прывялі яго ў паліцыю. Іншым разам, «ездзіў па розных непрыстойных месцах, піў і авантурыў да 12 гадзіны ночы». Па вяртанні дадому згадаў аб аплаце і аддаў свой медальён, а калі вазніца не прыняў гэта

[3] Дыстынкторыум (лац.) — медальён, звычайна ў форме крыжа, які насілі катэдральныя прэлаты і канонікі.

ў якасці аплаты, хацеў яго пабіць. Каб выправіць сітуацыю рэгент семінарыі Ксаверы Міцкевіч павінен быў заплаціць два рублі. Пры гэтым Ю. Вейтка прадстаўляў небяспечнасць для іншых людзей. Напрыклад, у семінарыі, увайшоўшы ў пакоі ксяндза пракуратара, Ю. Вейтка кінуўся на яго, «як звяры робяць». З дапамогай пакліканых людзей ксяндза звязалі і супакоілі. У сваім рапарце К. Міцкевіч згадвае некалькі разоў, калі такім чынам Ю. Вейтка «недзе ездзіў, а не маючы аплаты, кідаўся біцца». У такіх выпадках «яго (Ю. Вейткі. — *Аўт.*) кожнае слова сцвярджала аб недахопе ў ім здаровага розуму». Так, ён нібы лічыў сябе «вучоней усіх іншых» сцвярджаў, што «ведае сем моў, калі не ведае нават латыні», называў сябе «ледзь не Богам» [8, арк. 9–10]. Калі падобныя выпадкі пачалі адбывацца ўсё часцей, Ю. Вейтка 15 ліпеня 1839 г. быў высланы на выпраўленне у кляштар Святога Крыжа манахаў бенедыкцінцаў каля горада Нясвіжа Слуцкага павета [8, арк. 1–2 адв., 13].

У кляштары стан святара нязначна палепшыўся, аб чым сведчыць рапарт слуцкага дэкана ксяндза Бернарда Дамброўскага. У прыватнасці, у ім адзначаецца, што ксёндз Ю. Вейтка падчас пражывання ў кляштары «ніякіх схільнасцяў, насуперак дрэннаму меркаванню аб ім, не праяўляў». Займаўся чытаннем духоўных кніг і паводзіў сябе адпаведна духоўнаму стану. Часта для наведвання маці і сястры бываў у Нясвіжы, дзе спыняўся ў кляштары бенедыкцінак. Менавіта там «знаходзіў спосабы ажыўлення дрэнных схільнасцяў, выглядаў як вязень, загнаным, неспакойным, бяссонным і пакутуючым па здароўю». Напрыканцы мая, пры адсутнасці абата, знаходзячыся ў Нясвіжы ў нестасоўным таварыстве, «дапусціў п’янства да страты прытомнасці, таму прыйшлося выклікаць лекара». З гэтага абат зрабіў вынік, што «Ю. Вейтка схільны да ўжывання спіртных напояў, вельмі шкодных для яго здароўя асабліва пры яго жывасці характару і пры гэтай схільнасці не можа быць пакінуты сам па сабе» [8, арк. 15–16].

У 1841 г. Ю. Вейтка прызначаны на жыхарства ў Гарадзішчанскі бенедыкцінскі кляштар Пінскага павета, настаяцель якога Ян Дамброўскі 30 снежня 1852 г. паведамляў кансісторыі, што Вейтка «часам выходзіць па-за межы злосці». Напрыклад, «здарылася, што на калідоры пакалаціў іераманаха Малішэўскага ў асобе іншых манахаў і царкоўнаслужыцеляў. З-за гэтага наклаў на сябе пакаянне, чым не дапусціў сябе на набажэнствы» [15, арк. 35–35 адв.]. Пасля гэтага святара перавялі ў Нясвіжскі дамініканскі кляштар [5, арк. 300 адв. – 305].

Калі свае апошнія дні Ю. Вейтка правёў у кляштары і згадак аб яго далейшай жыццядзейнасці не захавалася, то жыццё Вікенція складвалася іншым чынам. Пінскі дэкан Антоні Машынскі, падчас візітацыі Гарадзішчанскага кляштара 25 чэрвеня 1839 г., адзначаў, што ў В. Вейткі «ўжо месяц не было выпадкаў ужывання спіртных напояў, якія (па

вялікаму рахунку) скончыліся». Пры гэтым ён удакладняў, што стан розуму разглядаемага святара «то павышаецца, то зніжаецца па прычыне рашэння сямейных праблем, якія тычацца непасрэдна яго», відавочна, што на ўвазе меліся паводзіны Юстына, а таксама працэс пацвярджэння шляхецкага паходжання іх роду, якім ён займаўся [8, арк. 19–19 адв.; 4, арк. 1–36]. Адначасова Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыяй разглядалася справа па скарзе звольненага са службы Мінскай інваліднай каманды штабс-капітана Гурыя Міхайлавіча Дзядзюшкіна аб хрышчэнні яго сына Мікалая па каталіцкаму абраду ксяндзом В. Вейтка. Г. Дзядзюшкін пісаў, што знаходзіўся ў камандзіроўцы ў Слуцку, калі жонка нарадзіла і хрысціла дзіця. Пры гэтым ён і яго іншыя дзеці былі праваслаўнымі, што патрабавала пакарання святара ў адпаведнасці з заканадаўствам Расійскай імперыі [7]. Улічваючы прывілеяванае становішча праваслаўнай царквы на грамадска-палітычнай арэне Расійскай імперыі і палітыку празелітызму, якую яе кіраўніцтва праводзіла на літоўска-беларускіх землях, святароў, што дачыніліся да пераходу з праваслаўя ў свае веравызнанні, чакала высвятленне абставін пад кантролем грамадзянскіх улад і пакаранне з боку канфесіянальных. Напрыклад, Мінскай кансісторыяй у 1837 г. разглядалася аналагічная справа аб вянчанні селяніна Фёдара Беразюка, праведзенае манахам Гарадзішчанскага бенедыкцінскага кляштара Казімірам Будзінскім. Нягледзячы на падрабязнасці, якія сталі вядомымі, напрыклад, што Ф. Беразюк паходзіў з каталіцкай сям'і, святара асудзілі на двухтыднёвую епітым'ю ў Пінскім францысканскім кляштары [6, арк. 88–88 адв.]. Пасля скасавання ўніяцкай царквы ўлады сталі больш жорстка ставіцца да канфесіянальных пераходаў, асабліва з праваслаўя, да якога залічваліся ўніяты. Напрыклад, за хрышчэнне дзіцяці праваслаўных бацькоў па іншаслаўным абрадзе ў першы раз належала, паводле прадпісанняў урада, выдаляць святара з парафіі на тэрмін ад шасці месяцаў да года, а ў другі — пазбаўляць духоўнага сану і аддаваць пад нагляд паліцыі [18]. В. Вейтка апынуўся ў больш складанай сітуацыі, таму што сам ахрысціў незаконна дзіця і яго маглі, нават, выслаць на пасяленне. Улічваючы ціск на каталіцкую царкву і недахоп святароў пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг., ксёндз В. Вейтка быў прызнаны «здаровым целам, але нездаровым на розум» [8, арк. 19–19 адв.] і таму не падлягаючым адказнасці.

У 1840 г. на пасяджэнні капітула было ўзнята пытанне аб утрыманні В. Вейткі, таму што ён, знаходзячыся ў кляштары, не выконваў абавязкі каноніка, а спадзяванняў, што ён вернецца на пасаду, паводле заключэння настаяцеля, амаль не заставалася. У выніку было вырашана захаваць за канонікам эмерытальнае ўтрыманне (пенсію) ад капітула, а таксама даходы ад Заслаўскай плябані ў памеры, вызначаным біскупам [8,

арк. 29–30 адв.]. Акрамя таго, капітул прасіў адміністратара Паўла Раву разгледзець магчымасць перамяшчэння В. Вейткі ў дом выпраўлення або Мінскі бернардзінскі кляштар за даходы гэтага святара. У Мінск яго не вярнулі, відавочна, разумеючы спакусы вялікага горада і яго паводзіны, а перавялі ў Івянецкі бернардзінскі кляштар, які неўзабаве быў хутка скасаваны [8, арк. 31–33 адв.].

У 1851 г. В. Вейтка пражываў пры Нясвіжскім касцёле, пробашч якога альцкі інфулат прэлат Ян Дамброўскі прасіў кансісторыю кампенсаваць выдаткі за час утрымання Вейткі і перавесці апошняга ў іншае месца. Падчас разгляду гэтага прашэння настаяцельніца нясвіжскіх бенедыкцінак пагадзілася прыняць каноніка В. Вейтку ў памяшканне ў флігелі кляштара, але ў гэтым кляштары сам канонік «жыць не жадае». Таму было прадпісана размясціць яго ў кляштары Святога Крыжа манахаў-бенедыкцінцаў, які знаходзіўся каля Нясвіжа, таму што па штаце ў ім не хапала манахаў [10, арк. 17–18].

У 1852 г. у Мінскую кансісторыю звярнуўся сам В. Вейтка, які, спасылаючыся на вусныя просьбы родных, а найбольш братоў, полацкага сакратара Пятра і лекара Андрэя, прасіў перамясціць яго ў Празароцкую парафію Дзісненскага павета Віленскай губерні, дзе ў маёнтку Ялоўка пражывалі яго сваякі [9, арк. 2]. Аднак яго перамясцілі зноў у Нясвіж. Паводле звестак, прадстаўленых настаяцелем, на 1 кастрычніка 1853 г. выдаткі кляштара Святога Крыжа манахаў-бенедыкцінцаў на ўтрыманне В. Вейткі складалі: за кватэру ў кляштары з двух пакояў з ацяпленнем у адным — 36 руб. срэбрам у год, на манаскі стол з улікам рэкамендацый лекараў — 60, гарбату з раніцы і ўвечары з булкай — 22 руб. 32 кап., утрыманне каноніка — 30 руб., асвятленне пакояў — 5, пранне бялізны — 4, нюхальны табак — 1 руб. 80 кап., галенне з дапамогай фельдшара — 1 руб. 50 кап., утрыманне служыцеля Вейткі, які заўсёды разам з ім, — 20 руб. Усяго атрымалася 180 руб. 62 кап. у год, што складала менш за суму, выдзеленую кансісторыяй па рашэнні біскупа (300 руб.). На астатнюю суму дэканам Бенядзіктам Шымкевічам заводзіўся рэестр расходаў, які штогод звяраўся ў кансісторыі [15, арк. 5–5 адв., 10]. Адначасова 50 руб. з утрымання В. Вейткі на свае патрэбы прасіла яго сястра Ксаверыя Вейтка, манахіня Нясвіжскага бенедыкцінскага кляштара [9, арк. 11]. У выніку перагляду справы святара зноў перамясцілі, на гэты раз у Гарадзішчанскі кляштар бенедыкцінцаў.

4 лютага 1856 г. В. Вейтка зноў звярнуўся ў кансісторыю, каб яна прызначыла яму жыхарства разам са сваім братам ксяндзом Юстынам у Нясвіжскім бернардзінскім кляштары. У адказе было зазначана: «Назіраючы, што ксёндз Юстын не пазбавіўся дагэтуль ад свайго цяжару, і нават няшмат мае жадання да выпраўлення, а пры гэтым мае вельмі неспакойны і буйны характар, не магу пагадзіцца», аднак канчатковае

рашэнне біскуп пакінуў за пагадненнем нясвіжскага і гарадзішчанскага настаяцеляў [10, арк. 19]. Верагодна, яны пагадзіліся, таму што з гэтага часу Вікенцій пражываў у Нясвіжскім бернардзінскім кляштары. Менавіта тут лад яго жыцця перамяніўся. Відаць, з гадамі яму ўдалося перамагчы «дрэнныя схільнасці», а кляштары, у якіх ён пражываў, таксама вялі пастырскую дзейнасць, што дазволіла яму падтрымліваць стасункі з парафіянамі. Засталося некалькі звестак аб яго грамадскай дзейнасці ў сталым узросце.

У 1872 г. у Мінскай аб'яднанай палаце крымінальнага і грамадзянскага суда разглядалася справа Слуцкага павятовага суда аб хрышчэнні па рымска-каталіцкаму абраду Схаластыкі, дачкі сялян Вікенція Адамава і Юзэфы Францавай Семянкевічаў. Палата высветліла, што ў Слуцкім судзе не звярнулі ўвагі на факт правядзення абраду ксяндзом з Нясвіжа Вікенціем Вейткам, які прызнаны звар'яцелым. Абставіны высвятляліся ў Віленскай кансісторыі, да юрысдыкцыі якой у разглядаемы час адносілася тэрыторыя Мінскай губерні. Тлумачэнні да стану В. Вейткі даваў пробашч Нясвіжскага касцёла Людвік Кулакоўскі, які асабіста зведаў стаўленне ўрада да каталіцкіх святароў як неабгрунтавана абвінавачаны і арыштаваны па падазрэнні ў дачыненні да пажараў у мястэчку Капыль у 1866 г. [5, арк. 23 адв. – 24]. Ён засведчыў, што В. Вейтка «гаворыць і дзейнічае разважліва, ён ціхага і спакойнага нораву, але мае парывы наравістасці і запальчывасці, таму сам пра сябе клапаціцца не можа». Гэта стала падставай, чаму па дарозе ў Мінск і падчас пражывання там святару-эмерыту патрабаваўся «неадступны, маючы ў ім давер спадарожнік, каб ён чаго не зрабіў і ў яго што-небудзь не згубілася». Акрамя таго, «на рукі яму (В. Вейтку. — *Аўт.*) нельга даць ні капейкі. Распарадзіцца дарогай ён не ў стане». Пры гэтым сам Л. Кулакоўскі не атрымліваў на яго ўтрыманне з 1871 г. нічога, правёў рамонт будынкаў плябані на суму звыш 215 руб., таму не можа асабіста падарожнічаць [10, арк. 5–5 адв.]. Нягледзячы на адпаведнае прадпісанне кансісторыі, святара не даставілі ў Мінск і не выносілі пакаранне за дзеянні, але з гэтага часу ў дачыненні да В. Вейткі з'яўляецца фармулёўка «страціў розум ад напружанай навуковай працы», што абараняла яго ад абвінавачванняў з боку ўлад.

У далейшым грамадская дзейнасць В. Вейтка актывізавалася. Так, селянін з фальварка Вітальдава Мінскага павета Станіслаў Кляменцьеў Міцкевіч у пачатку кастрычніка 1873 г. браў шлюб з Паўлінай Канстанцінавай Бычкоўскай, верагодна, у Нясвіжы. Міцкевіч спачатку сцвярджаў, што шлюб адбыўся ў праваслаўнага святара ў Грыцэвічах, затым — у Вільні. Пазней С. Міцкевіч сведчыў, што дагэтуль яны з жонкай не прымалі праваслаўя і не жадаюць, а вянчаў «канонік-стары ў чыімсьці садзе пад дрэвам у Нясвіжы», але імя дакладна не назваў.

У выніку следства Віленскай кансісторыяй пастаноўлена, што, улічваючы «вар'яцтва В. Вейткі, шлюб іх прызнаць непаўнавартасным і заключыць яго ў парафіі па прыналежнасці тых, хто шлюбаваўся» [11, арк. 1–11]. Адначасова, калі судовы следчы другога ўчастка Слуцкага павета запатрабаваў паслужны спіс Вейткі, таму што разбіраў справу аб правядзенні каталіцкіх духоўных абрадаў для праваслаўных, у кансісторыі адказалі, што справа святара Вейткі абгарэла, «верагодна, пры пажары», а па «ацалелых шматках паперы» нельга зрабіць заключэнне аб вінаватасці В. Вейткі [12, арк. 1–6].

Ксёндз Вікенцій Вейтка памёр 3 снежня 1881 г. у 6 гадзін раніцы ад энтэрыту і пахаваны на Слуцкіх могілках. Яго маёмасць складалася з «янотавага футра, летняга шыняля, трох старых сутан, двух сурдутаў, аднаго капялюша, дзвюх шапак, коўдры і падушкі», якія былі перададзены памочніку міравога суддзі першага ўчастка г. Слуцка [13, арк. 1–4].

Падсумоўваючы адзначанае вышэй, нельга сказаць, што В. Вейтка быў выключэннем для свайго часу. З прычыны актыўнага складу свайго характару, дасягнуўшы высокіх пасад сярод каталіцкага кліру ў маладым узросце, пад уплывам сямейных праблем і падзей на грамадска-палітычнай арэне краіны, ён не справіўся з напружанай працай і пачаў злоўжываць алкаголем, як і іншыя ў яго асяроддзі. Сёння нельга дакладна высветліць, ці быў В. Вейтка псіхічна хворым, таму што прыклады яго паводзін, якія засталіся ў дакументах Мінскай і Віленскай рымска-каталіцкіх кансісторый, можна трактаваць неадназначна. Адзінае, што можна сцвярджаць, гэта адмоўны ўплыў святара на брата — Юстына Вейтку, якому не ўдалося пераадолець свае слабасці. Яго звычкі, з аднаго боку, і захады, праведзеныя непасрэднымі апекунамі ў кляштарах знаходжання В. Вейткі, з другога, у пэўнай ступені дапамаглі абараніць яго ад адказнасці перад цывільнымі і канфесіянальнымі ўладамі. Зразумеўшы гэта і адчуваючы нехарактэрны для насельніцтва літоўска-беларускіх зямель рост напружанасці ў грамадстве на рэлігійнай глебе, згаданы святар ужо ў сталым узросце актывізаваў пастырскую дзейнасць.

На прыкладзе лёсу ксяндза В. Вейткі можна гаварыць пра тое, што рымска-каталіцкае святарства, нягледзячы на жорсткую дагматыку веравызнання, імкнулася ва ўсе гістарычныя перыяды адпавядаць патрабаванням соцыума. Пры гэтым, безумоўна, прадстаўнікі духавенства заставаліся людзьмі са сваімі памылкамі і слабасцямі, якія часам выправіць больш складана, чым свецкім асобам, паколькі патрабаванні грамадства да іх вышэйшыя.

## Крыніцы і літаратура

1. Антановіч, З. В. Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.) / З. В. Антановіч. — Дыс. … канд. гіст. навук: 05.25.02. — Мінск, 2010. — 148 с.
2. (ЕК) Каноник // Католическая Энциклопедия. — Т. 2: И–Л / О. В. Басий (редактор). — М.: Изд-во Францисканцев, 2005. — С. 758–759.
3. Задворный, В. Бенедиктинцы // Католическая Энциклопедия. — Т. 1: А–З / О. В. Басий (редактор). — М.: Изд-во Францисканцев, 2002. — С. 542–546.
4. НГАБ. — Ф. 319 (Мінскі дваранскі дэпутацкі сход). — Воп. 2. — Спр. 457. — Справа Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб шляхецкім паходжанні роду Вейткаў, 02.08.1830–15.06.1905 гг.
5. НГАБ. — Ф. 937 (Мінская рымска-каталіцкая кансісторыя). — Воп. 6. — Спр. 107. — Фармулярныя спісы духавенства Мінскай дыяцэзіі, 1867 г.
6. НГАБ. — Ф. 1781 (Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя). — Воп. 24. — Спр. 1104. — Справа аб пераходзе Ф. Беразюка, селяніна м. Любель Пінскага пав., з праваслаўнага ў рымска-каталіцкае веравызнанне, 1837–1838 гг.
7. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 24. — Спр. 1312. — Справа аб хрышчэнні сына штабс-капітана Г. М. Дзядзюшкіна ксяндзом В. Вейткам, 1839–1840 гг.
8. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 24. Спр. 1300. — Справа аб ксяндзах Вейтках, 1839–1840 гг.
9. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 24. — Спр. 5575. — Справа аб размяшчэнні каноніка В. Вейткі ў Нясвіжскім бернардзінскім кляштары, 1854–1855 гг.
10. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 24. — Спр. 15808. — Справа аб абследаванні разумовых здольнасцяў ксяндза В. Вейткі, 1872 г.
11. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 24. — Спр. 15838. — Справа па абвінавачванні ксяндза В. Вейткі ў вянчанні па рымска-каталіцкаму абраду праваслаўнага селяніна С. Міцкевіча і П. Бычкоўскай, 1873 г.
12. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 24. — Спр. 15960. — Справа аб правядзенні ксяндзом Вейткам каталіцкіх духоўных абрадаў для праваслаўных, 1881 г.
13. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 24. — Спр. 15967. — Справа аб смерці і маёмасцях ксяндза В. Вейткі, 1881 г.
14. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 27. — Спр. 23. — Пратаколы пасяджэнняў Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыі за 1829 г.
15. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 27. — Спр. 47. — Журналы Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыі за 1853 г.
16. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 27. — Спр. 135. — Пратаколы Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыі за 1829 г.
17. Полное собрание законов Российской империи с 1649 г. — Собрание первое: в 45 т. — Санкт-Петербург: Тип. II отд. собственной ЕИВ канцелярии, 1830–1851. — Книга штатов 4-го отделения. — С. 102–104.

18. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных. — Санкт-Петербург: Тип. II отделения соб. ЕИВ канцелярии, 1845. — С. 71.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 19.03.2013

*С. У. Грунтоў*

# Практыка перапахаванняў у Беларусі ў перыяд Расійскай імперыі (па матэрыялах НГАБ)

Наўторнае пахаванне з'яўляецца цікавым феноменам мемарыяльнай культуры, які звычайна аказваецца па-за фокусам даследчыцкай увагі. Як і ў большасці аналагічных выпадкаў, маргінальнае месца феномена ў культуры адпавядае яго знаходжанню ў прамежкавых зонах навуковага дыскурса. Дастаткова шмат было напісана пра пахавальна-памінальную абраднасць у народнай культуры беларусаў XIX–XX стст., а таксама пра аналагічную «pompa funebris» магнатаў і заможнай шляхты XVI–XVIII стст. Аднак практыкі, якія складалі дэвіяцыю (адхіленне) ад асноўнай мадэлі, прынятай у культуры, рэдка звярталі на сябе ўвагу. Дадзены артыкул накіраваны на тое, каб запоўніць лакуну ў ведах, звязаных з пахавальна-памінальнай практыкай у Беларусі часоў Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). Аб'ектам разгляду з'яўляецца практыка паўторнага пахавання (перапахавання). Важнай крыніцавай базай па згаданай праблематыцы з'яўляюцца справы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Ніжэй разгледзім розныя формы, у якіх існавала практыка паўторнага пахавання, высветлім прычыны, што рабілі неабходным яе рэалізацыю.

Практыка паўторных пахаванняў была добра вядома ўжо ў Рэчы Паспалітай XVI–XVIII стст. Аднак яна датычылася пераважна пахаванняў магнатаў і буйной шляхты і толькі ўмоўна адпавядала дадзенаму азначэнню. Верагодна, паўторныя пахаванні разглядаемага перыяду больш карэктна было б назваць «пахаваннем у два этапы». Гэта значыць, што першае пахаванне магло ад самага пачатку прадугледжваць другое як частку расцягнутага ў часе жалобнага цэрыманіялу [12, с. 254–255]. У некаторых выпадках перамяшчэнне цела праходзіла больш складана, чым у два этапы. Так, напрыклад, Мацей Форбэк-Летаў, лекар Уладзіслава IV, у якога 25 жніўня 1642 г. памёр двухгадовы сын, памясціў яго цела ў адным з Варшаўскіх касцёлаў, з узмацненнем маразоў перавёз яго ў Венграў. Адтуль, калі выпаў снег, цела нябожчыка даставілі ва Усялюб. Там пакінулі на пэўны час, а пасля перавезлі для канчатковага пахавання ў Вільню [12, с. 344].

Уваход беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі супаў з увядзеннем больш строгіх норм у санітарнае заканадаўства і рэформай могілак, якія выносіліся па-за межы населеных пунктаў, а астанкі памерлых лічыліся патэнцыяльнай крыніцай распаўсюджання небяспечных захворванняў [14, с. 409]. Была забаронена шырокая практыка пахаванняў у храмавых крыптах, а ўжо наяўныя пахаванні прадпісвалася выносіць за межы храма на могілкі [3]. Аднак заканадаўчыя ініцыятывы дзяржавы ў значнай ступені ігнараваліся, што ўскосна пацвярджае іх перыядычнае перавыданне. Таму многія крыптавыя пахаванні працягвалі існаваць яшчэ ў ХХ ст., а некаторыя з іх захаваліся да нашых дзён (у Нясвіжы, Гродна ў касцёле св. Францішка Ксаверыя, Камаях і інш). Для разгляду нашай тэмы больш істотна тое, што ў большасці выпадкаў перанясенне памерлых з крыпт на могілкі толькі тэхнічна можна было назваць перапахаваннем: звычайна астанкі людзей, якія аказвалася немагчыма ідэнтыфікаваць, проста закопвалі на асвечанай могілкавай зямлі ці тут жа на цвінтары [2; 3, арк. 27; 13, с. 28]. Перанясенне могілак за гарадскія межы звычайна не суправаджалася масавым перамяшчэннем старых пахаванняў. Рэдкае выключэнне складаюць каталіцкія могілкі ў Дзвінску (сёння — г. Даўгаўпілс у Латвіі), дзе для інжынерных патрэб Дзвінскай фартэцыі могілкі былі цалкам зрытыя разам з пагоркам, а таму пахаваныя на іх труны перавозіліся ў іншыя месцы [9].

У большасці выпадкаў, аднак, перапахаванні адбываліся па ініцыятыве сваякоў памерлага і зводзіліся да перанясення астанкаў з аднаго месца ў другое. Трэба адзначыць, што заканадаўства Расійскай імперыі забараняла правядзенне паўторнага пахавання памерлага, аднак пры гэтым прадугледжвалася магчымасць атрымання спецыяльнага дазволу ў якасці выключэння [15, с. 871; 16, с. 605]. Для атрымання такога дазволу трэба было накіраваць запыт у Міністэрства ўнутраных спраў (МУС), якое пры станоўчым рашэнні ўзгадняла абставіны перапахавання з духоўнай кансісторыяй, адпаведнай веравызнанню памерлага. Згаданыя працэдурныя асаблівасці сталі прычынай таго, што ў НГАБ захавалася даволі шмат спраў з вынікамі такіх запытаў, прыкладам чаго можа служыць фонд Магілёўскай рымска-каталіцкай духоўнай кансісторыі. Звычайна такія справы вылучаюцца невялікім аб’ёмам — ад аднаго да трох аркушаў. Часам гэта тэматычна сабраныя камплекты дазволаў, якія фарміруюць большую па аб’ёму справу.

Названы тып спраў дазваляе лепш зразумець геаграфію і матывы правядзення паўторных пахаванняў. Адлегласць перанясення цела памерлага магла складаць усяго некалькі вёрст (напрыклад, з фальварка Жукава ў сямі вярстах ад Магілёва на Магілёўскія каталіцкія могілкі [5, арк. 9]) ці сотні кіламетраў (напрыклад, з Омска ў Вільню ці з аўстрый-

скага Ціроля ў Сенненскі павет Магілёўскай губерні [4; 5, арк. 7]). Відавочна, што ў большасці выпадкаў прычынай перапахавання з'яўлялася жаданне пахаваць блізкага ў межах уласнага маёнтка, у сваёй парафіі, у радавым склепе пры яго наяўнасці. У дазволах на перапахаванне рэгулярна сустракаюцца выразы «пахаваць у маёнтку, у фамільным склепе, на фамільных могілках» [10, арк. 43, 63, 69] ці ў «сямейнай грабніцы» [8]. Адмовы на правядзенне перапахавання сустракаюцца даволі рэдка. У якасці тлумачэння адмовы звычайна выступае спасылка на адпаведны закон [1, арк. 2а].

У іншых выпадках перапахаванне было актам вымушаным, а «пераязджаць» прыходзілася цэлым сем'ям, а не асобным памерлым. Так у 1879 г. МУС дало дазвол на тое, каб «перанесці пахаваныя ў склепе пры праваслаўнай царкве ў маёнтку Міханеў Бабруйскага павета Мінскай губерні целы Каспара, Вікенція, Антаніны, Ядзвігі, Марыі, Елізаветы і Элеаноры Кельчэўскіх для аддання зямлі ў сямейным склепе пры рымска-каталіцкай капліцы ў маёнтку Янін таго ж павета» [6]. Можна меркаваць, што вырашальную ролю тут адыграў канфесійны фактар. Верагодна, храм пасля паўстання 1863–1864 гг. быў перададзены праваслаўным, а існуючыя пры ім каталіцкія пахаванні перанеслі да адмыслова пабудаванай каталіцкай капліцы з крыптай. У тым жа 1879 г. аналагічнае перапахаванне адбылося ў маёнтку Савічы Наваградскага павета (сёння — Баранавіцкі раён). Першапачаткова род Нарушэвічаў меў уласны склеп пры касцёле ў Задзевеі (побач з маёнткам), аднак у 1866 г. касцёл быў зачынены, а ў 1868 г. пераабсталяваны пад праваслаўную царкву [20, с. 256]. Праз дзесяць гадоў пасля гэтага Нарушэвічы пабудавалі асобны склеп ва ўласным маёнтку і атрымалі дазвол на перапахаванне там трох прадстаўнікоў свайго роду [7]. Пра тое як адбывалася такога кшталту калектыўнае перапахаванне мы можам даведацца з нататак Аляксандры Глогер, дачкі Аляксандра Ельскага, якая стала сведкай пераносу радавых пахаванняў Ельскіх, а таксама пародненых з імі Заранкаў і Прозараў у новы склеп у Дудзічах (сёння — Пухавіцкі раён) ва ўрочышчы Кобань: «У 1895 г. пасля пажару царквы і пашкоджання падзямелля, з дазволу ўлады, усе труны з двух стагоддзяў урачыста былі перанесены на суседнія каталіцкія могілкі, размешчаныя ў прыгожай мясціне, непадалёк ад дудзіцкага палаца. Тое пахавальнае шэсце было надзвычай урачыстае і хвалюючае. Дваццаць чатыры труны, накрытыя жалобным сукном і вянкамі, пераносіліся мясцовымі сялянамі са святлом і са спевамі, у прысутнасці тысяч навакольных жыхароў, членаў сем'яў і суседзяў, і былі пастаўлены ў новай, спецыяльна для гэтага вымураванай грабніцы [1], а святар, што правёў абрад, сваімі гарачымі

[1] Так у тэксце перакладу. Маецца на ўвазе каменны склеп. — *Рэд.*

словамі яшчэ вышэй падняў значэнне гэтай прыгожай і нязвыклай пахавальнай урачыстасці» [11, с. 452–453].

Сама практыка пахавання прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў у XIX – пачатку XX ст. спрыяла магчымасці рэалізацыі паўторнага пахавання. У першую чаргу на гэта ўплывала мадэль трунаў, якія былі ў шырокім ужытку. Гэта металічныя аб'ёмныя труны, якія герметычна закрываліся вечкам (накрыўкай). Такая форма асабліва неабходна для крыптавых пахаванняў, паколькі дазваляла не атручваць паветра прадуктамі раскладання. Гэта ж рабіла зручным перанос цела памерлага на новае месца пры з'яўленні такой неабходнасці. Часам выкарыстоўвалі двайныя труны: металічная знаходзілася ўнутры большай драўлянай. Распаўсюджанасць такіх трунаў тлумачылася і папулярнацю цагляных камер-склепаў, якія ўзводзіліся пад зямлёй на могілках і над паверхняй зямлі маглі ніяк не вылучацца: для іх металічная труна таксама падыходзіла найлепшым чынам. Пашыранасць такіх камер, а таксама склепаў і капліц-пахавальняў служыла другім фактарам, які аблягчаў правядзенне перапахавання. У названых формах размяшчэння трунаў яны не сутыкаліся з зямлёй, а выдатна захоўваліся на працягу стагоддзяў. Заўважым, што адносілася гэта і да самога цела памерлага — у герметычна зачыненай труне натуральным чынам адбывалася муміфікацыя [17, s. 201].

Яшчэ адной формай паўторнага пахавання было вымушанае перанясенне астанкаў памерлых пры пабудове новых храмаў на старых цвінтарах. Асабліва гэта датычылася касцёльнага будаўніцтва у пачатку XX ст., калі старыя драўляныя храмы замяняліся значна большымі мураванымі, часцей за ўсё ў неагатычным стылі. Выдатным прыкладам такой сітуацыі з'яўляецца будаўніцтва касцёла св. Аляксея ў Івянцы. Будаўніцтва, якое пачалося ў 1905 г., праходзіла побач са старым драўляным касцёлам на пагорку даўняга цвінтара, што азначала неабходнасць ліквідацыі вялікай колькасці старых пахаванняў. Ужо пры даследаванні грунту шляхам капання адмысловых калодзежаў было знойдзена шмат костак і фрагментаў старых трунаў [21, s. 27]. Колькасць іх непазбежна ўзрастала пры выкопванні траншэі пад фундамент. У напамін пра гэта застаўся мемарыяльны помнік, пастаўлены з правага боку ад уваходу ў касцёл з наступнай інскрыпцыяй: U ciszy tego cmentarz | spoczywają zwłoki ś.p rodzin | Plewako, Haciskich, | Konarzewskich, | Tukałło, | Kowerskich, | Burak, Szymanko | i innych parafian Iwieńca | Nowa swiątynia pokryła część ich grobów | Kolatorowie Elżbieta i Edward | Kowerscy |Proszą przechodniów o Zdrowaś Maryja, których groby | poruszono [2] [18, s. 90]. Чыгунныя пліты

---

[2] У цішы гэтых могілак | спачываюць астанкі с.(вятой) п.(амяці) сем'яў | Плявака, Гаціскіх, | Канажэўскіх, | Тукала, | Каверскіх, | Бурак, Шыманка | і іншых парафіян

Гацiскiх, Канажэўскiх, Плявакаў і Тукалаў выкладзены ў адзін шэраг у некаторым аддаленні ад касцёла з левага боку. Хутчэй за ўсё тут перапахавалі астанкі, знойдзеныя пры закладцы фундамента. Частка каменных надмагілляў была выкарыстана як будаўнічы матэрыял пры ўзвядзенні брамы перад касцёлам. У прыватнасці тут знаходзіцца надмагілле Уршулі Бурак (пам. 1884 г.) — прадстаўніцы адной з сем'яў, пералічаных у спісе.

Выкарыстанне надмагільных пліт для будаўнічых патрэб пры ўзвядзенні новага храма ці агароджы не з'яўляецца ўнікальным. Так у Старых Васілішках (Шчучынскі раён) старыя надмагіллі выкарысталі для аздаблення партала новаўзведзенага неагатычнага касцёла св. Пятра і Паўла [19, s. 93], такім жа чынам імі скарысталіся ў касцёле ў Крошыне (Баранавіцкі раён). У Ракаве (Валожынскі раён) іх выкарысталі для ўзвядзення мураванай агароджы. Верагодна, далёка не заўсёды гэта азначала правядзенне перапахавання, а надмагілле ў некаторай ступені працягвала выконваць функцыю захавання памяці аб памерлым, нават стаўшы часткай той ці іншай пабудовы.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў XIX – пачатку XX ст. у Беларусі правядзенне перапахаванняў — гэта маргінальная з'ява ў кантэксце пахавальна-памінальных практык, якая тым не менш была дастакова пашыранай. Асноўныя матывы перапахаванняў наступныя: ліквідацыя крыптавых пахаванняў у храмах у выніку санітарных новаўвядзенняў; жаданне сваякоў перавезці цела памерлага ў радавую пахавальню, бліжэйшую да маёнтка, ці на адмысловы сегмент парафіяльных могілак; стварэнне новай крыпты ці капліцы пахавальні і перанос туды трунаў з памерлымі; пабудова храма, звязаная з неабходнасцю вызвалення месца ад ранейшых пахаванняў. Матэрыялы з фондаў НГАБ істотна дапаўняюць нашы веды пра матывы, практыку і геаграфію правядзення перапахаванняў, дапамагаюць стварыць больш поўную карціну пахавальна-памінальных практык у Беларусі XIX – пачатку XX ст.

## Крыніцы і літаратура

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 136 (Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя). — Воп. 1. — Спр. 10203. — Справа па прашэнні памешчыцы Галахвацкай аб дазволе пабудаваць капліцу на магіле яе сына ў маёнт. Цялуша Бабруйскага пав. Мінскай губ. 1834 г.

---

Івянца | Новая святыня накрыла частку іх магіл | Заступнікі Эльжбета і Эдвард | Каверскія | просяць мінакоў (прамовіць) «Радуйся, Марыя» за тых, чые магілы | парушаны (пераклад — *С. У. Грунтоў*).

2. НГАБ. — Ф. 1781 (Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя). — Воп. 2. — Спр. 2733. — Справа аб крадзяжы са склепа Полацкага бернардзінскага кляштара труны з прахам Яна Шышкі. 1844 г.
3. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 2749. — Справа аб перапахаванні мёртвых цел з падзямелляў усіх касцёлаў на бліжэйшых могілках. 1847 г.
4. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 5732. — Справа аб перавозе цела Аляксандры Тамашэвіч, жонкі паручніка Тамашэвіча. 1867 г.
5. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 6249. — Справа аб перавозе мёртвых цел з аднаго месца ў іншае для перапахавання. 1871 г.
6. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 6804. — Справа аб перанясенні астанкаў сямі асоб з роду Кельчэўскіх для пахавання ў фамільным склепе пры капліцы ў маёнт. Янін Бабруйскага пав. Мінскай губ. 1879 г.
7. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 6807. — Справа аб перавозе цел трох асоб з роду Нарушэвічаў у фамільны склеп у маёнт. Савічы Навагрудскага пав. Мінскай губ. 1879 г.
8. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 6824. — Справа аб перавозе цела тайнага саветніка Корбута з Санкт-Пецярбурга ў маёнт. Вужанка Навагрудскага пав. Мінскай губ. 1881 г.
9. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 6861. — Справа аб перавозе мёртвых цел з Дынабургскіх могілак ў іншыя месцы. 1862 г.
10. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 6923. — Справа аб перавозе цела калежскага рэгістратара Франца Дэляліча дэ Лаваля і іншых асоб. 1875–1883 гг.
11. Ельскі, А. Выбранае / А. Ельскі. — Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 493 с.
12. Косман, М. З гісторыі і культуры Вялікага Княства Літоўскага / М. Косман. — Мінск: Медысонт, 2010. — 448 с.
13. Покровский, Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии / Ф. В. Покровский. — Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1895. — 165 с.
14. Полное собрание законов Российской империи с 1649 года: в 45 т. — Т. 19: 1770–1774 гг. — СПб.: 1830. — 1083 с.
15. Полное собрание законов Российской империи с 1649 года: в 45 т. — Т. 26: 1800–1801 гг. — СПб.: 1830. — 875 с.
16. Полное собрание законов Российской империи с 1649 года: в 45 т. — Т. 33: 1815–1816 гг. — СПб.: 1830. — 1173 с.
17. Johanson, K. The burial of the von Alderbergs of Viru-Nigula in the context of 19th century / K. Johanson, T. Jonuks, J. Limbo-Simovart // Folklore. — №32. — 2006. — S. 197–227.
18. Lewkowska, A. Zabytkowe cmentarze na Kresach Wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej. Województwo nowogródzkie / A. Lewkowska, J. Lewkowski, W. Walczak. — Warszawa: DiG, 2008. — 516 s.
19. Mączewska, K. Kościoł parafialny p.w. ŚŚ. Piotra i Pawła w Starych Wasiliszkach // Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa wileńskiego. T. 3. — Kraków: Miedzynarodowy centrum kultury, 2010. — S. 73–104.

20. Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich: w 15 t. — Warszawa, 1895. — T. 14. — 930 s.
21. Ziomków, G. Krótki zarys dziejów kosciołka zbudowanego na cmentarzu katolickim w miasteczku Iwieńcu gubernji Minskiej / G. Ziemkow. — Iwieniec: Sklad wydawnictwa u proboszcza Iwienieckiego, 1909. — 40 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 05.03.2013

*О. В. Долотова*

# Интеллигенция в социокультурной жизни Беларуси в годы третьеиюньской политической системы (1907–1914 гг.) (по материалам НИАБ)

Отдельным этапом в формировании интеллигенции Беларуси в особую социальную группу стал период между 1907 и 1915 г. В указанный отрезок времени на ее деятельность наложили отпечаток особенности политики самодержавия. После поражения революции 1905–1907 гг. в Российской империи сложилась новая политическая ситуация, характерной чертой которой являлось установление реакции и террора. Среди других особенностей третьеиюньской политической системы можно выделить уничтожение политической оппозиции, дискриминационную национальную политику, усиление русификации, насаждение православного вероисповедания. Для поддержания существующего порядка использовался силовой аппарат, тюрьмы переполнились.

Русские философы, являвшиеся современниками тех событий, со страниц «Вех» заявили о провале «интеллигентской революции» вследствие кризиса в ее мировоззрении. Белорусская интеллигенция была разрозненной социальной группой по происхождению, профессиональной деятельности, мировоззрению и целевым установкам. Образованная и общественно активная часть населения не была едина в своих политических взглядах. В 1926 г. Д. Жилунович в журнале «Полымя», приводя классификацию интеллигенции начала XX в., провел разделение между нереволюционной дворянско-буржуазной и социалистической интеллигенцией Беларуси [4, с. 80].

Согласно переписи 1897 г. к интеллигенции можно отнести не более 0,3 % от всего населения края [2, с. 28]. В качестве ее объединяющей групповой социальной позиции в начале XX в. выступает идея преобразований во всех сферах жизни общества. Наличие данной идеи обусловило участие интеллигенции в создании первых политических партий, а также разнообразных общественных организаций, которых было

большое количество именно в этот предвоенный период. Таким образом, наметилась связующая нить между представителями интеллигенции разных политических и национальных групп. Согласимся с рассуждениями историка Р. Пайпса, который в своей книге «Россия при старом режиме» отмечает, что для истинного интеллигента интересы общества были превыше личных, а политическая ситуация сплотила как радикалов, так и либералов с консерваторами [21, с. 252–253].

Таким образом, при отнесении того или иного индивида к интеллигенции, в первую очередь необходимо учитывать присутствие в его сознании идеи совершенствования общества, а также его практическую деятельность по осуществлению данной идеи. При этом его образование и профессия играют второстепенную роль.

Целью данной работы является представить информативность архивных источников на предмете изучения социокультурной деятельности интеллигенции Беларуси в 1907–1914 гг. Основой выступят данные материалов официального делопроизводства, хранящиеся в фондах Национального исторического архива Беларуси.

Документы НИАБ подтверждают, что интеллигенция северо-западных губерний Российской империи имела отличительные черты и особенности. Важную информацию по теме предоставляют делопроизводственные материалы царской администрации в крае, а именно документы канцелярий минского и витебского губернаторов (фонды 295 и 1430). Отметим, что до 1909 г. в Беларуси действовало «Положение об усиленной и чрезвычайной обороне». На местах царская администрация имела право издавать «обязательные распоряжения», которые имели силу закона. Они регламентировали каждый шаг населения. Реакционная политика хорошо просматривается в содержании документов, хранящихся в фондах канцелярий губернаторов. Среди данных источников большую часть составляют материалы переписки, а также распорядительная и отчетная документация: резолюции и циркуляры губернаторов, рапорты уездных исправников и полицмейстеров, прошения частных лиц и организаций. Интерес также представляет протокольная документация минского общества врачей (фонд 502).

После знакомства с источниками складывается впечатление, что, несмотря на реакционную политику властей, общественная жизнь Беларуси в 1907–1914 гг. была насыщена культурными мероприятиями.

Деятельность интеллигенции в крае находилась под непрерывным надзором администрации. В 1911 г. Министерство внутренних дел Российской империи было крайне недовольно предоставляемыми сведениями о ней из северо-западных губерний. В сентябре 1911 г. минский губернатор направил циркуляр полицмейстерам и уездным исправникам, в котором отмечалось, что «в большинстве случаев начальниками

полиции остается без достаточного выяснения настроение интеллигентных кругов, играющих, несомненно, руководящую роль на местах» [7, л. 48–48 об.].

В ноябре минский губернатор направил новый циркуляр с замечанием, что ежемесячные сведения о настроении населения, предоставляемые местной администрацией Министерству внутренних дел, не дают точного представления о положении дел на местах. Далее предлагался перечень обязательных сведений для ежемесячных отчетов: «о настроении различных групп населения, а именно: а) крестьянского — с указанием имевших место в отчетном месяце выдающихся массовых беспорядков и выступлений и волновавших крестьянские массы ложных и неосновательных слухов; б) рабочего — с указанием выдающихся случаев забастовочного движения; в) интеллигентных слоев общества, как, например, политических партий (конституционно-демократической и правее ее), прессы, просветительных организаций и обществ частной инициативы, лиц свободных профессий, учащейся молодежи, профессиональных обществ» [6, л. 45–45 об.]. Третий пункт перечня сведений чрезвычайно важен, так как конкретизирует содержание понятия «интеллигенция» для общественности того времени.

В 1908 г. Департамент полиции получил сведения о рассылке ЦК РСДРП сообщения провинциальным комитетам о временном прекращении забастовочной деятельности с предписанием основное внимание обратить на экономическую борьбу, а также на организацию и участие в культурно-образовательных обществах. Царская администрация немедленно отреагировала и направила свою деятельность на усиление надзора за культурно-образовательными мероприятиями [18, л. 71].

Под надзором находилась научная, лекторская, врачебная и другая деятельность интеллигенции. Департамент полиции предупреждал о том, что были выявлены случаи, когда представители подпольных организаций проводили свою агитацию, передвигаясь по стране в вагонах поездов, специально отведенных для научных экскурсий и экспедиций [8, л. 55]. Нетрудно представить, насколько усложнилась процедура получения разрешения на подобные мероприятия от губернатора после данного циркуляра.

В начале XX в. в Беларуси врачебной деятельностью занималось около 6,5 тыс. человек [2, с. 27–28]. В 1862–1917 гг. в Минске существовало общество врачей, которые придерживались в основном либеральных взглядов. В начале XX в. его члены поднимали вопросы о санитарном состоянии ночлежных приютов для бездомных, о состоянии городских свалок, являвшихся источником заболеваний. Член общества знаменитый минский доктор И. У. Зданович неоднократно обращался в городскую управу, требуя проведения дезинфекции подобных мест [16,

л. 17]. При обществе функционировали библиотека и комиссия по народным чтениям. Правление общества следило, чтобы проводилась культурная работа с населением.

Сложнее было проводить врачебную деятельность так называемым «неблагонадежным элементам». К 1911 г. дошло до того, что в условиях сложной эпидемиологической ситуации Департамент полиции Министерства внутренних дел велел запрещать фармацевтическую и врачебную деятельность врачам, заподозренным в антиправительственной пропаганде. В циркуляре говорилось: «Препятствовать этим лицам заниматься своим специальным ремеслом, дабы не увеличивать комплекта лиц, не имеющих определенных занятий, и таким образом не создавать искусственно оппозиционного элемента» [9, л. 58].

Важной группой источников, которая содержит огромное количество сведений о культурной жизни края в 1907–1914 гг., является исходно-разрешительная документация на проведение публичных культурных мероприятий. В годы третьеиюньской политической системы разрешение от администрации требовалось на любое общественное мероприятие. Фонды канцелярий минского и витебского губернаторов содержат большое количество дел с прошениями лекторов и устроителей на организацию вечеров и спектаклей и резолюциями губернаторов, полицмейстеров и уездных исправников.

Документы по культурной деятельности в целом отражают специфику белорусской интеллигенции. В частности, ее многонациональный и поликонфессиональный состав. В данный период большую активность проявляла ее еврейская по национальности часть. В городах и местечках существовали еврейские литературно-артистические общества, например в Несвиже [12, л. 61] и Калинковичах [13, л. 255]. Устраивались вечера литературы на еврейском языке. В Бобруйске в то время было крайне популярно творчество еврейского писателя И. Л. Переца [11, л. 34]. Еврейские врачи и юристы устраивали публичные лекции. В 1912 г. в Барановичах присяжный поверенный Ш. Я. Розембаум читал лекцию, посвященную вопросам изучения еврейского права, хотя власти долго не давали разрешения на ее прочтение за ненадобностью таковой в государстве, где действует русское законодательство [10, л. 16].

Положение еврейских учителей в данный период было крайне сложным. В газете «Двинская мысль» от 13 октября 1913 г. в рубрике «Местная хроника» рассказывалось о гонениях на еврейских учителей со стороны попечителя Виленского учебного округа, который запретил учителям еврейской национальности преподавать в гимназиях и прогимназиях русский язык, историю и географию [19, л. 2 об.]. Попечитель заявил, что им разрешается преподавать только закон своего Бога. Нельзя не усмотреть в данном факте политические и идеологические мотивы.

Представители католической конфессии, которые в документах часто именуются как «поляки», также старались разнообразить культурную жизнь общества различными спектаклями, вечерами, лекциями, выступлениями хоровых коллективов и т.д. Правда, получить разрешение на проведение мероприятия на польском языке было практически невозможно. Так органисту минского Мариинского костела И. И. Ломацкому власти отказали в разрешении устроить польский сценическо-вокальный вечер, так как «нельзя не усмотреть стремления к полонизации местного населения, укрепляя в нем уверенность, что природный язык местных католиков и здешний край не русский, а польский… послужит одним из способов к разжиганию политических страстей. Кроме того, незнание чинами полиции польского языка весьма затрудняет осуществление соответствующего надзора за подобными вечерами» [14, л. 150–151]. Власти подозревали, что полученные от вечера средства пойдут на ремонт костела, что было нежелательно.

Царская администрация подозрительно относились к служителям католической церкви. В 1912 г. пинский уездный исправник И. Г. Ансенс докладывал в Департамент духовных дел Министерства внутренних дел о том, что ксендзы обучают детей молитвам на польском языке, что с малолетства формирует в них антирусскую настроенность. Исправник утверждал, что ксендзы собирали детей в частных домах. Это считалось тайной деятельностью и было запрещено [5, л. 3].

Белорусская интеллигенция также принимала активное участие в культурной жизни края. В городах Вильно, Минск, Гродно и др. организовывала вечера с декламацией произведений белорусских поэтов и писателей, с исполнением белорусских народных песен и танцев. Очевидно, что большинство мероприятий проводилось тайно, без разрешения властей.

К данному периоду относится деятельность театральных трупп И. Буйницкого и А. Бурбиса. Сегодня можно только догадываться, чего стоило Игнату Буйницкому летом 1910 г. получить разрешение от губернских властей на организацию и гастроли первой белорусской труппы. Если в 1911 г. ему еще дали разрешение на гастроли, то в 1912 г. полностью запретили выступать. Следует вспомнить про второе выступление труппы Буйницкого на этнографическом вечере, организованном Виленским отделом императорского музыкального общества. Организаторы вечера были в замешательстве, когда белорусы захотели также выступить. К слову, желание еврейского хора участвовать в программе вечера никакого удивления не вызвало. Белорусский хор и труппа Буйницкого тогда выступили только потому, что за них просил профессор виленской музыкальной школы Раттасепп, финн по национальности [20, с. 425].

Среди документов на получение официальных разрешений на устройство публичных мероприятий встречаются экземпляры о проведении спектаклей на белорусском языке. Например, в 1913 г. А. Жданович, Н. Александрович и хористы Минского кафедрального костела устроили бесплатный вечер с постановкой комедии в одном действии «Суеверия» («Забабоны») Григоровича для служителей костела и хористов [15, л. 251–251 об.].

Активно себя проявляла польская и белорусская молодежь Гродненщины. Гимназисты организовали польский и белорусский кружки молодежи. Среди членов первой организации упоминаются С. Воеводский, М. Янковский, Л. Сивицкая, А. Бычковский и др. [3, с. 181].

Белорусский кружок молодежи действовал с 1909 г. Среди его организаторов гимназисты А. Бычковский, Ф. Эйсмонт, В. Семенович, З. Абрамович, П. Алексюк, сестры А. и М. Солянко, Е. Шегедевич, Л. Сивицкая и др. Руководил кружком ксендз Ф. Гришкевич. Члены кружка организовали белорусскую библиотеку, занимались постановкой спектаклей на белорусском языке, устраивали лекции, декламации произведений белорусских поэтов. В 1911 г. в кружке насчитывалось около 40 членов. В том же году один из вечеров посетил Иван Луцкевич.

редкостью) они имели возможность выбрать более «удобное» место. Это приводило к тому, что в приходы с «упорствующими» зачастую назначались молодые, неопытные священники. Несомненно, в таких приходах им служилось вдвойне трудно.

Как мы уже отмечали, по мнению В. Яновской, в Минской губернии главным фактором переходов из православия в католичество являлись смешанные браки. Чтобы обосновать данный тезис, исследователь приводит один из циркуляров минского епископа, в котором тот не благословлял православно-католические браки [31, с. 190], что на деле означало их запрет [31, с. 107]. Однако еще в 1902 г. минский губернатор Мусин-Пушкин в своем отчете императору определил число «упорствующих» губернии в 9500 человек. Если сравнить сведения губернатора с данными о количестве перешедших в католицизм с 1905 по 1913 г., то напрашивается вывод, что и в Минской губернии фактор «упорствующих» имел существенное значение.

Тем не менее анализ широкого круга источников (как официального делопроизводства, так и публицистических) позволяет согласиться с В. Яновской в том смысле, что значение фактора смешанных браков здесь было особенно велико. По нашему мнению, широкая распространенность смешанных браков объясняется, прежде всего, географическим положением Минской губернии: она являлась своего рода «пограничной» областью, так как связывала воедино два крупнейших белорусских региона: западный (Гродненская губерния, северо-западные уезды Минской губернии, уезды Виленской губернии, где преобладало белорусское население, отдельные уезды Витебской губернии) и восточный (Могилевская губерния, большая часть Витебской губернии, а также восточные уезды Минской). Первый регион традиционно выделялся значительной долей католиков в общем населении, в то время как второй отличался существенно большим влиянием православной церкви.

С изданием указа о веротерпимости обстановка в смешанных православно-католических семьях Минской губернии стала заметно ухудшаться. Во многом этому способствовала принципиальная позиция римско-католического духовенства в отношении смешанных браков, основанная на папской энциклике «Ne temere». В результате в православно-католических семьях супруг или супруга, принадлежавшие к костелу, вынуждены были под страхом отлучения от своей веры всячески убеждать всех членов своей семьи принять католичество. Католические священники упорно отказывались признавать детей от смешанных браков законнорожденными.

Например, в Бобруйском костеле все прихожане от смешанных браков, не приведшие детей на исповедь, сами лишались причастия [20, с. 4]. Вдова секретаря городской управы Стецкевича на 16 лет была от-

лучена бобруйским ксендзом от причастия за то, что вышла замуж за православного [19, с. 3]. Ксендз Трумпель, служивший в местечке Мир, узнав от прихожанки, что она замужем за православным, сказал, что ее дети попадут в ад [4, с. 235]. В другой раз, услышав от прихожанки во время исповеди, что она была замужем за православным, он оттолкнул ее от себя и крикнул: «Иди к тому диаволу, который венчал тебя с православным, и там исповедуйся!» [4, с. 235]

Крестьянка села Новосады Анна Григорьевна Санторович, католичка по вероисповеданию, исповедовалась в костеле местечка Койданово. Ксендз, узнав во время таинства исповеди, что ее муж православный, сначала не допустил ее к причастию, но видя, что женщина беременна, прежде, чем причастить, потребовал дать обещание, что родившегося ребенка она окрестит в костеле, а также попытается и мужа перевести в католичество [8, с. 21].

Во время «увещательной беседы» с Элеонорой Кроневской священник Острошицко-Городецкой церкви Минского уезда Амфилохий Руберовский выяснил, что написать прошение на переход в католичество ее заставили сложные семейные обстоятельства. «Я, нижеподписавшаяся, крестьянка Элеонора Герасимовна Кроневская по мужу, а Мокейчик по отцу, — сообщала женщина, — сим свидетельствую, что я подала прошение господину губернатору о разрешении перейти в католичество по крайней нужде, вследствие домогательств, требований, криков, ругательств, какие я переношу от мужа, возбужденного к этому своей матерью. Я каждый день плачу, жизнь моя из-за исповедания мною православной веры почти невыносима. Постоянные крики и угрозы выгнать меня, если я не уступлю их требованиям, сдурили меня, и я кончила тем, что согласилась подписать прошение губернатору. Прошение это писал логойский ксендз. Я и теперь рада остаться православною, но как я буду жить с малым ребенком, когда выгонит меня муж?» [16, л. 122–123].

При увещательной беседе с молодой крестьянкой Минской губернии Ольгой Петровной Сапега священник Константин Попов узнал, что женщина до 17 апреля 1905 г. жила мирно с мужем-католиком, детей крестили в православии, ходили в церковь, но после выхода указа о веротерпимости муж потребовал от жены срочно перейти в католичество, мотивируя тем, что ксендз не допустит его к причастию, пока вся семья не будет католической [23, с. 13].

Крестьянка Анна Семеновна Тумилович из д. Дуличи Старосельского православного прихода Минского уезда перешла в католичество после того, как ксендз раковского костела Карпович отказался обвенчать ее с католиком Викентием Ивановичем Васюкевичем, мещанином из имения Новое Поле. Анна была неграмотной, поэтому прошение за нее

написал бывший органист Родзевич, а когда она подписывалась органист водил ее рукой [16, л. 153].

В семье, где один из супругов был православным, а другой католиком, часто случались ссоры на конфессиональной почве. Летом 1913 г. служащий железной дороги Василий Синица, православный по вероисповеданию, попросил священника минской привокзальной церкви протоиерея Ипполита Квачевского и диакона Иосифа Гурина причастить свою 12-летнюю умирающую дочь Екатерину. Но жена Синицы Магдалена при приезде священнослужителей устроила скандал, крича, что ее дочь католичка. Муж Магдалены объяснил священнику, что жена втайне от него приняла католичество, в которое обратила и дочь, хотя официально они православные [17, л. 5 об.].

Существенным был фактор смешанных браков и в Витебской губернии. Как отмечало духовенство Полоцкой православной епархии, после издания указа о веротерпимости позиция ксендзов в отношении смешанных браков резко изменилась: «Запрещаемое раньше общение католической и православной молодежи, с целью брачных сопряжений, теперь католическим духовенством поощряется, с тем, конечно, условием, чтобы православная сторона перед браком непременно приняла католичество. Если же католической половине почему-либо приходится жить с православною в так называемом смешанном браке, то назойливые вмешательства ксендзов и девоток в семейную жизнь таких лиц в конце концов приводят к тому, что православный член семьи для поддержания семейного согласия переходит в католичество. Не редки случаи, когда мужья-католики подают губернатору заявления от имени своих православных жен, но без ведома и согласия последних (обыкновенно неграмотных), о желании их перейти в католицизм в расчете, что жены примирятся с совершившимся фактом» [18, л. 34].

В Могилевской губернии смешанные браки также способствовали переходам из православия в католичество [10, с. 682].

Весьма важной предпосылкой массовых переходов из православия в католичество являлся активный прозелитизм римско-католического духовенства. 1 мая 1905 г. в Минскую губернию приехал римско-католический митрополит граф Григорий Шембек. Он ездил с проповедью по многим городам и местечкам. Митрополита сопровождали всадники в униформе, поверх которой были надеты белые ленты с надписями на польском языке [21, с. 439]. Посещение Г. Шембеком различных населенных пунктов, находившихся на пути его следования, являлось важным событием в духовной жизни местных католиков и способствовало подъему их религиозных чувств, давало надежду на скорое восстановление былого влияния костела. Однако приезд митрополита помог не только религиозному подъему среди местного католического населения,

но и массовым переходам из православия в католичество. За полгода, которые Г. Шембек провел в Ракове, католичество там приняли несколько тысяч бывших православных [20, с. 4].

Массовому переходу в католицизм бывших православных Ракова оказал и активный прозелитизм местного ксендза Миржвинского. К сожалению, Миржвинский зачастую пользовался «приемами», запрещенными не только законом, но и морально-этическими нормами. Проповедуя в костеле, он называл веру православных «хлопской», «собачьей», «еретической», «явившейся из-под кнута» и т.д. [21, с. 440].

Успех римско-католического прозелитизма имел в своей основе и такой важный фактор, как высокий уровень подготовки духовенства, чем не могла похвастаться православная церковь. Об этом свидетельствуют отчеты обер-прокурора Синода: «…на всю Вильну, − эту столицу Северо-западного края, где на каждом шагу стоят католические храмы, − приходилось в 1907 году два приходских православных пастыря с высшим богословским образованием. Между тем, римо-католические ксендзы там почти все с высшим богословским образованием. В Литовской епархии ксендзов с высшим образованием свыше 50, из них 2 доктора богословия и 24 магистра богословия» [6, с. 130].

Во многих католических храмах богослужения проходили на фоне торжественных процессий, органной музыки, постоянной живой проповеди. Для сравнения: в большинстве храмов западных губерний Российской империи певческое дело находилось на низком уровне, особенно в сельских храмах, где хоры были далеко не везде. Во многих храмах службу пел один псаломщик, причем не всегда правильно [22, с. 360]. Почти при каждом костеле организовывались приходские братства, которые действовали довольно активно, особенно среди крестьян. Братства хорошо финансировались, поэтому могли устраивать торжественные мероприятия, куда приглашали и православных. Многие из них, привыкшие к скромному убранству своих храмов, с восхищением смотрели на происходившее, а отдельные даже принимали католичество [6, с. 32].

Кроме того, как отмечало православное духовенство, католики гораздо лучше знакомы с вероучением своей церкви, а потому тверже в вере. Дело в том, что римско-католическая церковь большими тиражами издавала доступные по цене молитвословы-златоалтарники с кратким изложением сущности вероучения, поэтому их имел каждый католик [5, с. 288–289].

Массовому переходу из православия в католичество способствовали и ложные слухи, распространяемые среди православного крестьянства, в значительной массе неграмотного, ксендзами и их «агентами». Показателен в этом отношении рапорт одного из священников Полоцкой

епархии, в котором первые дни после издания указа о веротерпимости описывались следующим образом: «Ксендзом указ был объявлен в костеле с приглашением к нему записаться, кто желает оставить православие; одновременно через девоток было объявлено по деревням с православным населением, что от царя вышел приказ, чтобы все были католиками…, что в Петербурге все начальники перешли в католичество, что главнокомандующий Линевич — католик, а пока был Куропаткин — «русский» — Бог нашему войску не помогал; все церкви будут обращены в костелы, а священники перейдут в католичество… Поднялась сильная смута. Народ стал толпами двигаться к ксендзу, чтобы записаться; чтобы не дать народу одуматься, было объявлено, что записывать будут только несколько дней, а потому необходимо спешить. Сначала пошли «уклоняющиеся», а потом и другие, считавшиеся истинными православными» [5, с. 295].

Подобные слухи широко распространялись во всех западных губерниях Российской империи. О том, насколько сильно они влияли на православное крестьянство, свидетельствует примечательный факт. Холмский епископ Евлогий (Георгиевский), чтобы убедить свою паству в ложности подобных сведений, взял с собой несколько человек и отправился с ними в Петербург, где сумел добиться аудиенции у Николая II. Только встреча с самим императором окончательно развеяла сомнения холмских крестьян в том, что Николай II и его семья православные, а слухи о переходе в католичество не имеют под собой никакого основания [11, с. 152–153].

Очевидно, что ложные слухи, с необычайной скоростью распространившиеся в западных губерниях, нацеливались на «колеблющихся» (так чиновники и православные священнослужители называли бывших униатов, которые не проявляли особой неприязни к своей новой вере, однако были недостаточно тверды в ней), а также исконных православных. В этой связи возникает вопрос: почему же эти слухи оказались столь эффективны, что для их развенчания православному духовенству приходилось прибегать подчас к весьма необычным методам? Отсылка к низкому уровню грамотности православного крестьянства в данном случае будет явно недостаточна.

Из многочисленных рапортов православного духовенства складывается впечатление, будто «господствующая» конфессия оказалась совершенно не готовой к изданию указа о веротерпимости, в отличие от своего традиционного конкурента. В документах зафиксированы сведения, которые говорят о том, что римско-католическое духовенство не только прекрасно знало о подготовке важного законодательного акта в сфере религии, но и в отдельных случаях «заранее оповещало» население об издании указа, разрешившего выход из православия. Так, 6 марта 1905 г.

священник Степской Свято-Троицкой церкви Бобруйского уезда Григорий Жуков узнал, что часть его паствы, жившая в околице Малиновка, перешла в католичество после того, как туда приехал ксендз Бобруйского костела, который «читал им закон о дозволении переходить в католичество» [13, л. 1].

Однако утверждать, что православное духовенство ничего не знало о подготовке указа о веротерпимости, было бы просто нелепо. Достаточно сказать, что в работе Комитета Министров, обсуждавшего направление и содержание будущих реформ в вероисповедном законодательстве, принимал участие и митрополит санкт-петербургский и ладожский Антоний (Вадковский).

Значит, дело отнюдь не в отсутствии информации. Судя по всему, свою роль сыграли кризисные явления, характерные для развития православной церкви в исследуемый период. Православному духовенству было непросто удержать свою паству от смены вероисповедания не только ввиду активного римско-католического прозелитизма, но и потому, что связь между духовенством и мирянами «первенствующей» конфессии значительно ослабла, приобрела во многом формальный характер. Это было одним из ярчайших проявлений кризиса в православной церкви, который к началу XX в. был уже очевиден. Ключевой предпосылкой данного кризиса, по мнению российских и западных исследователей разного времени, являлась синодальная система управления церковью [9, 24, 27, 29–30, 32]. Сущность ее заключалась в полной зависимости духовенства «первенствующей» конфессии от государства. Хорошо известны слова, сказанные по этому поводу вышеупомянутым митрополитом Антонием (Вадковским): «Я у себя в церкви не могу назначить не только священника, но и просфорни!».

Немалую роль в активизации переходов из православия в католичество сыграли помещики-католики. Как правило, они стремились обратить в свою веру православных крестьян и наемных работников. Последним обещали льготы и всяческие послабления, а на тех, которые не поддавались агитации, оказывали сильное давление. По сведениям православного священника, полоцкого епархиального миссионера П. Лепиня, в Дриссенском уезде Витебской губернии целые деревни Сарьянского и Росицкого приходов под влиянием помещика перешли в католичество [17, л. 32].

В ноябре 1908 г. рабочие экономии графа Красинского, которая находилась в имении Кайково Минского уезда, обратились к архиепископу Михаилу (Темнорусову) с просьбой защитить их от произвола управляющего имением Якова Вильчинского, заставлявшего их работать в православные праздники. На все просьбы рабочих о посещении храма

Вильчинский отвечал: «Сходи лучше в хлев и там помолись, чем пойдешь в церковь» [25, с. 493].

Известны случаи увольнения работников православного вероисповедания по религиозному признаку. Илью Глембовского, православного служащего Вороненской лесной дачи Слуцкого уезда, которая принадлежала князю Радзивиллу, уволили за то, что он православный [12, с. 67].

Таким образом, основными предпосылками массовых переходов из православия в католичество после издания указа о веротерпимости являлись: 1) наличие значительного числа «упорствующих», которые до издания указа о веротерпимости являлись православными лишь согласно метрическим документам, тайно же исповедовали католицизм; 2) широкое распространение смешанных православно-католических браков (наиболее характерно для Минской губернии); 3) длительное отсутствие контроля за переходами из православия в католичество со стороны правительства; 4) активный римско-католический прозелитизм, в том числе с использованием ложных слухов; 5) более высокий уровень подготовки римско-католического духовенства в сравнении с православным; 6) пышное убранство костелов в сочетании с органной музыкой, торжественность римско-католических богослужений; 7) экономическое давление на православных крестьян и наемных работников со стороны помещиков-католиков; 8) внутренний кризис в православной церкви, проявившийся в резком падении влияния духовенства на свою паству.

## Источники и литература

1. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя: Жыццярысы. Мартыралогія. Успаміны / Нац. навук.–асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны. — Мюнхен — Мінск : Выд. прадпрыемства “Бел. кнігазбор”, 1999. — 720 с.
2. Бендин, А. Ю. Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.) / А. Ю. Бендин. — Минск : БГУ, 2010. — 439 с.
3. Бендин, А. Ю. Религиозно-этнические проблемы интерпретации указа о веротерпимости от 17 апреля 1905 г. в Северо-Западном крае Российской империи / А. Ю. Бендин // Исторические записки / Отд-ние ист.- филол. наук РАН. Вып. 11 (129) / сост. и отв. ред. Б. В. Ананьич. — М. : Наука, 2008. — С. 218–258.
4. Братчик. Ксендзовские деяния // Вестник Виленского Свято-Духовского братства. — 1911. − № 12. − С. 235.
5. Воинствующий католицизм // Полоцкие епархиальные ведомости. — 1905. — № 12. — 15 июня. — Миссионерский отдел. — С. 288–297.

6. Всеподданнейший отчет обер-прокурора Св. Синода по ведомству православного исповедания за 1905−1907 гг. − СПб. : Синодальная типография, 1910. — 304 с.
7. Законодательные акты переходного времени. 1904−1908: сборник законов, манифестов, указов Пр. сенату, рескриптов и положений комитета министров, относящихся к преобразованию государственного строя России, с приложением алфавитного предметного указателя / Под ред. Н. И. Лазаревского. — СПб.: Юридич. кн. скл. «Право», 1909. — 1018 с.
8. Из жизни братства. Новосадский отдел народного братства // Братский листок. — 1910. — № 3. — С. 21.
9. Карташев, А. В. Русская церковь в 1905 г. / А. В. Карташев. — СПб.: Тип. Меркушева, 1906. — 20 с.
10. Лобковский, А., свящ. Собрание о. о. благочинных у Его Преосвященства 9-го августа / свящ. А. Лобковский // Могилевские епархиальные ведомости. — 1906. — № 20. — Ч. неоф. — С. 681–693.
11. Митрополит Евлогий. Путь моей жизни / Митрополит Евлогий. -Париж : ИМКА–пресс, 1947. — 520 с.
12. Насилие католиков // Братский листок. — 1910. — № 3. — С. 67.
13. НИАБ. — Ф. 136 (Минская духовная православная консистория). — Оп. 1. — Д. 37127. — Дело о склонении деканом Бобруйского костела Красницким и ксендзом Мержвинским прихожан степской Троицкой церкви Бобруйского уезда к переходу в римско-католическое вероисповедание. — 11 марта 1905 г. — 10 июня 1905 г.
14. НИАБ. — Ф. 136. — Оп. 1. — Д. 37171. — Дело по прошении лиц разных вероисповеданий, перешедших в православие, о разрешении возвращаться в прежнюю веру, в связи с выходом Указа Синода от 17 апреля 1905 года о свободе вероисповеданий. 1905–1907 гг.
15. НИАБ. — Ф. 136. — Оп. 1. Д. — 37367. — Дело по епархиальному отчету за 1908 г. 1910 г.
16. НИАБ. — Ф. 136. — Оп. 1. — Д. 37391. — Дело о преподании пастырских увещаний лицам православного исповедания, желающим перейти в инославные исповедания. 1909 г.
17. НИАБ. — Ф. 295 (Канцелярия минского губернатора). — Оп. 1. — Д. 8460. — Дело по обвинению М. Синицы в нанесении оскорблений священнику Квачевскому. Июль — ноябрь 1913 г.
18. НИАБ. — Ф. 1430 (Канцелярия витебского гражданского губернатора). — Д. 54191. — Дело о принятии мер к прекращению перехода христиан в католическое вероисповедание. — 15 февраля 1882 г. — 12 марта 1913 г.
19. Один из православных. «Обманом весь свет пройдешь, да назад не вернешься» // Минское слово. − 1907. − № 47. − С. 3.
20. Околович, Константин, священник. Еще несколько слов ксендзу Грабовскому // Минское слово. − 1906. − № 44. − С. 4.
21. Околович, Константин, священник. К вопросу о веротерпимости // Минские епархиальные ведомости. − 1905. − № 20. − С. 439−440.

22. Певческое дело в Западном крае // Вестник Виленского Свято-Духовского братства. — 1908. − № 17. − С. 360.
23. Попов, К., протоиерей. Мученица XX века / протоиерей К. Попов // Вестник Виленского Свято-Духовского братства. — 1911. − № 1. − С. 13.
24. Поспеловский, Д. В. Русская православная церковь в XX веке / Д. В. Поспеловский. — М. : Республика, 1995. — 511 с.
25. Прошение, поданное рабочими экономии графа Красинского (им. Кайково Минского уезда) // Вестник Виленского Свято-Духовского братства. — 1908. − № 22. − С. 493.
26. Римо-католический епископ барон Ропп // Окраины России. — 1907. — № 42. — С. 607.
27. Смолич, И. К. История русской церкви. 1700–1917 гг. Кн. 8: в 2 ч.: [пер. с нем.] / И. К. Смолич. — М.: Изд-во Спасо-Преображ. Валаам. монастыря, 1997. — Ч. 2. / пер. Б. Б. Вика, ред. пер. А. В. Назаренко. — 798 с.
28. Фанатизм веротерпимости // Вестник Виленского Свято-Духовского братства. — 1910. − № 2. − С. 31.
29. Фёдоров, В. А. Русская православная церковь и государство: синодальный период. 1700–1917 гг. / В. А. Фёдоров. — М. : Русская панорама, 2003. — 480 с.
30. Фирсов, С. Л. Православная церковь накануне перемен (1890-е–1918 г.) / С. Л. Фирсов. — М. : Культур. центр «Духов. Б-ка», 2002. — 623 с.
31. Яноўская, В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863−1914 гг. / В. В. Яноўская. — Мінск : БДУ, 2002. — 199 с.
32. Cunningham, James W. A vanquished hope, the movement for church renewal in Russia, 1905–1906. / James W. Cunningham. — New York : St. Vladimir's seminary press, 1981. — 384 p.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 07.02.2013

*А. А. Лашкевіч*

# Ліквідацыя паліцыі і жандармерыі і стварэнне міліцыі ў Віцебскай губерні пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

Публікацыя падрыхтавана на падставе вынікаў даследавання дакументаў фонду «Канцылярыя віцебскага губернскага камісара [Міністэрства ўнутраных справаў] Часовага ўрада». Пасля Лютаўскай рэвалюцыі новым урадам узначальваць губерні былі прызначаны спецыяльныя губернскія камісары, якія замянілі губернатараў. Афіцыйна апошнія, як і іх намеснікі (віцэ-губернатары), лічыліся часова адхіленымі ад выканання сваіх службовых абавязкаў. У большасці

выпадкаў пасады камісараў занялі кіраўнікі губернскіх земскіх упраў. У паветах аналагічныя функцыі выконвалі старшыні мясцовых земскіх упраў, якія сталі павятовымі камісарамі замест ранейшых спраўнікаў. Канчатковае ж рашэнне аб лёсе ўладнай вертыкалі ўскладалася на будучы Устаноўчы сход.

Даследаваны намі фонд змяшчае наступныя дакументы: пастановы, інструкцыі, цыркуляры Часовага ўрада, міністэрстваў унутраных спраў, гандлю і прамысловасці, земляробства, харчавання, народнай асветы; справаздачы і перапіска віцебскага губернскага і павятовых камісараў Часовага ўрада; пратаколы пасяджэнняў, даклады земскіх сходаў, дум і ўпраў аб стварэнні органаў улады Часовага ўрада на месцах, ліквідацыі жандармерыі і паліцыі, рэарганізацыі інстытутаў земства і судовай улады, палітычным і эканамічным становішчы Віцебскай губерні, пераўтварэнні сеткі народнай асветы, аб арганізацыі выбараў ва Устаноўчы сход і інш. Да 1952 г. дакументальныя матэрыялы фонду знаходзіліся ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці і ў тым жа годзе былі перададзены ў Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычнікай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва Беларускай ССР. На яго базе і былога Партыйнага архіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ пасля 1991 г. утварыўся Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. У 2012 г. матэрыялы фонду паступілі ў Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

Адначасова са зменай кіраўніцтва губерняў і паветаў Часовы ўрад прыняў рашэнне аб «перафарміраванні» былой паліцыі ў народную міліцыю. Што датычыцца Асобнага корпуса жандараў, то апошні наогул падлягаў поўнай ліквідацыі. У нашым артыкуле робіцца спроба паказаць з дапамогай дакументаў фонду, як гэта адбывалася на тэрыторыі Віцебскай губерні пасля падзей Лютаўскай рэвалюцыі.

Усе супрацоўнікі, якія на момант рэвалюцыі ўваходзілі ў штатны расклад паліцыі, падлягалі абавязковаму раззбраенню незалежна ад іх далейшага лёсу. Гэтым займаліся мясцовыя цывільныя і вайсковыя ўлады. Так, у архіўным фондзе захавалася копія распіскі краслаўскага валаснога старшыні (прозвішча неразборліва. — *А. Л.*) ад 6 сакавіка 1917 г. наконт таго, што ён прыняў ад урадніка Краслаўскай воласці 2-га стану Дзвінскага павета рэвальвер сістэмы «Наган» і шашку з адпаведным рыштункам. 8 сакавіка начальнік штаба Дзвінскай вайсковай акругі накіраваў на імя яшчэ віцебскага губернатара паведамленне аб тым, што адабраная ў паліцыі павятовымі вайсковымі начальнікамі зброя адпраўляецца ў тылавую майстэрню ў Пскоў [5, арк. 4, 9, 7].

Многія паліцэйскія службоўцы былі арыштаваны яшчэ ў час рэвалюцыі альбо адразу пасля яе. Па гэтай прычыне Міністэрства юстыцыі Часовага ўрада разаслала 7 красавіка 1917 г. старшыням судовых палат і акруговых судоў, а таксама пракурорам вышэйзгаданых юрыдычных

інстанцый адпаведнае цыркулярнае паведамленне. Гэтым дакументам вызначаўся парадак судаводства ў адносінах да супрацоўнікаў паліцыі і жандармерыі. Яны падлягалі арышту выключна з санкцыі судовых улад, якія абавязваліся неадкладна прыступіць да разгляду спраў тых, хто ўжо знаходзіўся ў зняволенні. Прычым службоўцы, супраць якіх да гэтага не мелася абвінавачанняў, падлягалі вызваленню. Таму віцебскі губернскі камісар у маі 1917 г. накіраваў павятовым камісарам прадпісанні наконт збору звестак аб арыштаваных пазасудовымі органамі. На такое распараджэнне, у прыватнасці, адказаў камісар Невельскага павета Міцякоў. Ён праінфармаваў кіраўніка губерні, што пад вартай у мясцовым арыштанцкім доме заходзіліся былы павятовы спраўнік Яўстафій Бялінскі і гарадавы Іван Крывенка. Першы з іх зняволены згодна з пастановай Выканаўчага камітэта салдацкіх дэпутатаў Невельскага гарнізона, другі — па загаду начальніка таго ж гарнізона. Справы наконт іх мясцовае кіраўніцтва перадало пракурору Віцебскага акруговага суда для правядзення следчых дзеянняў [4, арк. 5, 15].

22 сакавіка 1917 г. начальнік штаба Дзвінскай вайсковай акругі паведаміў віцебскаму, курляндскаму, пскоўскаму і цвярскому губернскім камісарам пра пастанову Часовага ўрада аб расфарміраванні Асобнага корпуса жандараў. У сувязі з гэтым ён запатрабаваў сабраць афіцэраў і ніжніх чыноў ліквідуемага корпуса ў спецыяльныя каманды пры ўпраўленнях адпаведных губернскіх вайсковых начальнікаў з мэтай наступнай іх адпраўкі ў дзеючую армію. Мабілізацыі таксама падлягалі і прыдатныя да ваеннай службы супрацоўнікі паліцыі [8, арк. 1].

Не ва ўсіх рэгіёнах Віцебшчыны ліквідацыя ранейшых структур аховы правапарадку адбывалася без перашкод і супраціўлення з боку іх прадстаўнікоў. Так, напрыклад, люцынскі павятовы спраўнік Лебядзінскі 7 сакавіка 1917 г. накіраваў на імя губернатара тэлеграму аб тым, што створаныя ў час рэвалюцыі органы ўлады, у прыватнасці «камітэт абывацеляў» Корсаўкі, аднаго з населеных пунктаў павета, патрабуе абяззбройвання паліцыі, але ён аддаў распараджэнне станавому прыставу не дапускаць гэтага. У адказ на тэлеграму губернскі камісар Карташоў катэгарычна загадаў выканаць патрабаванне «камітэта абывацеляў» [6, арк. 164, 167].

Новыя органы па забеспячэнні аховы грамадскага парадку і барацьбы са злачыннасцю пачалі з’яўляцца адначасова з фактычным разгонам паліцыі і жандармерыі. Гэтым пытаннем займаліся земскія і гарадскія самакіраванні і утвораныя Саветы рабочых, салдацкіх, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў. Так, на пасяджэнні выканаўчага органа Віцебскага гарадскога грамадскага камітэта, новага органа ўлады, створанага ў час рэвалюцыі, 6 сакавіка 1917 г. было вырашана ўтварыць у горадзе міліцыю. На гэтае ж пасяджэнне прыбылі прыставы былой паліцыі з заявамі

аб сваёй лаяльнасці да новай улады. Але камітэт не палічыў магчымым прыняць іх у міліцыю, загадаўшы пры гэтым працягваць выкананне сваіх абавязкаў да прызначэння новых службоўцаў. Наогул стварэнне міліцыі расцягнулася ў Віцебску на даволі працяглы час. Дадзенае пытанне неаднойчы абмяркоўвалася ў спецыяльнай міліцэйскай секцыі гарадскога грамадскага камітэта ў красавіку 1917 г. У выніку быў вырашаны шэраг пытанняў наконт арганізацыі працы гарадской міліцыі. На службу ў яе маглі прымацца толькі асобы, якія мелі рэкамендацыі ад грамадскіх арганізацый, у крайнім выпадку аўтарытэтных прадстаўнікоў міліцыі. Міліцыя павінна была займацца аховай грамадскага правапарадку, асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян. У іншых мясцовасцях у стварэнні міліцыі прымалі ўдзел нават прадстаўнікі старой улады. Напрыклад, рэжыцкі павятовы спраўнік паведаміў 5 сакавіка 1917 г. губернатару аб стварэнні ў г. Рэжыца часовай міліцыі па ініцыятыве маршалка шляхты. На дапамогу ёй планавалася падключыць вайскоўцаў размешчанага ў горадзе драгунскага палка. У сельскай мясцовасці меркавалася ў адпаведнасці з адозвай губернскага камісара Карташова да вясковага насельніцтва Віцебшчыны ад 9 сакавіка 1917 г. выбіраць міліцыянераў на валасных сходах па 3–5 чалавек на кожную грамаду па ўдакладненні з павятовым камісарам [2, арк. 108; 7, арк. 22, 23, 216–216 адв.].

Міліцыя, якая стваралася ў выніку рэвалюцыйных падзей, з’яўлялася часовым утварэннем, паколькі Часовы ўрад, абвясціўшы ліквідацыю паліцыі і жандармерыі, пры гэтым не вызначыў дакладных параметраў яе структуры і накірункаў дзейнасці. І толькі 28 красавіка 1917 г. часовае ўпраўленне па справах міліцыі і па забеспячэнні асабістай і маёмаснай бяспекі грамадзян праінфармавала губернскіх, абласных і гарадскіх камісараў наконт прыняцця 17 красавіка ўрадавай пастановы аб стварэнні пастаяннай гарадской і павятовай міліцыі замест ранейшай паліцыі. Пасля гэтага фарміраванне міліцыі ў рэгіёнах атрымала пэўную прававую падставу. Яна стваралася органамі мясцовага земскага і гарадскога самакіравання. У якасці прыкладу можна прывесці пратакол пасяджэння Люцынскай павятовай земскай управы ад 11 ліпеня 1917 г., на якім было вырашана стварыць у адпаведнасці з урадавай пастановай гарадскую і павятовую міліцыю з падзелам апошняй на пяць самастойных участкаў. Таксама ў выпадку неабходнасці прадугледжвалася злучэнне пасад кіраўнікоў гарадской і павятовай міліцыі ў адной асобе. Акрамя таго, у ім адзначалася, што «арганізаваная з першых дзён рэвалюцыі часовая міліцыя не адпавядае свайму прызначэнню». Між іншым у вышэйзгаданым цыркуляры давалася ў агульных рысах пазітыўная характарыстыка часовай міліцыі [11, арк. 29, 34–35].

Трэба адзначыць, што частка ранейшых супрацоўнікаў паліцыі ўвайшла ў склад ствараемай міліцыі. Яшчэ ў першыя дні Лютаўскай

рэвалюцыі выконваючы абавязкі міністра ўнутраных спраў князь Урусаў паведаміў гарадокскаму павятоваму камісару, што пытанне аб прыёме на службу ў міліцыю былых паліцэйскіх службоўцаў павінна вырашацца на месцах па дамове з органамі мясцовага земскага альбо гарадского самакіравання ці са замяніўшымі іх грамадскімі камітэтамі [6, арк. 43]. Так, адпаведна паведамленню начальніка дзвінскай гарадской міліцыі ад 16 сакавіка 1917 г. у губернскае праўленне ў міліцыю ўзялі трох паліцэйскіх канцылярскіх службоўцаў на аналагічныя пасады. У Веліжскім павеце згодна з інфармацыяй мясцовага камісара ад 29 сакавіка 1917 г. на міліцэйскую службу прынялі памочніка прыстава г. Веліж А. Саўкіна і ўрадніка Дзмітрыева. З перапіскі, якую вёў у чэрвені 1917 г. Саўкін з кіраўніцтвам губерні аб затрымцы ў выплаце яму грашовай надбаўкі, вынікае, што на дадзены момант ён займаў пасаду начальніка 1-га раёна веліжскай міліцыі. Да гэтага трэба дадаць, што першапачаткова ў рашэнні надзвычайнага земскага сходу Веліжскага павета ад 11 сакавіка 1917 г. рэкамендавалася ўстрымлівацца, нягледзячы на прапанову гласнага Пціцына прымаць у міліцыю ранейшых паліцэйскіх у сувязі з непрыхільным стаўленнем да іх грамадства. У Лепельскім павеце ў мясцовую міліцыю прынялі трох былых чыноўнікаў канцылярыі павятовага спраўніка. Разам з тым, у іншых мясцовасцях нікога з былых паліцэйскіх не ўзялі на новую службу, як гэта вынікае з паведамленняў себежскага, невельскага і гарадокскага павятовых камісараў губернскаму праўленню і губернскаму камісару ад 21 сакавіка, 20 красавіка і 18 мая, а таксама выконваючага абавязкі рэжыцкага павятовага камісара ад 28 сакавіка 1917 г. Нягледзячы на тое што на розных сходах і нарадах, прысвечаных арганізацыі працы ствараемай міліцыі, і ў прынятых імі адпаведных пастановах неаднаразова падкрэслівалася недапушчальнасць прыёму на службу былых службоўцаў паліцыі, шэраг з іх і надалей працягвалі службу ў створанай міліцыі. Гэта можна бачыць са справаздач губернскаму камісару начальнікаў міліцыі ў гарадах і паветах наконт асабовага і арганізацыйнага складу падначаленых ім структур. Напрыклад, памочнік начальніка віцебскай павятовай міліцыі В. А. Пятроўскі раней служыў паліцэйскім приставам у Віцебску, а памочнік начальніка 4-га ўчастка С. І. Пакроўскі — станавым приставам у Ковенскай губерні. Але і восенню 1917 г. прызначэнне некаторых чыноўнікаў царскай паліцыі іншы раз выклікала незадавальненне з боку мясцовых Саветаў. Так, выканаўчы камітэт Савета салдацкіх, рабочых і сялянскіх дэпутатаў Люцынскага павета заявіў 7 верасня 1917 г. аб сваім незадавальненні рашэннем павятовай земскай управы наконт прыёму былых станавых приставаў Арлоўскага і Іванова на пасады начальнікаў міліцэйскіх участкаў. У выніку першы з іх быў вымушаны адмовіцца ад прапанаванай яму пасады [7, арк. 8

адв., 9, 27, 142–142 адв., 147–147 адв.; 9, арк. 6, 7; 10, арк. 21–22 адв.; 11, арк. 6, 7, 9, 10, 12; 13, арк. 2–2 адв., 4].

Даволі сур’ёзным пытаннем з’явілася праблема ўзбраення міліцыі, паколькі значную частку паліцэйскай зброі ў свой час передалі вайсковым структурам, і цяпер яны не вельмі ахвотна жадалі развітвацца з ёю. Акрамя таго, як паведамляў 7 чэрвеня 1917 г. губернскаму камісару начальнік рэжыцкай павятовай міліцыі «…зброя … паліцэйскіх чыноў забраная натоўпам у сакавіку месяцы гэтага года і па прыналежнасці не здадзена». Гэта праблема працягвала існаваць і восенню 1917 г. [11, арк. 26].

Раптоўны злом раней існуючых структур аховы грамадскай бяспекі не стварыў аўтаматычна ўмоў для ўзнікнення нейкіх больш дасканалых форм, незалежна ад жаданняў і імкненняў ініцыятараў дадзеных пераўтварэнняў.

Створаная замест паліцыі і жандармерыі міліцыя не змагла належным чынам выконваць свае абавязкі. Аб гэтым неаднаразова сцвярджалася на шматлікіх нарадах рознага ўзроўню, дзе губернскі і павятовыя камісары, прадстаўнікі мясцовых земстваў, гарадскіх дум і Саветаў рабочых, салдацкіх, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў абмяркоўвалі пытанні перабудовы і дэмакратызацыі дзяржаўнага апарату і органаў самакіравання губерні пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Невысокі ўзровень працы міліцыі іх удзельнікі тлумачылі рознымі прычынамі. Па-першае, роспуск паліцыі і жандармерыі адбыўся раней, чым новая ўлада вызначылася са структурай і абавязкамі міліцыі, а таксама крыніцамі і парадкам яе фінансавання. Да прыкладу, даволі доўгі час не маглі канчаткова вырашыць пытанне аб тым, хто павінен выконваць функцыі ранейшай вышукной паліцыі: міліцыя альбо судовыя органы. Па-другое, надзвычай востра паўстала кадравае пытанне. Усеагульнай «забароны на прафесію» для былых паліцэйскіх службоўцаў афіцыйна не існавала, паколькі Часовы ўрад перадаў вырашэнне гэтага пытання на разгляд мясцовых улад і органаў самакіравання. Але менавіта апошнія не заўсёды ахвотна згаджаліся прымаць іх на новую службу, нягледзячы на неаднаразова імі ж дэклараваны дэфіцыт належным чынам падрыхтаваных спецыялістаў у гэтай сферы дзяржаўнай дзейнасці. Па згаданай прычыне вакантныя пасады супрацоўнікаў міліцыі даводзілася замяшчаць недастаткова кампетэнтнымі, а іншым разам, як гэта нярэдка адбывалася ў сельскай мясцовасці, малапісьменнымі і нават зусім непісьменнымі людзьмі. На нашу думку, зусім невыпадкова на пасяджэнні Веліжскага земскага сходу 18 кастрычніка 1917 г. выказвалася патрабаванне аб тым, што «павінна быць неадкладна рэарганізавана міліцыя». Віцебская гарадская дума 30 лістапада прызнала, што незвычайны рост гвалту, рабаўніцтва і забойстваў пагражае асновам грамадскай і асабістай бяспекі

гарадскога насельніцтва. З мэтай выпраўлення такога становішча гараджанам прапаноўвалася арганізоўвацца і абараняць саміх сябе: праводзіць начныя дзяжурствы і патруляванне месцаў свайго жыхарства, ствараць дзеля гэтай мэты спецыяльныя камітэты [3, арк. 475; 12, арк. 105, 108]. Фактычна дадзеную адозву можна лічыць афіцыйным прызнаннем недзеяздольнасці віцебскай міліцыі, створанай пасля лютага 1917 г. замест былых паліцыі і жандармерыі. Такім чынам, восенню 1917 г. зноў паўстала пытанне наконт яе рэарганізацыі, і гэтай справай давялося займацца ўжо новай уладзе. Рашэнне аб стварэнні савецкай міліцыі было прынята ў Віцебску 28 кастрычніка (10 лістапада) 1917 г., але разгляд дзейнасці гэтай структуры выходзіць за рамкі дадзенага артыкула [1, с. 241].

## Крыніцы і літаратура


1. Милиция // Витебск: Энциклопедический справочник / Редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) и др. — Минск: БелСЭ, 1988.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 3445 (Віцебскі губернскі камісар Часовага ўрада). — Воп. 1. — Спр. 2. — Распараджэнні старшыні Часовага ўрада, міністра ўнутраных спраў і віцебскага губернскага камісара; данясенні павятовых камісараў Віцебскай губерніі і перапіска з імі аб стварэнні на месцах органаў улады, падкантрольных Часоваму ўраду; аб засеве палёў, нарыхтоўцы харчавання і іншых пытаннях; заклікі і звароты Часовага ўрада да грамадзян, жаўнераў і сялян; загады па фронту. 5 сакавіка – 26 верасня 1917 г.
3. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 1. — Спр. 21а. — Абавязковыя пастановы міністра гандлю і прамысловасці Часовага ўрада, галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронта і начальніка Дзвінскага ваеннага акруга і перапіска з павятовымі камісарамі і начальнікамі міліцыі аб апублікаванні гэтых пастаноў. 29 верасня – 21 снежня 1917 г.
4. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 1. — Спр. 51. — Цыркуляр Міністэрства юстыцыі Часовага ўрада аб парадку арышта супрацоўнікаў адміністрацыі корпуса жандараў і паліцыі; спісы грамадзян, якія ўтрымліваюцца ў Дзвінскай, Лепельскай павятовых і Віцебскай гарадской турмах. 7 красавіка – 30 верасня 1917 г.
5. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 1. — Спр. 52. — Перапіска з МУС Часовага ўрада і начальнікам штаба Дзвінскай ваеннай акругі аб канфіскацыі зброі ў насельніцтва і супрацоўнікаў паліцыі. 2 студзеня – 22 кастрычніка 1917 г.
6. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 1. — Спр. 55. — Перапіска з павятовымі камісарамі аб ліквідацыі органаў паліцыі ў павеце, прызначэнні пенсіі сем’ям былых супрацоўнікаў паліцыі і па асабістаму складу. 27 красавіка 1916 г. – 2 верасня 1917 г.

7. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 1. — Спр. 66. — Матэрыялы аб арганізацыі міліцыі ў Віцебскай губерніі (загады, цыркуляры, штатныя расклады і г.д.). 6 сакавіка 1917 г. – 11 студзеня 1918 г.
8. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 1. — Спр. 67. — Загад галоўнага начальніка Дзвінскай ваеннай акругі ад 22 сакавіка 1917 г. з абвяшчэннем пастановы Часовага ўрада аб расфарміраванні на месцах корпусаў жандараў; перапіска з судовай камісіяй пры Віцебскім гарадскім грамадскім камітэце па асабістаму складу Віцебскага ахоўнага аддзялення. 8–12 сакавіка 1917 г.
9. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 2. — Спр. 10. — Данясенні павятовых камісараў аб арганізацыі і працы; звесткі аб асабістым складзе органаў міліцыі ў паветах. 10 сакавіка — верасень 1917 г.
10. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 2. — Спр. 13. — Рапарты паліцэйскіх чыноў Дрысенскага, Полацкага і іншых паветаў Віцебскай губерні аб выдачы ім дадатковага заробку, налічэнні павятовым спраўнікам дадатковых грашовых выплат па прывілеям службы за 1916 г.; перапіска з Віцебскім губернскім праўленнем і віцебскім губернскім камісарам па гэтым пытанні. 1 студзеня – 9 верасня 1917 г.
11. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 2. — Спр. 36. — Матэрыялы аб арганізацыі міліцыі ў Віцебскай губерні (цыркуляр Міністэрства юстыцыі Часовага ўрада, жарналы пасяджэнняў Люцынскай павятовай земскай управы, перапіска з павятовымі камісарамі і земскімі ўправамі, спісы былых членаў паліцыі). 23 снежня 1916 г. – 16 кастрычніка 1917 г.
12. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 3. — Спр. 38. — Матэрыялы восьмага надзвычайнага Веліжскага павятовага земскага сходу (журналы пасяджэнняў, даклады, рэзалюцыя рэдакцыйнай камісіі па пытанні народнай адукацыі, лісты па выбарах гласных у павятовае земства і інш); перапіска з павятовымі земскімі ўправамі аб перавыбары іх; спісы членаў валасных земскіх упраў; журналы пасяджэнняў Себежскага павятовага земскага камітэта; каштарыс прыбыткаў і выдаткаў заштатнага гор. Сураж на 1917 г. 21 студзеня 1917 г. – 2 студзеня 1918 г.
13. НГАБ. — Ф. 3445. — Воп. 3. — Спр. 52. — Журнал пасяджэнняў дзясятага надзвычайнага Веліжскага павятовага земскага сходу, харчовай камісіі і камісіі па рэарганізацыі органаў паліцыі ў органы міліцыі. 11 сакавіка 1917 г.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 25.01.2013

*В. М. Лебедзева*

# Новыя дакументы аб універсітэцкім перыядзе жыцця Мітрафана Доўнар-Запольскага

Біёграфамі М. Доўнар-Запольскага ўжо ўведзены ў навуковае абарачэнне матэрыялы і звесткі, звязаныя з кіеўскім перыядам яго жыцця — вучобай у Першай кіеўскай мужчынскай гімназіі, стварэннем і кіраўніцтвам Кіеўскім камерцыйным інстытутам, дзейнасцю ў якасці гласнага Кіеўскай гарадской думы і г.д.

Пры гэтым своеасаблівую «белую пляму» складалі біяграфічныя дакументы, якія датычаць вучобы і працы ва ўніверсітэце св. Уладзіміра. Адной з прычын такой сітуацыі з'яўлялася адсутнасць асабістых студэнцкай і прафесарскай справаў М. Доўнар-Запольскага ў фондах універсітэта (Ф. 14, Ф. 16), якія захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве горада Кіева. Высветлілася, што частка дакументаў універсітэцкага перыяду трапіла ў Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў Кіеве (ЦДГАУК) — той самы, дзе знаходзіцца найбольш вядомы даследчыкам жыцця і дзейнасці вучонага «Асабісты фонд прафесара М. В. Доўнар-Запольскага» (Ф. 262). Аднак студэнцкія дакументы апынуліся ў зусім іншым архіўным масіве — фондзе «Канцылярыі папячыцеля Кіеўскай навучальнай акругі» (Ф. 707).

Тут за вопісам 287 у справе № 1303 захоўваецца архіўны комплекс, звязаны з набыццём М. Доўнар-Запольскім універсітэцкай адукацыі. Сярод іх найперш варта адзначыць «Прошение бывшего студента Историко-филологического факультета Университета св. Владимира Митрофана Запольского-Довнара» ад 11 красавіка 1894 г., адрасаванае ў гісторыка-філалагічную камісію Кіеўскага ўніверсітэта з просьбай дапусціць да выпрабаванняў за курс гістарычнага аддзялення. Важнае значэнне маюць таксама: пасведчанне аб выніках паўкурсавых іспытаў, пратакол выпускных экзаменаў, уласныя «Автобиографические сведения», рукапіс студэнцкага даследавання «Возвышение Москвы» і інш. Асаблівую каштоўнасць мае тагачасны здымак М. Доўнар-Запольскага, зроблены ў студыі папулярнага кіеўскага фатографа Высоцкага.

Усе гэтыя дакументы пэўны час заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў і не былі ўведзены ў навуковае карыстанне. Між тым іх каштоўнасць для рэканструкцыі ранняга перыяду біяграфіі, фактараў, умоў і характару фарміравання будучага навукоўца надзвычай вялікая.

Так, «Автобиографические сведения» — фактычная справаздача М. В. Доўнар-Запольскага аб зробленым за перыяд універсітэцкага навучання — вызначаюцца не толькі высокай інфармацыйнай каштоўна-

сцю, але цікавыя элементамі самаацэнкі і псіхалагічнага партрэта аўтара.

Сярод іншага, гэты дакумент утрымлівае экскурс у больш ранні перыяд, які папярэднічаў універсітэцкаму. Дзякуючы гэтаму да раней вядомых біяграфічных фактаў аб дзяцінстве і гімназічным навучанні М. Доўнар-Запольскага дадаюцца новыя істотныя звесткі: напрыклад, пра заканчэнне Рэчыцкага народнага вучылішча, пра знаходжанне ў сям'і старэйшай сястры Соф'і падчас вучобы ў Мінскай гімназіі, пра ад'езд бацькоў у Балгарыю, пра ўражанні ад Мазырскай прагімназіі і Мінскай гімназіі і г. д.

Адметна, што пры апісанні ўласнага юнацтва і выхавання аўтар дакумента не хавае вострай і балючай для яго праблемы матэрыяльнай незабяспечанасці бацькоў, а таксама свайго амаль беспрытульнага стану з малых гадоў. Наадварот, у інтэрпрэтацыі М. Доўнар-Запольскага гэтыя абставіны выглядаюць як жыццёвыя выклікі, адказам на якія стала прага да адукацыі і набыцця больш высокага сацыяльнага статусу. Крокамі на абраным шляху з'явіліся даследчыцкія спробы, якія не толькі рэалізавалі інтэлектуальныя памкненні, але і былі ледзь не галоўным сродкам існавання: «С половины третьего класса я был предоставлен самому себе, помогать мне и заботиться обо мне было некому… В гимназии мне пришлось вынести жестокую борьбу за существование. Это имело и хорошие стороны (с 4-го класса гимназии, от января 1883 г. начали появляться мои первые статьи в «Заре», «Еженедельном обозрении» и др.), но зато здоровье мое было подорвано» [6, арк. 94]. Сапраўды, моцным здароўем М. Доўнар-Запольскі не вызначаўся, аб чым сведчыць, напрыклад, яго кандуіцкі спіс у Першай кіеўскай мужчынскай гімназіі, адпаведна якому толькі за першае паўгоддзе 1886 навучальнага года пропускі заняткаў з-за хваробы склалі амаль два месяцы [4, арк. 32].

Аўтабіяграфічныя разважанні раскрываюць таксама вытокі і імпульсы цікавасці гімназіста да гістарычных ведаў і даследаванняў, указваюць таксама на некаторыя адметныя і прынцыповыя рысы расійскай гімназічнай адукацыі. Так, М. Доўнар-Запольскі з удзячнасцю згадвае сваіх настаўнікаў у Мазырскай прагімназіі Дабравольскага і Глебава, якія не толькі выдатна выкладалі гісторыю, але растлумачылі гімназісту розніцу паміж публіцыстычнай і навуковай літаратурай, упершыню пазнаёмілі яго з імёнамі і творамі І. Сразнеўскага, Ф. Буслаева, А. Пагодзіна і інш.

Лёсавызначальным для М. Доўнар-Запольскага стала трохгадовае (1885–1888) навучанне ў прэстыжнай Першай кіеўскай мужчынскай гімназіі. З яе выкладчыкаў найбольшы ўплыў на будучага гісторыка зрабіў прафесар універсітэта П. Галубоўскі, які знаходзіў час на размовы з дапытлівым навучэнцам і прызвычаіў яго да чытання навуковых

прац. Менавіта пад кіраўніцтвам П. Галубоўскага краязнаўчыя спробы М. Доўнар-Запольскага сталі набываць даследчыцкія рысы. У аўтабіяграфічных запісках ён адзначае, што такі стыль выкладання быў нетрадыцыйным і выходзіў за межы афіцыйнага адукацыйнага рэгламенту: «…обычно гимназических мальчиков не хвалят за чтение научных сочинений: инспекция мне запрещала не раз» [6, арк. 94]. Як вядома, прычынай выключэння М. В. Доўнар-Запольскага з Першай кіеўскай мужчынскай гімназіі стала якраз знаходка на яго кватэры навуковых славяназнаўчых выданняў.

Асноўны змест азначанага дакументальнага комплексу звязаны з перыядам і абставінамі ўніверсітэцкага студэнцтва будучага навукоўца. Найбольш высокай якасцю і навізной інфармацыі вызначаецца «Прошение бывшего студента Историко-филологического факультета Университета св. Владимира Митрофана Запольского-Довнара» аб допуску да выпускных іспытаў.

Гэты дакумент разам з «Автобиографическими сведениями» сведчыць, што навучальны працэс для студэнта М. Доўнар-Запольскага не меў сістэматычнага аўдыторнага характару, а ў значнай ступені складаўся з самастойных заняткаў. Вынікаюць неаднаразовыя факты пропускаў і перарываў у вучобе, адтэрміновак у здачы экзаменаў.

Прычын такога характару навучання было некалькі. Першай з іх з'яўляліся адзначаныя вышэй праблемы са здароўем, якія праследавалі М. Доўнар-Запольскага і далей. Нягледзячы на гэта, ён здолеў яшчэ ў студэнцкія гады прадэманстраваць яркі тэмперамент і своеасаблівы максімалізм у адносінах да любой справы, неўтаймаваную прагу да разнабаковай дзейнасці і напаўнення жыцця наогул. Такі стыль не толькі быў крыніцай даследчыцкіх і жыццёвых дасягненняў, але таксама і прычынай зрываў уласных жа планаў і мэт, не мог не адбіцца і на характары акадэмічных заняткаў.

«Автобиографические сведения» даюць пацвярджэнне гэтаму, інфармуючы пра раней не вядомы і адметны факт студэнцкай біяграфіі — значны перарыў навучання на першым курсе ўніверсітэта. Аўтар запіскі адзначае, што пасля першага семестра «полукурсовые испытания я не окончил, да и шли они не особенно удачно». Як вынік, «год был потерян», вучоба аднавілася толькі на наступны 1890 г. [6, арк. 93].

Пасля аднаўлення на факультэце М. Доўнар-Запольскі выказаў упартасць і волю да вяртання страчанага. Наступныя тры ўніверсітэцкія гады прайшлі надзвычай напружана і плённа: «я старался, кроме обязательных курсов, прослушать возможно больше необязательных. Так, я прослушал: у профессора Антоновича 1) Историю Западной Руси (2 семестр), 2) Источники Западно-русской истории (2 семестр); 3) Русские древности (2 семестр)» [6, арк. 94]. Звяртаюць на сябе ўвагу дысцыплі-

ны, якія студэнт М. Доўнар-Запольскі абраў сваім прыярытэтам — яны яскрава сведчаць пра арыентацыю на беларусазнаўчую праблематыку.

Не менш плённымі былі даследчыцкія дасягненні. За два гады вучобы (1890–1892) М. Доўнар-Запольскі апублікаваў больш за 40 самастойных прац і рэцэнзій, сярод якіх: «Календарь Северо-Западного края на 1890 год», «Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия», «Песни пинчуков» і інш. Даследаванні, публікацыі, экспедыцыі і г.д. прыносілі прызнанне навуковай супольнасці: у 1890 г. М. Доўнар-Запольскі быў абраны сябрам этнаграфічнага аддзела, а ў 1891 г. — ужо сапраўдным сябрам Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі. Ад таварыства ён атрымаў вялікі срэбны медаль за этнаграфічныя экспедыцыі. У 1892 г. Рускае геаграфічнае таварыства ўзнагародзіла маладога даследчыка яшчэ адным срэбным медалём за працу «Крестьянские игры в Минской губернии».

начальства вымушана будзе перамясціць яго на другі, горшы, прыход» [5, арк. 66 адв. – 67 адв.].

Усе пералічаныя судзімасці былі прыведзены ў гучнай справе пазнейшага судовага працэсу над Струкоўскім. Чарговае абвінавачанне адбылося, за тое што 14 студзеня 1896 г. святар правёў заручыны сялян Арцемія Галаты і Марфы Жыткавец без іх наступнага вянчання (па прычыне адсутнасці хроснай метрыкі жаніха). Гэты факт выклікаў абурэнне ў начальства Мінскай кансісторыі, бо мог стаць падставай для незаконнага пражывання разам, а таксама прывесці да падзення статуса і змены значэння хрысціянскага шлюбу для прыхаджан. Са Струкоўскага ўзялі абяцанне, што пасля заручын ён абавязкова будзе праводзіць вянчанне, аднак пазней айцец Фёдар пачаў апраўдваць свой учынак, спасылаючыся на трэбнік [5, арк. 47–51]. У сувязі з гэтым ён атрымаў месячную епітым'ю на два тэрміны (14–29.10; 15–30.11.1897) з накіраваннем у Пінскі Багаяўленскі манастыр. Знаходзячыся там, Струкоўскі паводзіў сябе адказна і станоўча, прынёс пакаянне [5, арк. 78].

Абвостранае пачуццё справядлівасці і жаданне пакараць віноўнага на зямлі, з тым каб пазбавіць яго пакарання на небе, знайшло адбітак яшчэ ў адной судовай справе. У 1898 г. Фёдару Струкоўскаму давялося трапіць пад новае судовае следства ў якасці абвінавачанага па справе знікнення ў настаўніка Старажоўскай царкоўна-прыходскай школы Ісідора Галавача 45 руб., што адбылося 7 красавіка 1898 г. Аднак давесці гэты факт перад судом Галавач не здолеў, на што Фёдар Струкоўскі адрэагаваў абвінавачаннем у ілжывым даносе, якое было разгледжана, і ў выніку настаўнік прызнаў сябе вінаватым [19].

Адзіная дачка Анастасія і Разаліі Вольга была замужам за Міхаілам Паўлавічам Гаховічам, святаром Засульскай царквы Мінскага павета (1893), пазней — Барбароўскай царквы Рэчыцкага павета (1912). Усе астатнія дзеці абралі для сябе свецкія прафесіі. Аляксандр служыў участковым прыставам у Варшаве (1893), капітан-ад'ютантам ва Уладзівастоку (1912); Антон — настаўнікам рэальнага вучылішча ў Панявежы Ковенскай губерні (1893), стваральнікам і загадчыкам вучэбнай часткі Слуцкага прыватнага жаночага вучылішча, а затым гімназіі (1907–1912), выкладчыкам гісторыі Мінскага прыватнага жаночага камерцыйнага вучылішча (1913); Кіпрыян — настаўнікам Гомельскага духоўнага вучылішча (1893), затым Кацярынадарскага чыгуначнага вучылішча (1912); Георгій — участковым у Варшаўскай паліцыі (1893), затым чыноўнікам казённай палаты (1912); Іван — штатным чыноўнікам па Варшаўска-Цярэспальскай чыгунцы (1893), земскім начальнікам 1-га участка Барысаўскага павета (1912) [12, арк. 219 адв. – 220; 13, арк. 308 адв. – 309; 22, с. 142; 23, с. 80; 24, с. 354].

Айцец Парфірый Іванавіч Струкоўскі па сканчэнні курса навук у Мінскай духоўнай семінарыі быў звольнены з яе з атэстатам другога разраду і рукапакладзены ў святары з накіраваннем у Старынскую царкву (19.01.1858), з якой пераведзены ў Ліцвянскую (05.09.1860). За адказнае нясенне службы і прыкладныя паводзіны ўзнагароджаны архіепіскапам мінскім і бабруйскім Міхаілам набедранікам (21.08.1866). Новым і апошнім пераводам для яго было накіраванне на выкананне святарскіх абавязкаў у Пятра-Паўлаўскую царкву мястэчка Узда (28.05.1875). Там жа ён атрымаў прызначэнне на пасаду настаўніка закона Божага пры мясцовым народным вучылішчы. Пазней загадам Мінскай духоўнай кансісторыі айца Парфірыя прызначылі акружным следчым па другой акрузе Ігуменскага павета (30.03.1883). У студзені 1884 г. яго ўзнагародзілі скуф'ёй, а 1 жніўня 1888 г. ён атрымаў падзяку Епархіяльнага навучальнага Савета за руплівасць у справе народнай адукацыі. Праз два гады атрымаў удзячнасць савета Дырэкцыі за добрае навучанне дзяцей закону Божаму, а таксама за іх стараннасць і паспяховасць (16.07.1890 і 08.10.1890). На ўсіх набажэнствах айцец Парфірый выступаў перад прыхаджанамі з павучаннямі. Праводзіў гутаркі з імі і ў вольны час. Падобных гутарак з 1875 па 1891 г. ім праведзена 47. Паводзіны былі прыкладнымі, судзімасці не меў. Сям'я айца Парфірыя складалася з жонкі Алены Феліцыянаўны (51 г. на момант 1891 г.), дзяцей Івана (33 г.), Паўла (30 г.), Пятра (28 г.), Вячаслава (26 г.), Зінаіды (19 г.) [11].

Паводле норм царкоўнага права, якое было замацавана ў заканадаўстве Расійскай імперыі, шлюб разглядаўся як цялесны і духоўны саюз мужчыны і жанчыны. Пры гэтым у выпадку смерці мужа не дапускаўся шлюб удавы з блізкім сваяком нябожчыка, бо гэта падпадала пад судовы артыкул аб кровазмяшэнні. Менавіта аб такім выпадку ў рапарце Мінскай кансісторыі сведчыў 8 снежня 1889 г. святар Уздзенскай царквы Парфірый Струкоўскі. Сялянка вёскі Сыманчыцы Ганна Андрэева Пяткевіч пасля смерці мужа Фёдара Восіпава Пяткевіча, з якім мела двух сыноў Міхала і Анісіма, для дапамогі сабе ўзяла на гаспадарку яго роднага брата Івана. Паколькі вянчацца сваякам было забаронена, яны 13 гадоў пражылі ў «грамадзянскім» шлюбе і нажылі пяцёра дзяцей. Іх сваяцтва характарызавалася «другім сцепенем двухроднага свойства». У якасці пакарання абодвух належала накіраваць на чатыры месяцы ў манастыр і «падвергнуць царкоўнаму пакаянню па распараджэнні іх духоўнага начальства» [17, арк. 21–23, 38, 46–50].

Парфірый Струкоўскі памёр 16 сакавіка 1898 г. і быў пахаваны на цвінтары Уздзенскага храма. На яго магіле надпіс «будаўнік Пятра-Паўлаўскай царквы». Будаўніцтва новага мураванага храма ў мястэчку Узда было завершана толькі ў 1905 г. Побач з айцом Парфірыем пахаваны

яго жонка Алена Феліцыянаўна (+17.03.1898) і малодшы сын Вячаслаў (+10.02.1898).

Прыведзены артыкул акцэнтуе ўвагу на найбольш перспектыўных пры рэканструкцыі святарскай генеалогіі і штодзённасці дакументах, якімі з'яўляюцца кліравыя ведамасці і судовыя справы. На падставе кліравых ведамасцяў можна высветліць абставіны і шляхі рассялення святарскіх родаў, назіраць асаблівасці іх службовай дзейнасці. Разгляд асобнай біяграфіі ці генеалогіі з дапамогай судовых крыніц дазваляе прасачыць гісторыю жыцця святара або яго роду з нечаканых ракурсаў. Асобы выступаюць тут не толькі як служыцелі Бога, а таксама як грамадскія і царкоўныя дзеячы, выразнікі людскіх настрояў, станоўчы або адмоўны прыклад для вернікаў. Генеалагічная каштоўнасць крыніц падкрэсліваецца праз прысутнасць прамой генеалагічнай інфармацыі ў кліравых ведамасцях, прамой або ўскоснай адпаведнай інфармацыі ў судовых матэрыялах. Абодва віды крыніц узаемадапаўняюць адзін аднаго і прадстаўляюць вялікую значнасць пры незахаванасці метрычных запісаў.

## Крыніцы і літаратура

1. Зиновьев, А. В. Плышевские — православные священно- и церковнослужители Беларуси XVIII–XX веков / А. В. Зиновьев. — Минск: Белорусская Православная Церковь, 2008. — 584 с.
2. Іванова, В. С. "Чалавек ад Бога". Біяграфія протаіерэя Іаана Струкоўскага (па дакументах асабістага архіва і ўспамінах родных і знаёмых) / Вольга Іванова // Праваслаўе. — 2010. — № 16. — С. 136–141.
3. Маракоў, Л. У. Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі. 1917–1967. Энцыклапедычны даведнік у 2-х тамах. Т. 1: Абаленскі — Кушнер / Л. Маракоў. — Мінск: Беларускі экзархат, 2007. — 460 с.; Т. 2: Лабяк — Яцкевіч / Л. Маракоў. — Мінск: Беларускі экзархат, 2007. — 648 с.
4. Минские епархиальные ведомости / Духов.-просвет. и информ. изд. // Мин. епархия. — Минск, 1868–1917.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 136 (Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя). — Воп. 1. — Спр. 36601. — Справа па абвінавачанні Фёдара Струкоўскага, святара Старажовіцкай царквы Мазырскага пав., у здзяйсненні абрада заручынаў без вянчання паміж Арцеміям Якаўлевым Галатай, селянінам с. Старажоўцы, і Марфай Фёдаравай Жыткавец, сялянкай в. Сямурадцы. 1896–1897 гг.
6. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 40390. — Арк. 11–12, 23–24, 27–28. — Кліравыя ведамасці Белавушскай Троіцкай, Рэмельскай Свята-Міхайлаўскай, Малешаўскай Іаана-Багаслоўскай цэркваў Давід-Гарадоцкай пратапопіі Мінскай епархіі. 1796 г.

7. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 40414. — Арк. 134–137, 152–153. — Кліравыя ведамасці Рэмельскай Свята-Міхайлаўскай, Малешаўскай Іаана-Багаслоўскай, Ленінскай Раства-Багародзіцкай цэркваў Мінскай епархіі. 1800 г.
8. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 40777. — Арк.103–106. — Кліравая ведамасць Прылуцкай Свята-Духаўскай царквы Мінскай епархіі. 1855 г.
9. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 40902. — Арк. 144–147 адв. — Кліравая ведамасць Прылуцкай Раства-Багародзіцкай царквы Мінскага пав. 1870 г.
10. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 40965. — Арк. 196–199 адв. — Кліравая ведамасць Прылуцкай Раства-Багародзіцкай царквы Мінскага пав. 1880 г.
11. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр 41042. — Арк. 262 адв. – 264. — Кліравая ведамасць Уздзенскай Пятра-Паўлаўскай царквы Ігуменскага пав. 1891 г.
12. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41055. — Арк. 217–222. — Кліравая ведамасць Прылуцкай Раства-Багародзіцкай царквы Мінскага пав. 1893 г.
13. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41145. — Арк. 303–309. — Кліравая ведамасць Прылуцкай Раства-Багародзіцкай царквы Мінскага пав. 1912 г.
14. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41149. — Арк. 99–106. — Кліравая ведамасць Грозаўскай Мікалаеўскай царквы Слуцкага пав. 1912 г.
15. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 13. — Спр. 306 а. — Метрычная кніга аб народжаных, абвенчаных і памерлых па цэрквах Давыд-Гарадоцкай пратапопіі Мінскай епархіі. 1786–1794 гг.
16. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 13. — Спр. 317. — Арк. 640–644. — Метрычная кніга Рэмельскай Свята-Міхайлаўскай царквы Мінскай епархіі аб народжаных, абвенчаных і памерлых. 1803 г.
17. НГАБ. — Ф. 183 (Мінскі акружны суд). — Воп. 2. — Спр. 4546. — Справа па абвінавачанні Івана Восіпава Пяткевіча і яго братавай Ганны Андрэевай Пяткевіч, сялян в. Сыманчыцы Уздзенскай вол. Ігуменскага пав. Мінскай губ., у кровазмяшэнні. 1890 г.
18. НГАБ. — Ф. 183. — Воп. 2. — Спр. 6514. — Справа па абвінавачанні Цімафея Цітава Быханя, селяніна в. Сямурадцы Тураўскай вол. Мазырскага пав., у ілжывым сведчанні па справе паміж памешчыцай Ірынай Сямёнавай і святаром Фёдарам Струкоўскім. 1892–1893 гг.
19. НГАБ. — Ф. 183. — Воп. 2. — Спр. 13195. — Справа па абвінавачанні запаснога фельдшарскага вучня і настаўніка Старажовіцкай царкоўнай школы Ісідора Васільева Галавача, з сялян в. Млынок Жыткавіцкай вол. Мазырскага пав., у ілжывым даносе на Фёдара Струкоўскага, святара Старажовіцкай царквы Тураўскай вол. Мазырскага пав. 1900–1901 гг.
20. НГАБ. — Ф. 242 (Мінская губернская па сялянскіх справах прысутнасць). — Воп. 1. — Спр. 535. — Справа па абвінавачанні Анастасія

Струкоўскага, святара Прылуцкай царквы, у падбухторванні сялян да непавінавення старшыні праверачнай камісіі Іеўлеву і міравому пасрэдніку Бярэзіну. 1865 г.
21. НГАБ. — Ф. 1204 (Загальская царква Рэчыцкага пав. Мінскай губ.). — Воп. 1. — Спр. 2. — Кліравая ведамасць Загальскай Троіцкай царквы Рэчыцкага павета. 1837 г.
22. Памятная книжка Минской губернии и календарь на 1912 год. — Минск: Губернская типография, 1911. — 224, 211, III с.
23. Памятная книжка Минской губернии и календарь на 1913 год. — Минск: Губернская типография, 1912. — 232, 197, III с.
24. Самусік, А. Слуцкія жаночыя гімназіі / А. Самусік // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 6. — Ч. 1. — Мінск, 2001. — С. 354.
25. Снапковский, Ю. Н. Федор Андреевич Жудро — историк, археограф, краевед, публицист (опыт биобиблиографии) / Ю. Н. Снапковский, Д. Л. Яцкевич // Архіварыус: зборнік навук. арт. і паведамл. — Вып. 8. — Мінск: НГАБ, 2010. — С. 298–310.
26. Шумейко, М. Ф. Архивист и археограф Дмитрий Иванович Довгялло. — Минск: БелНИИДАД, 2002. — 164 с.
27. Щеглов, Г. Э. Преосвященный Виктор Садковский, первый минский Архиепископ. — Минск: Изд-во Белорусского Экзархата, 2007. — 134 с.
28. Щеглов, Г. Э. Светильник Христов. Изд. 2-е, перераб. и доп. — Минск: Братство в честь Святого Архистратига Михаила в г. Минске Минской епархии БПЦ, 2008. — 95 с.
29. Щеглов, Г. Э. Степан Григорьевич Рункевич (1867–1924). Жизнь и служение на переломе эпох / Г. Э. Щеглов. — Минск: ВРАТА, 2008. — 436 с.

Артыкул пастyпіў у рэдакцыю 11.01.2013

*Я. А. Чарнецкі*

## Да праблемы паходжання роду Фядкевічаў з Кіеўскага ваяводства (XVI–XVII стст.) [1]

У першай палове XVII ст. Фядкевічы (Хвядкевічы) належалі да асяроддзя дробнай шляхты, якая жыла на поўначы Кіеўскага ваяводства. Увага да гэтага роду абумоўлена ўжо тым, што ва ўказаны перыяд Герасім і яго сын Арцемій знаходзіліся ў асяроддзі аднаго з самых уплывовых мясцовых панскіх родаў — Нямірычаў. Арцемій Фядкевіч у сваім тастаменце 1646 г. звярнуўся з просьбай аб міласці да

[1] Пераклад з украінскай мовы зроблены Г. М. Мажэйка, на той час вядучым навуковым супрацоўнікам аддзела публікацыі дакументаў НГАБ. — *Рэд.*

Юрыя Стэфанавіча Нямірыча (1612–1659), кіеўскага падкаморыя і будучага канцлера Вялікага Княства Рускага. Сын Яўстафія Арцемій зрабіў кар'еру ў часы гетмана Івана Выгоўскага і дасягнуў пасады корсунскага палкоўніка і генеральнага пісара Украінскага гетманата. Яго подпіс стаіць сярод іншых пад актам Гадзяцкай уніі 1658 г. Сын гэтага казацкага старшыні Канстанцін або Яўстафій-Канстанцін у адрозненне ад значнай часткі паплечнікаў свайго бацькі, якія перайшлі на левабярэжную гетманшчыну, застаўся ў Рэчы Паспалітай і працягваў збіраць пераважна закладныя маёнткі ў Кіеўскім і Валынскім ваяводствах. Яго сыны наўгародскі казначэй Ян і оўруцкі гараднічы Міхал належалі да кіеўскай і луцкай палестры [2], былі актыўнымі дзеячамі мясцовых сеймікаў і праваслаўнага руху ў канцы XVII і на працягу першай паловы XVIII ст.

Адной з надзённых праблем гісторыі роду Фядкевічаў з'яўляецца яго паходжанне, звязанае з Менскім ваяводствам.

Памесную сітуацыю першых вядомых нам Фядкевічаў, якія жылі ў другой палове XVI – першай палове XVII ст., вызначае тастамент Арцемія Фядкевіча 1646 г. Тастатар даручыў сваім дзецям дасягнуць паразумення з нашчадкамі яго родных дзядзькаў і атрымаць спадчыну, што знаходзілася ў Вялікім Княстве Літоўскім, а менавіта ў сяле Навасёлкі Менскага ваяводства. Як адзначана ў тастаменце, у свой час Герасім Фядкевіч з сям'ёй (у прыватнасці, і сынам Арцеміем) пераехаў у Кіеўскае ваяводства, а сваю частку нерухомасці ў Навасёлках даручыў родным братам [1, арк. 310 адв. – 311].

З гэтых звестак вынікае, што ўласнасць братоў Фядкевічаў у Навасёлках была агульнай, непадзельнай і, мяркуючы па ўсім, вельмі сціплай. Менавіта гэта магло ўскладніць ці нават зрабіць немагчымым вылучэнне часткі для аднаго з братоў. Таму і саміх братоў Фядкевічаў можна аднесці да дробных землеўласнікаў — баяр.

Аналіз тастамента, а менавіта яго фрагмента, які адрасаваны да Стэфана і Юрыя Нямірычаў, пратэктараў сям'і тастатара, дазваляе зрабіць выснову аб пасяленні Герасіма Фядкевіча ў Чарняхоўскай воласці Нямірычаў паміж 1609 і 1630 гг. [1, арк. 311]. Менавіта тады гэтымі маёнткамі валодаў Стэфан Нямірыч, якога Герасім Фядкевіч удзячна ўспамінае, звяртаючыся да яго сына Юрыя з просьбай аб літасці.

Нягледзячы на адсутнасць у Арцемія Фядкевіча ўласнай ці нават закладнай нерухомасці ў Кіеўскім ваяводстве, сыны так і не рэалізавалі свае правы на частку ў Навасёлках. Пра гэта паведамляе тастамент Яўстафія-Канстанціна Фядкевіча, унука Арцемія, складзены ў 1702 г. Тастатар услед за сваім дзедам сведчыў, што гэта «старажытная фартуна» ў сяле Навасёлкі Менскага ваяводства засталася неабцяжаранай ніякімі

---

[2] Палестра — карпарацыя юрыстаў і адвакатаў. — *Я. Ч.*

абавязкамі, і даручыў атрымаць яе ў сваякоў сваім сынам Яну і Міхалу. Яўстафій-Канстанцін таксама адзначыў, што на працягу жыцця часта распавядаў дзецям пра гэту радавую ўласнасць [2, арк. 8].

Такім чынам, невялікая спадчына, пакінутая ў Навасёлках, на працягу XVII ст. была часткай сямейнай гісторыі Фядкевічаў, памяць аб якой перадавалася з пакалення ў пакаленне. Невядома, ці спрабаваў хто з іх атрымаць зямлю ў сваё валоданне, аднак усе яны пра яе ведалі.

Гісторыя аб перасяленні Герасіма Фядкевіча з сям'ёй з Менскага ваяводства ў Кіеўскае, якую мы закранулі вышэй, адлюстравалася ў адной з сямейных славутасцяў. Гаворка ідзе пра вялікую генеалагічную схему з малюнкам сямейнага герба пад назвай «Enologia domu slachetnie ur. pp. Fedkiewiczow». Першы варыянт гэтай радовай каштоўнасці Фядкевічаў створаны, як мы лічым, у 1670–1680-х гг. Пасля яна прыцярпела некалькі пераробак з нагоды змен у афіцыйнай канструкцыі роду. Адна з версій гэтага помніка захоўвалася аж да пачатку 1840-х гг. у сяле Ражкі Таращанскага павета Кіеўскай губерні ў невялікім сямейным архіве нашчадкаў адзінага вядомага ўнука Яўстафія-Канстанціна — Тамаша Фядкевіча. Затым разам з іншымі дакументамі яна трапіла ў архіў Кіеўскага губернскага праўлення. Менавіта «Enologia domu slachetnie ur. pp. Fedkiewiczow» змяшчае імёны братоў Герасіма Фядкевіча, хоць і звязвае іх не з Навасёлкамі, а з Волкавым Сялом: «z Wołkowoho Sieła Matwiey, Łukasz Sielczuk y Harasym Fedkiewiczowie bracia rodzeni obywatele wdztwa Minskiego W. X. Litt.» [3, арк. 76].

Не выключана, што памяць аб Волкавым Сяле была звязана з жонкай Арцемія Фядкевіча Анастасіяй (Настай) Волкаўнай, якая згадваецца ў яго тастаменце [1, арк. 311]. Яна магла належаць да роду Ваўкоў з Менскага павета. У попісе войска Вялікага Княства Літоўскага 1567 г. у гэтым павеце згаданы:

- 20 ліпеня сталі Яхім Воўк (конь, кафтан, калчан, шабля) і Марцін Гаўрылавіч Воўк (конік, калчан, шабля);
- 1 жніўня Фёдар Васілевіч Воўк, які служыў у роце пана Глябовіча, паставіў замест сябе слугу Марціна (конь, панцыр, прылбіца [3], рагаціна, корд), а ўдава Васілева Волкава замест свайго маленькага сына, які служыў пану віленскаму цівуну, выставіла слугу Андрэя (кляча, панцыр, прылбіца, калчан, рагаціна, корд);
- 8 жніўня Амос Воўк, сыны якога служылі панам, а сам ён быў стары, выставіў слугу Ігната (конік, калчан, шабля) [4, с. 1216, 1218–1219].

---

[3] Прылбіца — частка ўзбраення, якая выкарыстоўвалася для аховы галавы і шыі рыцара. — *Рэд.*

З гэтых звестак відаць, што Ваўкі належалі да дробных землеўладальнікаў Менскага павета. Між іншым, ні адзін з Фядкевічаў не згаданы ў Менскім павеце ў попісе 1567 г., што можа таксама сведчыць аб іх сціплым сацыяльным статусе. Гэтым можна было б растлумачыць, чаму Фядкевічы ў канцы XVII ст. упрыгожылі сваю ганаровую генеалагічную табліцу не дробнай спадчынай у Навасёлках, аб якой кожны раз згадвалі ў тастаментах, а Волкавым Сялом — магчымым радавым гняздом сваёй бабулі і прабабулі Анастасіі Волкаўны.

Што ж тычыцца Навасёлак, то ў перапісе 1567 г. яны згадваюцца ў Менскім павеце двойчы. Сярод шляхты, якая была запісана ў надворнай харугве вялікага князя, быў і Стэфан Гладкі. Сам ён служыў пану падканцлеру. Са свайго маёнтка Навасёлкі ў Менскім павеце Стэфан выстаўляў слугу Марціна Мядзевіча (тры кані, панцыр, прылбіца, шчыт, древ. [4]). Ён жа выставіў двух драбаў (пешых ваяроў) з мячамі і ручніцамі [4, с. 535]. У той жа крыніцы пазначана, што Васілёва Гладка Аляксандрава з маёнтка Навасёлкі накіравала слуг Цішка і Петрака (два кані, панцыры, прылбіцы, рагаціны, шаблі) [4, с. 1229]. Гэтыя звесткі паказваюць, што маёнтак Навасёлкі Менскага павета, які належаў Гладкім у 1567 г., ужо быў падзелены паміж членамі гэтага роду на часткі.

Дастаткова сціплыя звесткі аб Гладкіх прывёў Адам Банецкі, згадаўшы каралеўскага двараніна Дашка Раманавіча Гладкага (1548 г.). Таксама ён падаў звесткі пра Гладковічаў, з якіх Федзя і Юшко былі мсціслаўскімі баярамі (1536 г.). Найбольш цікавымі з’яўляюцца звесткі пра Васіля Грыньковіча Гладковіча, слугу віленскага біскупа Паўла Гальшанскага. Апошні запісаў Васілю сяло Навасёлкі, а вялікі князь Жыгімонт-Аўгуст пацвердзіў гэты запіс у 1548 г. [6, s. 90; 7, s. 71]. Не выключана, што Васілёва Гладка Аляксандрава ў 1567 г. магла быць жонкай ці ўжо ўдавой Васіля Грыньковіча.

Звяртаюць на сябе ўвагу і звесткі аб Гладкіх, прыведзеныя ў гербоўніку графа Севярына Урускага. У прыватнасці, гэты гербоўнік змяшчае згадкі за 1591 г. аб менскім земскім пісары Стэфане, а таксама Лукашы, які быў жанаты на Дароце з Крэмпскіх [8, s. 153]. У кантэксце наяўных крыніц можам асцярожна параўнаць двух Стэфанаў Гладкіх — слугу падканцлера 1567 г. і менскага земскага пісара 1591 г.

Параўноўваючы інфармацыю аб уладальніках Навасёлак Менскага павета са звесткамі аб продках Фядкевічаў, мусім канстатаваць, што апошнія, найбольш верагодна, маглі быць слугамі Гладкіх. Разам з тым нельга выключаць і таго, што Фядкевічы — адно з адгалінаванняў роду Гладкіх з Навасёлак. Пры гэтым можна параўнаць Герасімавага брата Лукаша Сельчука з Навасёлак з Лукашом Гладкім з 1591 г.

---

[4] Значэнне скарачэння “древ.” не высветлена. Так у тэксце дакумента. — *Я. Ч.*

Адным з аргументаў супраць апошняй здагадкі з'яўляюцца гербы Гладкіх і Фядкевічаў. Калі Гладкія карысталіся гербам уласным (у блакітным полі срэбны паўмесяц рожкамі ўверх, над якім срэбны кавалерскі крыж) [5, s. 123; 8, s. 153], то герб Фядкевічаў фактычна з'яўляецца варыяцыяй герба «Сас» (страла вастрыём уверх, якая прабівае паўмесяц рожкамі ўніз з шасціпрамянёвымі зоркамі на канцах) [3].

У любым выпадку праблема паходжання Фядкевічаў патрабуе далейшых даследаванняў.

### Крыніцы і літаратура

1. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў г. Кіеў. — Ф. 2. — Воп. 1. — Спр. 6.
2. Дзяржаўны архіў Житомірскай вобласці. — Ф. 146. — Воп. 1. — Спр. 1189.
3. Дзяржаўны архіў Кіеўскай вобласці. — Ф. 1. — Воп. 295. — Спр. 29234.
4. Русская историческая библиотека, издаваемая Императорской археографической комиссией. Том 33. Литовская метрика. Отдел первый. Часть третья: книги публичных дел. Переписи войска литовского. — Петроград: Типография Главного управления уделов, 1915.
5. Gajl, T. Herbarz polski od średniowiecza do XX wieku. — Gdańsk: L&L, 2007.
6. Herbarz polski. Część I. Wiadomości historyczno-genealogiczne o rodach szlacheckich / Ułożył i wydał Adam Boniecki. — Warszawa: Gebethner i Wolff, 1903. — Tom VI.
7. Poczet rodów w Wielkiem Księstwie Litewskiem w XV i XVI wieku / Ułożył i wydał A. Boniecki. — Warszawa: J. Berger, 1887.
8. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej / Opracowany przez s. hr. Uruskiego przy współudziale A. A. Kosińskiego, wykończony i uzupełniony przez A. Włodarskiego. — Warszawa: Gebethner i Wolff, 1908. — Tom V.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 13.05.2013

*Ф. В. Чарняўскі*

## Матэрыялы да генеалогіі Ратамскіх

Прозвішча Ратамскі ў XVIII ст. найбольш часта сустракаецца ў дакументах, якія прайшлі актыкацыю ў судах Аршанскага, Ашмянскага і Менскага паветаў. Неаднаразова сустракаюцца ўпамінанні пра Ратамскіх і ў матэрыялах судоў іншых паветаў і ваяводстваў ВКЛ. Значным уплывам карысталіся прадстаўнікі гэтага роду ў межах Аршанскага павета, куды яны перасяліліся з Менскага павета яшчэ ў

канцы XVI ст. З цягам часу Ратамскія ўвайшлі ў склад эліты Аршанскага павета і канкурыравалі з Галінскімі за ўплыў на ход падзей у гэтай частцы ВКЛ. У першай палове XVIII ст. Ратамскія трымалі многія ўрады і пасады ў Аршанскім павеце. На жаль, гісторыкі да гэтага часу не звярталі належнай увагі на складанне генеалогіі роду Ратамскіх.

На нашу думку сапраўдны росквіт гэтага роду адбыўся менавіта ў XVI ст., калі яны яшчэ месціліся ў межах той часткі Віленскага павета, якая пасля 1567 г. увайшла ў склад новаўтворанага Менскага павета. З прадстаўнікоў гэтага роду, спачатку зямян Віленскага, а потым і Менскага ваяводстваў, якія нарадзіліся і жылі ў XVI ст., нашу ўвагу прыцягнулі Яцка (Якуб) Іванавіч і яго сын Канстанцін, каралеўскія дыпламаты, якія прысвяцілі сваё жыццё ўстанаўленню добрасуседскіх адносін з дзяржавамі, што ўзніклі пасля распаду Залатой Арды, Лаўрын Канстанцінавіч і яго сын Міхал, каралеўскія ротмістры, якія са зброяй у руках абаранялі межы краіны.

Праведзеная намі праца па збору і апрацоўцы гістарычных матэрыялаў, маючых адносіны да гісторыі роду Ратамскіх, паказала, што захавалася дастаткова звестак пра жыццё і дзейнасць вышэйпазначаных асобаў, менавіта пра Яцку Іванавіча Ратамскага, яго сына Канстанціна, унука Лаўрына і праўнука Міхала. Захавалася таксама некаторая колькасць дакументаў, датычных жыцця і дзейнасці тых Ратамскіх, якія ў канцы XVI і пачатку XVII ст., пасля перасялення з Менскага павета, набылі землі ў Пінскім павеце, што ўваходзілі ў склад Берасцейскага ваяводства, і трымалі ўрады гэтага павета.

Як сведчыць Севярын Урускі, сапраўднае прозвішча Ратамскіх было Вінк, а Ратамскімі яны сталі толькі пасля атрымання ў сваё валоданне зямель у Ратам’і (цяпер Ратамка Мінскага р-на Мінскай вобл. — *Ф. Ч.*), размешчаным непадалёку ад Менска [49, s. 173].

Атрыманне продкамі Ратамскіх зямель у ваколіцах тагачаснага Менска, на нашу думку, адбылося ў другой палове XV ст., яшчэ пры каралю Казіміру. У канцы праўлення Казіміра Ягелончыка, менавіта 4 індыкта 24 красавіка, з даходаў смаленскага мыта выдадзена ўзнагарода за каралеўскую службу ў 6 коп грошай лічбы літоўскай Федку Вінкаву [13, арк. 24 адв.]. Не выключана, што і каралеўскі прывілей на землі ў Ратам’і атрымаў сам Федка Вінк. Адзін з сыноў першага ўладальніка зямель у ваколіцах Менска пачаў ужываць прозвішча Ратамскі.

У дакуменце, які прайшоў актыкацыю ў Менскім гродскім судзе ў другой палове XVIII ст., нам сустрэлася паведамленне аб Івану Ратамскім, які нібыта ў 1502 г. займаў пасаду намесніка крэўскага і мядзельскага [33, арк. 100]. Праверка дакумента выклікала сумненне ў яго сапраўднасці. Не выключана, што дакумент быў падроблены і фальшывы непасрэдна перад яго актыкацыяй у актавых кнігах Менскага гродскага

суда. Як даводзіць А. Рахуба, яшчэ 4 сакавіка 1501 г. пасаду намесніка крэўскага займаў Станіслаў Нарбутавіч. Ужо 5 жніўня 1502 г. і 15 лютага 1505 г. у дакументах выконваючым абавязкі намесніка крэўскага пазначаны князь Сестранец [48, № 49–50, s. 62]. Іван Ратамскі мог выконваць абавязкі намесніка крэўскага толькі ў перыяд з 4 сакавіка 1501 г. і да пачатку жніўня 1502 г. На жаль, у нас адсутнічаюць звесткі аб асобах, якія займалі ў гэты перыяд пасаду намесніка мядзельскага.

Як пазначана ў дакуменце, Альбрыхт Марцінавіч Гаштольд, які нібыта займаў на гэты час пасады ваяводы віленскага і канцлера ВКЛ, яшчэ да 7 сакавіка 1502 г. прадаў Мікалаю Іванавічу Францкевічу, старасту браслаўскаму, сяло Мацкаўка на беразе ракі Сервеч [33, арк. 100]. Аднак ваяводам і канцлерам ВКЛ Альбрыхт Гаштольд на гэты час яшчэ не быў. У сапраўднасці пасады ваяводы і канцлера Гаштольд заняў толькі ў 1522 г. [44, арк. 500]. Ды і Мікалай Іванавіч Францкевіч, калі толькі ён жыў у гэты час, мог займаць пасаду намесніка браслаўскага, але толькі не старасты судовага браслаўскага. Гэтая пасада была ўведзена значна пазней. Дарэчы, пасаду браслаўскага намесніка да 23 чэрвеня 1501 г. займаў Станіслаў Янавіч Заберазінскі, гаспадарскі падстолі, а ў чэрвені 1502 г. прызначэнне на гэтую пасаду атрымаў Іван Сямёнавіч Сапега, гаспадарскі пісар, канцлер каралевы польскай і вялікай княгіні літоўскай Алены [48, № 4616–4617, s. 588]. У канцы дакумента паведамляецца аб яго пацвярджэнні 27 мая 1620 г. у Галоўным трыбунале ВКЛ. Сярод іншых асобаў подпіс пад дэкрэтам паставіў і Мікалай Янавіч Глябовіч, кашталян віленскі. У той жа час вядома, што прывілей на гэтую пасаду Глябовіч атрымаў толькі ў наступным, 1621 г. [45, арк. 53]. Зусім дзіўным з’яўляецца ўпамінанне аб удзеле ў зацвярджэнні дакумента Яна Осціка, суддзі земскага Віленскага ваяводства. Як устанавіў А. Рахуба, суддзя склаў тастамент яшчэ 12 верасня 1611 г. і неўзабаве пакінуў гэты свет [48, № 919, s. 172].

У другой палове XVIII ст. на тэрыторыях усходніх паветаў і ваяводстваў ВКЛ, якія былі далучаны да Расійскай імперыі, пачалася праверка шляхты з мэтай пацвярджэння правоў кожнага, хто лічыў сябе шляхцічам, на знаходжанне ў шэрагах прывіліяванага стану. За мінулыя часы шмат дакументаў, якія пацвярджалі правы сапраўдных шляхцічаў, было страчана. Да таго ж атрымлівалі адукацыю і прадстаўнікі тых сацыяльных слаёў, якія мелі дастаткова грошай, але не маглі карыстацца тымі правамі, што дзейнічалі ў ВКЛ. Забяспечваліся імі толькі высакародныя. Зразумела, што гэтыя людзі таксама не маглі прымірыцца з існуючым парадкам і шукалі выйсця са свайго становішча. У Вялікім Княстве Літоўскім атрымала шырокае распаўсюджванне фальсіфікацыя дакументаў, якія пацвярджалі правы на шляхецтва. Знайшлося нямала асобаў, абазнаных у гісторыі ВКЛ, якія прымянялі свае веды дзеля за-

давальнення жадання ахвочых давесці сваю шляхетнасць. У некаторых выпадках выкарыстоўваліся сапраўдныя дакументы. У новы дакумент, не змяняючы цалкам тэксту, упісвалі толькі прозвішчы мяркуемых продкаў чалавека, жадаючага пацвердзіць сваю радавітасць. На нашу думку, у дадзеным выпадку фальсіфікатары пайшлі менавіта гэтым шляхам і ў дакуменце захавалася ўпамінанне аб рэальна існуючай асобе. На жаль, мы не маем пацвярджэння тоеснасці гэтай асобы і бацькі каралеўскага дыпламата. Улічваючы знаходжанне Яцка Іванавіча Ратамскага ў пачатку XVI ст. пры двары Жыгімонта I у якасці каралеўскага адзвернага, не выключана, што памянёная ў дакуменце асоба і была бацькам Яцка Іванавіча Ратамскага.

На працягу XVI ст. у Ратам'і карысталіся землямі як Ратамскія, так і прадстаўнікі сем'яў, якія працягвалі ўжываць прозвішча Вінк. Сучаснікам Яцкі Ратамскага і яго суседам быў Іван Вінк. Яго сын Андрэй Іванавіч Вінк у сярэдзіне XVI ст. знаходзіўся на службе ў Мікалая Юр'евіча Радзівіла, на той час яшчэ падчашага ВКЛ, а ў канцы жыцця ён займаў пасады вялікага гетмана і канцлера ВКЛ [21, арк. 390]. Унук Івана Вінка Езоф Андрэевіч Вінк, які дзякуючы роднасці з Андрэем Мікалаевічам Станкевічам, старастам судовым менскім, займаў у канцы XVI ст. пасаду падстарасты судовага гродскага Менскага ваяводства, як і яго дзед і бацька, валодаў землямі ў Ратамцы. Нам не трапілі ў рукі дакументы, якія былі складзены сумесна прадстаўнікамі абедзвюх галін гэтага роду. Невядомы нам і матэрыялы судовых працэсаў паміж Ратамскімі і Вінкамі.

Адначасова з Яцкам Іванавічам Ратамскім у Ратам'і пражывалі родныя браты Фёдар і Андрушка (Андрэй) Ратамскія. У канцы першай паловы XVI ст. іх дзеці Гаўрыла і Іван звярнуліся ў суды Віленскага ваяводства па справе прыналежнасці каня-паходніка. У кастрычніку 1551 г. Гарайн, зяць Міхала Ратамскага, яшчэ аднаго зямяніна з Ратам'і, па даручэнні цесця пачаў судовую справу з Грышкам Іванавічам Перапечам, зямянінам Слонімскага павета, абвінавачваючы яго пасерба (пасынка. — *Ф. Ч.*) у невяртанні 100 коп грошай [24, арк. 152 адв.]. Гарайны, зямяне Навагародскага павета, прыехалі ў Менскі павет пасля 1542 г., часу атрымання Васілём Тышкевічам, у якога яны знаходзіліся на службе ў менскім гродскім судзе, каралеўскага прывілея на менскае судовае староства. Шлюб Гарайна на дачцы Міхала Ратамскага адбыўся да 1550 г.

На жаль, мы не змаглі ўстанавіць іх роднасных сувязей з Яцкам Ратамскім. Не выключана, што прозвішча Ратамскі маглі ўжываць і асобы, якія належалі да іншых шляхетных родаў і валодалі землямі ў Ратам'і. Такія выпадкі былі нярэдкімі ў ВКЛ. Многія асобы, атрымаўшы землі ў новых мясцінах, з цягам часу пераставалі ўжываць свае ранейшыя прозвішчы і карысталіся прозвішчамі, утворанымі ад назваў тых

паселішчаў, у якіх знаходзіліся іх зямельныя валоданні. Можна прывесці ў якасці прыкладу гісторыю Свентарэцкіх. Спачатку яны карысталіся прозвішчам Юхновічы, але пасля атрымання зямель на берагах ракі Свенты, пачалі ўжываць падвойнае прозвішча Юхновічы Свентарэцкія. У канцы XVII – пачатку XVIII ст. тая частка роду, якая набыла землі ў межах Менскага павета, адмовілася ад ужывання падвойнага прозвішча і карысталася толькі прозвішчам Свентарэцкія.

У канцы XVII ст. некаторыя прадстаўнікі роду Ратамскіх пачалі ўжываць падвойнае прозвішча Ратамскія-Вінкі. 10 сакавіка 1688 г. Міхал Ратамскі Вінк, падчашы рэчыцкі, набыў за 10 000 злотых у Казіміра Сенькавіча Дуброўскага, зямяніна Менскага ваяводства (павета), частку фальварка Ломжына Вайшнароўскага, размешчанага ў межах Менскага павета [30, арк. 121].

Першыя паведамленні пра Яцку Ратамскага сустрэліся нам у дакументах, складзеных падчас мецяжу Міхала Глінскага, або непасрэдна пасля спынення ваенных дзеянняў з маскоўскімі войскамі. Прычым у адным з такіх дакументаў паведамляецца аб падзеях, якія, на нашу думку, мелі месца яшчэ ў канцы жыцця Аляксандра, караля польскага і вялікага князя літоўскага.

Для вырашэння складаных пытанняў у Маскву, яшчэ да 1506 г., Аляксандрам Казіміравічам Ягелончыкам было накіравана вялікае пасольства. Для яго суправаджэння і аховы ў цяжкім падарожжы ў суседнюю краіну па загаду караля выдзелілі атрад літоўскай шляхты, які ўзначалілі смаленскія баяры, браты Багдан Рыгоравіч і Васка Жабы. У склад атрада залічылі Яцку і Сеньку Іванавічаў Ратамскіх. Адносіны паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам на гэты час, нягледзячы на ўступленне ў шлюб Аляксандра, караля польскага і вялікага князя літоўскага, з Аленай, дачкой вялікага князя маскоўскага, пагоршыліся настолькі, што паміж дзвюма краінамі магла пачацца непажаданая для ВКЛ вайна. Аб тым, як у Маскве абышліся з літоўскімі пасламі паведамілі ў сваім «чоломбіцці» Жыгімонту I Багдан і Васка Жабы ўжо пасля вяртання дамоў. Смаленскія баяры пісалі, што «будучы на службе брата нашого, славное памяти Алексанъдра, короля его м(и)л(о)сти, впали в руки людемъ великого князя московъского и тамъ в нятстве были и надзу теръпели, а тыми часы отътол вышли и не мають ся чымъ пожывити» [5, № 438, s. 324].

Не выключана, што пасольства, у склад якога ўваходзілі Яцка і Сенька Ратамскія, было затрымана ў Маскве яшчэ ў 1500 г. Сярод асобаў, якія з Васкам Жабай у Маскве сядзелі і ў 1509 г. атрымалі каралеўскую даніну, пазначаны і Ян Юр'евіч Глябовіч. Ён атрымаў «20 копъ грошей з бобровъшчинных пенезей в Полоцку в Полубенского» [5, № 565, арк. 413]. У 1500 г. вялікі князь маскоўскі ў сваіх граматах неаднаразо-

ва абвінавачваў Аляксандра і яго бліжэйшых слуг і дарадчыкаў у тым, што «Олександр по докончанью ни в чом не правит (не выконвае ўмовы мірнай дамовы. — *Ф. Ч.*), великую княгиню Елену и панов русских князей нудит к римскому закону» (прымушае іх да пераходу ў каталіцкую веру. — *Ф. Ч.*) [41, арк. 77]. З мэтай улагоджвання ўзнікшых супярэчнасцяў у гэтым жа годзе ў Маскву накіраваўся Ян Юр'евіч Глябовіч, як пазначана ў «Выписках из посольских книг о сношениях российского государства с польско-литовским за 1487–1572 гг.» [41, арк. 77], ваявода трокскі, маршалак земскі ВКЛ. Ён спрабаваў упэўніць Івана Васільевіча, вялікага князя маскоўскага, у беспадстаўнасці яго абвінавачванняў, але беспаспяхова. Паслоў і Яна Глябовіча затрымалі ў Маскве, а ў ВКЛ накіравалася вялікая армія, якая пачала пустошыць памежныя воласці Літоўскага княства. Як паведамляецца ў «Выписках из посольских книг...», «государевы воеводы на Ведроши литовских людей побили, воеводу князя Костянтина Острожского с товарыщи» [41, арк. 77].

У «Выписках из посольских книг...» Ян Юр'евіч Глябовіч памылкова пазначаны ваяводам трокскім і маршалкам земскім ВКЛ. Ваяводам трокскім Глябовіч ніколі не быў, а на пасаду маршалка земскага атрымаў прызначэнне толькі ў 1514 г. У цудам захаваных дакументах пачатку XVI ст., якія датычацца перамоў Аляксандра Ягелончыка з вялікім князем маскоўскім, знаходзяцца ўпамінанні пра Станіслава Глябовіча, ваяводу полацкага, стрыя (брата бацькі. — *Ф. Ч.*) Яна Юр'евіча Глябовіча. Ваявода полацкі, які памёр у 1513 г., па загаду караля з 1501 г. па 1504 г. некалькі разоў наведваў Маскву ў якасці пасла з дыпламатычнымі даручэннямі. На нашу думку, Ян Юр'евіч Глябовіч сапраўды прымаў удзел у адным з пасольстваў у Маскву і не па сваёй волі затрымаўся там некаторы час. Але сумнеўна, каб маладому чалавеку даручылі правесці перамовы з маскоўскімі ўладамі.

«Выписки з пасольских книг...» складаліся каля 1572 г., і зразумела, што складальнікі ведалі аб кар'ерным росце Яна Глябовіча, які пасля 1540 г. заняў пасаду канцлера ВКЛ, але заблыталіся ў дэталях. У нас няма сумневу ў сапраўднасці паведамленняў маскоўскіх пасольскіх дзякаў, якія карысталіся дакументамі, складзенымі яшчэ ў пачатку XVI ст., але пазней знішчаных часам.

Намі не ўстаноўлена, колькі часу знаходзілася пасольства ў Маскве і калі вярнуліся суправаджаючыя яго людзі дамоў. Магчыма, што менавіта аб гэтым пасольстве вяліся перамовы ў Маскве ў 1508 г. Летам гэтага ж года ў Маскву прыехаў пасол караля польскага і вялікага князя літоўскага Фёдар Святоша [41, арк. 104]. У сваім выступленні перад Васілём Іванавічам, вялікім князем маскоўскім, ён напамінаў аб нядаўнім вяртанні ў Літву людзей, затрыманых у Маскве. Аб часе затрымання паслоў Святоша не ўпамінае, але ўдакладняе, што гэта адбылося ў той

час, «как были королевские послы на Москве, и в те поры воевод своих в его землю вослал, а послов для того долго задержал».

Захаваныя архіўныя дакументы пацвярджаюць выснову аб вяртанні з маскоўскага вязення (турмы. — *Ф. Ч.*) літоўскага пасольства не пазней чым у 1507 г. Прывілей Ратамскаму «на имене на Обрыне в Новогородском повете» кароль падпісаў 10 мая 1507 г. [5, № 263, арк. 222]. У гэтым дакуменце Яцка Ратамскі названы каралеўскім падзверным (пазней адзверны. — *Ф. Ч.*).

У той жа час даручэнне аб наданні братам Жабам у карыстанне карчмы ў Барысаве на адзін год у якасці кампенсацыі за тыя нягоды, якія яны пацярпелі ў Маскве, кароль падпісаў толькі 7 ліпеня 1509 г. [5, № 438, арк. 324]. На нашу думку, сваё прашэнне аб наданні карчмы на адзін год у Барысаве, якую яшчэ нядаўна трымаў Сямён Ямантавіч, князь Падбярэзскі, Багдан і Васка Жабы падалі адразу ж пасля вяртання з Масквы, прыблізна ў 1507 г. У кіраўніцтва краіны, якое вяло ваенныя дзеянні з татарамі і атрадамі Міхала Глінскага, не хапала часу для ўзнагароджвання пацярпелых у час пасольства, — было дастаткова іншых клопатаў.

Зразумела, што для Ратамскіх падарожжа ў сталіцу Маскоўскага княства было нялёгкім. Верагодна і таму каралеўская ўзнагарода, якую яны атрымалі каля 15 мая 1509 г., лічылася вельмі значнай. Яцка Ратамскі атрымаў скуркі ліс на футру і 12 коп грошай з даходаў каралеўскіх зямель, размешчаных у ваколіцах Вільні, а яго брат Сенька такую ж колькасць грошай са штрафаў, накладзеных на ўладанні Бельскіх [5, № 565, арк. 413].

Пачатак XVI ст. быў вельмі цяжкім для краіны. Сярод тых, хто здрадзіў Радзіме і пад началам Міхала Глінскага ваяваў з кароннымі і літоўскімі войскамі, аказалася значная колькасць прадстаўнікоў сярэдняй і дробнай літоўскай шляхты праваслаўнага веравызнання. Прычын для незадавальнення шляхтай станам рэчаў, існуючым у ВКЛ, хапала. У 1504 г. на службу да вялікага князя маскоўскага са значнай колькасцю прыхільнікаў перайшоў Астафі Дашкевіч.

На баку прыхільнікаў Глінскіх ваявалі не толькі князі Адзінцэвічы-Гальцоўскія і Лукомскія. На бок Глінскага перайшоў і выдатны дыпламат часоў караля Аляксандра Якуб Івашэнцавіч, намеснік мазырскі, цесць Яцка Ратамскага. Калі Астафі Дашкевіч праз некаторы час вярнуўся на Радзіму і прысягнуў Жыгімонту І, то Івашэнцавіч застаўся жыць у межах Маскоўскай дзяржавы. На яго выбар ў некаторай ступені паўплывалі роднасныя сувязі: Якуб Івашэнцавіч узяў шлюб з дачкой аднаго з братоў Глінскіх. На нашу думку, немалы ўплыў на яго паводзіны аказалі і матэрыяльныя інтарэсы. Перад пачаткам паўстання не толькі Глінскія аказаліся ў каралеўскай апале і паступова пазбаўляліся каралеўскіх прывілеяў. Верагодна і ў Якуба Івашэнцавіча з'явілася адчуванне, якое

дыпламат і не думаў хаваць, аб адсутнасці з боку караля належнай ацэнкі яго высілкаў на службе. Аб сваіх крыўдах Івашэнцавіч паскардзіўся крымскаму хану, і той у адным са сваіх пасланняў Жыгімонту Старому прасіў караля аб вяртанні ласкі да дыпламата. Найбольш верагодна, што заступніцтва крымскага хана толькі пашкодзіла Івашэнцавічу, і кароль не змяніў сваіх адносін да дыпламата. У выніку Мазыр, які знаходзіўся ў пажыццёвым карыстанні каралеўскага дыпламата, на кароткі час стаў базай для ўступлення атрадаў Глінскага ў ВКЛ. Даведаўшыся аб здрадзе, кароль пазбавіў Якуба Івашэнцавіча ўсіх маетнасцяў і набыткаў у межах ВКЛ. Між тым жонка дыпламата засталася жыць у ВКЛ, і аб атрыманні дазволу Жыгімонта I на яе выезд у Маскву ішлі доўгія, але, верагодна, беспаспяховыя перамовы паміж пасламі абедзвюх краін. Лёс пані Якубавай Івашэнцавічавай нам не ўдалося ўстанавіць.

Яцка Ратамскі, нягледзячы на роднасныя адносіны, захаваў вернасць Жыгімонту I і заняў вакантнае месца свайго цесця на дыпламатычнай службе. На нашу думку, на стаўленне Яцка Ратамскага да мецяжу Міхала Глінскага паўплывала яго знаходжанне ў пасольстве ў Маскве і тыя цяжкасці, якія прыйшлося яму перажыць за гэты час.

У гады вайны, якую праводзіла ВКЛ з Масквой і мяцежнымі атрадамі Міхала Глінскага, Яцка Ратамскі неаднойчы ездзіў у Крым для перамоў з крымскім ханам Менглі Гірэем. Сваіх сіл для вядзення вайсковых дзеянняў з маскоўскімі войскамі і мяцежнікамі ў краіне не хапала. Неабходна было дамовіцца аб сумесных дзеяннях з крымскім ханам. Толькі ў выпадку аб'яднання сіл можна было прымусіць «непрыяцеля, вялікага князя маскоўскага» да пачатку вядзення перамоў аб устанаўленні міру і вяртанні захопленных зямель. 5 кастрычніка 1507 г. Яцка Ратамскі выязджае з Трокаў у далёкае падарожжа ў Крымскую Арду [5, № 511, арк. 87]. Вялікі гетман літоўскі з войскам ВКЛ чакаў каля Менска вынікаў перамоў, гатовы ўдарыць у спіну маскоўскім войскам, якія будуць адцягнуты для аказання супраціву татарскім загонам на мяжы Дзікага поля. Праз год, 11 чэрвеня 1508 г., Ратамскі зноў накіроўваецца ў Крым для паведамлення хану аб выніках мецяжу Глінскага [5, № 64, арк. 103]. Яму было даручана дабівацца ад хана хутчэйшага выканання яго ранейшых абяцанняў аб уступленні ў вайну «з нашым непрыяцелем, вялікім князем маскоўскім» [2, арк. 47, 50]. Яцка Ратамскі перадаў крымскаму хану не толькі лісты ад Жыгімонта I. У яго абозе аказаліся і значныя грашовыя сумы, якія, на думку караля і паноў рады ВКЛ, павінны былі павысіць зацікаўленасць хана ў выкананні яго абяцанняў аб ваеннай дапамозе ВКЛ. Паслы Вялікага Княства Літоўскага Ратамскі і Тамарскі паведамілі хану, што атрады Міхала Глінскага выгнаны з межаў краіны, а для канчатковага разгрому праціўніка да Старадуба накіравалася вялікае літоўскае войска, падрыхтаванае для вядзення су-

месных ваенных дзеянняў з татарскімі загонамі. Крымскі хан паабяцаў накіраваць войска да маскоўскіх рубяжоў, але яго ваяры на гэты раз так і не сустрэліся з маскоўскімі палкамі. Як тлумачыў хан у адным са сваіх лістоў Жыгімонту I, яму перашкодзілі зрабіць гэта мяцежныя нагайскія ханы. На працягу 1507–1509 гг. Яцка Ратамскі некалькі разоў наведаў стаўку крымскага хана.

Заслугі Яцка Ратамскага былі высока ацэнены каралём. 10 мая 1507 г. Жыгімонт I надае прывілей Ратамскаму на «імене на Обрыне в Новгородском повете» [5, № 263, арк. 222]. Па дзеючым у той час старадаўнім звычаі беспатомныя Івашка Турчын і яго жонка ўзялі Ратамскага за сына. Яцка Ратамскі павінен быў карміць старых і даглядаць іх належным чынам да самай смерці. У выпадку пачатку ваенных дзеянняў Ратамскі выстаўляў у войска ВКЛ колькасць ваяроў, адпаведную атрыманай зямлі. Гэты звычай быў пашыраны ў ВКЛ. Нават Радзівілы пагаджаліся браць на сябе абавязкі даглядаць нямоглых людзей, атрымліваючы ў сваё вечнае валоданне іх землі. Пасля смерці Турчына і яго жонкі Ратамскі павінен быў прасіць караля аб зацвярджэнні гэтых зямель у Навагародскім павеце ў сваё валоданне на вечнасць. Асноўная частка былых зямельных уладанняў Якуба Івашэнцавіча таксама перайшла ў рукі яго зяця Яцка Ратамскага. Каралеўскім прывілеем, нададзеным у дзень святых апосталаў Пятра і Паўла, 29 чэрвеня 1508 г., Ратамскі атрымаў былыя ленныя ўладанні Івашэнцавіча — Глівін і Упірэвічы, размешчаныя непадалёку ад Менска, а таксама і Церабоў каля Мазыра [37, арк. 20].

Пасля спынення цяжкай вайны Яцка Іванавіч працягваў выконваць шматлікія дыпламатычныя даручэнні караля. Асноўнай задачай Ратамскага да самай смерці стала падтрыманне сувязей з уладарамі Крымскай Арды. Пасля 8 сакавіка 1510 г. Яцка Ратамскі ў суправаджэнні татарскага атрада накіраваўся ў пасольства ў Крымскую Арду. У Кракаве яму было выдадзена са скарбу 14 локцяў высакаякаснай тканіны, 200 коп грошай і «шуба лисья завыикавая» [5, № 573, арк. 421].

Шлях у Арду праходзіў па незаселеных мясцінах і лічыўся вельмі небяспечным. Ахова пасольства пастаянна была напагатове для адбіцця нападу татарскіх атрадаў. Небяспека падсцерагала пасольства і ў Ардзе. Крыніцы з Метрыкі ВКЛ паведамляюць аб смерці пасля прыбыцця ў 1515 г. Ратамскага ў Арду яго памочніка Кіянскага, зямяніна Берасцейскага павета [43, № 459, арк. 1174].

Згодна з паведамленнем Севярына Урускага, Яцка Іванавіч Ратамскі, дыпламат каралёў Аляксандра і Жыгімонта I, у 1507–1509 гг. займаў вельмі адказную пасаду гараднічага менскага і павінен быў забяспечваць гатоўнасць муроў Менскай крэпасці для аказання адпору заваёўнікам [49, s. 173]. Аднак ні ў адным дакуменце за 1507–1509 гг., якія трапілі ў нашы рукі, мы не знаходзім прыкладаў выканання Яцкам Ратам-

скім гэтага ўрада. Сустракаюцца паведамленні аб удзеле Ратамскага ў 1507–1508 гг. у пасольствах да Менглі Гірэя, хана Крымскай Арды [5, арк. 87, 103, 141], у ваенных экспедыцыях, аб атрыманні ім узнагарод за выдатнае выкананне сваіх абавязкаў. У паведамленні аб накіраванні 8 сакавіка 1510 г. Яцкі Ратамскага ў Крымскую Арду таксама не ўпамінаецца аб наяўнасці ў яго якога-небудзь тытула або пасады [5, № 573, арк. 421]. Верагодна, што атрыманне прывілея магло мець месца толькі ў прамежак часу ад сярэдзіны 1510 г. і да пачатку 1511 г.

Адзінае ўпамінанне аб атрыманні Ратамскім урада гараднічага менскага сустрэлася нам у дэкрэце гаспадарскага (каралеўскага. — *Ф. Ч.*) суда, прынятага ў ліпені 1510 г. [43, № 10, арк. 10]. Людзі Яцкі Ратамскага падчас знаходжання яго з пасольствам у Ардзе, напалі на двор зямяніна Багдана Яраславіча і, як гэта даволі часта рабілася ў тыя часы, добра абрабавалі маёмасць. У дадатак слугі Яцкі Ратамскага звялі з хлева двух валоў. Уласна кажучы, гэтыя валы і аказаліся той прычынай з-за якой і адбыўся па загадзе Ратамскага напад яго падданых на двор, што належаў Багдану Яраславічу. Невядомыя людзі, у адсутнасць гаспадарскага пасла, напалі на двор Ратамскага і звялі гэтых валоў. За любую крыўду неабходна было адпомсціць. Яцка Ратамскі, даведаўшыся аб здарэнні, даручыў сваім «сочам» [1] узяць пад нагляд усе мясцовыя кірмашы. Падданы Багдана Яраславіча на валах наведаў адзін з такіх кірмашоў і быў заўважаны слугамі гараднічага менскага.

Адначасова з Яцкам Ратамскім у 1510 г. каралеўскую даніну атрымалі яшчэ некалькі дзясяткаў каралеўскіх дваран [5, № 573, арк. 421]. Некаторыя ўзнагароджаныя асобы, менавіта пан Іван, падскарбі дворны, Юры Мікалаевіч, ваяводзіч віленскі, Літавор, маршалак дворны, Вялічка, ключнік трокскі, Ян Шчыт, мечны літоўскі, пазначаны са сваімі тытуламі. Адсутнасць упамінання у такім дакуменце тытула або пасады, пры іх наяўнасці, нанесла б вялікую шкоду гонару Яцкі Ратамскага.

На нашу думку, Ратамскі вельмі кароткі час займаў пасаду гараднічага менскага і адмовіўся ад яе на карысць свайго сябра Валошкі Шапялевіча. Урад гараднічага менскага Шапялевіч атрымаў у канцы 1510 г. або ў самым пачатку 1511 г. Паведамленне пра Шапялевіча, які ўжо карыстаўся тытулам гараднічага менскага, сустрэлася ў матэрыялах Метрыкі, унесеных 6 сакавіка 1511 г. [5, № 151, арк. 159]. Аб добрых адносінах Шапялевіча з Яцкам Іванавічам Ратамскім сведчыць паведамленне, унесенае ў Метрыку. Да 13 снежня 1521 г. Шапялевіча запрасіў Яцка Ратамскі, які на той час ужо займаў пасаду дзяржаўцы аінскага. Аб гэтым сведчыць дакумент аб устанаўленні межаў паміж землямі

---

[1] Сочы — слугі, якія займаліся высочваннем злодзеяў, пошукам страчанай маёмасці. — *Ф. Ч.*

каралеўскага староства Аіны (цяпер Гайна. — *Ф. Ч.*) і Гаянамі, якія на той час знаходзіліся ў валоданні Багдана Васільевіча Таўкачэвіча [35, арк. 501–502].

У дакуменце, складзеным 8 сакавіка 1510 г., яго называюць панам. Сярод некалькіх дзясяткаў асобаў, пра якіх упамінаецца ў гэтым дакуменце, акрамя Ратамскага тытулаваны панамі толькі Астафі Дашкевіч, у будучым абаронца паўднёвых межаў ВКЛ, Юры Мікалаевіч Радзівіл, які з цягам часу атрымаў пасады кашталяна віленскага, маршалка надворнага літоўскага, старасты гарадзенскага, дзяржаўцы лідскага, і Станіслаў Барташэвіч, які да 1519 г. займаў пасаду каралеўскага маршалка [5, № 573, арк. 421].

У 1512 г. Яцка Ратамскі прыняў удзел у адным з першых попісаў літоўскага войска, што рыхтавалася да чарговай ваеннай экспедыцыі. Як пазначана ў попісе, Ратамскі «свайго імення не мае». На нашу думку, у гэтым выпадку мелася на ўвазе, што ў яго не было зямель у асабістым валоданні. Знаходжанне ў карыстанні ленных, пажыццёвых зямельных уладанняў дазволіла Яцку Іванавічу выставіць «почт» (атрад. — *Ф. Ч.*) у складзе чатырох ваяроў, што было магчымым пры наяўнасці ў яго каля 32 службаў людзей [5, № 158, арк. 163]. Ад сваіх спадчынных зямель у Ратамцы, на нашу думку, каралеўскі дыпламат адмовіўся на карысць роднага брата Сенькі (Сямёна. — *Ф. Ч.*) Іванавіча.

Каля 1515 г. Ратамскі атрымаў у сваё пажыццёвае карыстанне землі Аінскага староства, памеры якога на той час былі значна большыя, чым у канцы XVIII ст. На поўдні, непадалёку ад Менска, яно межавалася з землямі Гаян і Беларуч, на ўсходзе ў склад староства ўваходзілі Айнаравічы, Кашчыцы і Жырблевічы. Не выключана, што ў канцы XV ст. землі аінскай дзяржавы на поўначы дасягалі Пуцілава і Укропавіч. Да 1790 г. Гаенскае староства ў некалькі разоў зменшылася ў памерах і ў яго склад уваходзілі толькі мястэчка Гайна і сёлы Бухнавічы, Жылічы, Рацькавічы, Стайкі, Сліжына і Сярпішчана з сумежнымі з імі землямі. Прычым, акрамя Сярпішчана, якое было заснавана толькі ў першай палове XVIII ст., усе астатнія вёскі мелі на той час шматвяковую гісторыю.

Значную частку свайго часу дзяржаўца аінскі займаўся судовымі справамі, што ўзнікалі паміж мясцовымі зямянамі. Судовая ўлада дзяржаўцы аінскага далёка перасягала межы староства. У некаторых дакументах такое каралеўскае ўладанне, разам з сумежнымі земскімі землямі, на якія распаўсюджваліся правы дзяржаўцы, называлі паветам, або прысудам. Шляхта, валодаючы пажыццёвымі правамі на кіраванне каралеўскай маёмасцю, абавязана была вяршыць суд у межах вызначанай ім тэрыторыі. У распараджэнні дзяржаўцаў (пазней — стараст) знаходзіліся віжы, службовыя асобы, якія высылаліся на месца здарэння для агляду пацярпелых і вызначэння вінаватых.

Дзяржаўца аінскі абавязаны быў удзельнічаць і ў працы гаспадарскага суда. У 1516 г. ён на працягу некалькіх месяцаў засядаў у судзе разам са сваім сябрам Ваўчком Шапялевічам, гараднічым менскім, спрабуючы справядліва вырашыць справу аб прыналежнасці зямель. Нязгода ўзнікла паміж мітрапалітам Іосіфам з аднаго боку і княгіняй Аляксандравай Юр'евіча Гальшанскай і Станіславам Барташэвічам, гаспадарскім маршалкам з другога [43, № 217, арк. 879; № 218, арк. 881].

У абавязкі дзяржаўцаў уваходзіла і ўвязанне (увядзенне ў правы валодання. — *Ф. Ч.*) розных асобаў у землі, набытыя імі самімі, нададзеныя каралём, падараваныя блізкімі крэўнымі або магнатамі, на службе ў якіх знаходзіліся гэтыя шляхетныя асобы. 6 жніўня 1516 г. Жыгімонт I папярэджвае Якуба Іванавіча Ратамскага, намесніка аінскага, аб наданні Мікалаю Мікалаевічу Радзівілу, ваяводу віленскаму і канцлеру ВКЛ, возера «двора нашого Аинского на имя Мядзела, а трех ч(о)л(о)в(е)ков того озера на имя Бакуна и его двух товарищовъ, которые того озера стерегивали...» [6, № 636, арк. 348; № 693, арк. 372]. У ваколіцах каралеўскага мястэчка Аіны вялікія азёры адсутнічаюць. На паўночны захад ад Стаек у лясістай і балоцістай мясціне знаходзіцца невялікае возера Дзікае, але подступы да яго цяжкія і сёння, а ў тыя часы дабрацца да яго было значна цяжэй. З каралеўскага прывілея Мікалаю Радзівілу, ваяводу віленскаму і канцлеру ВКЛ, вынікае, што возера Мядзела знаходзілася непадалёку ад сяла Тумілічы над ракой Бярэзінай. Побач з нададзеным у пажыццёвае валоданне возерам Мядзел Радзівіл набыў за 20 коп грошай лічбы літоўскай у зямяніна Ашмянскага павета Станіслава Тамковіча, яго маці і айчыма яшчэ «шесть ч(о)л(о)в(е)ков его отчизных, которыи седят над рекою Березынею». Аднак дакумента аб увязанні Яцкам Ратамскім Мікалая Радзівіла ў валоданне землямі, купленымі ў Станіслава Тамковіча, мы не знайшлі.

Адбітак у матэрыялах Метрыкі ВКЛ пакінулі намаганні старасты аінскага па выкананні каралеўскіх пастаноў аб пошуку ў межах аінскай дзяржавы зямель, населеных сялянамі, для перадачы іх у валоданне асобаў, вызначаных каралём. Землі выдзяляліся і зямянам, выгнанцам са Смаленшчыны і памежных з ёю зямель. Пустаўшчыну (незаселеную землю) З'ялоўшчыну ў Аінскім павеце (старастве) атрымаў яшчэ пры жыцці Ратамскага Багдан Дробыш, продак Пятра Драбышэўскага, падстарасты судовага гродскага менскага, які займаў гэтую пасаду ў першай палове XVII ст. [15, арк. 225 адв.]. Паколькі зямля выдзялялася толькі пажыццёва, то ў 1537 г. Дробыш дабіўся атрымання прывілея на пераход былой пустаўшчыны ў асабістае валоданне. З кожным такім каралеўскім наданнем памеры аінскага старастваў, грошы з якога ішлі на дзяржаўныя патрэбы, паступова змяншаліся. Зразумела, што пры та-

кім падыходзе магчымасці дзяржаўнага скарбу станавіліся ўсё больш мізэрнымі.

Нярэдкімі былі выпадкі выдзялення аінскіх зямель і магнатам ВКЛ. Каралеўскія землі перадаваліся спачатку ў пажыццёвае карыстанне, а потым пераходзілі ў вячыстае дзедзічнае валоданне былых іх ленных карыстальнікаў.

Яцка Ратамскі карыстаўся любой магчымасцю для павелічэння сваіх зямельных уладанняў. Да 23 красавіка 1517 г. ён падае прашэнне аб замацаванні на вечныя часы за ім і яго спадкаемцамі каралеўскіх наданняў, атрыманых продкам яго жонкі ў мінулыя часы [6, № 666, арк. 362]. Некалі кароль Казімір падараваў продку яго жонкі Івану Міхальчукову сёлы Хамінічы, Цешывічы, Дзегна і Белы Ручай з усім, што да іх належала. На жаль, у тэксце прывілея не пазначана, у якой мясціне ВКЛ былі размешчаны гэтыя сёлы. Але дапаўненне, зробленае ў тэксце прывілея, аб тым, што былыя каралеўскія наданні Івану Міхальчукову, яшчэ да часу падпісання каралеўскага прывілея Яцку Ратамскаму, «отошли у сторону неприятеля нашого московског(о)», дазваляе зрабіць дапушчэнне аб іх знаходжанні на Смаленшчыне. Дзяржаўца аінскі прасіў караля замацаваць за ім і яго крэўнымі правы на сяло Лоеўскае на Прудах каля Смаленска і на двор у самім горадзе, спадзеючыся на тое, што «з Божею помочю тотъ замокъ нашь Смоленскъ отъ неприятеля нашого» зможам вызваліць.

13 снежня 1521 г. скончылася доўгая судовая справа па размежаванні зямель каралеўскага старасства Аіны з землямі Багдана Таўкачэвіча (пазней — Таўкача) Гаянскага ў Гаянах, якія падлягалі земскаму праву [35, арк. 501–502]. Дзякуючы высілкам прыяцеляў Ратамскага і Таўкачэвіча справа скончылася мірам, і бакі, адмовіўшыся ад некаторых прэтэнзій, правялі межаванне сваіх зямель. Яцка Ратамскі, як ён запісаў у дакуменце, «саступіў Багдану Таўкачэвічу лес, роспаш і сенажаці ад ракі і старыя межы, якія дзялілі грунты Аінскія з Беларучамі». Новая мяжа ішла ад Меркавіч да сяла Бяларучы. На той час Вялікія Бесяды яшчэ ўваходзілі ў склад аінскай дзяржавы. Мяжа, што падзяляла землі Гаян і Аіны, праходзіла ў ваколіцах Сёмкава. Па леваму баку дарогі з Бяларуч размяшчаліся землі аінскай дзяржавы, якая знаходзілася ў пажыццёвым кіраванні Яцкі Ратамскага. Суседзі дамовіліся аб сумесным выкарыстанні лесу і ловаў звярыных, а таксама вызначыліся з уласнасцю на бортныя дрэвы ў пушчы.

Праз шмат гадоў пасля атрымання прывілея на землі ў Абрыне Ратамскаму прыйшлося правесці вельмі складаны судовы працэс з навагародскімі зямянамі, суседзямі яго былых уладанняў. Спадзеючыся на адсутнасць належных дакументаў, яны паспрабавалі аспрэчыць правы Ратамскага на землі на Навагародчыне, якія некалі належалі Жыдавіна-

вічу і Івашку Турчыну. 26 ліпеня 1522 г. Яцка Ратамскі атрымаў каралеўскі вырак (пастанову. — *Ф. Ч.*) па скарзе навагародскіх зямян Федзькі Парфяновіча і яго зяця Грыня Абрагімовіча аб незаконным атрыманні наместнікам аінскім маёнтка Зенькаўшчына каля Абрынскай маетнасці ў Навагародскім павеце. У сваёй скарзе зямяне спасылаліся на тое, што гэтыя землі з'яўляюцца іх дзядзькаўшчынай, што належала некалі іх дзядзьку Зеньку Жыдавінавічу [11, № 2, арк. 42]. Яшчэ ў пачатку XVI стагоддзя Яцка Ратамскі быў узяты Івашкам Турчыным і яго жонкай, якія не мелі дзяцей, за сына і абавязаўся даглядаць старых людзей да іх смерці. Пасля іх смерці дзяржаўца аінскі папрасіў караля аб наданні яму прывілея на землі Івашкі Турчына і яго жонкі. Праз некаторы час Ратамскі падараваў землі на Навагародчыне, зразумела з дазволу караля, свайму сестранцу (пляменніку, сыну сястры. — *Ф. Ч.*) Іллі. Пасля такога падарунка навагародскія зямяне адчулі сябе моцна пакрыўджанымі і пазвалі Ратамскага ў каралеўскі суд, патрабуючы вяртання дзедзічных зямель. Згодна з прававымі нормамі, дзеючымі ў ВКЛ, іх уладальнікі пры любых абставінах мелі прыярытэтнае права на вяртанне такіх уладанняў у сваё вечнае карыстанне. На судзе нечакана для навагародскіх зямян высветлілася, што яны спрабавалі ўвесці каралеўскі суд у зман. Дзякі з вялікакняскай канцылярыі паведамілі, што яшчэ кароль Аляксандр, пасля смерці былога ўладальніка гэтых зямель, Зенькі Жыдавінавіча, надаў Зенькаўшчыну баярыну Івашку Турчыну, які ўступіў у шлюб з жонкай нябожчыка Зенькі з абавязкам спраўляць каралеўскую службу з зямель Жыдавінавіча, на што атрымаў дазвол Аляксандра. Як Зенька Жыдавінавіч, так і Турчын, не пакінулі нашчадкаў і ў дадатак да гэтага Жыдавінавіч не быў дзядзькам Парфяновіча. Зразумела, што Яцка Ратамскі, як выдатны юрыст, добра падрыхтаваўся да працэсу. Ды і дзякі вялікакняскай канцылярыі не па ўласным жаданні гарталі старонкі старых прывілеяў, а рабілі гэта, спадзеючыся на добрую аплату сваіх паслуг дзяржаўцам аінскім.

25 верасня 1522 г. кароль надаў новы прывілей, пацвярджаючы правы Яцка Іванавіча Ратамскага на некаторыя іншыя землі. Прычым у гэтым прывілеі даваліся пацвярджэнні не толькі на тыя землі, якія ім былі набыты ў зямян, што пражывалі ў наваколлі Менска, але і на выніки межаванняў яго зямель з суседзямі. У Міхно, Федзькі і Андрушкі Васковічаў Песляковічаў, аінскіх (пасля 1600 г. ужывалася найменне гаенскія. — *Ф. Ч.*) баяраў, якія з даўніх часоў жылі ў Дамашах, ён набыў на рацэ Вяча невялікае прудзішча (стаў. — *Ф. Ч.*) [11, № 17, арк. 54]. На той час і Дамашы яшчэ ўваходзілі ў склад аінскай дзяржавы. Кароль пацвердзіў і вынікі межавання зямель, погляды на межы якіх у Песляковічаў і Ратамскага вельмі разніліся. Адмежавальная лінія паміж іх землямі па згодзе абодвух бакоў устанаўлівалася ад аінскай мяжы па рацэ Ло-

пеніцы да мяжы з землямі зямян Мажэйкавічаў. Як тлумачылі Ратамскі і Песляковічы, гэта было зроблена для таго, «ажбы через тые границы один в другог(о) сторону ничым ся не уступовал». Гэтак жа мірам скончыліся спрэчкі Яцка Ратамскага з суседзямі Мажэйкавічамі. Абодва бакі на спрэчныя землі «судей своих там выводили и границы свои перед тыми судьями обводили, и в том межи собою свою ровность учынили». У выніку Ратамскаму дасталіся землі «по правой руцэ къ своей земли Семковской пропаши и лесы, и сеножати, и бортное дерево, а тые Можейковичы по левой руцэ къ своим двором земли». Такі мірны вынік зямельных спрэчак у тыя часы быў даволі рэдкай з’явай. У большасці выпадкаў вайна за зямлю паміж суседзямі вельмі часта набывала характар сапраўднай невялічкай вайны, што нярэдка прыводзіла да смерці яе ўдзельнікаў.

Адначасова кароль пацвердзіў Ратамскаму правы на валоданне некаторымі землямі і ў ваколіцах Бяларуч, на якія прэтэндаваў і ўладальнік зямель сяла Гаяны, гаспадарскі дваранін Багдан Таўкачэвіч. Некалі гэтыя землі Якуб Івашэнцавіч, дыпламат вялікага князя літоўскага Аляксандра, выдзеліў у якасці пасагу дачцэ, з якой узяў шлюб Яцка Іванавіч. Справа атрымала такі розгалас, што вырашэннем яе вымушаны быў заняцца сам Мікалай Радзівілавіч (Радзівіл. — *Ф. Ч.*), ваявода віленскі і канцлер ВКЛ. На дату прывілея канцлер ужо зышоў з гэтага свету, але, на нашу думку, справа пачала вырашацца яшчэ да атрымання Яцкам Ратамскім каралеўскага прывілея. Яго сусед, каб папярэдзіць падзеі, першым звярнуўся ў суд. Мікалай Радзівіл у гэтай справе Яцку Ратамскага «правог(о) знашол, и листъ свой на то ему дал» [11, № 17, арк. 54]. У выпадку судовай справы з Якубам Вяжэвічам, таксама менскім зямянінам, прыйшлося звяртацца ў суд да Канстанціна Іванавіча Астрожскага, ваяводы трокскага, гетмана ВКЛ. І ў гэтым выпадку землі ў Вычалпях і Лекарэўская зямля таксама былі прысуджаны Ратамскаму.

Асаблівай любоўю ў Яцкі Іванавіча карысталіся землі ў ваколіцах Буцавіч. Да 1522 г. ён набыў у менскай баярыні пані Барбары Марцінавай Юр’евай і яе сына Мацяса трэць яе зямельных валоданняў у Буцавічах, размешчаных ва ўрочышчы Перцаўшчына [11, № 17, арк. 54].

Пра сямейныя адносіны Яцкі Іванавіча Ратамскага звестак да нас трапіла вельмі мала. На іх аснове нельга рабіць высновы аб яго бацьках. Невядома калі памёр бацька былога гараднічага менскага, менавіта Іван Ратамскі. Не выключана, што ён памёр да 1508 г.

Некаторае святло на паходжанне маці дыпламата Жыгімонта I пралівае каралеўскі прывілей, падпісаны 18 лістапада 1522 г. Сястра Яцкі Ратамскага Федзька Ратамская прасіла караля аб замацаванні за ёй навечна Пацкаўшчыны, матчыных зямель, якія засталіся без гаспадароў [9, № 87, арк. 169]. Маці Ратамскага паходзіла з зямян, якія некалі ва-

лодалі землямі ў межах Крычаўскага староства. Аказалася, што Глеб, родны брат маці Яцкі і Сенькі Іванавічаў і іх сястры Федзькі, атрымаў у спадчыну частку зямель сваёй маці, бабулі, братоў і сястры Ратамскіх, і пасля доўгага карыстання імі памёр, не пакінуўшы дзяцей. Праз некаторы час памерла і яго жонка. Кароль ласкава аднёсся да просьбы сястры намесніка аінскага і загадаў крычаўскаму намесніку Васілю Сямёнавічу Жылінскаму ўвязаць (увесці. — *Ф. Ч.*) Федзьку Ратамскую ў валоданне землямі, якія некалі належалі яе дзядам і прадзедам па мацярынскай лініі. Не выключана, што і бацька Яцкі Ратамскага нарадзіўся і доўгі час жыў на ўсходзе ВКЛ і толькі пасля атрымання зямель у Ратам'і перасяліўся ў ваколіцы Менска.

Што ж датычыцца пані Федзькі Ратамскай, то яна, на нашу думку, у шлюб не ўступала і памерла беспатомнай. Маючы шмат гадоў за плячыма на час складання прашэння, яна карысталася толькі сваім дзявочым прозвішчам. Відаць, гэта была не адзіная сястра Яцкі Ратамскага. Яшчэ адна сястра выйшла замуж і пакінула пасля сябе сына Іллю, якому дзяржаўца аінскі пакінуў землі ў Абрыне.

У 1517 г. Яцка Ратамскі ў прашэнні каралю ўпамінае продка сваёй жонкі, Івана Міхальчукова, які служыў яшчэ каралю Казіміру, бацьку Жыгімонта Старога [6, № 666, арк. 362]. На жаль, мы не ведаем, колькі разоў уступаў у шлюб Ратамскі. Дакладна вядома, што першай яго жонкай была дачка Якуба Івашэнцавіча, выдатнага дыпламата каралёў Казіміра і Аляксандра, які не толькі падтрымліваў на патрэбным узроўні адносіны з уладарамі Крыма, але, выконваючы каралеўскія даручэнні, ездзіў на перамовы і ў Маскву. Аб лёсе пані Івашэнцавічаўны мы не маем ніякіх звестак. З дзяцей Яцкі Ратамскага нам вядома толькі аб існаванні дачкі і сына Канстанціна.

У той час калі дзяржаўца аінскі атрымліваў новыя і новыя каралеўскія наданні за сваю службу, баяры Ратамскія, прыпісаныя да гаспадарскага менскага двара, не вызначаліся асаблівай заможнасцю. У 1528 г. у час перапісу войска ВКЛ, ужо пасля смерці дзяржаўцы аінскага, Пётр (або Пятрашка) Ратамскі з братамі ставіў аднаго каня. Не вызначаўся заможнасцю і родны брат Яцкі Іванавіча Сенька, у якога хапала сродкаў таксама толькі на аднаго каня [42, арк. 61].

У 1523 г. Яцка Ратамскі, верагодна ў апошні раз, выпраўляецца ў далёкую і небяспечную дарогу ў Крым [8, № 159, арк. 148]. Адносіны паміж каралём польскім і ханам Крымскай Арды на гэты час былі моцна сапсаваныя. Уладары Крыма палічылі больш выгодным устанавіць добрыя стасункі з Масквой і нападалі на гарады і сёлы Літвы. У 1503–1510 гг. іх загоны неаднаразова даходзілі да Лагойска і дашчэнту руйнавалі ваколіцы Менска [46, арк. 507–508]. Асабліва цярпелі ад набегаў крымскіх татар паўднёвыя паветы і ваяводствы ВКЛ. Як напі-

саў у лісце Жыгімонт I, і ў гэтым годзе (у 1523 г. — *Ф. Ч.*) сын хана «Алпъ сольтан з немалыми людми землю нашу воевал, тежъ шкоду нам немалую вчынил». Ратамскаму даручалася перадаць хану каралеўскае пасланне з прамымі абвінавачваннямі ў правядзенні варожай палітыкі супраць Польскай кароны і ВКЛ. Жыгімонт I успамінаў аб часах добрасуседскіх адносін, якія існавалі паміж Крымскім ханствам і Польскай каронай у часы кіравання Крымам Менглі Гірэем, бацькам цяпершняга ўладара Крыма. Асноўнымі патрабаваннямі Жыгімонта I былі: спыненне набегаў на паўднёвыя землі ВКЛ і адпраўка ханам «сыновъ своихъ з воискомъ своим великимъ землю непрыятеля н(а)шого московского воевати». На нашу думку, і Жыгімонт I не ва ўсім быў чыстасардэчны ў адносінах са сваім паўднёвым суседам. Уладар Крыма даведаўся аб тым, што ў ВКЛ знаходзіцца ў вялікай пашане Шіг Ахмат, хан Заволжскай Арды, вялікі яго вораг, і патрабаваў выдачы Ахмата на суд у Крым. Разумеючы небяспечнасць сітуацыі для жыцця пасла, Жыгімонт I папярэджваў улады Крыма, каб ён, «брат нашъ, посла н(а)шого, пана Яцка Ивановича Ратамъского к нам отпустил».

Яцка Іванавіч Ратамскі памёр да 29 верасня 1524 г. На гэты час смаленскі баярын Іван Фёдаравіч Казарын атрымаў каралеўскі ліст на пяць служб людзей і на дзве зямлі пустыя. Усе гэтыя наданні павінен быў адшукаць у Аінскім павеце (прысудзе) Ратамскі, намеснік аінскі. Яцка Ратамскі паспеў выдзеліць Казарыну і яго маці толькі тры службы людзей у Кашчыцах, Кашалевічах і Мікішыне і дзве пустыя зямлі: Буракоўшчыну і Хачэўшчыну. Нечаканая смерць былога дыпламата не дазволіла яму выканаць каралеўскі загад. Выкананнем даручэння Жыгімонта I заняўся каралеўскі канюшы Васіль Багданавіч Чыж, які пасля смерці Ратамскага атрымаў каралеўскія землі ў Аіне ў сваё пажыццёвае карыстанне [9, № 386, арк. 325].

Пані Ратамская, удава дзяржаўцы аінскага, мела значна большыя зямельныя ўладанні, чым яго крэўныя, і выстаўляла ў войска 17 вояроў [42, арк. 56]. Нягледзячы на тое што значная частка ленных зямель пасля смерці дзяржаўцы аінскага трапіла ў распараджэнне караля, у яго жонкі заставалася яшчэ каля 140 служб падданых. Зразумела, што ў пані Ратамскай заставаліся некаторыя землі, якія пасля яе смерці таксама вярнуліся ў каралеўскае распараджэнне і былі аддадзены іншым асобам. Большая ж частка тых зямель, з якіх у войска ВКЛ Ратамскімі выстаўляліся ваяры, нададзена Яцку Ратамскаму навечна, у дзедзічнае валоданне. На гэты час мы знайшлі зямельныя ўладанні Ратамскіх і ў іншых частках ВКЛ. У літоўскае войска аднаго ваяра выставіла ў харугву Юрыя Вайдатавіча, мемежскага харужага, пані Ратамская [42, арк. 69]. Не выключана, што ваяра выстаўляла ўдава Яцкі Ратамскага, які, магчыма, валодаў землямі і ў ваколіцах Мемежа.

У нашы рукі трапіла і некаторая інфармацыя пра нашчадкаў каралеўскага дыпламата. Пра дачку Ратамскага нам сустрэлася толькі адно паведамленне. 23 кастрычніка 1509 г. Жыгімонт I падпісаў прывілей Тарноўскаму на атрыманне са скарбу 10 коп грошай літоўскіх [5, № 158, арк. 166; № 567, арк. 416]. Верагодна ў пачатку гэтага ж года Тарноўскі з почтам з чатырох ваяроў суправаджаў Цэскага ў час пасольства «да волахаў» (у Валахію. — *Ф. Ч.*). Тарноўскі ў дакуменце пазначаны як зяць Ратамскага. Гэта дазваляе дапусціць, што ў 1509 г. Яцка Ратамскі меў за плячыма не менш чым сорак гадоў жыцця. На жаль, у дакуменце не пазначана імя Тарноўскага. Невядомым засталося і імя дачкі Яцкі Іванавіча. Не выключана магчымасць таго, што Тарноўскага называлі зяцем Ратамскага з-за яго шлюбу з сястрой каралеўскага дыпламата.

У матэрыялах Метрыкі ВКЛ сустракаюцца ўпамінанні аб Аляксандры Тарноўскім, які ў пачатку XVI ст. знаходзіўся на службе ў каралевы і вялікай княгіні Алены, жонкі караля Аляксандра [7, № 62, арк. 73]. У дакументах, складзеных ужо ў пачатку 20-х гг. XVI ст., знаходзім паведамленні пра Аляксандра Тарноўскага, на гэты час намесніка ў Біржах, якія належалі Юрыю Мікалаевічу Радзівілу, кашталяну трокскаму, старасту гарадзенскаму [9, № 570, арк. 440].

У дадатак да ўсяго сказанага ў Аляксандра Тарноўскага ў Віленскім павеце жыў брат, аб імені якога, як і аб імені і прозвішчы яго жонкі, паведамленняў намі не знойдзена. На дадзеным этапе даследаванняў мы не маем пацвярджэнняў аб тоеснасці Тарноўскага, зяця Яцкі Ратамскага з Аляксандрам Тарноўскім, слугой каралевы Алены і ўпраўляючым радзівілаўскага маёнтка Біржы, або з яго братам. Хто з братоў быў у шлюбе з дачкой Яцкі Ратамскага, намі на гэты час не ўстаноўлена.

Калі пра брата Аляксандра Тарноўскага нам не сустрэлася дастатковай інфармацыі, то пра слугу каралевы Алены мы даведаліся значна больш. У першай палове 1520 г. Аляксандр Тарноўскі прадаў Грынашку Багданавічу Шалухіну (Шалусе), які пасля 1540 г. займаў пасаду гараднічага менскага, землі дварца Грынкоўскага ў ваколіцах Старога Сяла непадалёку ад Менска, якія ён атрымаў ад каралевы і вялікай княгіні Алены [7, № 62, арк. 73]. 10 чэрвеня 1520 г. Грынашку Багданавічу Жыгімонтам I нададзена пацвярджэнне аб набыцці ў Аляксандра Тарноўскага зямель дварца Грынкоўскага ў Гарадзенскім павеце (прысудзе. — *Ф. Ч.*). У Тарноўскага не склаліся адносіны з Шыкірамі, зямянамі князёў Слуцкіх. Адчуваючы вялікія страты ад наездаў суседзяў, Тарноўскі паскардзіўся каралеве і вялікай княгіні Алене і атрымаў яе дазвол на пакаранне свавольных зямян, што і выканаў з вялікім задавальненнем. Улічваючы, што каралева Аляксандравая Алена Іванаўна памёрла ў канцы студзеня 1513 г., наезд Аляксандра Тарноўскага мог мець месца каля 1509 г.

У пачатку 20-х гг. XVI ст. Аляксандр Тарноўскі паспрабаваў прыцягнуць да адказнасці Мікалая Аляксандравіча Гімбутавіча, зямяніна Віленскага павета, які забіў яго брата, жонку і не пашкадаваў нават іх сына, сестранца (пляменніка. — *Ф. Ч.*) Аляксандра Тарноўскага [14, арк. 320 адв.]. Настойлівыя спробы Тарноўскага пакараць злачынцу прывялі да ўзнікнення супрацьстаяння з Юрыем Мікалаевічам Радзівілам, працадаўцам Тарноўскага.

Магчыма, што Тарноўскі вельмі хутка атрымаў бы дзве галоўшчыны (штрафы за забойства яго брата з жонкай. — *Ф. Ч.*) памерам ў 300 коп лічбы літоўскай з Гімбутавіча, каб не ўмяшальніцтва Юрыя Радзівіла, старасты гарадзенскага. Гімбутавіч спачатку згадзіўся выканаць патрабаванні Аляксандра Тарноўскага і падпісаў усе паперы на пераход у валоданне Тарноўскага сваёй самай вялікай маетнасці ў Ушполі, якую яны ацанілі ў 300 коп. Потым Гімбутавіч (пазней прадстаўнікі гэтага роду ўжывалі прозвішча Гімбут. — *Ф. Ч.*) перадумаў. Спачатку ён жорстка расправіўся з тымі сваімі слугамі, якія прымалі ўдзел у злачынным забойстве сям'і брата Аляксандра Тарноўскага. Па загадзе Мікалая Гімбутавіча ўтапілі яго галоўнага памочніка ў гэтай справе Багдана Кунцэвіча. Магчыма, што такі ж лёс напаткаў і іншых яго слуг і падданых, якія ўдзельнічалі ў нападзе і забойстве Тарноўскіх. Нягледзячы на прыкладзеныя намаганні, Аляксандру Тарноўскаму ўсё ж не ўдалося знайсці ніводнага з памочнікаў забойцы [43, № 354, арк. 1073].

Мікалай Гімбутавіч прадпрыняў усе магчымыя дзеянні для ратавання сваёй асобы ад пакарання ў судах ВКЛ. Будучы беспатомным, ён прыняў старасту гарадзенскага за сына і нават прызначыў яго сваім апекуном, паабяцаўшы перадаць Радзівілу не толькі свае землі ва Ушполі, але і іншыя валоданні. Пры гэтым Гімбутавіч аддаліў (пазбавіў правоў на спадчыну. — *Ф. Ч.*) усіх сваіх крэўных. Юрый Радзівіл, адчуваючы магчымасць значна павялічыць свае зямельныя валоданні на захадзе ВКЛ, пачаў ратаваць Гімбутавіча ад пакарання. Адначасова Радзівіл выказаў сумненне ў неабходнасці выплаты Тарноўскаму двух галоўшчын памерам у 300 коп, звяртаючы ў сваім паведамленні ўвагу караля на тое, што згодна са старым звычаем выплата за забойства павінна быць у некалькі разоў меншай. Не павінны былі перайсці ў валоданне Тарноўскага і ўшпольскія землі. Па разліках старасты гарадзенскага землі Гімбутавіча ва Ушполі каштавалі значна болей, чым тыя 300 коп грошай лічбы літоўскай, у якую іх ацаніў Тарноўскі і вымушаны быў пагадзіцца Гімбутавіч. Аднак біржанскі ўпраўляючы аказаўся чалавекам з характарам і, нягледзячы на патрабаванні і пагрозы магната, не згадзіўся пайсці на прымірэнне з забойцам. У выніку абарона Гімбутавіча прынесла магнату вялікія грашовыя страты, ацэненыя Радзівілам у 600 коп грошай лічбы літоўскай. Юрый Радзівіл абвінаваціў былога ўрадніка

ў неналежным выкананні службовых абавязкаў і, падлічыўшы страты, запатрабаваў у якасці кампенсацыі перадаць яму маетнасці Тарноўскага на Пораве [9, № 570, арк. 440].

Гэтая справа вельмі яскрава сведчыць аб сутнасці тагачаснай судовай сістэмы. Адчуўшы немагчымасць на месцы, у Віленскім ваяводстве, улагодзіць справу, не падымаючы лішняга розгаласу, Радзівіл накіраваўся ў Варшаву. Падчас сустрэчы з каралём яму ўдалося дабіцца пацвярджэння пераходу апекі над Гімбутавічам у свае рукі. Кароль дазволіў Юрыю Мікалаевічу Радзівілу прыняць пад сваё кіраванне і выкарыстанне ўсе землі і набыткі свайго падапечнага. Адначасова манарх згадзіўся з просьбай Радзівіла аб вывадзе забойцы з падсуднасці віленскага ваяводы і канцлера ВКЛ Альбрыхта Марцінавіча Гаштольда і яго судовыхураднікаў. Такое рашэнне караля сур'ёзна падрывала эканамічныя і прававыя асновы існавання судовых структур Віленскага ваяводства, ды і не абмінала самога ваяводу і канцлера ВКЛ. На нашу думку, Гаштольд паведаміў каралю аб парушэнні ім права ВКЛ і аб сур'ёзным парушэнні права самім Радзівілам, які не паведаміў манарху аб усіх абставінах гэтай справы. Альбрыхт Марцінавіч Гаштольд, ваявода віленскі, канцлер ВКЛ, староста лідскі і мазырскі, папярэдзіў караля Жыгімонта I, што ў Гімбутавіча ёсць больш блізкія людзі, чым яго апякун і прыёмны сын Юрый Мікалаевіч Радзівіл. Па праву, якое дзейнічала ў ВКЛ, яны мелі бясспрэчныя правы на землі забойцы, на якія беспадстаўна прэтэндаваў Радзівіл [14, арк. 320 адв.]. У выніку кароль забараніў Юрыю Радзівілу ўвязвацца (у праўным парадку атрымаць у сваё распараджэнне. — *Ф. Ч.*) у землі Гімбутавіча.

Аляксандр Тарноўскі добра разумеў усе магчымыя наступствы свайго супрацьстаяння з Радзівілам. Ужо пасля сустрэчы Радзівіла з каралём, патаемна ад гарадзенскага старасты, ён прадаў Станіславу Мікалаевічу, дзяржаўцу ўшпольскаму і пенянскаму, толькі што атрыманыя ад Гімбутавіча землі ў Ушполе і атрымаў за подпісам караля дазвол на іх продаж. Адначасова ён атрымаў пацвярджэнне гаспадарскага суда на працяг праследавання Гімбутавіча. Не ведаючы ўсіх абставін справы, Жыгімонт I зацвердзіў усе дзеянні Аляксандра Тарноўскага і сваім подпісам пацвердзіў законнасць набыцця Станіславам Мікалаевічам ушпольскіх зямель. Зразумела, што гэта аказала негатыўны ўплыў на аўтарытэт каралеўскай улады, якая лічылася апошняй інстанцыяй у вырашэнні ўсіх судовых спраў. У выніку кароль загадаў забраць прысуджаныя Тарноўскаму 300 коп у скарб. Землі ва Ушполі, каб не дапусціць іх разрабавання, было загадана ўзяць пад ахову дзяржавы.

На нашу думку, учынак старасты гарадзенскага не аказаў сур'ёзнага ўплыву на становішча магната ў ВКЛ. У той жа час несумненна, што кароль пасля гэтых падзей пазбавіў Юрыя Радзівіла свайго даверу. Пры

праглядзе матэрыялаў Метрыкі ВКЛ намі знойдзены дакумент, складзены ў кастрычніку 1527 г., ужо пасля завяршэння разгляду вышэйпазначанай справы ў судах ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Несумненна, што ў гэтым дакуменце адчуваецца адгалосак справы Аляксандра Тарноўскага з Гімбутавічам. Васіль Багданавіч Чыж, дзяржаўца аінскі, узяў апошні свой шлюб з жанчынай, у якой засталіся непаўналетнія дзеці [14, арк. 317 адв.]. Па тастаменце нябожчыка дзяржаўца аінскі павінен быў узяць у сваё распараджэнне яго землі ў Гарадзенскім павеце і даглядаць іх да часу дасягнення спадчыннікамі паўналецця. Даведаўшыся аб гэтым, Юрый Мікалаевіч Радзівіл запатрабаваў у Васіля Чыжа прадстаўлення ў свой суд усіх дакументаў, якія пацвярджалі яго правы на трыманне маетнасцяў нябожчыка. Кароль забараніў дзяржаўцу аінскаму станавіцца на суд старасты гарадзенскага і перадаваць яму дакументы, што пацвярджалі б правы Васіля Багданавіча Чыжа.

Праз шмат гадоў пасля падзей, якія адбыліся ў пачатку 20-х гг. XVI ст., менавіта ў 1559 г., у актавых дакументах Метрыкі ВКЛ упамінаюцца Уршуля Войцахаўна Аляксандравая Тарноўская і яе сын Станіслаў [15, л. 781 зв.]. Бацька памёр, маці і сын вырашалі свае маёмасныя справы самастойна. У тым выпадку, калі размова ідзе пра былога зяця Ратамскага, то яго дачка, пані Аляксандравая Тарноўская, памерла каля 1520 г. і ў пачатку 20-х гадоў XVI ст. яе муж паўторна ўступіў у шлюб з Уршуляй Войцахаўнай.

Адзіны нам вядомы сын Яцкі Ратамскага Канстанцін да 1539 г. уступіў у шлюб з князёўнай Барбарай, дачкой Васіля Іванавіча Саламярэцкага, і запісаў ёй зямельныя надзелы ў ваколіцах Менска [27, арк. 20]. Барбара Саламярэцкая прынесла ў дом вялікі пасаг. Ад бацькі і маці яна атрымала значныя землі ў ваколіцах Айнаравіч, што размешчаны непадалёку ад Аіны. Сярод тых зямель, якія належалі яму на правах вечнасці, менавіта Айнаравічы карысталіся найбольшай яго любоўю.

Канстанцін Яцкавіч (Якубавіч) Ратамскі сваё жыццё прысвяціў службе дыпламата і працягваў справу бацькі па ўсталяванні добрых стасункаў з валадарамі Крымскага ханства і тымі дзяржавамі, якія ўзніклі пасля распаду Залатой Арды. Неаднаразова ён ездзіў у Крым, выконваючы даручэнні караля і канцлера ВКЛ. У 1542 г. такая паездка ледзьве не скончылася для каралеўскага пасла трагічна. Па загадзе крымскага хана Саіп Гірэя яго кінулі ў вязніцу [2, арк. 391].

З 1548 г. і да канца 1551 г. Канстанцін Ратамскі неаднаразова ўпамінаецца сярод суддзяў, устаноўленых падскарбіем дворным ВКЛ для разгляду спрэчак паміж зямянамі Віленскага ваяводства. Апошняе паведамленне пра Ратамскага датычыцца кастрычніка 1551 г.

На нашу думку, Канстанцін Ратамскі выдатна выконваў дыпламатычныя даручэнні караля, за што кароль шчодра адзначыў яго. За гады

свайго жыцця Канстанцін Ратамскі атрымаў у пажыццёвае, леннае, валоданне значную колькасць зямельных уладанняў, размешчаных у розных паветах і ваяводствах ВКЛ. Да 1550 г. Ратамскаму надаецца ў часовае карыстанне валозінская (валожынская. — *Ф. Ч.*) дзяржава. У сакавіку 1550 г. Ратамскі, спраўца (часовы выканаўца. абавязкаў дзяржаўцы каралеўскага маёнтка. — *Ф. Ч.*) гаспадарскага двара валозінскага, паслаў віжоў (службоўцаў. — *Ф. Ч.*) з Валожына для азнаямлення з сутнасцю справы, якая ўзнікла паміж Жданам Стэцковічам, вайтовічам слуцкім, і гаспадарскім дваранінам Сямёнам Мікулічам, у будучым войтам менскім [22, арк. 177 адв.]. У сярэдзіне чэрвеня 1550 г. Канстанцін Ратамскі высылаў віжа «валожынскай каралеўшчыны» Рыгора Валашаніна для ўчынення справядлівасці ў справе Сямёна Паўкозіча з Янам Багушэвічам [22, арк. 396 адв.].

Да ліпеня 1551 г. валожынская дзяржава перададзена ў пажыццёвае карыстанне Ярашу Карыцкаму, дзяржаўцу трабскаму. 29 ліпеня гэтага года ў гаспадарскім судзе разглядалася яго скарга на суседа, Паўла Каспаравіча Астравецкага, які з грамадой людзей па-суседску «заехаў» (напаў) ў яго маёнтак Астравецкі і абрабаваў маёмасць дзяржаўцы валожынскага і трабскага [23, арк. 13 адв.].

Не застаўся пакрыўджаным і Канстанцін Ратамскі. Да кастрычніка 1551 г. яму была нададзена «да жывата» (да смерці) дзяржава асцёрская. Яшчэ ў канцы 1550 г. землямі, прылеглымі да каралеўскага замка асцёрскага, карыстаўся Пётр Дзмітравіч Корсак, староста асцёрскі і быхаўскі, які неаднаразова ўдзельнічаў у судах Віленскага павета [22, арк. 500 адв.].

Не склаліся адносіны Канстанціна Ратамскага і яго сына Лаўрына з іх крэўнымі, нашчадкамі Якуба Івашэнцавіча. Спрэчкі, верагодна, пачаліся ўжо пасля смерці Яцкі Ратамскага. Так, праз пэўны час пасля згаданай падзеі нашчадак Якуба Івашэнцавіча, а менавіта Андрэй Макаровіч (сын Макара Івашэнцавіча пачаў першым у родзе Макаровічаў ужываць імя бацькі ў якасці прозвішча. — *Ф. Ч.*) Івашэнцавіч пазваў у 1551 г. у каралеўскі суд свайго крэўнага, Канстанціна Яцкавіча Ратамскага. Трэба думаць, што гаспадарскі суд не ўпершыню праводзіў судовае пасяджэнне па разглядзе прэтэнзій крэўных асобаў. Андрэй Макаровіч успомніў, што землі ў Бяларучах першапачаткова належалі прадстаўнікам роду Івашэнцавічаў [25, арк. 12]. Дэкрэт каралеўскага суда пакінуў гэтыя землі за Ратамскім. Верагодна, што Яцка Ратамскі атрымаў ад Жыгімонта I прывілей толькі на частку былых уладанняў Якуба Івашэнцавіча. Некаторая частка івашэнцавічаўскіх зямель кароль надаў і братам здрадніка, якія захавалі вернасць каралю.

Адносіны паміж Канстанцінам Ратамскім і яго швагрdevamі Саламярэцкімі на працягу яго жыцця заставаліся вельмі добрымі. У матэрыялах

Метрыкі ВКЛ захаваліся сведчанні аб сумесным выкарыстанні братамі Саламярэцкімі прыватнай вязніцы (турмы. — *Ф. Ч.*), пабудаванай каралеўскім дыпламатам у Айнаравічах. Неаднаразова Саламярэцкія, вяртаючыся пасля паспяховых нападаў на землі сваіх ворагаў, пакідалі на некаторы час захопленых імі слуг і падданых у вязніцы Канстанціна Ратамскага.

У пачатку кастрычніка 1551 г. Цімафей Фёдаравіч Лопат выклікаў Ратамскага, мянуючы яго дзяржаўцам асцёрскім, і Андрэя Макаровіча ў гаспадарскі суд [23, арк. 42 адв.]. Нам невядома, як Лопат аказаўся ўладальнікам той часткі Бяларуч, якая знаходзілася раней у валоданні Ратамскага і Андрэя Макаровіча. Па ўсім відаць, што да гэтага часу адносіны Ратамскага і Лопата былі самымі прыяцельскімі, і раней яны прыходзілі да ўзаемаразумення па спрэчных пытаннях. Аднак на гэты час сувязі былых сяброў моцна сапсаваліся. Ні Макаровіч, ні Ратамскі не пагаджаліся «даць дзел» (правесці падзел зямель. — *Ф. Ч.*) Цімафею Лопату і вызначыць лёс «карчмы вольнай», якую Ратамскі збудаваў на землях таго ж Цімафея Лопата. У дадатак стараста асцёрскі атрымаў ад Лопата зямлю Падрэзаўскую, на якой збудаваў сабе дварэц, а адмену даваць не хацеў. Суд быў прызначаны на «дзень святога Міхала».

Аднак, як паведамлялася ў дакуменце па судовай справе, узбуджанай Цімафеем Лопатам супраць Канстанціна Ратамскага, старасты асцёрскага, і Андрэя Макаровіча Івашэнцавіча, разгляд скаргі не адбыўся ў прызначаны дзень святога Міхала [23, арк. 42 адв.]. З-за «небяспечнасці ад паганства татарскага» Ратамскаму і Макаровічу было «наказана» (загадана) ад’ехаць на службу гаспадарскую ў Кіеў, а суд адклалі да спынення ваенных дзеянняў. Пасля вяртання з вайны Ратамскі неўзабаве памёр ад атрыманых раненняў у перыяд пасля кастрычніка 1551 г. і да 1562 г.

Справа з зямельнымі надзеламі ў Бяларучах не скончылася. Пасля смерці Канстанціна Ратамскага становішча ўдавы пагоршылася. На яе землі ўзнавілі прэтэнзіі Івашэнцавічы. Падданыя пані Ратамскай выдатна выкарысталі гэту сітуацыю. Ведаючы аб надзейнай абароне з боку сваёй гаспадыні, яны зжалі жыта, якое належала самому Андрэю Макаравічу [26, арк. 139]. Князёўна Барбара Васільеўна Саламярэцкая, у першым шлюбе Канстанцінавая Ратамская, старасціна асцёрская, запісваючы свайму другому мужу Васільевічу Каленіцкаму Тышкевічу землі ў Глівіне, Упірэвічах і Бяларучах успамінала аб чарговай спробе Фёдара, пляменніка яе першага мужа, і Андрэя Макаровіча Івашэнцавічаў вярнуць у сваё карыстанне тыя землі, якія некалі былі аддадзены іх продку, Якубу Івашэнцавічу [26, арк. 139].

На дадзеным этапе даследаванняў мы ведаем толькі аб нараджэнні сына Лаўрына ў Канстанціна Яцкавіча і князёўны Барбары Васільеўны

Саламярэцкай Ратамскіх. Нам невядома, ці нараджаліся яшчэ дзеці ў гэтай сям'і.

Каралеўскі ротмістр Лаўрын Канстанцінавіч Ратамскі за сваё жыццё атрымаў ад польскіх каралёў значныя зямельныя наданні. Верагодна, што самым вялікім з гэтых наданняў было асцёрскае староства, якое Ратамскі атрымаў праз некаторы час пасля смерці бацькі, 20 сакавіка 1566 г. [10, № 11, арк. 14]. У каралеўскім прывілеі дадзена высокая ацэнка дзейнасці не толькі самога Лаўрына Ратамскага, каралеўскага ротмістра, які «самъ служачи жолнерскую (службу) и не литуючи здоровя своего намъ, г(о)с(по)д(а)ру и Речипосполитои, такими ж службами своими добре ся подобал», але і яго бацькі Канстанціна Яцкавіча.

Пасля смерці Канстанціна Ратамскага асцёрская дзяржава яшчэ да кастрычніка 1562 г. была нададзена Філону Кміце. Восенню гэтага года пад Старадубам яго харугва ўшчэнт разбіла маскоўскага военачальніка князя Васіля Іванавіча Цёмкіна [3, арк. 7]. Атрымаўшы паведамленне аб перамозе, кароль загадаў Філону Кміце, мянуючы яго старастам асцёрскім, звярнуць асаблівую ўвагу на ўмацаванне асцёрскага замка, які знаходзіўся на маскоўска-літоўскім памежжы. Да 1565 г. Філон Кміта атрымаў вялікае Чарнобыльскае староства і адмовіўся ад асцёрскай дзяржавы. На нашу думку, асцёрскае староства было атрымана Ратамскім па цэсіі (згодзе. — *Ф. Ч.*) вядомага палітычнага дзеяча ВКЛ Філона Кміты Чарнобыльскага, у будучым старасты аршанскага. Не выключана, што на атрыманне цэсіі Філона Кміты на пераход староства ў карыстанне Лаўрына Ратамскага аказаў уплыў яго айчым Каляніцкі Васільевіч Тышкевіч, які, узначальваючы харугвы белагорскіх татараў, прымаў актыўны ўдзел у разгроме палкоў Васіля Цёмкіна.

Айнараўскія землі перайшлі ў валоданне Лаўрына Канстанцінавіча Ратамскага ад маці Барбары Васільеўны Саламярэцкай. Яны былі перададзены ёй бацькам Васілём Саламярэцкім пасля яе ўступлення ў першы шлюб з Канстанцінам Яцкавічам. Айчым Лаўрына, Каляніцкі Тышкевіч, набыў у суседзяў землі ў ваколіцах Айнаравіч памерам у тры валокі і далучыў іх да маетнасці [1, арк. 471–476]. Незадоўга да смерці Лаўрына Ратамскага яго айнараўскія надзелы моцна пацярпелі ад нападу яго суседа Станіслава Кеўліча [38, арк. 114]. Не выключана, што прычынай жорсткага нападу Кеўліча на землі старасты асцёрскага аказаліся супярэчнасці, якія ўзніклі яшчэ пры жыцці Тышкевіча і не знайшлі да гэтага часу вырашэння.

За выдатныя вайсковыя заслугі Лаўрын Ратамскі атрымаў ад караля некаторыя землі ленным правам. Ратамскі за ўласныя грошы набыў землі і ў ваколіцах Хатаевіч, якія ляжалі ў межах Менскага павета, а таксама маетнасць Узлы ў Ашмянскім. Верагодна, самай вялікай часткай яго валоданняў былі тыя землі, што яму пакінулі ў заставунае права Ян

Янавіч Глябовіч, спачатку кашталян менскі, а потым ваявода трокскі, і яго жонка Кацярына Кратоская, ваевадзянка інаўроцлаўская. Вялікія абшары зямель у межах Упіцкага павета памерам у 60 валок Лаўрын Ратамскі атрымаў, пазычыўшы ваяводзе трокскаму 3 000 коп грошай лічбы літоўскай. Пазыкаатрымальнікі зышлі з гэтага свету, не разлічыўшыся з даўгамі, а іх нашчадкі не мелі дастатковых грошай, каб выкупіць бацькоўскія землі. Ад дзеда і бацькі Ратамскаму засталіся землі ў Глівіне і Бяларучах, размешчаныя ў межах Менскага павета. Некалі гэтыя землі каралі польскія надалі прадзеду Лаўрына Ратамскага Якубу Івашэнцавічу, дыпламату Аляксандра, караля польскага і вялікага князя літоўскага. Жыгімонт І адабраў Глівін і Бяларучы ў Івашэнцавіча, які перайшоў на бок Міхала Глінскага, і надаў іх зяцю здрадніка, менавіта Яцку Іванавічу Ратамскаму, захаваўшаму адданасць каралю. У межах Менскага павета Ратамскі выкупіў у татар землі ў Раванічах і Дрэгчы, якія ім былі аддадзены ў даўно мінулыя часы за ваенную службу. У Мазырскім павеце староста асцёрскі валодаў землямі ў Міхнавічах, Церабове і Рашэлі. У Аршанскім павеце яму належалі землі за Бярэзінай: Латыголічы і Нежычы [1, арк. 471–476]. За ўдзел у паходах Стэфана Баторыя пад Віцебск, Полацк і Пскоў Лаўрын Ратамскі атрымаў Казловічы і Барысавічы ў Мазырскім павеце. Усе гэтыя землі былі размеркаваны ім пры складанні тастамента 7 лютага 1594 г. паміж дзецьмі, народжанымі ў першым і другім шлюбах.

Як і іншай шляхце, якая пастаянна прымала ўдзел у войнах ВКЛ з яе суседзямі, Лаўрыну Ратамскаму перад кожнай ваеннай экспедыцыяй патрабаваліся грошы для абнаўлення ваеннага рыштунка, як для сябе, так і для тых людзей, якіх ён выпраўляў у войска. Да 7 снежня 1582 г. Лаўрын Ратамскі застаўляў сваіх людзей і тыя «вяцкія» (на рацэ Вяча. — *Ф. Ч.*) землі, на якіх яны сядзелі ў маёнтку Бяларучы, Рыгору Андрэевічу Макаровічу, суддзі Галоўнага Трыбунала ВКЛ ад Менскага ваяводства (павета) [38, арк. 61]. Грошы пры жыцці старасты асцёрскага так і не былі вернуты крэдытору, але ў пачатку 1594 г. у сваім тастаменце Лаўрын Ратамскі патрабуе ад сваіх дзяцей, каму ён запісаў бяларуцкія грунты ў спадчыну, выплаціць Макаровічу, на гэты час ужо суддзі земскаму менскаму, пазыку і вярнуць у сваё распараджэнне застаўленыя землі.

Лаўрын Ратамскі некалькі разоў уступаў у шлюб. Ад шлюбу з Зафеяй Юр’еўнай Тышкевічаўнай, ваевадзянкай берасцейскай, нарадзіўся сын Міхал, які аддзедзічыў (атрымаў у спадчыну. — *Ф. Ч.*) па бацьку не толькі староства асцёрскае, але і значную частку бацькоўскіх набыткаў. У гэтым жа шлюбе нарадзіліся і тры дачкі: Фядора, на час смерці бацькі яшчэ не ў шлюбе, Аляксандра, якая была ў шлюбе з Рыгорам Корсакам, і Зося, у шлюбе з Адамам Руцкім, пісарам земскім Мазырскага павета [1, арк. 471]. Як паведамляе А. М. Нарбут, Лаўрын Ратамскі браў шлюб і са

старэйшай дачкой Рыгора Друцкага Горскага і Тамілы з князёў Заслаўскіх, менавіта з Ганнай [12, арк. 111]. На нашу думку, шлюб доўжыўся нядоўга, і жанчына памерла пасля 1580 г., не пакінуўшы пасля сябе дзяцей. Неабходна заўважыць, што сам Лаўрын Ратамскі ў тастаменце аб гэтым шлюбе не згадвае.

Захаваліся сведчанні аб уступленні Лаўрына Ратамскага ў шлюб з Аленай Рыгораўнай Друцкай Горскай, адной з малодшых сясцёр Ганны. Для Алены Друцкай Горскай гэта быў другі шлюб, у першы шлюб яна ўступіла з Матэвушам Тышкевічам [12, арк. 111]. Як паведамлялася ў тастаменце Лаўрына Ратамскага, у шлюбе з Аленай, князёўнай Друцкай Горскай, нарадзіліся дочкі Гелена і Марына і сыны Канстанцін і Рыгор, якія яшчэ не дасягнулі «гадоў зупольных» (сталасці. — *Ф. Ч.*) [1, арк. 471–476]. Да 1607 г. яшчэ адна дачка Лаўрына Ратамскага, на жаль, імя яе не ўстаноўлена, уступіла ў шлюб з Янам Гарабурдам, крэўным былога кашталяна менскага.

Памёр Лаўрын Ратамскі, стараста асцёрскі, да 11 лютага 1594 г., менавіта ў гэты дзень праведзена актыкацыя яго тастамента, складзенага 7 лютага [1, арк. 471–476]. Лаўрын Ратамскі пастараўся забяспечыць пасля сваёй смерці спакойнае жыццё жонцы і дзецям. Апекунамі дзяцей, сярод якіх былі і непаўналетнія, ён прызначыў самых уплывовых людзей павета: Фёдара Друцкага Горскага, роднага брата жонкі, Багдана Саламярэцкага, старасту крычаўскага, Івана Фёдаравіча Быкоўскага, войскага менскага, параднёнага з Тышкевічамі, і Яраша Ваўчка.

Пасля смерці мужа Алена Друцкая Горская новы шлюб не ўзяла і працягвала самастойна кіраваць сваімі маёнткамі ў Айнаравічах. Па нейкіх прычынах гэтае сяло карысталася дрэннай славай. Неаднаразова на Айнаравічы нападалі суседзі і наносілі вялікія шкоды яе падданым. 7 жніўня 1595 г. у сяло ўварваўся натоўп менскіх месцічаў і дашчэнту зруйнаваў не толькі сядзібу самой пані, але і пабудовы яе падданых [40, арк. 36].

5 лістапада 1599 г. Алена Друцкая Горская Лаўрынавая Ратамская, старасціна асцёрская, склала фундушовы дакумент на чацвёртую частку маёнтка Качынскага, размешчанага ў Менскім павеце [36, арк. 236]. Дакумент быў перададзены Мікалаю Марысу, плябану менскаму. Падараванне прадвызначалася аднаму з менскіх касцёлаў, дзе быў пахаваны яе заўчасна памерлы сын Андрэй, народжаны ў яе першым шлюбе з Матэвушам Тышкевічам. Мікалай Марыс, а потым і іншыя асобы, «якія будуць ксяндзамі... у маленнях сваіх павінны прасіць выратавання» для яе і яе блізкіх крэўных. Крыху раней яна ў гэтым касцёле «алтар у хвалу богу збудавала».

Алена Лаўрынавая Ратамская, старасціна асцёрская, і ў пачатку XVII ст. працягвала кіраваць сваімі землямі, не перадаючы іх у вало-

данне не толькі дзецям мужа ад яго першага шлюбу, але і сваім дзецям. 5 ліпеня 1608 г. у каралеўскім асэсарскім судзе скончыўся разгляд справы, узбуджанай менскімі месцічамі супраць пані Лаўрынавай Ратамскай і яе сыноў. Як паведамлялася ў скарзе, старасціна асцёрская захапіла і працягвала ўтрымліваць у сваім распараджэнні дом з пляцам на вуліцы Няміжскай, размешчаны каля дома менскага бальвера (лекара, які лячыў травамі. — *Ф. Ч.*) Паўла Скаржэўскага. Некалі гэты будынак належаў сыну Гелены Друцкай Горскай ад яе першага шлюбу Андрэю Мацвеевічу Тышкевічу. 8 ліпеня 1593 г., верагодна перад смерцю, Андрэй Тышкевіч падараваў гэты дом вернаму слузе Крыштофу Антаневічу. Пасля смерці апошняга і яго сына дом перайшоў ва ўласнасць удавы па Крыштофу Антаневічу мінскай месцічцы Варушы Жабчанцы. Пані Варуша Антаневічавая 19 мая 1599 г. сваім тастаментавым запісам пакінула дом з пляцам менскім шпіталям, якія былі створаны пры манастырах царквы Святой Тройцы [28, арк. 39].

Старэйшы сын Лаўрына Канстанцінавіча Ратамскага, старасты асцёрскага, народжаны ў яго першым шлюбе, Міхал на 1598 г. быў жанаты на Гальшцы Шчаснай Харлінскай, якая належала да ўплывовага роду, што меў значныя зямельныя валоданні ў межах Аршанскага, Віцебскага, Кіеўскага, Мазырскага, Новагародскага і Рэчыцкага паветаў. Частка зямель Харлінскіх у Мазырскім павеце перайшла ў якасці пасагу Міхалу і Гальшцы Ратамскім [18, арк. 306]. Аб наяўнасці дзяцей у гэтай сям'і звестак няма.

Землі ў Трусавічах, атрыманыя Міхалам Ратамскім па тастаменце бацькі, былі абцяжараны пазыкамі, атрыманымі яшчэ пры жыцці Лаўрына Ратамскага, так і не вернутых яго нашчадкамі. Верагодна, што і ў старасціча асцёрскага не было дастаткова грошай, каб выплаціць усе пазыкі свайго бацькі. У пачатку жніўня 1595 г. пасля доўгіх і цяжкіх спрэчак Міхал Ратамскі адмовіўся ад некаторых зямель у гэтым паселішчы і ўступіў іх аднаму з крэдытораў Лаўрына Ратамскага, Мікалаю Зароскаму з Дамашэвічаў (цяпер Дамашы. — *Ф. Ч.*) [40, арк. 3]. Пасля 1594 г. Міхал Лаўрынавіч Ратамскі дабіўся атрымання каралеўскага прывілея на староства асцёрскае, якое некаторы час было ў распараджэнні караля пасля смерці яго бацькі, Лаўрына Канстанцінавіча Ратамскага.

У студзені 1600 г. Міхал Лаўрынавіч Ратамскі, стараста асцёрскі, і яго жонка Гальшка Шчасная Харлінская выклікалі вознага ў тую частку Трусавіч, якая належала ім. Возных выклікалі па розных прычынах кожны дзень, і каб справіцца з гэтай нялёгкай працай, у кожным павеце аднačасова працавала некалькі асобаў, якія мелі каралеўскі прывілей на выкананне сваіх абавязкаў. Возны павінен быў правесці агляд пані Зафеі Паўлаўны Сапяжанкі Андрэевай Тышкевічавай, кашталянкі кіеўскай [31, арк. 10]. Нас не здзівілі клопаты Ратамскіх аб стане старой жан-

чыны. Пасля смерці каля 1591 г. першага мужа Андрэя, сына Рыгора і Настассі Гарнастаеўны Сангушкаў Ковельскіх, яна ўступіла ў шлюб са зводным братам Міхала Лаўрынавіча, Андрэем Тышкевічам, які таксама заўчасна зышоў з гэтага свету да 1599 г. [12, арк. 81, 160]. У той жа час А. М. Нарбут паведамляе ў сваёй працы, што пані Зафея Сапяжанка, дачка Паўла Іванавіча, кіеўскага кашталяна, і Ганны Хадкевічаўны, сястра вядомага па ўдзеле ў вайне з Маскоўскім княствам Яна Пятра Сапегі, старасты ўсвяцкага, гетмана Ілжэдзмітрыя, памерла ў 1591 г. [12, арк. 160]. На нашу думку, А. М. Нарбут памыляецца, сястра старасты ўсвяцкага памерла значна пазней пазначанай ім даты.

Як і многія іншыя зямяне ВКЛ, якія належалі да дробнай і сярэдняй шляхты, Міхал Лаўрынавіч Ратамскі прыняў удзел у авантуры Ілжэдзмітрыя, які прэтэндаваў на маскоўскі трон. Падчас знаходжання ў акружэнні Самазванца, яшчэ да яго каранавання на царскі прастол у Маскве, Міхал Ратамскі пасябраваў з сакратаром будучага маскоўскага цара, менавіта са Станіславам Слонскім, дробным зямянінам са Слонімскага павета. На нашу думку, сяброўскія адносіны паміж Слонскім і Ратамскім доўжыліся нядоўга. Карыстаючыся сваім становішчам, Слонскі «браў паборы каштоўныя і золатам» і толькі пасля гэтага дапускаў жадаючых да размовы з «праваслаўным вялікім царом маскоўскім князем Дзмітрыем Іванавічам» [34, арк. 568–569 адв.]. Як можна зразумець з захаваных дакументаў Станіслаў Слонскі не рабіў выключэнняў нават для сваіх сяброў і гэтым моцна пакрыўдзіў Ратамскага. Задоўга да 5 кастрычніка 1605 г. Міхал Ратамскі, як аб гэтым паведамляе Станіслаў Слонскі, «ад цара Маскоўскага з вялікай выслугай выехаў».

Міхал Ратамскі вярнуўся дамоў, але прага помсты авалодала старастам асцёрскім. Даведаўшыся, што праз Менск у складзе вялікага пасольства ад Ілжэдзмітрыя да караля Рэчы Паспалітай едзе і Станіслаў Слонскі, Міхал Ратамскі вырашыў падпільнаваць былога сябра і абрабаваць яго [34, арк. 568–569 адв.]. Па нейкіх прычынах Слонскі адстаў ад пасольства, якім кіраваў Афанас Уласаў, і з невялікай аховай ехаў у Польшчу. «5 кастрычніка 1605 г., у сераду тую, перад світаннем, калі ён начаваў у Талачыне, дарогаю дабравольнаю, ноччу месячнай ехаў, даганяючы вялікага пасла». Людзі Міхала Ратамскага каля Трасцянца, які на той час знаходзіўся ў валоданні старасты асцёрскага, пераняглі на дарозе Станіслава Слонскага, «сакратара праваслаўнага, вялікага цара маскоўскага Дзмітрыя Іванавіча, маскоўскага пасла». Верагодна, Станіслаў Слонскі, аказаўшыся сярод натоўпу нападаючых, моцна спалохаўся, але, убачыўшы твары Турчыновіча і Плуцінскага, слуг Ратамскага, знаёмых з часоў сумеснага побыту ў Дзмітрыя, пачаў «лагодна з імі застанаўляцца». Спачатку Турчыновіч і Плуцінскі паабяцалі забіць сакратара і пасла Дзмітрыя, але потым, абвінаваціўшы яго ў неаднаразовых паборах з іх пана,

запатрабавалі выплаты 1500 чырвоных злотых. Забраўшы грошы і двух яго слуг, памочнікі Ратамскага адпусцілі Слонскага. Несумненна, што людзі Ратамскага пагадзіліся адпусціць Слонскага толькі пасля таго, як атрымалі ад яго абяцанне захоўваць гэтую падзею ў таямніцы.

У Менску сакратар і пасол «вялікага цара маскоўскага» адразу ж накіраваўся да Андрэя Мікалаевіча Станкевіча, судовага старасты і мастаўнічага менскага, патрабуючы абароны ад рабаўнікоў. Аднак патрэбнай абароны і пакарання вінаватых у грабяжы Станіслаў Слонскі не дачакаўся. Уся эліта Менскага павета аднадушна стала на абарону Міхала Ратамскага. Як толькі Слонскі выказаў намер унесці ў Менскія судовыя гродскія актавыя кнігі маніфест аб нечуваным у грамадстве злачынстве, да яго прыйшлі і сталі прасіць: Станіслаў Свірскі, падсудак земскі Ашмянскага павета, Пётр Тышкевіч, ваяводзіч берасцейскі, у будучым кашталян, а потым і ваявода менскі, Мікалай Вольскі, дэпутат Галоўнага Трыбунала ВКЛ, Пётр Зяневіч, суддзя земскі Рэчыцкага павета, Рыгор Макаровіч, суддзя земскі менскі, і Ян Гарабурда, швагер Міхала Ратамскага. Абаронцы Міхала Ратамскага прасілі Слонскага не падымаць у судах княства гэтую справу, абяцаючы праз адну ноч прывезці ўсе грошы. На працягу пяці дзён да Слонскага прыязджалі прыяцелі Ратамскага і «уніжана» прасілі спачатку пачакаць некалькі дзён, а потым толькі некалькі гадзін. Праз сваіх сяброў Міхал Ратамскі абяцаў Слонскаму вярнуць грошы, кожны раз выстаўляючы новыя прычыны немагчымасці ў гэты момант вярнуць нарабаванае. Аднак грошы так і не былі вернуты іх гаспадару. Станіслаў Слонскі страціў цярпенне і вырашыў падаваць у суд. Але без рызыкі для жыцця ён мог зрабіць гэта толькі ў сваім родным Слонімскім павеце, куды і выехаў, зняважаны не толькі стратай грошай, але і ашуканствам уладаў павета і самога Міхала Ратамскага. Нам невядома аб вяртанні Міхалам Ратамскім грошай Слонскаму.

У маі 1606 г. Міхал Ратамскі з дэлегацыяй ад Менскага павета прыязджаў у Маскву да Дзмітрыя для ўдзелу ў вяселлі маскоўскага ўладара з Марынай Мнішак, ваевадзянкай сандамірскай. Нягледзячы на своечасовае папярэджанне, новы маскоўскі цар і яго вяльможныя госці не прынялі неабходных мер перасцярогі і пасля паўстання жыхароў Масквы, распачатага ў суботу 17 мая, большая частка палякаў і літоўцаў, якія знаходзіліся ў Маскве, як і цар Дзмітрый, былі перабіты паўстанцамі. Міхал Ратамскі, як паведамляюць архіўныя крыніцы, цудам застаўся ў жывых. Ад немінучай смерці яго выратаваў царскі канюшы, верагодна добры знаёмы старасты асцёрскага. Самуэл Маскевіч паведамляў аб знаходжанні ў палоне добра вядомых на той час асоб: Мнішка, ваяводу сандамірскага, і яго сына, Канстанціна князя Вішнявецкага, Малагоскага, пасла Жыгімонта ІІІ на вяселле, і Міхала Ратамскага, старасту асцёрскага [47,

s. 5]. Новыя маскоўскія ўлады «ўзяўшы (іх) да вязення, на замкі розныя іх разаслалі». Пасля ўступлення на царскі прастол Шуйскага большасць польскіх і літоўскіх палонных, якія не пагадзіліся прыняць прысягу на вернасць новым маскоўскім уладам, разам з ваяводам сандамірскім, яго дачкой і сынам адправілі дамоў. Да дому яны, аднак, не даехалі. Ілжэдзмітрый II перахапіў былых вязняў і прымусіў іх прыбыць у яго стаўку пад Тушынам. Паведамленняў аб знаходжанні Міхала Ратамскага ў Тушыне, а потым і ў асадзе ў Маскоўскім Крамлі мы не знайшлі. Не сустракаюцца ўпамінанні пра старасту асцёрскага і ў лістах на радзіму ад ваяроў, вязняў Маскоўскага Крамля.

Міхал памёр да 21 красавіка 1626 г., знаходзячыся ў маскоўскім палоне [19, арк. 148 адв.]. Неабходна мець на ўвазе, што ў ВКЛ лічылі вязнямі і тых, хто, страціўшы веру ў дапамогу сваёй Радзімы ў вяртанні дамоў, пагаджаўся прыняць прысягу і станавіўся на службу маскоўскім уладам. Не выключана, што Міхал Ратамскі, страціўшы надзею на выкуп з палону, прыняў прысягу на вернасць Маскве і памёр далёка ад родных мясцін, дасягнуўшы глыбокай старасці.

Пані Гальшка Харлінская Міхалавая Ратамская, старасціна асцёрская, жыла яшчэ ў 1610 г. У гэты час унутрысямейныя адносіны ў Ратамскіх абвастрыліся настолькі, што яна вымушана была звярнуцца да Жыгімонта III аб ахове ад варожых дзеянняў крэўных. 28 верасня гэтага ж года яна атрымала ад караля ахоўны ліст [29, арк. 48 адв.]. Гальшка тлумачыла, што яе муж, «які на паслузе нашай будучы, праз масквіціна, па забойстве Дзмітрыя, у вязенне непрыяцельскае маскоўскае ўзяты быў». Не чакаючы вяртання Міхала Ратамскага дамоў, яго маетнасці ў розных паветах і ваяводствах ВКЛ крэўныя яе мужа паспрабавалі «бяспраўна» забраць. Мала таго, яны пачалі «на яе здароўе отпаведзі і пахвалкі (пагрозы на жыццё. — *Ф. Ч.*) чыніць». У дакуменце ўпамінаюцца Сузанна Канстанцінавічаўна і брат мужа Рыгор Лаўрынавіч Ратамскія. Суд пастанавіў адкласці вырашэнне справы да вяртання з вязення Міхала Лаўрынавіча Ратамскага.

Калі пра нашчадкаў гараднічага менскага захавалася дастаткова дакументаў, неабходных для складання жыццяпісу, то інакш атрымалася ў адносінах да яго крэўных, менавіта дзяцей брата і сястры. У нашы рукі трапіла толькі адно паведамленне пра пляменніка Яцкі Ратамскага, пра Дзмітрыя Сямёнавіча Ратамскага. У жніўні 1550 г. ён сведчыць заставуны запіс Яна Карэйвы, які атрымаў у часовае карыстанне каштоўныя «шаты» (адзенне. — *Ф. Ч.*), Андрэю Сямёнавічу Адзінцэвічу на адну службу людзей [22, арк. 438].

У канцы XVI ст. у ВКЛ жылі не толькі нашчадкі Яцкі Ратамскага і яго крэўных. У межах Менскага павета адзначана пражыванне Ратамскіх, якія, на нашу думку, паходзілі не ад былога гараднічага менскага.

15 красавіка 1547 г. Гаўрыла Фёдаравіч Ратамскі ўнёс у каралеўскі суд дакумент аб неабходнасці пільнасці ў адносінах да яго крэўнага Івана Андрушавіча Ратамскага. Некалі Іван Ратамскі на некаторы час атрымаў ад Гаўрылы Фёдаравіча каня гнядога, так званага «паходніка» (які выкарыстоўваецца толькі ў выпадку вайсковых паходаў. — *Ф. Ч.*) і не вярнуў у абумоўлены тэрмін. Напамінанні аб неабходнасці вяртання «паходніка» не далі вынікаў і, нават на суд стрыечны брат не збіраўся. На нашу думку, атрыманне каня з'яўлялася пачаткам складанай камбінацыі, якая павінна была ў канчатковым выніку прывесці Івана Андрушавіча да вырашэння на сваю карысць даўніх непаразуменняў, што ўзніклі з братам па валоданні спадчыннымі землямі. Вяртанне каня стрыечны брат Гаўрылы абумоўліваў вяртаннем яму часткі гэтых зямель, якія, на яго думку, бяспраўна ўтрымліваліся Гаўрылам Фёдаравічам Ратамскім [20, арк. 175]. Сярод павятовай шляхты Гаўрыла Ратамскі быў даволі вядомай і аўтарытэтнай асобай. Яго імя і прозвішча ў канцы 50-х гг. XVI ст. неаднаразова сустракаюцца ў спісах суддзяў, якія разам з віленскім намеснікам удзельнічалі ў разглядзе судовых спраў.

Нам сустрэлася толькі адно паведамленне пра нашчадкаў Пятра (Пятрашкі) Ратамскага. У лістападзе 1559 г. у гаспадарскі суд паскардзілася жонка Давыда Тоўкача (Таўкачэвіча) Гаянскага на Андрэя і Богуша Пятрашкавічаў Ратамскіх. Сабраўшы дастатковую колькасць падданых, браты наехалі на яе ўласную пушчу і «пачынілі (нанеслі) шмат шкод, старыя межавыя знакі зруйнавалі і ўстанавілі новую мяжу», якая на погляд братоў больш адпавядала іх патрэбам [16, арк. 840 адв.].

Яшчэ адзін прадстаўнік роду Ратамскіх, Аляксандр Рыгоравіч, знаходзіўся на службе ў Юрыя Карыбутавіча Збаражскага, крайчага кароннага, судовага старасты пінскага. Аляксандр Ратамскі нарадзіўся ў сям'і Рыгора і Людмілы Барэйкаўны. Рыгор Ратамскі памёр да 8 студзеня 1567 г. Улічваючы ваенныя заслугі Рыгора Ратамскага перад краінай Жыгімонт Аўгуст прывілеем пацвярджае дажыватныя правы ўдавы на Столін (32, л. 232). Людміла Барэйкаўна Рыгоравая Ратамская памерла ў 1595 г., але змагла дабіцца атрымання каралеўскага прывілея на пераход Століна ў валоданне сына і яго нашчадкаў.

Аляксандр Рыгоравіч Ратамскі карыстаўся вялікай павагай і даверам князя Збаражскага. Яшчэ да 8 снежня 1591 г. Ратамскі атрымаў прызначэнне ад старасты судовага пінскага на заняцце пасады падстарасты судовага гродскага Пінскага павета і ў яго адсутнасць кіраваў штодзённай працай гродскага, або старасцінскага, суда гэтага павета [4, с. 58]. За сваю адданую службу князь Збаражскі добра ўзнагародзіў Ратамскага. У 1596 г. Аляксандр Ратамскі атрымаў каралеўскі прывілей на валоданне ленным правам землямі ў межах Пінскага павета [16, арк. 87]. Не выключана, што ў склад гэтых зямель уваходзіла і сяло Броніца. Адным са

сваіх запісаў стараста судовы пінскі непрадбачліва перадаў землі гэтага сяла свайму адданаму слузе і дабіўся атрымання каралеўскага прывілея, які пацвердзіў тое наданне. Пасля смерці Аляксандра Рыгоравіча Ратамскага, якая адбылася да 1614 г., Юрый Збаражскі паспрабаваў вярнуць у сваё валоданне землі сяла Броніцы [30, арк. 249, 255]. Па загаду старасты судовага Пінскага павета Ельскія ўчынілі наезд на Броніцу і паспрабавалі замацаваць гэтае сяло за Збаражскім. Загад Ельскія выконвалі з вялікай ахвотай: стараста судовы Пінскага павета перадаў пасаду падстарасты судовага гродскага пінскага ў пажыццёвае трыманне Мікалая Рыгоравіча Ельскага. Аднак далей справы пайшлі не так, як спадзяваліся Збаражскі і яго памочнікі. Сабраўшы натоўп шматлікіх слуг і падданых, Ратамскія і апекуны жонкі і дзяцей памерлага падстарасты судовага гродскага Пінскага павета выбілі Ельскіх з сяла і звярнуліся ў суды княства за справядлівым вырашэннем сваіх крыўд. У суды Пінскага павета, улічваючы ўплыў Збаражскага, Ратамскія не звярталіся, а свае скаргі падавалі ў суды Слонімскага павета і ў Галоўны Трыбунал ВКЛ. Па тастаменту Аляксандра Ратамскага сяло Броніца павінна было перайсці ў якасці пасагу ў валоданне яго дачкі Раіны, якая была ў шлюбе з Іванам Гадэбскім. Суды княства ўсклалі на Ельскіх пакаранне памерам у 20 коп грошай лічбы літоўскай за гвалтоўны наезд на Броніцу і пакінулі сяло за Гадэбскімі. Справа цягнулася яшчэ болей чым 70 гадоў. Спачатку гэтай справай займаўся сам Юрый Збаражскі, а потым яго спадчыннікі. Апошні вядомы нам дэкрэт Галоўнага Трыбунала ВКЛ па гэтай справе быў прыняты 26 мая 1689 г. І на гэты раз суд прызнаў правы Базыля Гадэбскага, сына Івана і Раіны Аляксандраўны Ратамскай Гадэбскіх, на Броніцу. Базыль Гадэбскі, лоўчы пінскі, на наступны дзень пасля прыняцця дэкрэта, менавіта 27 мая гэтага ж года, правёў актыкацыю ў актавых кнігах Галоўнага Трыбунала ВКЛ дароўнага запісу на Броніцу, складзенага яшчэ 9 студзеня 1689 г., сваёй жонцы Апалоніі Ігнатоўскай [30, арк. 261].

Калі Броніца перайшла ў валоданне дачкі Раіны, то Столін па тастаментаваму запісу бацькі знаходзіўся ў валоданні сына падстарасты судовага гродскага пінскага Самуэла Аляксандравіча Ратамскага. Пасля смерці апошняга на Столін у 1629 г. прад'явіў прэтэнзіі Раман Ельскі, які змог атрымаць каралеўскі прывілей на пераход сяла ў сваё пажыццёвае валоданне. Крыштоф Завіша і Яраш Пузына, апекуны дзяцей Самуэла Ратамскага, жанатыя на яго крэўных адпаведна Ганне і Марыі Ратамскіх (не выключана, што гэта былі дочкі Аляксандра Ратамскага. — *Ф. Ч.*), звярнуліся ў суды княства і дабіліся прызнання першапачатковага каралеўскага прывілея аб пераходзе Століна ў карыстанне дзяцей Самуэла Ратамскага. Зразумела, што бацька Аляксандра Рыгоравіча не мог нарадзіцца ў сям'і Лаўрына Ратамскага. Канстанцін і Рыгор Лаўрынавічы

Ратамскія былі народжаны ў другім шлюбе старасты асцёрскага і дасягнулі паўналецця толькі пасля 1594 г.

З цягам часу Ратамскія страцілі землі ў Ратам'і і асноўныя іх зямельныя ўладанні аказаліся ў межах Аршанскага, Ашмянскага і Пінскага паветаў ВКЛ. На нашу думку, гэты працэс пачаўся яшчэ ў канцы XVI ст. 1 красавіка 1594 г. возны менскі Ждан Сенніцкі выязджаў у Ратам'е для ўвязання (увядзення) у валоданне землямі ў сяле Мікалая Пузакевіча, які набыў іх у Васіля Ратамскага [39, арк. 160].

## Крыніцы і літаратура


1. Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне (далее — АВАК). — Т. 8: Акты Виленского гродского суда (1755–1790). — Вильно, 1875.
2. Акты, относящиеся к истории Западной Руси, собранные и изданные археографической комиссией. 1506–1544. — Т. 2. — Санкт-Петербург, 1848.
3. Акты, относящихся к истории Северо-Западной Руси, собранные и изданные археографической комиссией. — Т. 4. — Вильно, 1867.
4. Акты, относящихся к истории Северо-Западной Руси, собранные и изданные археографической комиссией. — Т. 6. — Вильно, 1869.
5. Lietuwos Metrika. Knyga 8/8 (1499–1514). — Vilnius, 1995.
6. Lietuwos Metrika. Kniga 9/9 (1511–1518). — Vilnius, 2002.
7. Lietuwos Metrika. Knyga 10/10 (1440–1523). — Vilnius, 1997.
8. Lietuwos Metrika. Knyga 11/11 (1518–1523). — Vilnius, 1997.
9. Lietuwos Metrika. Knyga 12/12 (1522–1529). — Vilnius, 2001.
10. Lietuwos Metrika. Knyga 51/51 (1566–1574). — Vilnius, 2000.
11. Lietuwos Metrika. Knyga 224/4 (1522–1530). — Vilnius, 1997.
12. Нарбут, А. Н. Генеалогия Белоруссии. Выпуск 2 (XVI–XVIII вв.). – Москва, 1994.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ у Мінску). — КМФ 18 (Калекцыя мікрафільмаў «Літоўская метрыка»). — Воп. 1. — Спр. 4. — Кніга судовых пастаноў, дамоў на арэнду мыт, данін і пацвярджэнняў, складзеная падчас праўлення караля Казіміра, 1479–1490 гг.
14. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 14. — Кніга розных спраў і лістоў паточных, складзеная падчас праўлення караля Жыгімонта І, 1524–1529 гг.
15. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 21. — Кніга розных спраў, запісаных падчас візіта караля Жыгімонта І у Кракаў, 1536–1537 гг.
16. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 40. — Кніга Віленскага земскага суда, складзеная падчас канцлерства Мікалая Радзівіла Чорнага, маршалка земскага і ваяводы віленскага, 1558–1559 гг.
17. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 83. — Прывілеі, пацвярджэнні і пажалаванні, 1596–1598 гг.

18. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 84. — Прывілеі, пацвярджэнні і пажалаванні, 1596–1601 гг.
19. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 99. — Прывілеі на розныя пасады, староства, арэнды і пажалаванні ў ВКЛ, 1623–1631 гг.
20. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 233. — Кніга Віленскага замкавага суда, складзеная падчас канцлерства Яна Юр'евіча Глябовіча, 1546–1548 гг.
21. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 237. — Кніга Віленскага замкавага суда, складзеная пры Іване Гарнастаі, спраўцы абавязкаў ваяводы віленскага, 1549–1551 гг.
22. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 238. — Кнігі спраў судовых, складзеныя намеснікам віленскім Багданам Андрэевічам Эпімахам паводле загаду Івана Гарнастая, спраўцы абавязкаў ваяводы віленскага, і запісаныя дзякам Іванам Салтанавічам, 1549–1551 гг.
23. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 239. — Кніга спраў судовых, складзеная каралеўскім сакратаром Станіславам Якубавічам Камароўскім паводле загаду караля Жыгімонта ІІ Аўгуста, 1551 г.
24. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 242. — Кніга Віленскага замкавага суда, складзеная пры Іване Гарнастаі, спраўцы абавязкаў ваяводы віленскага, і падчас канцлерства Мікалая Радзівіла Чорнага, маршалка земскага і ваяводы віленскага, 1551–1552 гг.
25. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 243. — Кніга Віленскага замкавага суда, складзеная падчас канцлерства Мікалая Радзівіла Чорнага, маршалка земскага і ваяводы віленскага, 1551–1552 гг.
26. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 245. — Кніга Віленскага замкавага суда, складзеная падчас канцлерства Мікалая Радзівіла Чорнага, маршалка земскага і ваяводы віленскага, 1553–1554 гг.
27. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 251. — Метрыка спраў судовых і пацвярджэнняў, складзеная падчас праўлення караля Жыгімонта І, 1555–1558 гг.
28. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 292. — Метрыка спраў судовых і пацвярджэнняў, складзеная падчас канцлерства Льва Сапегі, 1608–1612 гг.
29. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 293. — Сублевацыі, баніцыі, ахоўныя граматы, выдадзеныя ў час панавання караля Жыгімонта ІІІ, падчас канцлерства Льва Сапегі, 1609–1616 гг.
30. НГАБ. — Ф. 1702 (Галоўны Трыбунал ВКЛ). — Воп. 1. — Спр. 2. — Актавая вячыстая кніга, 1689 г.
31. НГАБ. — Ф. 1727 (Менскі гродскі суд). — Воп. 1. — Спр. 1. — Актавая паточная кніга Менскага гродскага суда, 1600 г.
32. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 13. — Актавая паточная кніга Менскага гродскага суда, 1758–1764 гг.
33. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 23. — Актавая паточная кніга Менскага гродскага суда, 1784 г.

34. НГАБ. — Ф. 1737 (Слонімскі гродскі суд). — Воп. 1. — Спр. 8. — Актавая паточная кніга Слонімскага гродскага суда, 1605 г.
35. НГАБ. — Ф. 1769 (Менскі земскі суд). — Воп. 1. — Спр. 9. — Актавая паточная кніга Менскага земскага суда, 1777–1779.
36. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 10. — Актавая паточная кніга Менскага земскага суда, 1779–1780.
37. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 15. — Актавая паточная кніга Менскага земскага суда, 1784.
38. НГАБ. — Ф. 1926 (Павятовыя камісіі па праверцы актавых і метрычных кніг). — Воп. 5. — Спр. 1. — Рэестр дакументаў актавых кніг Менскага гродскага суда № 11765–11766, 1582–1596 гг.
39. НГАБ. — Ф. 1926. — Воп. 5. — Спр. 2. — Рэестр дакументаў актавых кніг Менскага гродскага суда № 11767–11768, 1593–1594 гг.
40. НГАБ. — Ф. 1926. — Воп. 5. — Спр. 3. — Рэестр дакументаў актавых кніг Менскага гродскага суда № 11769, 1595 г.
41. Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. — Т. II. — «Выписки из посольских книг» о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1547–1572 гг. / Ред. кол. И. Граля, М. Дыго, М. Нагельский, И. А. Тихонюк, Б. Н. Флоря, Ю. М. Эскин. — Москва–Варшава: Археографический центр, 1997.
42. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. — Кніга 523. — Кніга публічных спраў 1. — Мінск: Беларуская навука, 2003.
43. Русская историческая библиотека, издаваемая Императорской археографической комиссией: В 33 т. — СПб., 1872–1927. — Т. XX. (Ав. Сост. С. А. Бершадский) / Под ред. П. А. Гильдебрандта. — СПб., 1904; Литовская Метрика. — Отд. 1. — Ч. 11. — Книги судных дел. — Т. 1 (Книги судовых спраў): (221) (1510–1517); 2: (222) (1506–1522); 3 (223) (1518–1522).
44. Нарбут, А. М. Гаштольды / А. М. Нарбут // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 2. — Мінск, 1994. — С. 500.
45. Заяц, Ю. Глябовічы / Ю. Заяц // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 3. — Мінск, 1996. — С. 53–54.
46. Спірыдонаў, М. Татарскія набегі на Беларусь / М. Спірыдонаў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 6. — Ч. 1. — Мінск, 2001. — С. 507–508.
47. Dyaryusz Samuela Maskewicza. — Wilno, 1837.
48. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. — Spisy. — T. 1. — Województwo wileńskie XIV–XVIII wiek. / red. A.Rachuba. — Warszawa, 2004.
49. Uruski, Seweryn. Rodzina. Herbarz szlachty Polskiej. — T. XV / Opr. A. Włodarski. — Warszawa, 1931.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 09.03.2013

*А. І. Шаланда*

# Гербавыя пячаткі роду Быхаўцаў XVII–XVIII стст. (па матэрыялах НГАБ у г. Гродна)

Род Быхаўцаў паходзіў са Смаленскай зямлі, але прозвішча сведчыць пра тое, што родапачынальнік быў ураджэнцам Быхава. У 1510 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Стары надаў родным братам Васілю і Ваську Мітковічам Быхаўцам, смаленскім баярам 12 незаселеных вёсак у Дарсунішскім павеце, а ў 1514 г., відаць, пасля страты Смаленска, дадаў Ваську яшчэ 8 вёсак. Трэці іх брат Андрэй Мітковіч Быхавец, дваранін ЯКМ у 1536 г. ад таго ж Жыгімонта Старога атрымаў розныя землі ў Троцкім павеце [1, s. 18]. Барташ Папроцкі першым згадаў Быхаўцаў, праўда, з перакручаным прозвішчам: «Bichowscy w trockiem», а іх герб назваў «Магілай» [2, s. 867]. Войцах Віюк Каяловіч зафіксаваў Быхаўцаў ужо як у Троцкім, так і ў Менскім ваяводствах, а пра герб удакладніў, што яны ўжывалі «Mogiły ze dwiema krzyżami» [3, s. 168]. Так у гербоўніках за гербам Быхаўцаў замацавалася назва «Магіла», якая тлумачыла іх клейнавы гербавы знак. У сваю чаргу, Каспар Нясецкі прыйшоў да памылковай думкі, што «Быхаўцы герба Магіла» і жамойты Білевічы таксама герба «Магіла» — адзін род [4, т. 2, s. 374]. Працуючы з дакументамі родавага архіва Быхаўцаў, якія сёння захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродна (ф. 1664, воп. 1), нам трапіліся шэсць адбіткаў гербавых пячаткаў прадстаўнікоў згаданага роду, жыўшых у XVII–XVIII стст.

**(1).** ***Быхавец Юстына***, зямянка гаспадарская Ваўкавыскага павета, 1653 г.

**Герб**: на тарчы чатырохкутнік з простымі крыжамі, якія выходзяць зверху і знізу, над тарчай гелм з каронай, у кляйноце тры пёры стравуса, вакол тарчы намёт, па баках кляйнота ініцыялы: «I[ustyna] B[ychowiec]».

**Пячатка**: адбітак, фігурная кустодзея, 10x11 мм, кепская захаванасць [5, арк. 1 адв.].




14 кастрычніка 1653 г. у Хруставе Юры Крыштафавіч Алендскі, суддзя земскі ваўкавыскі запячатаў пячаткай жонкі Юстыны Быхавец свой асабісты ліст да Базыля Быхаўца. Падпісаўся: «Jerzy Olendsky S: Z: W: mp». У гэтым жа лісце Ю. Быхаўцова Алендская зрабіла ад сябе прыпіску, дзе назвала Базыля Быхаўца стрыем. Падпісалася: «JBOlendska».

Згаданы ў лісце Базыль Быхавец быў віленскім гродскім пісарам у 1623–1632 гг. [6, s. 135]. У 1622–1628 гг.

ён судзіўся з Андрэем Вінкам па справе аб межах іх маёнткаў Таўкачэвічы і Шацк у Менскім ваяводстве. Апошні абвінавачваў Базыля ў тым, што «пан Быховец на поедынок его п[а]на Винка вызывалъ отповед и похвалку чынилъ» [7, арк. 2 адв.]. У 1640–1645 гг. меў судовую справу з Аляксандрам Кярдзеевічам Замайскім аб доўгу ў памеры 627 злотых польскіх [8, арк. 1; 9, арк. 1–2; 10, арк. 1–1 адв.]. Займаўся гаспадаркай, вырабляў з лесу «wanczos, pyple y tarcice», вёў гандлёвыя і фінансавыя справы ў Вільні і Караляўцы (Прусія) [11, арк. 1 адв.; 12, арк. 1; 13, арк. 1]. У 1641 г. (па стане на 27 ліпеня) валодаў маёнткамі Бакшты, Кавалевічы, Сяргеевічы, Таўкачэвічы, Хатляны, Касцюковічы і Грэбені ў Менскім ваяводстве (77 валокаў) [14, арк. 1]. 13 ліпеня 1647 г. Базыль Быхавец заставіў на тры гады за 2000 злотых польскіх Гераніму Дзежыцу, лідскаму мечніку маёнтак Падаўгі ў Троцкім ваводстве [15, арк. 1–4]. У 1651 г. валодаў у тым жа Менскім ваяводстве маёнткам Сідаровічы [16, арк. 1]. Памёр без нашчадкаў пасля 14 кастрычніка 1653 г. Роднымі братамі Базыля Быхаўца былі Януш і Аляксандр Пракоп [7, арк. 2; 17, арк. 1; 18, арк. 1]. Бацька іх нам не вядомы.

***Януш Быхавец*** меў за жонку княжну Ганну Друцкую Горскую, маршалкоўну аршанскую, памёр да 8 мая 1622 г. Валодаў купленымі маёнткамі Таўкачэвічы (з 1617 г.) і Грэбені Дудзічы (з 1621 г.) у Менскім ваяводстве [19, арк. 1; 20, т. 2, s. 271]. У 1616–1621 гг. трымаў арэндай у суме 5000 злотых польскіх маёнтак Шацк у тым жа ваяводстве ад князя Аляксандра Галаўчынскага, ваяводы мсціслаўскага [21, арк. 1]. Пасля смерці Януша Таўкачэвічы і Грэбені Дудзічы адышлі да брата Базыля, які быў апекуном яго дзяцей: сына Яна і дачкі Леаноры [22, арк. 3]. Апошняя ў 1638 г. выхоўвалася ў віленскім кляштары Святой Кацярыны [23, арк. 1]. У 1645 г. згадваецца братам Янам як законніца рэгулы Святога Бенядыкта віленскага кляштара Святой Кацярыны [24, арк. 1].

***Аляксандр Пракоп Быхавец*** меў за жонку Зоф'ю Белазор, падкамаранку ўпіцкую (бралі шлюб у Вільні 4 лютага 1646 г.) [17, арк. 1; 25, арк. 1; 26, арк. 1–4]. Валодаў маёнткамі Каралёў Мост у Гарадзенскім павеце (1625 г.), Падаўгі ў Троцкім павеце (1626 г.), Грэбені Дудзічы з вёскамі Дудзічы, Церабелі, Сяргеевічы і Кабылічы (1646 г.) [27, арк. 1; 28, арк. 1; 29, арк. 1]. Памёр да 29 1646 г., калі жонка аддала рухомыя рэчы нябошчыка Базылю Быхаўцу. Сярод іх былі: «Ornat Biały tabinowy zstułą y Manipularzem z Herbem Niebosczykowskim, Ornat Czerwony Adamaszkowy zstułą Manipularzem y z Herbem Niebosczykowskim, ... Mszał Rzym.[ski], Kielich srebrny złocisty z pateną na ktorym Herb niebosczykowski...» [30, арк. 1, 2]. Звернем увагу на тое, што аўтар згаданага рэестру — сам Базыль Быхавец — не называе герб брата «Магілай». У сувязі з гэтым, або такую назву свайго герба ў 1646 г. Быхаўцы яшчэ не ўжывалі, або пад «гербам нябошчыка» Базылём ра-

зумеўся асабісты складаны герб Аляксандра Пракопа Быхаўца, што малаверагодна.

Калі зыходзіць з таго, што Юстына Быхавец з мужам у лісце пытаюцца ў Базыля Быхаўца пра праўдзівасць чутак: «jakoby (czeo Boże uchoway) steo swiata miała ustąpic do gurnich niebieskjch pałacow panna Bychowcowa Synowica Wm meo ... pana A curka ... pani Stetkiewiczowey Chorązyney Pinskiey [1] ...» [5, арк. 1], то тады Аляксандр Пракоп Быхавец з Зоф’яй Белазор меў дачку. Пасля смерці мужа Зоф’я да 7 красавіка 1650 г. другі раз выйшла замуж за Вільгельма Стэткевіча, харужага менскага [2] [32, арк. 1].

Юстына Быхавец, як пляменніца Базыля Быхаўца, магла быць толькі старэйшай дачкой Януша Быхаўца. Яшчэ пры жыцці бацькі яна была выдадзена замуж за Юрыя Алендскага. Яе гербавая пячатка дае ўяўленне аб сапраўдным кляйноце ўласнага герба Быхаўцаў.

**(2).** ***Быхавец Самуэль Дабрагост Банавентура***, зямянін гаспадарскі Ваўкавыскага павета, староста люцынскі, 1695 г.

**Герб**: на тарчы два чатырохкутнікі, упісаныя адзін у адзін, зверху і знізу большага выходзяць два простыя крыжы, над тарчай карона, па баках тарчы дзве галінкі, перавязаныя ўнізе, надпіс у атоку пячаткі: «+ SAMUEL ◦ BYCHOWIEC STAROSTA • LUCINSKI».

**Пячатка**: адбітак, прамакутная кустодзея, 26х32 мм, выдатная захаванасць [33, арк. 1].




24 кастрычніка 1695 г. у Лыскаве Самуэль Дабрагост Быхавец, староста люцынскі склаў кантракт з гарадзенскім мулярам Балтрамеем Гадэвічам на пабудову ў двух яго лыскоўскіх дамах склепа, коміна, печы і выбрукоўку сяней за 150 злотых польскіх і пракорм. Падпісаўся: «Samuel Dobrogost Bychowiec SL mp».

Самуэль Дабрагост быў сынам ***Яна Янушавіча Быхаўца***, стольніка віцебскага і Крыстыны Войны [34, арк. 1]. Як было сказана вышэй, Ян Янушавіч пасля смерці бацькі выхоўваўся апекуном — стрыем Базылём Быхаўцам. У маладосці ён вучыўся ў Віленскім езуіцкім калегіуме і Акадэміі, быў «namowiony do zakonu Jchmscow Oycow Soietatio Jesu w Wilnie y mieszkałem miedzy nimi lat kilka», аднак хутка пакінуў ордэн, бо «nie miał do niego powołania Bożego» [24, арк. 1–1 адв.]. У

---

[1] Тут памылка, трэба «*Mińskiej*».

[2] Паводле Тэадора Жыхлінськага, Зоф’я Белазор, дачка Станіслава, падкаморыя ўпіцкага першы раз была замужам за Вільгельмам Стэткевічам, а другі раз — за Людвікам Зэльскім [31, s. 8]. На самой справе гэта былі яе другі і трэці шлюбы.

1652 г. (па стане на 10 ліпеня) Ян Быхавец валодаў у Менскім ваяводстве маёнткам Таўкачэвічы з вёскамі Таўкачэвічы (57 дымоў), Хатляны (76), Кавалевічы (35), Любячы (14), Касцюковічы (18) — усяго 200 дымоў [14, арк. 2]. У 1656 г. загінуў у бітве са шведамі пад Варшавай [35, т. 2, s. 103]. 12 жніўня таго ж года жонка была ўведзена ў валоданне маёнткам Таўкачэвічы «po zabitym podczas Batalij mężu Janie Bychowcu» [36, арк. 1 адв.].

Маці Самуэля Дабрагоста Быхаўца — Крыстына Феліцыяна была адзінай дачкой Лукаша Андрэевіча Войны (†1650 г.), харужага Ваўкавыскага павета і Ізабэлі Аляксандраўны Масальскай (†1673 г.), кашталянкі берасцейскай (2v. Уладзіслаў Казаноўскі; 3v. Крыштаф Марцінавіч Валадковіч, ваявода наваградскі). Пасля смерці Яна Быхаўца Крыстына другі раз выйшла замуж за Якуба Тэадора Кунцэвіча, ваяводу берасцейскага, старосту каняўскага і дубіцкага (1663 г.) [20, т. 2, s. 271; 37, арк. 3 адв.; 38, s. 180, 182]. Памерла да 26 студзеня 1685 г. [39, арк. 1].



Самуэль Дабрагост Банавентура Быхавец быў спярша падчашым менскім (1676 г.) і старостай люцынскім (1678 г.), пазней — стольнікам менскім (1698 г.). Ён першым з Быхаўцаў у канцы XVII ст. пераехаў у Ваўкавыскі павет з Менскага ваяводства — паводле вячыстага запісу маці ад 20 студзеня 1676 г. Самуэль Дабрагост атрымаў тут маёнтак Лыскава [40, арк. 3 адв.]. У 1685 г. з паловы Лыскава выплаціў 115 злотых «tylko od głow prostego stanu» [41, арк. 8]. Другая палова дзякуючы падзелу 19 мая 1685 г. належала яго роднаму брату Якубу Дамініку Кунцэвічу, ваяводзічу берасцейскаму [42, арк. 1 адв.]. Але ў 1690 г. Самуэль Дабрагост валодаў ужо ўсім лыскаўскім маёнткам з мястэчкам Лыскава, з жыдамі, з карчмой і двума млынамі (33 дымы), з Лыскаўскай воласцю (60) — усяго 93 дымы [38, s. 182; 43, арк. 1–1 адв.]. Як сведчыць вадзяны знак на паперы кантракта 1695 г., менавіта Самуэль Дабрагост Быхавец з’яўляўся заснавальнікам лыскаўскай паперні [3].

Таксама ў Лідскім павеце Самуэль Дабрагост меў маёнтак Глыбокае з вёскамі Раганічы, Галоўцы, Ляхаўцы і Савічы — усяго 31 дым [45, s.216]. Гэта была ўласнасць яго жонкі — Крыстыны Дэнгоф, кашталянкі віцебскай, дачкі Яна Дэнгофа, цівуна віленскага, кашталяна віцебскага і Ганны Крышкоўскай, харужанкі віленскай [46, арк. 1–1 адв., 4–4 адв., 5]. Акрамя гэтага, як вынікае з дзельчага ліста ад 31 жніўня 1682 г., паміж сёстрамі Марыянай і Крыстынай Дэнгофаўнамі, кашталянкамі віцебскімі, з матчыных маёнткаў апошняя разам з мужам Самуэлем

---

[3] Вадзяны знак уяўляў сабой тарчу, падзеленую на дзве часткі, дзе ў правай быў герб Быхаўцаў «*Магіла*», а ў левай — уласны герб Дэнгофаў (гл. мал.) [44, с. 100].

Дабрагостам Быхаўцам атрымала Шацк у Менскім і Рагачы ў Берасцейскім ваяводствах [47, арк. 2–2 адв.]. У Горадні Самуэль Дабрагост валодаў дваром на вуліцы Залатой. Ён быў на пляцы, купленым 10 чэрвеня 1691 г. у ксяндза Паўла Хмялеўскага, Яна Гамоцкага і яго жонкі Марыяны Дзіваўны за 1100 злотых [48, арк. 1; 49, арк. 1–2].

Некалькі разоў Самуэль Дабрагост Быхавец асуджаўся на баніцыю. Як сведчыць баніцыйны ліст караля польскага і вялікага князя літоўскага Яна III Сабескага ад 15 сакавіка 1689 г., першы раз — па справе са Стэфанам Багушэвічам, падчашым аршанскім. Яго разам з Юрыем Лукомскім, войскім віцебскім, войтам менскім і Станіславам Клакоцкім суд задворны асэсарскі «яко вечных банитов на инфамию, на горло и на лапане… на вечное зо всих земль и панств нашых выволане всказал…» [50, т. 2, с. 150; 51, арк. 1]. Але да выканання выраку справа не дайшла. Тым не менш Самуэль Дабрагост, відаць, па гэтай прычыне выехаў са сваіх маёнткаў Таўкачэвічы і Сяргеевічы Менскага ваяводства ў Ваўкавыскі павет. Другі раз ён быў абвешчаны банітам па справе з Янам Антоніем Сахоцкім, лідскім стражнікам і яго жонкай Канстанцыяй Валішэўскай (1v. Даніэль Спасоўскі) судовым дэкрэтам ад 30 красавіка 1700 г. [34, арк. 3, 8]. Справа цягнулася аж да самай смерці Самуэля Дабрагоста, які памёр 3 кастрычніка 1709 г., пакінуўшы сыноў Яна, Уладзіслава, Людвіка і Міхала (†1726 г.) Быхаўцаў [42, арк. 1–2 адв.; 52, арк. 46].

Сярод рэчаў у рэестры, падпісаным самім Самуэлем Дабрагостам Быхаўцам у 1678 г., згадваюцца: «...spraw fastykułow 4 roznych...; ...Xiąg Wielkich 6; małych 10; Officium Wielkie z srebnemi clausurami przy ktorym gwiazd srebnych 10; Xięga do Pisania oraty ect; ...Szkatuła wielka ze sprawami roznemi; szkatułła kałamarzowa w ktorey Pieczęc srebna, nożyczki ect; Obraz Panny Naswiętszey przy ktorzym szafierow Dziewięc we srebro oprawnych; Skarbiec Szacki spisany... Skrzynia z sprawami; ...Spraw fastykulow 3 y Przywiley Pargaminowy ziedwabnym sznurem; Skarbiec Tołkaczewski spisany... Xiąg roznych 20, notacie związane; ...Zelazo do herbowania» [53, арк. 1–2 адв.]. Згаданым жалезам, відаць, і быў зроблены адбітак апісанай вышэй гербавай пячаткі. З рэестру таксама вынікае, што бібліятэка і архіў Самуэля Дабрагоста Быхаўца былі даволі вялікія. Звяртаюць на сябе ўвагу «Кніга для запісаў казанняў і інш.», а таксама «звязаныя нататкі». Ці не тут дзе крылася перапісаная лацінкай «Хроніка», якая пазней стала вядома як «Хроніка Быхаўца»?

**(3).** ***Быхавец Ян Казімер***, ксёндз, канцлер Віленскай дыяцэзіі, воўпенскі пробашч, 1714 г.

**Герб**: тарча падзелена на чатыры часткі, у 1-й — чатырохкутнік, сярэдзіна якога заштрыхавана (чырвоны), з простымі крыжамі, што выходзяць зверху і знізу; у 2-й — галава дзіка з іkламі; у 3-й — тры трубы з

матузкамі, злучанымі ў веер («Трубы»), у 4-й — страла вастрыём дагары на лукаватай падставе («Адравуж»), над тарчай — карона, вакол тарчы дзве галінкі, перакрыжаваныя ўнізе.

**Пячатка**: адбітак, чырвоны сургуч, 16х18 мм, выдатная захаванасць [52, арк. 34 адв.].

У 1714 г. у Вільні ксёндз Ян Быхавец разам з братамі Людвікам і Міхалам выдаў Уладзіславу Быхаўцу, падчашаму менскаму, суддзі Трыбуналу ВКЛ ліст з пунктамі паразумення з лыскаўскім кляштарам закону Святога Базыля Вялікага па справе аб іх прэтэнзіях на фальварак Шпакаў. Падпісаўся: «Jan Bychowiec Kanclerz Diecezyey Wilenskiey Proboszcz Wołpienski mp».



Ксёндз Ян Казімер — старэйшы сын Самуэля Дабрагоста Быхаўца, старосты люцынскага і Крыстыны Дэнгоф. У 1-м полі яго асабістага герба быў уласны радавы герб («Магіла»), у 2-м — уласны герб маці, у 3-м — герб бабкі па бацьку Крыстыны Войны («Трубы»), у 4-м — герб бабкі па маці Ганны Крышкоўскай («Адравуж») [20, т. 13, s. 28; 35, т. 8, s. 133].

Духоўную кар'еру для сына абралі бацькі. Пра гэта сведчыць асабісты ліст ад 13 мая 1695 г. яго маці Крыстыны Дэнгофаўны Быхаўцовай да біскупа перамышленскага, у якім яна з падзякай згадвае біскупа віленскага, які спрыяў прызначэнню Яна Казімера «na pierszy Gradus Kapłanski» [54, арк. 1]. Сапраўды, ужо 18 верасня 1695 г. ён пасля ксяндза Мацея Анцуты, каноніка смаленскага быў прызначаны адміністратарам лыскаўскай плябаніі «з волі» біскупа віленскага Канстанціна Бжастоўскага [55, арк. 1]. Для другіх сваіх сыноў маці прасіла ў біскупа перамышленскага або пасаду пісара ВКЛ («O Wakans Pisarstwa Litewskiego [4]»), або харужага ВКЛ («Jakosz teraz Wakuie Chorąstwo WXLitt iezeli mozna a w samey rzeczy niezyie Jeomsc Pan chorązy Wielkiego XLitt Bo nie w Litwie ale w podgurzu Vmarł [5] smiała bym ote łaskę prosic abysmy mieli na te chorąstwo Przywiley») або хаця б якое-небудзь староства («przynamniey ... starostwo ktore na nas pokornie wyprawic prosze. Bo dwa Starostwa vakuią iedne Mscibow a drugie Tryszki») [54, арк. 1].

У 1711 г. Ян Казімер Быхавец згадваецца як ксёндз Віленскай дыяцэзіі, у 1712 г. як канцлер Віленскай дыяцэзіі і віленскі пробашч [57, арк. 1; 58, арк. 8]. Ужо ў 1719 г. ён — віленскі канонік [59, арк. 1]. 24 красавіка 1723 г. ксёндз Ян Быхавец, канонік віленскі, пробашч і плябан воўпенскі аддаў у арэнду на год за 80 бітых таляраў Тамашу Насілоўскаму, чашніку Бельскай зямлі і яго жонцы Яганне Шарэйкоўне маёнтак

[4] У 1690–1695 гг. пісарам вялікім ВКЛ быў Канстанцін Ян Шуйскі [56, s.130].

[5] Ян Казімер Пац, староста ўсвяцкі, харужы надворны ВКЛ у 1687–1695 гг. [56, s. 31].

Одла або Плябанаўцы ў Гарадзенскім павеце, які быў яму дадзены «od Przeswiętney Kapituły naszey Wilenskiey» [60, арк. 1]. 30 сакавіка 1724 г. ён з братамі выдаў Матэвушу Дэрлінгу, паперніку лыскаўскаму кантракт на арэнду іх паперні ў вёсцы Агароднікі на 3 гады за 300 злотых у год [61, арк. 1–1 адв.]. У 1743 г. — ён ужо кантар і пралат віленскі [62, арк. 1]. Памёр у 1754 г. [63, арк. 1].

Як вынікае з чарнавіка яго тастаменту (захаваўся без канца, пісаны паміж 1750 і 1754 г.), ксёндз Ян Быхавец, кантар і пралат катэдральны віленскі, пробашч воўпенскі і лыскаўскі разам з Андрэем Храбтовічам, гарадзенскім стольнікам «...uczyniłem Fundacyą w Dobrach moich Dziedzicznych miescie Łyskowie WWJchMsciow Xięży Myssionarzow instituti Sancti Vincentij a Paulo, aby na tym mieyscu a nie inszym perpetuis temporibus mieli swoją rezydencyą, y tam mieszkając za Duszę moją S:P:Rodzicow moich Braci y krewnych moich żyjących y nieżyjących Maiestat Boski Błagali, Chwałę Boską pomnażali, y Naukami Apostolskimi ludowi obojego obrządku Łacińskiego y Greckiego pomoc zbawienia czynili, odprawując częste po rożnych mieyscach Xięstwa Litewskiego Missye vigore sui instituti, na ktorą nową Fundacyą wypłaciłem y oddałem do rąk WWJchMsciow Xięży Missyonarzow Łyskowskich summy gotowey [20000] złotych polskich, osobliwie zas Dwa Folwarki w Powiecie Wołkowyskim leżące Hrusko nazwane niedaleko Miasta Łyskowa sytuowane...» [64, арк. 1]. Ім жа ён перадаў разам з іншай рухомасцю свае кнігі: «Xięgi moje oddałem» [64, арк. 1 адв.]. Пахаваць сябе ксёндз Ян прасіў або ў віленскім касцёле ксяндзоў місіянераў («jeżeli w Wilnie wieku Dokonam»), або ў лыскаўскім парафіяльным касцёле «w grobie Oycow moich» («jeżeli zaś w kraju Wołkowyskim smierc mię z Woli Boskiey zakroczy»). Усе свае маёнткі («Dziedzictwa mojego Łyskowskiego y Fortun Ruskich Dziedzicznych w zastawie będących część trzecią miedzy nami Bracią na mnie Należącą») дароўным правам ён адпісаў пляменніку — сыну брата Уладзіслава — ***Яну Мікалаю Быхаўцу***, суддзічу земскаму ваўкавыскаму. Свой залаты кананічы крыж з залатым ланцужком ксёндз Ян Быхавец перадаў у віленскі катэдральны касцёл «do Kaplicy Jmienia Maryi ktorey kaplicy jestem Proboszczem, ażeby ten krzyżyk w teyże Kaplicy na Ołtarzu Nayswiętszey Panny zawsze był zawieszony» [64, арк. 1 адв. – 2 адв.].

**(4). *Быхавец Людвік***, пісар скарбовы ВКЛ, 1726 г.

**Герб**: на картушы чатырохкутнік, сярэдзіна якога заштрыхавана (зялёны), з простымі крыжамі, што выходзяць зверху і знізу, над картушом шляхецкая карона.

**Пячатка**: адбітак, чырвоны сургуч, 13x14 мм, выдатная захаванасць [65, арк. 1 адв.].

20 верасня 1726 г. у Нядзьвецку Людвік Быхавец, пісар скарбовы ВКЛ выдаў свой пленіпатэнцыйны ліст Уладзіславу Быхаўцу, харужаму

пяцігорскаму знаку Пана падкаморыя ВКЛ [6]. У ім ён перадаваў брату правы на сваю частку маёнтка Галэмбюв у Прусіі польскай, з-за таго што: «ta pomieniona Maiętnosć Gołębiow iest nam odległa».



Згаданы маёнтак быў спадчынай па смерці іх цёткі Канстанцыі Дэнгофаўны Любавецкай, старосцінай асвяцімскай. Падпісаўся: «Ludwik Bychowiec Pisarz Skarbowy WXLtto mp». Сярод сведкаў былі Міхал Сурын, падстолі мсціслаўскі, Казімер Дырмунт Сівіцкі, Якуб Брындза.

Людвік — брат ксяндза Яна і Уладзіслава Тадэвуша Быхаўцаў у 1720–1734 гг. займаў пасаду пісара скарбовага ВКЛ. Памёр пасля 6 лістапада 1734 г. [56, s. 117]. У Ваўкавыскім павеце валодаў маёнткам Нядзьвецк (1731 г.) і саваёй часткай Лыскава. Жонкай яго была Людовіка Тызенгаўз (†26 чэрвеня 1736 г.). Пакінуў адзіную дачку Ружу ці Разалію [66, арк. 1; 67, арк. 1; 68, арк. 3].

Для дачкі пасля смерці маці 29 чэрвеня 1736 г. апекуном ксяндзом Янам Быхаўцам са згоды другога апекуна — яго брата Уладзіслава Быхаўца «Tribunalis Magni Ducatus Lituania & Castrensis Vołcoviscens[is] Judicis», у прысутнасці прыяцеляў-пячатароў Антонія Казімера Шэмета і Хрызастома Вярэнкі, каморніка земскага ваўкавыскага была складзена «Рэвізія» спраў, дакументаў, кляйнотаў і іншай рухомасці, дзе сярод іншага згадваліся бацькоўскія: «...Przywileje na Pisarstwo y Gleyta ružne... Pas Perski ze srybrem karmazynowy... Woz skarbny kowany skurą obity... Skrzynia Czerwona skurą obita okowana z Herbem Mogiłą na Wierzchu... Xiąg 4...» [66, арк. 3 адв., 4, 7]. Звяртае на сябе ўвагу тое, што герб Быхаўцаў названы ў «Рэвізіі» «Магіла». Калі ўлічыць, што гербоўнік К. Нясецкага не быў яшчэ надрукаваны (першы том выйшаў у 1728 г.), то такая назва магла быць запазычана толькі з працы Б. Папроцкага і рукапісу В. Каяловіча. Згадка пра чатыры кнігі Людвіка, а таксама пра кнігі ксяндза Яна (у яго тастаменце) і кнігу Уладзіслава Быхаўцаў (гл. ніжэй), магчыма, сведчыць, што бацькоўская бібліятэка была падзелена паміж братамі.

Дачка Людвіка Быхаўца Ружа ці Разалія ў 1745 г. ва ўзросце 14 гадоў таемна ад сваіх апекуноў-стрыяў выйшла замуж за Адама Біспінга, старадубаўскага чашніка і ўцякла разам з ім: «Nie było zadney wiolencyi bo nawed męza mego nie było na dziedzincu ale mie na goscincu czekał dokąd za dobrowolnie wyszłam y tam poiazd gotowy zastawszy pogług umowy naszey z męzem moim poiachałam do Dobr męza mego do Kołonny» [69, арк. 1 адв.]. Аднак шлюб быў скасаваны, і Ружа ўжо ў тым жа годзе выйшла замуж за Даменіка Антонія Сухадольскага, пісара гродскага

[6] У 1702–1734 гг. падкаморыем ВКЛ быў Багуслаў Эрнэст Дэнгоф, палкоўнік пешай каронай гвардыі [56, s. 151].

ваўкавыскага [20, т. 2, s. 271; 70, арк. 3]. Памерла пасля 10 мая 1786 г. [71, арк. 76].

**(5). *Быхавец Уладзіслаў Тадэвуш***, суддзя гродскі Ваўкавыскага павета, 1727 г.

**Герб**: у полі пячаткі тры чатырохкутнікі, упісаныя адзін у адзін, зверху і знізу большага выходзяць два простыя крыжы, вакол выявы дзве галінкі, перавязаныя ўнізе, над выявай шляхецкая карона, вакол герба ініцыялы: «W[ładysław] T[adeusz] B.[ychowiec] S[tarosta] L[ucynski] [7]».

**Пячатка**: адбітак, чырвоны сургуч, Ø 19 мм, добрая захаванасць [72, а.1].

19 чэрвеня 1727 г. у Лыскаве Уладзіслаў Тадэвуш Быхавец, суддзя гродскі ваўкавыскі выдаў свой тастаманіяльны ліст Базылю Тарусевічу, зямяніну ЯКМ Наваградскага ваяводства, які: «persewerująс w Powiecie Wołkowyskim, służył roznym JchmPmPm Powietnikom naszym a potym y nam Bychowcom poczesciwie Dotąd poko, iego ochota kazała, aże upatrzył sobie iako wolny Człowiek z żoną mieysce w Wdzwie Brzeskim [8] do mieszkania, żadney do iego praetensyi y Akcessu niemaiąc, te Testimonium iako wolnemu y poczesciwemu Człowiekowi daię...». Падпісаўся: «Władysław Bychowiec SGW».



Уладзіслаў Тадэвуш — брат ксяндза Яна і Людвіка Быхаўцаў — спярша падчашы менскі (1714–1726 гг.), суддзя Галоўнага трыбунала ВКЛ (1714 і 1736 гг.) і староста люцынскі (1718 г.), харужы пяцігорскі знаку Пана падкаморыя ВКЛ (1725 г.) і стольнік ваўкавыскі (1726 г.) [73, арк. 1; 74, арк. 1 адв.], суддзя гродскі ваўкавыскі (1727–1736 гг.), затым — падстароста судовы Ваўкавыскага павета (1738–1740 г.) і суддзя земскі ваўкавыскі (1740–1761 гг.) [20, т. 2, s. 271; 35, т. 2, s. 103; 75, арк. 1; 76, арк. 1–1 адв.; 77, арк. 1; 78, арк. 1; 79, арк. 1; 80, арк. 1; 81, арк. 1–1 адв.].

У Ваўкавыскім павеце валодаў маёнткам Раневічы ці Граневічы (1726 г.) і сваёй часткай Лыскава (з Магілёўцамі). Як вынікае з ліста да маці ад 13 кастрычніка 1734 г., Уладзіслаў Тадэвуш Быхавец меў 47 дымоў [82, арк. 1]. Два разы браў шлюб — першы раз у 1726 г. з Галенай Біспінг, суддзянкай земскай старадубаўскай, якой 5 сакавіка таго ж года заставіў сваю частку Лыскава за 50 000 злотых [83, арк. 1]. У 1739 г. яго жонкай была ўжо Марыяна Нінеўская [76, арк. 1]. Памёр 10 жніўня 1761 г. [84, арк. 5]. Ад першай жонкі меў сына Яна, а ад другой — сына Ігната і тры дачкі: Тэрэзу, Яганну і Францішку [71, арк. 11 адв.].

---

[7] Літара «L» пададзена ў люстраным адбітку.

[8] Базыль Тарусовіч *vel* Тарасовіч з жонкай Зоф'яй Тхарніцкай валодаў у Берасцейскім ваяводстве дварам і маёнткам Кракаў, які ляжаў на Сялецкім тракце [72, арк. 2].

У рэестры розных рухомых рэчаў, які пасля смерці бацькі склаў сын Ян Быхавец, вылучым: «...Xiążkę przeciwko kalwinom Lutrom oddałem Jmc Xiędzu Zajączkowskiemu [9]. ...Sygnet Krwawnikowy sczerozłoty z Herbem naszym...» [84, а.3–3 адв.]. Звернем увагу на тое, што Ян Быхавец не называе герб на сыгнеце «Магіла».

**(6). *Ён жа***, падстароста судовы Ваўкавыскага павета, 1740 г.

**Герб**: на авальнай картушовай тарчы два чатырохкутнікі, упісаныя адзін у адзін, зверху і знізу большага выходзяць два простыя крыжы, над картушом шляхецкая карона.

**Пячатка**: адбітак, прамакутная кустодзея, 40х50 мм, добрая захаванасць [85, арк. 2, 6 («pod pieczęcią urzędową Wołkowyską» 1740 г.)].



Герб Уладзіслава Тадэвуша Быхаўца быў змешчаны на гродскай пячатцы Ваўкавыскага павета, якая цалкам выглядала так: у цэнтры на авальнай тарчы літара «М», з якой выходзіць угору просты крыж, пад ёй тры ўрубы (герб «Масальскі» зменены), пад ім герб падстаросты судовага, над тарчай верхняга герба — княжацкая мітра, абодва гербы ляжаць на княжацкім плашчы, надпіс у атоку: «*PIECZĘC GRODZKA :◊: POWIATV :◊: WOLKOWYSKIEGO .◊. RU· 1738·». Яна была прыкладзена да выпісу з ваўкавыскіх кніг гродскіх ад 11 ліпеня 1740 г. з квітацыйным лістом Тэрэсы з Урэтаў спярша Савіцкай [10], гараднічынай віленскай, а пасля Шуйскай, падсудкавай пінскай для Уладзіслава Тадэвуша і Марыяны з Нінеўскіх Быхаўцаў, падстаростаў судовых Ваўкавыскага павета. У сувязі з тым што справа датычылася самога падстаросты, склад гродскага суда выглядаў так: Францішак Бяляўскі, староста зарэцкі (на месцы У. Т. Быхаўца), Аляксандр Бяляўскі, канюшы і суддзя гродскі ваўкавыскі, Дамінік Антоні Сухадольскі, пісар гродскі ваўкавыскі.

Уладзіслаў Тадэвуш Быхавец меў таксама пячатку з манаграмай, якая была прыкладзена да яго асабістага ліста, пісанага ў Граневічах 30 сакавіка 1726 г. да брата ксяндза Яна. На жаль, ад яе захаваўся толькі фрагмент: «на картушовай авальнай тарчы манаграма, над тарчай шляхецкая карона» [86, арк. 2 адв.]. Кляйнот адсутнічаў. Калі ўзгадаць, што ў гербе Юстыны Быхавец у кляйноце былі тры пёры стравуса, а на захаваным фрагменце пячаткі сына У. Т. Быхаўца — Яна, маршалка Ваўкавыскага павета (на тастаменце ад 23 снежня 1790 г.) відаць толькі шляхецкая карона без кляйнота [87, арк. 1], то вядомы кляйнот герба

---

[9] Апошняя вядомая нам згадка пра бібліятэку Быхаўцаў. Ксёндз Заянчкоўскі належаў да ксяндзоў місіянераў лыскоўскіх [84, арк. 5 адв.].

[10] Міхал Алаізы Савіцкі, чашнік ваўкавыскі, ротмістр ЯКМ, гараднічым віленскім быў у 1713–1726 гг. [6, s.105].

«Магіла» Быхаўцаў у выглядзе ўзнятага ліса паміж дзвюх труб [20, т. 2, s. 271; 88, s. 689] трэба аднесці да позніх здабыткаў.

## Крыніцы і літаратура


1. Boniecki, A. Poczet rodów w Wielkim księstwie Litewskiem w XV i XVI wieku. — Warszawa, 1887. — 425 s.
2. Paprocki, B. Herby rycerstwa polskiego 1584. — Kraków, 1858.— 964 s.
3. Kojałowicz, Wijuk W. Herbarz rycerstwa W.X.Litewskiego tak zwany Compendium. — Kraków, 1897. — 527 s.
4. Niesiecki, K. Herbarz polski. — Lipsk, 1839–1846. — T.1–10.
5. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр.28.
6. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. Województwo Wileńskie XIV–XVIII wiek. / Pod red. A. Rachuby. Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk. — Warszawa, 2004. — T. I. — 764 s.
7. ГДГАМ. КП № 15129.
8. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 128.
9. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 130.
10. ГДГАМ. КП № 15111.
11. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 107.
12. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 127.
13. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 244.
14. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 745.
15. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 720.
16. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 137.
17. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 135.
18. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 743.
19. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 209.
20. Boniecki, A. Herbarz Polski. — Warszawa, 1899–1913. — T. 1–16.
21. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 755.
22. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 770.
23. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 875.
24. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 10.
25. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 533.
26. ГДГАМ. № КП 9221/а.
27. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 125.
28. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 126.
29. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 768.
30. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 68.
31. Żychliński, T. Złota księga szlachty polskiej. — Poznań, 1883. — R.V.– 490 s.
32. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 123.
33. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 245.

34. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 150.
35. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. — Warszawa, 1904–1931. — T. I–XV.
36. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 307.
37. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 869.
38. Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo nowogródzkie 1690 r. / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. — Warszawa, 2002.– 290 s.
39. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 29.
40. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 529.
41. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 588.
42. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 73.
43. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 589.
44. Лауцявичюс, Э. Бумага в Литве в XV–XVIII веках. — Вильнюс, 1979. — 187 с.
45. Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskigo. Województwo wileńskie 1690 r. / Opr. A.Rachuba. — Warszawa, 1989. — 372 s.
46. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 536.
47. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 141.
48. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 70.
49. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 108.
50. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Мінск: БелЭн, 1993–2003. — Т. 1–6.
51. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 894.
52. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 871.
53. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 69.
54. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 21.
55. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 149.
56. Urzędnicy centralni i dostojnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy. / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. — Kórnik, 1994. — 255 s.
57. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 92.
58. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 873.
59. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 157.
60. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 840.
61. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 93.
62. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 160.
63. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 259.
64. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 7.
65. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 538.
66. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 71.
67. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 160.
68. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 163.

69. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 3.
70. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 116.
71. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 808.
72. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 301.
73. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 110.
74. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 537.
75. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 156.
76. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 173.
77. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 215.
78. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 502.
79. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 778.
80. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 804.
81. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 887.
82. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 13.
83. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 575.
84. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 234.
85. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 784.
86. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 12.
87. НГАБ у г. Гродна. — Ф. 1664. — Воп. 1. — Спр. 8.
88. Małachowski, P. Zbiór nazwisk szlachty z opisem herbów własnych familiom zostaiącym w Królestwie Polskim i Wielkim Xięstwie Litewskim. — Lublin, 1805. — 817 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 16.05.2013

# Постаці архівістаў

*В. В. Урублеўскі*

## Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (частка IV, літары П–Я)

Дадзеным артыкулам завяршаецца публікацыя біяграм службоўцаў канцылярыі Мінскага ДДС, якія акрамя сваіх непасрэдных справаводных абавязкаў ажыццяўлялі ўлік і забеспячэнне захаванасці дакументаў [1]. На гэты раз публікуюцца звесткі аб канцылярыстах, чые прозвішчы пачынаюцца на літары П–Я (19 асоб). Акрамя гэтага, прадстаўлена біяграфічная інфармацыя адносна двух канцылярыстаў Мінскага ДДС, якая не ўвайшла ў папярэднія часткі даведніка (П. Ардынец, П. Вярыга). У ліку іншых публікуецца біяграма Івана Міхайлавіча Чакатоўскага, рэчыцкага земскага спраўніка, які ў 1834 г. быў прадстаўлены да ўзнагароды за выратаванне ад пажару архіўных спраў Мінскага ДДС.

Найбольшая ўвага ў біяграмах акцэнтавана на дакументы НГАБ, асабліва на фармулярныя спісы і вывадовыя справы з фонда Мінскага ДДС (Ф. 319), а таксама фармулярныя спісы за 1817 і 1836 гг. з фонда Мінскага губернскага праўлення (Ф. 299).

.......................................................................................................................

[1] Гл.: Урублеўскі В. В. Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (частка I, літары А — В) // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт.; вып. 8. — Мінск: НГАБ, 2010. — С. 289–294; Урублеўскі В. В. Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (частка II, літары Г–З) // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт.; вып. 9. — Мінск: НГАБ, 2011. — С. 234–243; Урублеўскі В. В. Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (частка III, літары К–Н) // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт.; вып. 10. — Мінск: НГАБ, 2011. — С. 295–301.

Умоўныя скарачэнні:

арк. — аркуш
адв. — адваротны
воп. — вопіс
вул. — вуліца
г. — год
гор. — горад
губ. — губерня
ДДС — Дваранскі дэпутацкі сход
дзес. — дзесяціна
кап. — капейка
маёнт. — маёнтак
муж. — колькасць прыгонных мужчын
мяст. — мястэчка
НГАБ — Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
пав. — павет
руб. — рубель
с. — старонка
спр. — справа
т. — том
тыс. — тысяча
ф. — фонд
фальв. — фальварак
* — дата нараджэння
+ — дата смерці

**Пржыбора Вітальд Ігнацій Сцяпан Феліксавіч** (*25.03.1821). Са шляхецкага роду герба «Сыракомля», зацверджанага ў дваранстве Сенатам 31 снежня 1838 г. Католік, хрышчаны ў Халопеніцкім касцёле, сын Фелікса і Канстанцыі Пржыбор. Уладальнік маёнт. Красналукі Барысаўскага пав. Мінскай губ. (71 муж.). Прайшоў курс навук у Слуцкай гімназіі (26.06.1836), прызначаны ў лік канцылярскіх служыцеляў Мінскага ДДС (30.04.1859) на месца пісара Сцяпана Іванавіча Дыбоўскага, пераведзенага ў штат канцыляры мінскага губернатара (29.11.1858). Прыняў прысягу на пасаду чыноўніка Мінскага ДДС (15.05.1859). Па ўласным прашэнні звольнены са службы (22.05.1863). Атэстат аб службе ў Мінскім ДДС адпраўлены Пржыбору на месца яго новага жыхарства па адрасу: г. Вільна, дом Гаўштэйна (21.05.1865). Падчас праходжання службы ўзведзены ў чын калежскага рэгістратара (30.04.1861).

Жонка Станіслава Радзішэўская, дваранка, дзеці: Канстанцыя (*каля 1848), Станіслаў (*каля 1849), Уладзіслава (*каля 1850), Людамір (*каля 1853), Вітальд (*каля 1853), Клара (*каля 1855). Жонка і дзеці каталіцкага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 1. — Спр. 210. — Арк. 36 адв. – 37; Воп. 3. — Спр. 270.

**Пугач-Мурашкевіч Раман Міхайлавіч** (*09.12.1881). З сялян Палужскага сельскага таварыства Карэліцкай вол. Навагрудскага пав. Мінскай губ. Праваслаўны. Па атрыманні хатняй адукацыі пастановай Мінскага губернскага праўлення залічаны ў штат канцылярскіх служыцеляў III разрада (09.12.1903). Выключаны з ліку сялян Палужскага сельскага таварыства (03.01.1904). Па выслузе двух гадоў прызначаны экспедытарам Мінскага ДДС (20.03.1906). Загадам кацярынаслаўскага губернатара залічаны паводле свайго прашэння ў сакратары Кацярынаслаўскага губернскага статыстычнага камітэта (20.06.1910),

адпаведна, выключаны са спісаў служачых Мінскага ДДС (05.07.1910). Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (05.10.1906), губернскага сакратара (05.10.1909).

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 273. — Арк. 3 адв. – 4, 9 адв. – 10, 11 адв. – 12, 14 адв. – 15.

**Пузіноўскі Януарый Кіпрыянавіч** (*04.10.1802). Са шляхецкага роду, зацверджанага ў дваранстве Сенатам 15 ліпеня 1833 г. Католік, хрышчаны ў Пяршайскім парафіяльным касцёле. Па сканчэнні Навагрудскай павятовай вучэльні (15.07.1827) паступіў на службу ў канцылярыю Мінскага ДДС (30.09.1827), падчас эпідэміі халеры знаходзіўся на службе ў губернскім камітэце па пераадоленні хваробы (15.11. — 16.12.1830). Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (31.12.1829), губернскага сакратара (31.12.1832). За дбайнасць, руплівасць і стараннасць па службе атрымліваў пахвальную атэстацыю (07.09.1829, 08.10.1832, 30.10.1835).

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 2657. — Арк. 67–67 адв.; Воп. 3. — Спр. 274. — Арк. 1 адв., 5–6.

**Пуцята Антон Жыгімонт Станіслаў Пятровіч** (*03.05.1832). Са шляхецкага роду, зацверджанага ў дваранстве Сенатам 21 мая 1835 г. Католік, хрышчаны ў касцёле мяст. Узда (15.05.1832), сын Пятра Антонавіча і Сафіі (з Магнушэўскіх) Пуцятаў. На момант 11 мая 1859 г. ва ўласнасці яго бацькі знаходзіўся маёнт. Габрыэльеўка Ігуменскага пав. (122 муж.). Па залічэнні ў лік студэнтаў Дэрпцкага ўніверсітэта выбыў з яго па ўласным жаданні ў тым жа годзе (09.06.1854), прызначаны пісарам у канцылярыю Мінскага ДДС на месца звольненага са службы Артура Данілава Горвата (13.07.1856), на што выканаў прысягу (16.07.1856). Праз пяць гадоў па ўласным прашэнні звольнены (20.01.1861). Падчас праходжання службы ўзведзены ў чын калежскага рэгістратара (13.07.1857).

Жонка Марыя Гнаінская, дваранка, сыны Пётр Ян Тэадозій (*17.05.1861, г. Навагрудак) і Аляксандр Гілярый (*14.01.1869, маёнт. Замір'е Навагрудскага пав.), каталіцкага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 2656. — Арк. 15, 17; Воп. 3. — Спр. 275. — Арк. 2, 4, 9 адв. – 10, 20, 22.

**Ратыньскі Сармат Аўдоцій Віктар Антонавіч** (*12.04.1810). Са шляхецкага роду, зацверджанага ў дваранстве Сенатам 17 лістапада 1832 г. Католік, хрышчаны 13 лістапада 1813 г. у Блоньскім касцёле, сын Антона Ігнатавіча Ратынскага, ігуменскага павятовага харунжага. У 1836 г. у закладным валоданні яго маці знаходзіліся землі з насельніцтвам у 582 падданых, акрамя гэтага, ва ўласнасці Ратыньскага і двух малодшых братоў знаходзілася яшчэ 567 сялян. Пачаў службу канцылярыстам Мін-

скага ДДС (28.12.1829), зацверджаны на гэтай пасадзе губернскім праўленнем (16.04.1830). Затым абраны на пасаду ігуменскага павятовага маршалка шляхты (11.10.1835) і знаходзіўся на ёй адзін тэрмін. Адпраўлены ў адстаўку без атрымання новага чына (27.08.1836). Падчас праходжання службы ўзведзены ў чын калежскага рэгістратара (24.01.1834).

Жонка Лавінія Львоўна Алеша, сыны Сцяпан (*каля 1835), Багдан Лукаш Марыян (*18.10.1846), Збігнеў Марыян Варфаламей (*30.08.1851). Жонка і сыны каталіцкага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 2689. — Арк. 52, 108; Воп. 3. — Спр. 277.

**Скрабін Іван Іпалітавіч** (*каля 1853). Са святарскай сям'і. Праваслаўны. Па сканчэнні курса навук у Варонежскай духоўнай вучэльні пастурпіў на службу наглядчыкам на Горкую паштовую станцыю (вобласць войска Данскога) (01.08.1871), затым прызначаны сарціроўшчыкам у Каменскую акружную паштовую кантору (01.11.1872), канцылярскім служыцелем Паўлаўскай дваранскай апекі (29.07.1874), раз'ездным чыноўнікам ніжэйшага аклада Упраўлення перавозкай пошты па чыгуначных дарогах (03.12.1876). Па прашэнні перамешчаны ў штат чыноўнікаў канцылярыі Мінскага ДДС (03.03.1880). Па прычыне перамяшчэння на пасаду бутурлінскага паштмейстара з ліку чыноўнікаў Мінскага ДДС выключаны (10.03.1881). Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (01.08.1875), губернскага сакратара (01.08.1878). На момант 1880 г. заробак складаў 300 руб. у год.

Жонка Варвара Васільеўна Палякова, праваслаўнага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 287. — Арк. 4 адв. – 6, 12.

**Суліміоўскі Усевалад Леанідавіч**. Канцылярскі служыцель першага разрада. Пачаўшы службу ў канцылярыі мінскага павятовага маршалка шляхты (30.09.1902) па ўласным прашэнні пераведзены ў штат канцылярыі Мінскага ДДС (04.04.1905), дзе хадайнічаў аб наданні яму чына калежскага рэгістратара (23.07.1905), які атрымаў за выслугу год (10.02.1906).

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 292. — Арк. 2–6 адв.

**Сулкоўскі Андрэй Рыгоравіч** (*20.08.1874). Асабісты ганаровы грамадзянін, сын дыякана. Праваслаўны. Выхоўваўся ў Мінскай духоўнай семінарыі, адкуль па хваробе звольнены з пятага класа (31.12.1893). Пастановай Мінскага ДДС залічаны ў штат яго канцылярыі (19.01.1899), дзе ў хуткім часе прызначаны рэгістратарам (08.04.1900). Загадам упраўляючага Маскоўскага кантрольнай палаты перамешчаны на службу ў згаданую палату (21.04.1901).

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 293. — Арк. 2 адв. – 4, 6.

**Сямашка Карл Якаў Марцінавіч** (*каля 1823). Са шляхецкага роду, зацверджанага ў дваранстве Сенатам 14 ліпеня 1859 г. Католік. Па атрыманні хатняга выхавання прызначаны на службу ў Мінскі ДДС (14.01.1863). Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (14.01.1867), губернскага сакратара (14.01.1870). На момант 1871 г. заробак складаў 114 руб. 27 кап.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 284.

**Татур Касьма Феліксавіч** (*11.11.1870 – +08.07.1937, г. Масква). Са шляхецкага роду герба «Дамброва». Праваслаўны, хрышчаны 14 лістапада 1870 г. Дашлюбны сын Ганны Навумаўны Кавалінскай і Фелікса Фаміча Татура, якога апошні ўсынавіў і зраўняў у правах з другім сынам Феліксам (*21.12.1876), народжаным у шлюбе. Ва ўласнасці жонкі знаходзіліся маёнт. Прудок Рэчыцкага пав. Мінскай губ. і Мялікі Вілейскага пав. Віленскай губ. Па сканчэнні Барысаўскай гарадской вучэльні (14.06.1885) прызначаны пісьмавадзіцелем канцылярыі слуцкага павятовага маршалка шляхты (24.01.1894). Затым працаваў на аналагічнай пасадзе ў канцылярыі мінскага губернскага маршалка шляхты (22.02. — 13.12.1897). Часова, а затым паўнавартасна, выконваў абавязкі сакратара Мінскага ДДС (08.03.1897–03.12.1904). Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (24.01.1896), губернскага сакратара (24.01.1899). Узнагароджаны цёмна-бронзавым медалём за працы па перапісу 1897 г. (30.01.1897), срэбным медалём у памяць царавання Аляксандра III (30.03.1898), ордэнам Святой Ганны III ступені (1902).

Паводле пастановы Віленскага акружнога суда ад 25 верасня 1905 г. запланаваў і здзейсніў разам з Мікалаем Антонавым Івашкам, селянінам сяла Грыцэвічы Слуцкага пав., падпал уласнага хлебнага свірна ў маёнт. Масткі Вілейскага пав., з мэтай атрымаць за яго страхоўку (04.06.1902), за што быў асуджаны да двух год і чатырох месяцаў выпраўленчага арыштанцкага аддзялення. Пастановай Мінскага ДДС ад 10 сакавіка 1911 г. унесены ў спіс дваран Мінскай губерні, як пазбаўлены правоў свайго стану.

У кастрычніку 1911 г. паступіў на службу ў Мінскую землеўладкавальную камісію бухгалтарам, у 1916 г. перамешчаны ў Мінскі ссудны камітэт на пасаду справавода, а затым упраўляючага канцылярыі, у 1919–1920 гг. — справавод землямернага тэхнічнага пададдзела Наркамзема Літвы і Беларусі. У 1926 – жніўні 1928 гг. — старшы бухгалтар Мінскага спіртаводачнага завода Цэнтраспірта, затым вызвалены ад займаемай пасады па стану здароўя. Пазней арыштаваны (26.03.1929) і асуджаны да трох год паражэння ў правах за антысавецкую агітацыю (26.07.1929). З 1931 г. працаваў бухгалтарам-планавікам Тарускай арцелі інвалідаў

«Самаклопат», з 1932 г. — галоўны бухгалтар арцелі вышывальшчыц. Пасля смерці пахаваны на Увядзенскіх могілках у Маскве.

Жонка Алімпіяда Іванаўна Залюбоўская (*05.07.1877), дачка калежскага асэсара, сыны: Сяргей (*28.06.1899 – +08.06.1974), прафесар эканамічных навук, Генадзь (*23.01.1902 – +07.06.1979), прафесар тэхнічных навук, Георгій (*24.08.1904), Пётр (*12.07.1907 – +02.05.1982), прафесар эканамічных навук, заслужаны дзеяч навукі Узбекістана. Жонка і дзеці праваслаўнага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 3181. — Арк. 640–643; Воп. 3. — Спр. 294. — Арк. 54–58; Стецкевич-Чебоганов, А. В. Я — сын Ваш: Некрашевичи герба «Любич». Татуры герба «Донброва». Севруки герба «Курч». Керножицкие герба «Юноша». Мостволовичи герба «Доленга» / Анатоль Стецкевич-Чебоганов. — Минск: Белорусская Православная Церковь, 2012. — С. 274–276, 286, 288–289.

**Тышкевіч Вітальд Іосіф Дамінік Адам Восіпавіч** (*22.01.1835). Са шляхецкага роду графскай вартасці, зацверджанага ў дваранстве Сенатам 28 чэрвеня 1854 г. Католік. Яго бацьку належыў маёнт. Плешчаніцы Барысаўскага пав. (71 муж.), уласнасцю маці з'яўляўся маёнт. Петралін таго ж пав. (270 муж.). Па сканчэнні поўнага курса навук у Варшаўскім высакародным інстытуце на працягу года навучаўся на юрыдычным факультэце Маскоўскага ўніверсітэта (1855–1856 гг.). Паступіў на службу ва Урадавую камісію ўнутраных і духоўных спраў (16/28.01.1858–4/16.01.1860), затым прызначаны ў лік канцылярыстаў Мінскага ДДС і ў той жа дзень выканаў на гэта прысягу (20.05.1860). Па ўласным прашэнні быў звольнены са службы па хатніх абставінах (12.03.1863). Падчас праходжання службы ўзведзены ў чын калежскага рэгістратара (20.05.1861).

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 303. — Арк. 6 адв. – 11.

**Тышкевіч Канстанцін Піевіч** (*17.02.1806 – +13.07.1868). Са шляхецкага роду графскай вартасці, зацверджанага ў дваранстве Сенатам 28 чэрвеня 1854 г. Сын маршалка шляхты Барысаўскага павета Пія Феліцыянава Тышкевіча (1756–1858) і яго жонкі Аўгусты Аўгуставай Броэль-Плятэр. Уладальнік радовага маёнт. Лагойск (488 муж.). Католік. Па сканчэнні курса навук у Віленскім універсітэце атрымаў ступень студэнта (27.06.1828), працаваў у канцылярыі міністра фінансаў Царства Польскага (27.06.1828–15.01.1831). Па выбарах дваранства з'яўляўся суддзёю Мінскага губернскага межавога суда (10.10.1832–27.10.1835). Падчас праходжання службы ўзведзены ў чын губернскага сакратара (24.05.1835). Паступіў у лік канцылярыстаў Мінскага ДДС (03.10.1836–30.12.1839). Па выбарах дваранства абраны дэпутатам Мінскага ДДС па Барысаўскім пав. (07.10.1841–02.10.1844).

З 1836 г. жыў у Лагойску, дзе разам з братам Яўстафіем Тышкевічам у 1842 г. заснаваў першы на Беларусі музей старажытнасцей, у які сабраў архіў старажытных рукапісаў, калекцыю мастацкіх твораў, унікальную бібліятэку. Адзін з заснавальнікаў Віленскага музея старажытнасцей, член Віленскай археалагічнай камісіі. Даследаваў каля 200 курганоў, у тым ліку курганы крывічоў і дрыгавічоў, гарадзішчаў і замчышчаў Мінскай губерні, склаў першыя тапаграфічныя карты гарадзішчаў і замчышчаў. Першы класіфікаваў знаходкі па тэхніцы і матэрыялах выканання і звёў іх у табліцы. У 1856 г. арганізаваў экспедыцыю па рацэ Віліі, па выніках якой напісаў краязнаўчую манаграфію «Вілія і яе берагі» (Дрэздэн, 1871). Пра археалагічныя знаходкі пісаў у газеце «Новы час», якая выдавалася А. Кіркорам у Пецярбургу ў 1868–1871 гг.

Жонка Паўліна Цеханавецкая, дваранка, сын Оскар Станіслаў Пій (*каля 1836) на момант 1853 г. навучаўся ў Віленскім шляхецкім інстытуце. Жонка і сын каталіцкага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 304. — Арк. 1 адв., 6; Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 1-я. — Мінск: БЕЛТА, 2001. — С. 510–511; Яцкевіч З. Радавод Яўстафія Тышкевіча // Архівы і справаводства. — № 2. — 1999. — С. 61–66.

**Філіповіч Георгій Францавіч** (*каля 1790). Са шляхецкага роду. Па сканчэнні курса навук навучаўся заканадаўству і парадку вядзення справаводства пры канцылярыі Дзісненскага земскага павятовага суда (1810). Затым займаўся справаводнай дзейнасцю пры барысаўскім павятовым маршалку і Барысаўскай павятовай па вайсковай павіннасці прысутнасці (03.10.1811–20.09.1814), працаваў віцэ-рэгентам з абавязкам збора судовых грошай пры Барысаўскім земскім павятовым судзе (11.10.1814–19.11.1815), На момант 28 верасня 1817 г. займаўся справаводствам у канцылярыях Мінскага ДДС і губернскага маршалка шляхты (з 25.11.1815).

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 299. — Воп. 7. — Спр. 24. — Арк. 87 адв. – 88.

**Чакатоўскі Іван Міхайлавіч** (*1795 – пасля 02.1874). Са шляхецкага роду, зацверджанага ў дваранстве Сенатам 15 студзеня 1841 г. Католік. Уладальнік фальварка Трасцянец Мінскага пав. (1 муж.), зямлі ў вак. Суцін Ігуменскага пав. Па сканчэнні курса навук (1809) навучаўся заканадаўству і парадку вядзення справаводства пры канцылярыі Ігуменскага земскага павятовага суда (1812), прызначаны канцылярыстам у Мінскі ніжні земскі суд на пасаду памочніка засядацеля Антонія Краеўскага (01.01.1813), затым на аналагічнай пасадзе распачаў працу ў канцылярыі Мінскага ДДС (01.11.1814). На момант 28 верасня 1817 г. займаўся зборам працэнтаў з даходаў памешчыцкіх маёнткаў. Праз некаторы час прызначаны столаначальнікам (20.12.1823). Па распараджэнні

вярхоўнага начальства накіраваны засядацелем у Мінскі земскі суд па піцейнай частцы (12.02.1827). Звыш прамых абавязкаў прызначаны да пастаяннай прысутнасці ў Мінскім земскім судзе (08.03.1832). Загадам Мінскага губернскага праўлення перамешчаны на пасаду рэчыцкага земскага спраўніка (17.11.1834) і зацверджаны на ёй (24.07.1836). На падставе трох пастаноў Мінскага земскага суда быў прадстаўлены да ўзнагароды губернскага начальства за выратаванне ад пажару архіўных спраў Мінскага ДДС коштам страты сваёй маёмасці (08.04.1829, 28.01.1832, 03.11.1834). Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (31.12.1818), губернскага сакратара (31.12.1821), калежскага сакратара (31.12.1824), тытулярнага райцы (31.12.1827), калежскага асэсара, надворнага райцы. За поспехі арганізацыі піцейнай справы атрымаў падзяку ад генерал-губернатара князя Хаванскага (09.03.1831), ушанаваны знакам адметнасці за 15-гадовую беззаганную службу (22.08.1835). У лютым 1874 г., знаходзячыся ў адстаўцы, пражываў у спадчынным маёнт. Трасцянец Менскага пав.

Жонка Ганна Пятроцкая (па першым мужу — Ардынцава), дзеці: Іосіф (*каля 1829), Вацлаў Антоній (*каля 1830), Міхаліна (*каля 1831, па мужу Шорцава), Пётр Анастазій (*каля 1833), доктар медыцыны, Франц Іардан (*каля 1835) (гл. ніжэй), Атон Павел (*каля 1842). Жонка і дзеці каталіцкага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 299. — Воп. 7. — Спр. 24. — Арк. 89–90; Спр. 86. — Арк. 399 адв. – 401; Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 3632. — Арк. 312–313.

**Чакатоўскі Франц Іардан Іванавіч** (*каля 1835). Са шляхецкага роду, зацверджанага ў дваранстве Сенатам 15 студзеня 1841 г. Католік, сын І. М. Чакатоўскага (гл. вышэй). Уласнасцю бацькоў з'яўляўся маёнт. Трасцянец Мінскага пав. (740 дзес.). Па сканчэнні поўнага курса навук у Мінскай губернскай гімназіі прызначаны на пасаду пісара Мінскага ДДС (26.10.1863). Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (26.10.1864), губернскага сакратара (26.10.1867). На момант 1873 г. атрымліваў заробак у памеры 156 руб. срэбрам.

Жонка Адэлія Юльянаўна Валодзька, дваранка, каталіцкага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 309. — Арк. 1 адв. – 2.

**Эйтвід Карл Аўгусцін Станіслававіч** (*28.08.1848, фальв. Горын Навагрудскага пав. Мінскай губ.). Са шляхецкага роду герба «Драгаслаў», зацверджанага ў дваранстве Сенатам 29 студзеня 1862 г. Католік, хрышчаны ў Стараельненскім касцёле 26 верасня 1848 г., сын Станіслава Косткі і Юзэфы (Беранштэйн) Эйтвідаў. Пасля заканчэння сямі класаў Мінскай класічнай гімназіі (30.11.1884) паступіў на службу ў штат

канцылярыстаў Мінскага ДДС (15.01.1891), дзе атрымаў прызначэнне на выкананне абавязкаў сталаначальніка (07.01.1892). З'яўляўся ганаровым членам Мінскага губернскага папячыцельства (17.12.1892), дэпутатам ад шляхты Мазырскага пав. (23.12.1893–27.09.1897). Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (15.01.1893), губернскага сакратара (26.09.1896). Узнагароджаны срэбным медалём у памяць царавання Аляксандра III (28.02.1897). На момант 1 траўня 1893 г. атрымліваў заробак у памеры 300 руб. срэбрам.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 3662. — Арк. 31; Воп. 3. — Спр. 312. — Арк. 2, 28 адв. – 29, 47 адв. – 48, 58–58 адв.

**Янушкоўскі Баляслаў Антонавіч** (*10.04.1865). Са шляхецкага роду Мінскай губерні герба «Побуг», зацверджанага ў дваранстве Сенатам 6 снежня 1802 г. Каталік, сын Антона Рамуальдава Янушкоўскага і Пелагеі Асвяцімскай. Па сканчэнні шасці класаў Мінскай гімназіі працаваў у штаце канцылярыі Мінскага ДДС (20.05.1886–30.06.1888). На момант 30 чэрвеня 1888 г. атрымліваў заробак у памеры 150 руб. срэбрам. Падчас праходжання службы ўзведзены ў чын калежскага рэгістратара (30.05.1886). Пражываў у гор. Мінск, на вул. Скобелеўская, дом Юнгермана (18.11.1887). На момант 30 чэрвеня 1888 г. атрымліваў заробак у памеры 150 руб. срэбрам.

Жонка (з 1887 г.) Антаніна Казіміраўна Валадзько, дваранка, каталіцкага веравызнання.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 3764. — Арк. 155, 168; Воп. 3. — Спр. 314. — Арк. 8, 11 адв. – 12, 13 адв. – 14.

**Янушэвіч Іван Францавіч** (*каля 1797). Са шляхецкага роду Геральт-Янушэвічаў герба «Даліва», незацверджанага ў дваранстве Сенатам 22 студзеня 1825 г. Скончыў прыхадскую вучэльню ў мяст. Смілавічы Ігуменскага пав. (15.02.1812), знаходзіўся на пасадзе памочніка мінскага губернскага архітэктара (01.05.1812–17.02.1816), прызначаны канцылярыстам па справах Мінскага ДДС і губернскага маршалка (18.02.1816). На згаданай пасадзе знаходзіўся і на момант 28 верасня 1817 г.

Сын Мечаслаў, палкоўнік Пражскага палка.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 299. — Воп. 7. — Спр. 24. — Арк. 91–92; Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 3747. — Арк. 54–54 адв.

**Ярмаловіч Канстанцін Паўлавіч** (*1843, сяло Крывічы Мінскага пав. Мінскай губ.). Са святарскай сям'і. Праваслаўны, старэйшы сын Паўла Фёдаравіча і Пелагеі Фёдараўны Ярмаловічаў. Па сканчэнні Мінскай духоўнай павятовай вучэльні паступіў на службу ў скарбавае аддзяленне Мінскай казённай палаты ў якасці канцылярскага служачага

(16.03.1867), затым працаваў экзекутарам Мінскага ДДС (08.12.1860 – пасля 13.09.1872). Падчас праходжання службы ўзводзіўся ў чыны: калежскага рэгістратара (16.03.1868), губернскага сакратара (16.03.1871). На момант 1870 г. атрымліваў заробак у памеры 132 руб., у 1871 г. зарабляў 171 руб. 24 кап. срэбрам.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 40821. — Арк. 11 адв.; Ф. 319. — Воп. 3. — Спр. 315, 316.

***

**Ардынец Павел Антонавіч** (*каля 1793). Са шляхецкага роду герба «Ладдзя», малодшы з чатырох сыноў ваўкавыскага стражніка Антона Ардынца і Багумілы Грынеўскай. Скончыў Мінскую гімназію (01.01.1816), прызначаны канцылярыстам у Мінскі ДДС (01.02.1816 – пасля 28.09.1817), обер-правіянтмайстар войск расійскіх, стацкі радца, кавалер ордэна Св. Уладзіміра.

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 299. — Воп. 7. — Спр. 24. — Арк. 93–94; Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 2362; Яцкевіч З. Ардынцы гербу «Ладдзя» / З. Яцкевіч // Гербоўнік беларускай шляхты. Т.1. — Мінск: БелНДІДАС, 2002. — С. 262–263.

**Вярыга Паўлін Губерт Восіпавіч** (*1797). Са шляхецкага роду герба «Шанява», які паходзіў ад уніяцкага святара Васіля Вярыгі, іерэя царквы ў в. Замосце Менскага пав. (1682). Хрышчаны 18 чэрвеня 1797 г., сын уладальнікаў фальв. Русалішкі Завілейскага пав. Юзафа і Ганны (Якавіцкай) Вярыгаў. Скончыў Мінскую гімназію (08.01.1816), працаваў канцылярыстам у Мінскім ДДС (14.02.1816–1820). Падчас праходжання службы ўзведзены ў чын калежскага рэгістратара (1825).

*Крыніцы:* НГАБ. — Ф. 299. — Воп. 7. — Спр. 24. — Арк. 95–96; Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 866; Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг.: зборнік дакументаў / Укладальнік Д. В. Лісейчыкаў. — Мінск: І. П. Логвінаў, 2009. — С. 42–43, 87–88.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 27.03.2013

# Хроніка і бібліяграфія

*З. В. Антановіч*

## Памяці Таццяны Анатольеўны Навіцкай

На сваёй 54-й вясне, 1 мая 2013 года, зусім нечакана пайшоў з жыцця цудоўны чалавек, наша калега, сяброўка, супрацоўніца — Таццяна Анатольеўна Навіцкая. Гэтую сумную навіну ніяк не хочуць прымаць ні душа, ні розум, бо такая недарэчная страта не можа стасавацца з салаўінымі майскімі днямі, калі ўсё навокал адраджаецца і трыумфуе ад усведамлення жыцця. Балюча сціскаецца сэрца і падступаюць слёзы, калі бачыш ужо каторы дзень зачыненыя дзверы пакоя, дзе было працоўнае месца Таццяны Анатольеўны. Мы ведалі яе як добразычлівага, адкрытага, адказнага чалавека, разам з якім жыццё рабілася больш утульным. Мы штодзень згадваем яе мудрыя парады, якімі Таццяна Анатольеўна шчыра дзялілася з усімі, хто меў у іх патрэбу. Ад прысутнасці гэтага чалавека рабілася святлей і нельга было ўявіць, што калісьці мы не ўбачым яе прыцягальную ўсмешку на заўжды адкрытым, прыгожым твары.

Сустракаючыся з Таццянай Анатольеўнай штодзень, мала хто прыгадваў, колькі гадоў яна правяла з намі. Здавалася, што мы былі побач з ёю заўсёды і так будзе доўжыцца бясконца. Таццяна Анатольеўна нарадзілася 21 лістапада 1958 года. У 1999 годзе скончыла Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга палітэхнікум па спецыяльнасці «дакументазнаўства і дакументацыйнае забеспячэнне кіравання», аднак яе працоўны шлях пачаўся на 20 гадоў раней. З 1976 года Таццяна Анатольеўна працавала ў Мінскім чыгуначным паштамце, упраўленні «Мінскводаправод», а ў 1977 годзе прыйшла ў архіўную галіну. Першапачаткова яна займала пасаду машыністкі ў Галоўным архіўным упраўленні пры Савеце Міністраў БССР, з 1989 года — аналагічную пасаду ў Цэнтральнай лабараторыі мікрафільміравання і рэстаўрацыі дакументаў, у 1998 годзе стала спецыялістам ІІ катэгорыі, затым — вядучым спецыялістам Камітэта па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У аддзеле аўтаматызаваных архіўных тэхналогій Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Таццяна Анатольеўна пачала працаваць з 2006 года на пасадзе вядучага, пазней — галоўнага архівіста і з гэтага моманту стала незаменным супрацоўнікам. Яна была задзейнічана ў адным з найбольш значных напрамкаў дзейнасці архіва — забеспячэнні захаванасці дакументаў шляхам стварэння фонду карыстання на лічбавых носьбітах. Праз яе рукі прайшлі тысячы ўнікальных і асабліва каштоўных помнікаў гісторыі нашай краіны. Да кожнага з іх Таццяна Анатольеўна ставілася вельмі далікатна, асцярожна і ўважліва, разумеючы іх непаўторнасць і значнасць для сучаснікаў і будучых пакаленняў. Ёй можна было без сумнення даручаць самыя складаныя і адказныя заданні, бо Таццяна Анатольеўна заўжды выконвала іх бліскуча і аператыўна. Кожны супрацоўнік, кожны наведвальнік архіва і нашага сайта карыстаўся вынікамі яе працы пры выкананні запытаў на скановіраванне, праглядзе лічбавых копій дакументаў, азнаямленні з віртуальнымі выставамі. Усё гэта надоўга захавае памяць аб ёй.

Таццяна Анатольеўна прысвяціла архіўнай галіне 36 гадоў свайго жыцця і кожны дзень з іх сустракала з радаснай усмешкай. Добрую, светлую памяць пакінуў аб сабе ў нашым калектыве гэты непаўторны чалавек.

*З глыбокай пашанай калектыў аддзела*
*аўтаматызаваных архіўных тэхналогій*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 23.05.2013

***Бендин, А. Ю.*** *Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.) / А. Ю. Бендин. — Минск : БГУ, 2010. — 439 с.*

С обретением нашей республикой независимости в отечественной исторической науке значительное внимание уделяется проблемам конфессиональной истории. Как правило, учеными исследуются вопросы истории конкретной религиозной организации, конфессиональная политика тех или иных государств, в состав которых на различных исторических этапах входили белорусские земли, межконфессиональные отношения.

Следует признать, что монография «Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.)», автором которой является доцент кафедры церковной истории Института теологии им. Св. Кирилла и Мефодия при БГУ А. Ю. Бендин, в этом отношении выделяется на фоне подавляющего большинства подобных исследований. Дело в том, что автор, применяя в качестве методологиче-

ской основы своей работы сочетание системного и институционального подходов, сумел по новому взглянуть на конфессиональную историю Беларуси второй половины XIX – начала XX в., а, точнее, ее ключевую проблематику, которая заключалась в сложных, противоречивых отношениях между российским правительством и римско-католической церковью в Северо-Западном крае в период между восстанием 1863–1864 гг. и началом Первой мировой войны. Новизна эта заключается в том, что А. Ю. Бендин рассмотрел указанную тематику сквозь призму исследования института веротерпимости.

По мнению автора, именно институт веротерпимости находился в основе государственной политики в религиозной сфере. Сущность его заключалась в том, что при наличии в империи привилегированной религиозной организации, коей являлась православная церковь (в терминах российского законодательства того времени — «первенствующая» и «господствующая»), остальные признанные законом конфессии относились к «терпимым». Это означало, что последователям данных религиозных общностей позволялось свободно исповедовать свое вероучение.

Особый статус православной веры выражался, во-первых, в принадлежности к ней императора, который считался «помазанником Божьим» (тем самым, православная церковь освящала его власть), и его семьи; во-вторых, в обязанности императора и государственных чиновников всех рангов способствовать ее укреплению и распространению; в-третьих, в запрете на выход из нее (до издания 17 апреля 1905 г. Указа о веротерпимости); в-четвертых, в эксклюзивном праве православного духовенства на убеждение законными способами верующих других конфессий перейти в православие; в-пятых, в уголовном преследовании за попытки «совращения» из православия в другую религию.

Однако понимание российским правительством принципов, лежавших в основе института веротерпимости, по автору, отнюдь не являлось застывшим, оно менялось со временем. Книга А. Ю. Бендина, таким образом, посвящена исследованию эволюции института веротерпимости и его реализации в Северо-Западном крае в 1863–1914 гг., на примере отношений между российским правительством и римско-католической церковью.

Монография написана на основе анализа широкого круга источников: законодательных актов, материалов официального делопроизводства, данных статистики, публикаций в периодической печати, мемуаров. Автором использованы материалы фондов Национального исторического архива Беларуси, Национального исторического архива Беларуси в г. Гродно, Российского государственного исторического архива (г. Санкт-Петербург), Литовского государственного исторического архи-

ва (г. Вильнюс). Помимо систематизации источников, введение к монографии содержит анализ отечественной и зарубежной историографии.

Автор подразделяет источники, использованные в его исследовании, на две основные категории: опубликованные и архивные. К первым относятся, прежде всего, законодательные акты, которые регулировали правовое положение «господствующей» православной церкви и «терпимой» римско-католической церкви, а также область религиозных запретов и преступлений. Они были включены в Полное собрание законов Российской империи и Свод законов Российской империи. К числу правовых источников А. Ю. Бендин относит и нормы канонического права римско-католической и православной церквей.

Вопросы, связанные с положением православной церкви и оценкой действий католического духовенства в Северо-Западном крае, автор исследовал на основе ежегодных отчетов обер-прокурора Святейшего Синода, в журналах Предсоборного Присутствия и отзывах епархиальных архиереев о церковной реформе.

Из мемуарных источников исследователем были использованы воспоминания церковных и политических деятелей: митрополита Евлогия (Георгиевского), протоиерея Г. В. Шавельского, С. Ю. Витте и др.

Важную группу источников в работе А. Ю. Бендина составляют периодические издания, как светские, так и церковные. Среди первых следует назвать «Новое время», «Речь», «Русь», «Виленский вестник», «Минское слово», «Kurjer Litewski» и др.

Из церковных изданий, использованных автором, следует упомянуть «Церковные ведомости», «Церковный вестник», «Вестник Виленского Православного Свято-Духовского братства», Литовские, Минские, Могилевские, Гродненские и Полоцкие епархиальные ведомости.

В монографии А. Ю. Бендина использованы статистические данные об этническом и религиозном составе населения Северо-Западного края, содержащиеся в материалах Первой всероссийской переписи населения 1897 г.

Особую роль в исследовании А. Ю. Бендина играют документы делопроизводства государственных и церковных учреждений. Значительная часть из них хранится в Российском государственном историческом архиве. В нем находятся фонды Департамента духовных дел (Ф. 821) и Департамента общих дел (Ф. 1284) МВД, канцелярии римско-католических митрополитов (Ф. 826) и канцелярии Святейшего Синода православной церкви (Ф. 796). Документы, находящиеся в этих фондах, позволили автору изучить правительственную политику по разработке законодательства о веротерпимости и конкретные политические решения по реализации отдельных законодательных актов, затрагивавших интересы католической и православной иерархий, духовенства и населения.

Необходимые для работы над монографией источники автор выявил и в Государственном архиве Российской Федерации (г. Москва). Речь идет о фонде Особого отдела Департамента полиции Министерства внутренних дел (Ф. 102), фонде III Отделения собственной Его Императорского Величества канцелярии (Ф. 109), фонде министра внутренних дел П. Д. Святополк-Мирского (Ф. 1729), коллекции рукописей Царскосельского дворца (Ф. 543). Документы, находящиеся в указанных фондах, позволили А. Ю. Бендину рассмотреть политические и международные аспекты религиозных проблем веротерпимости в Северо-Западном крае.

Исследователем также были использованы материалы, хранящиеся в Отделе рукописей Российской национальной библиотеки (г. Москва). К ним относятся личные фонды лиц, игравших различные роли в конфессиональной политике на территории Северо-Западного края. Это фонды В. Ф. Ратча (Ф. 629), фонд П. П. Альбединского (Ф. 16), фонд П. Н. Батюшкова (Ф. 52), фонд И. П. Корнилова (Ф. 377).

Дополнительные сведения о конфессиональной политике российского правительства А. Ю. Бендин почерпнул в фонде К. П. Победоносцева, обер-прокурора Святейшего Синода (Ф. 230), который находится в Научно-исследовательском отделе рукописей Российской государственной библиотеки.

Большой массив документов, необходимых для исследования обозначенного автором круга проблем, был выявлен им в Национальном историческом архиве Беларуси. К ним относятся материалы фондов Минского губернского правления (Ф. 295, 299), Витебского губернского правления (Ф. 1430) и Могилевского губернского правления (Ф. 2001). В НИАБ находятся ценные источники для изучения позиции православной церкви в противоречивых православно-католических отношениях. Это материалы фондов православных епархиальных консисторий: Минской (Ф. 136), Полоцкой (Ф. 2531) и Могилевской (Ф. 2301).

Как отмечает автор, важную роль в его исследовании сыграли документы, находящиеся в Литовском государственном историческом архиве. Это прежде всего архивные материалы канцелярии Виленского генерал-губернатора (Ф. 378), позволившие выяснить вопросы конфессиональной политики и взаимодействия светских и духовных властей в решении религиозно-этнических проблем трех губерний: Гродненской, Виленской и Ковенской. Для изучения положения православной церкви в северо-западных губерниях А. Ю. Бендин привлек документы Литовской православной духовной консистории (Ф. 605).

В фондах Виленской римско-католической духовной консистории (Ф. 604, 694) и Тельшевского римско-католического епархиального управления (Ф. 696) автор выявил документы о поведении католическо-

го епископата и духовенства в конфликтах со светской властью и православной церковью. Ценные сведения о религиозно-этнических проблемах школьной политики были обнаружены А. Ю. Бендиным в фонде канцелярии попечителя Виленского учебного округа (Ф. 567).

Кроме того, исследователь использовал в своей монографии данные из отчетов губернаторов Северо-Западного края, которые находятся в Государственной публичной исторической библиотеке (г. Москва). Нельзя не отметить, что значительная часть архивных источников, проанализированных А. Ю. Бендиным, впервые вводится в научный оборот.

Как видим, автором был использован широкий круг опубликованных и неопубликованных источников, что позволило ему подкрепить ключевые концептуально-теоретические положения монографии богатым фактологическим материалом. Тем не менее, на наш взгляд, все же необходимо обратить внимание на некоторые особенности источниковой базы исследования А. Ю. Бендина.

Так, если говорить об использованных автором материалах периодической печати, все же обнаруживается определенный крен в пользу изданий, отражавших позицию российского правительства, а также православной церкви по различным вопросам конфессиональной политики государства в Северо-Западном крае и проблемам, связанным с православно-католическими отношениями. Что же касается изданий, выражавших мнение римско-католического духовенства и простых верующих-католиков, то они использованы в значительно меньшей степени. Например, в кратком обзоре источников, использованных в монографии, А. Ю. Бендин упоминает лишь газету «Kurjer Litewski», издававшуюся в Вильно с 1913 г. Между тем интересы римско-католического населения Северо-Западного края отстаивали также журналы «Bielarus» и «Homon».

Следует отметить, что незадолго до начала Первой мировой войны данные издания стали проявлять определенную гибкость в национальном вопросе. В частности, они стали выступать против отождествления религиозной и этнической принадлежности в отношении белорусов, т. е. против того, чтобы всех православных белорусов считать русскими, а белорусов-католиков — поляками. В отечественной историографии этот факт оценивается по-разному. Если А. Смоленчук, автор монографии «Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864 – люты 1917 г.» [1], с доверием относится к подобным публикациям, то В. Линкевич, защитивший кандидатскую диссертацию

---

[1] Смалянчук, А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864 – люты 1917 г. / А. Смалянчук. — СПб : Неўс. Прасцяг, 2004. — 404 с.

по межконфессиональным отношениям на территории Беларуси в 1863–1914 гг., оценивает их двояко. Он допускает возможность, что «…не исключено и иное …, таким образом, разыгрывая «белорусскую карту», они (католические священнослужители. — *М. К.*) пытались повысить авторитет и влияние католичества в обществе» [2]. В этой связи было бы интересно узнать мнение А. Ю. Бендина о данных публикациях.

Кроме того, в своем исследовании автор не использовал материалы фонда Могилевской римско-католической духовной консистории (Ф. 1781), хранящегося в НИАБ (г. Минск). В нем отложилось значительное количество дел, характеризующих православно-католические отношения в белорусско-литовских губерниях во второй половине XIX в. Фонду Могилевской римско-католической духовной консистории посвящено диссертационное исследование отечественного историка З. В. Антонович.

Первая глава работы посвящена исследованию феномена «упорствующих» в латинстве как проявления кризиса института веротерпимости. «Упорствующими» в латинстве во второй половине XIX – начале XX в. называли тех верующих, которые формально (по метрическим книгам) являлись православными, но тайно исповедовали католичество. Проанализировав значительный фактический материал по феномену «упорствующих», А. Бендин приходит к выводу, что существование данной проблемы свидетельствовало о противоречии между принципом «свободы веры» для неправославного населения империи, закрепленным в Основных законах, и привилегированным статусом православной церкви. Выход из этого противоречия, заключает автор, можно было осуществить только с помощью реформирования существовавшего законодательства о веротерпимости.

Во второй главе рассматривается попытка «обрусения» костела, предпринятая правительством в конце 60-х гг. XIX в.

Третья глава посвящена проблемам веротерпимости в учреждениях народного просвещения Виленского учебного округа. Проблемы эти заключались в противоречиях, возникших между российским правительством и римско-католическим духовенством в образовательной сфере. Дело в том, что к концу 1860-х гг. система образования в Северо-Западном крае была коренным образом реформирована. Одним из важных направлений этих реформ стало вытеснение польского языка и замена его русским. Значительный рост в Северо-Западном крае количества церковно-приходских и народных школ, массовое обучение в них детей-католиков вызывали обеспокоенность римско-католического ду-

---

[2] Линкевич, В. Н. Межконфессиональные отношения в Беларуси (1863–1914 гг.) : пособие / В. Н. Линкевич. — Гродно : ГрГУ, 2008. — 105 с.

ховенства, которое утрачивало влияние на свою паству и потому, как правило, запрещало ей отдавать детей в эти школы. В результате массовым явлением стало возникновение тайных польских школ. По мнению А. Ю. Бендина, установление конструктивного диалога между российским правительством и римско-католической церковью в образовательной сфере было возможно лишь с реформированием институтов веротерпимости.

Четвертая и пятая главы раскрывают проблемы эволюции правовых и морально-психологических проблем накануне издания 17 апреля 1905 г. указа о веротерпимости, а также подготовку данного законодательного акта, его иделогию и цели. Оценивая указ о веотерпимости как важнейший законодательный акт, свидетельствовавший об эволюции института веротерпимости, А. Ю. Бендин, тем не менее, обращает внимание на такую важную его особенность, как отсутствие подзаконных нормативных актов, которые бы раскрыли и уточнили положения нового закона в сфере религии.

Шестая — десятая главы посвящены ключевым аспектам реализации указа о веротерпимости в Северо-Западном крае. В первой из них анализируется интерпретация указа 17 апреля 1905 г. римско-католическим духовенством белорусско-литовских губерний. В седьмой главе раскрывается проблематика, связанная с обострением православно-католических отношений. В восьмой главе исследователь анализирует спектр проблем, связанных с возвращением римско-католической церкви конфискованных ранее (в основном после подавления восстания 1863–1864 гг.) культовых зданий. Кроме того, в ней он уделяет внимание вопросам постройки и ремонта римско-католических культовых зданий после издания указа о веротерпимости. В девятой главе рассматривается проблематика, связанная с реализацией пункта 14 указа о веротерпимости, согласно которому учащиеся инославных христианских вероисповеданий получили возможность изучать Закон Божий на своем «природном» языке. Десятая глава посвящена анализу практического применения законов о римско-католической церкви, изданных 26 декабря 1905 г., а также непростой морально-психологической обстановке в смешанных православно-католических семьях после издания указа о веротерпимости.

На наш взгляд, дискуссионной является оценка А. Ю. Бендиным политики виленского епископа Э. фон Роппа, которую последний проводил во вверенной ему епархии после издания указа о веротерпимости.

Данный законодательный акт оказал ключевое влияние на отношения между российским правительством и римско-католической церковью, а также православно-католические отношения, так как разрешил переходы из православия в другие христианские вероисповедания. При этом

следует подчеркнуть, что указом не была определена процедура оформления подобных переходов. Уже 21 апреля 1905 г. виленский епископ Э. фон Ропп ввел в своей епархии упрощенную процедуру регистрации переходов из православия в католичество (без участия правительства и духовенства православной церкви). В свою очередь, Министерство внутренних дел, которому, согласно российскому законодательству того времени подчинялись все учреждения римско-католической церкви в империи, 18 августа 1905 г. издало циркуляр № 4628, установивший правила регистрации переходов из православия в другие христианские вероисповедания. Согласно циркуляру № 4628 желавшие выйти из православия должны были подать губернатору прошение соответствующего содержания и пройти через процедуру «увещания» со стороны православного духовенства (заключалась в беседах с православными священниками). Э. фон Ропп не подчинился данному циркуляру, за что впоследствии был уволен с епископской кафедры.

В конфликте между российским правительством и виленским епископом Э. фон Роппом А. Ю. Бендин явно встает на сторону власти. Он называет позицию епископа «политическим фрондерством», отмечая при этом, что подчинение циркуляру № 4628 требовало от Э. фон Роппа «гораздо больше политической воли, социально-правовой ответственности и, добавим, подлинно христианского смирения».

Мы полагаем, что данная проблема достаточно противоречива и потому требует учета позиций обеих сторон. Позиция российского правительства достаточно аргументированно представлена А. Ю. Бендиным. По его словам, «соблюдение… правил не создавало дополнительных сложностей для населения», так как «…заключалось лишь во внесении соответствующих отметок и изменений в акты гражданского состояния, ведением которых занималось приходское духовенство. Исполнение католическим духовенством белорусско-литовских губерний циркулярного распоряжения было обязательным и в силу того, что в соответствии с действовавшим законодательством … Римско-Католическая Церковь в России обладала статусом государственного учреждения, находившегося в ведении Министерства внутренних дел. Следовательно, министерство имело право требовать от подведомственных ему учреждений соблюдения издаваемых им распорядительных документов».

Свое нежелание руководствоваться циркуляром Министерства внутренних дел в процессе регистрации переходов из православия в католицизм, как следует из монографии А. Ю. Бендина, виленский епископ Э. фон Ропп аргументировал временным характером действия циркуляра, а также непричастностью католического духовенства к процедуре государственной регистрации, оставляя ее на усмотрение просителей.

Конечно, Э. фон Ропп вряд ли был полностью откровенен, объясняя свои мотивы неподчинения циркуляру. По нашему мнению, римско-католическое духовенство могло воспринять выход временных правил регистрации переходов как проявление слабости со стороны правительства. Ведь правила были изданы в форме циркуляра, а не полноценного законодательного акта. Тем самым высшее чиновничество словно «стыдилось» тех ограничений, которые вводились 18 августа 1905 г. Об этом свидетельствовал и тот факт, что такой важный циркуляр не был опубликован ни в «Правительственном вестнике», ни в «Губернских ведомостях». Более того, нерешительность власти в лице высокопоставленных чиновников косвенно подтверждает наше предположение. Так, виленский генерал-губернатор А. А. Фрезе вообще не посчитал необходимым настаивать на безусловном выполнении положений циркуляра, о чем в письме сообщил министру внутренних дел П. Н. Дурново. Он опасался волнений среди населения, которое могло воспринять любое давление со стороны администрации как попытку вернуть «отпавших» в православие.

Следует отметить, что осторожность правительства в решении вопроса о регистрации переходов из православия в католичество легко объяснима. Не будем забывать, о том, что указ о веротерпимости был издан на фоне революционных событий в стране. Если же говорить о белорусско-литовских губерниях, то правительство находилось здесь «между двух огней». С одной стороны, смягчение политики в отношении католиков способствовало активизации римско-католического прозелитизма и росту напряженности в православно-католических отношениях. С другой, резкое свертывание объявленных реформ в вероисповедной сфере могло привести к еще большему обострению обстановки. Характерно, что высшее римско-католическое духовенство Российской империи в своей переписке с губернаторами и Министерством внутренних дел постоянно подчеркивало, что остается верным правительству и убеждает свою паству ни в коем случае не присоединяться к революционным силам. Естественно, это отнюдь не означает, что костел оставался вне политики. Тем не менее российские чиновники не могли не учитывать негативное отношение католического духовенства и верующих к социал-демократическому движению и потому ради сохранения относительной стабильности в западном регионе были готовы идти на некоторые уступки.

Следует подчеркнуть, что высказанные выше суждения по поводу отдельных спорных моментов монографии А. Ю. Бендина отнюдь не умаляют ее высокой научной значимости. Исследование А. Ю. Бендина представляет собой удачную попытку проанализировать сложные и противоречивые отношения между российским правительством и рим-

ско-католической церковью, а также православно-католические отношения в Северо-Западном крае.

Книга окажется полезной для научных работников, преподавателей и студентов исторических специальностей, всех, кто интересуется историей религии в Беларуси.

*М. А. Кривицкий*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 13.03.2013

*Фонды Национального архива Республики Беларусь: краткий справочник / составители Г. Н. Лихтенштейн, Е. Р. Маньковская. — Минск: НББ, 2012. — 229 с.*

Публикация архивных справочников с информацией о составе документов Национального архива Республики Беларусь, включая одного из его предшественников ЦГАОР БССР, имеет более чем 50-летнюю историю, однако только одно из соответствующих изданий не было межархивным. Это опубликованный в 1967 г. к юбилею Великой Октябрьской социалистической революции путеводитель «Центральный государственный архив Октябрьской революции и социалистического строительства БССР» (под редакцией А. И. Азарова) — итог многолетнего труда и неоднократных переделок по замечаниям Научного совета республиканского Главархива. В нем были представлены поисковые данные, исторические справки и аннотации на фонды ЦГАОР БССР до 1941 г.

В 1998 г. информационная лакуна относительно состава фондов военного периода была закрыта межархивным тематическим справочником «Документы по истории Великой Отечественной войны в государственных архивах Республики Беларусь» (ответственный составитель С. В. Жумарь). Послевоенные документы НАРБ аннотированы в межархивном справочнике «Государственные архивы Республики Беларусь (1944–1997)» (ответственный составитель С. В. Жумарь), вышедшем в 2000 г., а личные фонды — в справочнике «Фонды и коллекции документов личного происхождения в государственных архивах Республики Беларусь» (ответственный составитель Т. И. Седляревич). Краткая информация о партийных фондах бывшего ЦПА Института истории партии при ЦК КПБ дана в двухтомном кратком справочнике «Фонды бывших архивов Коммунистической партии Белоруссии» (ответственный составитель В. Д. Селеменев). Однако до сих пор отсутствовало издание, в котором в систематизированном виде были бы отражены все фонды НАРБ, находящиеся в открытом доступе. Таковым изданием стал справочник «Фонды Национального архива Республики Беларусь»,

в подготовке которого кроме непосредственных составителей весьма значима роль бывшего директора НАРБ, одного из самых крупных архивистов Беларуси В. Д. Селеменева.

Данная архивоведческая справочная работа не предполагает аннотирования состава фондов, но изначально ориентирована на подготовку в будущем фундаментального путеводителя по крупнейшему государственному архиву республики. В справочнике достаточно гибкая структура, в основе которой классифицирующие и системообразующие принципы использованы в соответствии с их значимостью для построения конкретных информационных рядов. В 14 разделах названия фондов систематизированы на основании государственной и административной (ведомственной) принадлежности фондообразователей, их статуса и значимости, направлений деятельности, функциональных особенностей, хронологии, состава документов фондов и др. Недостаток структуры — размещение разделов по Великой Отечественной войне без учета хронологического принципа в конце справочника и абсолютное калькулирование соответствующих фрагментов «Документов по истории Великой Отечественной войны в государственных архивах Республики Беларусь» без малейшей попытки редактирования. Первое сделано потому, что ряд фондов довоенного периода имеют идентичную нумерацию с соответствующими послевоенными фондами, продолжая их, второе вполне объясняется достаточной полнотой справочника по трофейным фондам и фондам структур движения Сопротивления в Беларуси. Тем не менее, в данном издании представлялось бы целесообразным дать некоторые фонды «в разрыве», показать весь довоенный комплекс документов вне связи с послевоенным как некую цельность независимо от временного поля, в котором существовала та или иная структура (ее фонд) на протяжении всей своей истории, постараться «увидеть» нечто новое в фондах военного периода. Это лишь незначительно изменило бы объем справочника в сторону увеличения, сделав его структуру более логичной и исторически обоснованной.

Фонды и коллекции личного происхождения составителями даны почти без изменений по тексту профильного межархивного справочника, изданного БелНИИДАД в 2009 г. Это связано с тем, что ранее НАРБ готовил собственное издание по личным фондам, которое не вышло в свет, а соответствующие материалы были переданы для справочника «Фонды и коллекции личного происхождения в государственных архивах Республики Беларусь».

В целом справочник «Фонды Национального архива Республики Беларусь» представляет собой информационно-презентационное издание. Несмотря на то, что он не является чем-то сверхновым, в нем даны уточненные данные по количеству дел в фондах и впервые приведены

сведения о количестве описей в каждом фонде, что весьма значимо для исследователей. Впервые в справочнике опубликован полный указатель фондов по номерам с 1 по 1488 (включая литерные и пропущенные), а также указатель фондов организаций и учреждений, облегчающий тематический поиск с учетом видов и функционального назначения фондообразователей. Имело бы смысл привлечь внимание читателя к составу научно-справочного аппарата архива, библиотеки, включая уникальное собрание периодики межвоенного периода и оккупационной прессы 1941–1944 гг. Тем не менее и в представленном виде справочник является значимой акцией в деле подготовки путеводителя по фондам архива и справочных пофондовых публикаций Национального архива Республики Беларусь.

*С. В. Жумарь*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 05.03.2013

***Шаланда, А.*** *Сімвалы і гербы зямель Беларусі ў X–XVIII стст.: геральдычна-сфрагістычныя нарысы / А. Шаланда. — Мінск: Беларуская навука, 2012. — 182 с.*

Праблема мінулага беларускіх гербавых сімвалаў на хвалі агульнага ўзняцця грамадскай увагі да сімволікі гарадоў і зямельна-тэрытарыяльных адзінак Беларусі знаходзіць сваё асвятленне ў навуковых артыкулах і манаграфіях айчынных аўтараў, сярод якіх варта адзначыць С. Я. Рассадзіна, А. В. Сцепулёнка, А. К. Цітова, А. І. Шаланду.

На сённяшні дзень актуальнасць аргументаванага выкладу разнастайнага тэарэтычнага і факталагічнага матэрыялу па гісторыі беларускіх зямельных і гарадскіх гербаў вынікае з неабходнасці ў тым ліку зрабіць больш эфектыўнай і якаснай працу Геральдычнай камісіі пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, якая стварае новыя гербы для гарадоў і вёсак Беларусі.

У мінулым годзе пад аўтарствам А. І. Шаланды, загадчыка аддзела спецыяльных гістарычных дысцыплін і інфармацыйна-аналітычнай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, пабачыў свет зборнік геральдычна-сфрагістычных нарысаў па гісторыі сімвалаў і гербаў Беларусі ў X–XVIII стст. Выданне складаецца з васьмі глаў, дзе паслядоўна асвятляюцца праблемныя бакі беларускай геральдыкі. Так, даследуецца сімволіка і геральдыка Полацкай дзяржавы, харугваў войска ВКЛ у бітве пад Грунвальдам у 1410 г., «гербавыя войны» паміж ВКЛ і Польшчай, асвятляецца гісторыя дзяржаўнага герба ВКЛ «Пагоня». Немалая ўвага нададзена зямельнай геральдыцы XVI–XVIII стст., у прыватнасці выявам мядзведзя і Святога архангела Міхаіла. У працы прысутнічае глава,

прысвечаная даследаванню гербавых сімвалаў на пячатках ВКЛ часоў праўлення Стэфана Баторыя (1576–1586 гг.).

Усе геральдычна-сфрагістычныя нарысы напісаны на падставе артыкулаў, апублікаваных аўтарам у розных выданнях у 2001–2011 гг. Змяшчэнне іх пад адной вокладкай спрыяе лепшаму, больш цэласнаму азнаямленню з абставінамі ўзнікнення, фарміравання і выкарыстання беларускіх гарадскіх і гербавых сімвалаў на працягу акрэсленых стагоддзяў. Усе восем тэм маюць асобныя канкрэтна вызначаныя аб'екты і прадметы даследавання. Задачы вырашаюцца згодна з існуючым колам пытанняў, якія маюцца ў кожнай главе. Зборнік змяшчае 74 малюнкі і 20 каляровых графічных выяў (каляровыя выявы адносяцца, галоўным чынам, да першых трох раздзелаў).

На падставе звестак з летапіснай і мемуарнай літаратуры, рэчавых і пісьмовых дакументальных крыніц, навуковых даследаванняў беларускіх, польскіх, расійскіх, літоўскіх і ўкраінскіх даследчыкаў аўтарам сабраны і асэнсаваны багаты геральдычны і сфрагістычны матэрыял X–XVIII стст., неабходны для рэканструкцыі беларускай старадаўняй сімволікі.

Першая глава цалкам прысвечана складанай праблеме сімволікі і геральдыкі Полацкай дзяржавы ў X–XV стст. У згаданым храналагічным адрэзку аўтарам вылучаюцца чатыры этапы: княжацкі (X – пачатак XII ст.), які характарызуецца прысутнасцю на княжацкіх пячатках геральдычных выяў трызубаў і Святога (Чэснага або Узвіжальнага) Крыжа; рэспубліканскі (20-я гг. XII – 70-я гг. XIV ст.), калі сімвалам Полацкай феадальнай тэакратычнай рэспублікі была выява Багародзіцы, вядомая з пячатак полацкіх епіскапаў Якава (1309 г.) і Грыгорыя (1338 г.); вялікакняжацкі (канец 70-х гг. XIV ст.), дзе сімвалам Полацкага княства з'яўлялася выява льва з лілеяй над ім, што прымянялася на пячатцы смаленскага князя Фёдара Расціслававіча; баярска-намесніцкі (канец XIV – канец XV ст.), калі сімвалам незалежнасці Полацка-Смаленскай зямлі быў герб з двума львамі, адзначаны ў «Хроніцы Канстанцкага сабора 1414–1418 гг.» пад аўтарствам Ульрыха Рыхенталя.

Другая глава прысвечана дзяржаўнаму гербу ВКЛ «Пагоня». Аўтарам падкрэсліваецца эвалюцыя значэння герба ў канцы XV – пачатку XVI ст., калі пад вершнікам пачала разумецца не асоба вялікага князя, а агульны вобраз абаронцы Айчыны. Менавіта ў гэты перыяд герб набыў назву «Пагоня». Адзначаецца, што карані герба вядуцца ад коннай выявы з партрэтных пячатак вялікіх князёў літоўскіх пры спалучэнні яе з асабістымі гербамі Уладзіслава Ягайлы і Вітаўта («Бойчай» і «Калюмнамі»).

Актуальная праблема сімволікі харугваў Польшчы і ВКЛ падчас Грунвальдскай бітвы 5 ліпеня 1410 г. вырашаецца аўтарам на падставе

маестатавай і гербавай пячатак Вітаўта, гербоўніка «Хронікі Канстанцкага сабора 1414–1418 гг.» Ульрыха Рыхенталя, літоўскіх частак брусэльскага гербоўніка «Armorial Lyncenich» і стакгольмскага гербоўніка «Codex Bergshammar». У прыватнасці, праводзіцца рэканструкцыя пяці харугваў вялікакняжацкага гуфа, дзесяці харугваў гуфа Трокскай зямлі, сямі харугваў гуфа Віленскай зямлі, трох харугваў гуфа Смаленскай зямлі, пяці харугваў гуфа гасцей і наёмнікаў, дзесяці харугваў гуфа Жамойцкай зямлі.

Чацвёртая глава прысвечана гербавай канфрантацыі паміж ВКЛ і Польшчай у кантэксце інтэграцыйных працэсаў у пачатку XV ст. і ў другой палове XVI ст. Першы датычыў статусу і функцый польскіх шляхецкіх гербаў у ВКЛ, а таксама прававых падстаў для іх выкарыстання мясцовай шляхтай. Другі канфлікт закранаў гербы зямель, якія змянілі сваю дзяржаўную прыналежнасць пасля Люблінскай уніі 1569 г. (Падляшша, Валынь і Кіеўшчына). Аўтарам шляхам крытычнага аналізу «Хронікі Быхаўца» для першага выпадку і дэталёвага разгляду пазіцый геральдыстаў М. Бельскага, Б. Папроцкага і К. Нясецкага па другім пытанні, пры далучэнні адпаведнай дапаможнай навуковай літаратуры і крыніц, паслядоўна раскрываюцца перадумовы, сутнасць і вынікі «гербавых войнаў».

Даследаванне геральдычных выяў на пячатках вялікага князя Стэфана Баторыя знайшло адбітак у пятай главе нарысаў, дзе разглядаюцца прычыны, змест і наступствы змен на пячатцы 1581 г. у параўнанні з пячаткай 1576 г. На падставе ўсебаковага асэнсавання звестак геральдыстаў XVIII–XIX стст. Ю. А. Ябланоўскага, Б. Папроцкага, К. Нясецкага, Ф. Пекасінскага, пазнейшых даследчыцкіх прац польскіх навукоўцаў XX ст. У. Сямковіча, М. Гумоўскага, С. К. Кучынскага, З. Пеха робіцца выснова аб тым, што змены ў вялікай пячатцы 1581 г. былі выкліканы тэрытарыяльнымі стратамі, панесенымі ВКЛ у войнах з Масковіяй і ў выніку Люблінскай уніі з Польшчай.

Адна з найбольш заблытаных праблем у гісторыі беларускай зямельнай геральдыкі звязана з выявай мядзведзя ў гербах Жамойцкай, Кіеўскай, Смаленскай зямель. Прысвечаная гэтаму пытанню шостая глава раскрывае паходжанне і сэнс названай сімволікі, у ёй адзначаецца частая зменлівасць ідэйнага зместу і выгляду геральдычнай выявы мядзведзя.

У наступнай главе даследуюцца кардынальныя змены ў вялікай пячатцы вялікіх князёў літоўскіх, якія адбыліся пасля смерці Стэфана Баторыя ў 1586 г. і абрання на трон Жыгімонта III Вазы ў 1587 г. Шляхам аналізу наяўнага гістарычнага і геральдычнага матэрыялу аўтарам праводзіцца ідэнтыфікацыя трох незнаёмых зямельных гербаў з ліку дванаццаці, змешчаных на пячатцы вакол дзяржаўнай «Пагоні». Пры гэтым абвяргаецца тэорыя Ю. А. Ябланоўскага, выказаная на гэты конт яшчэ

ў сярэдзіне XVIII ст. Неапазнаныя геральдыстамі папярэдніх часоў гербы з умоўнымі назвамі «Спас», «Дзве асобы», «Алень» аргументавана атаясамляюцца з гербамі адпаведна Віцебскага, Падляшскага і Полацкага ваяводстваў. На думку аўтара, асноўнай прычынай, якая паўплывала на тое, што ўсе гербы былі сабраны разам, з'яўлялася жаданне аўтараў вялікай пячаткі ВКЛ давесці цэласнасць і магутнасць сваёй дзяржавы. Немалаважнымі былі намеры нагадаць пра страчаныя і спрэчныя тэрыторыі, наблізіць вялікалітоўскую пячатку пад вялікую пячатку Польшчы.

На падставе крытычнага аналізу звестак Я. Длугаша ў апошняй і заключнай главах А. І. Шаланда пры выкарыстанні дадатковых сведчанняў робіць выснову, што «Пагоня» не з'яўлялася гербам Наваградскага ваяводства да адміністрацыйнай рэформы 1565–1566 гг. Спасылаючыся на геральдыста Б. Папроцкага, які асабіста ведаў харужага наваградскага Івана Харытановіча і яго сына Сямёна, знаёмых з гістарычнай гербавай сімволікай Наваградчыны, аўтар сцвярджае, што ўжо ў пачатку XVI ст. гербам Наваградскага ваяводства лічылася выява архангела Міхаіла. Чорны колер тлумачыцца патрэбай геральдыста зрабіць герб непадобным да адпаведнай сімволікі Кіеўскай зямлі. Не выключаецца і магчымая памылка гравёра, які мог зрабіць герб у негатыве. Пры гэтым аўтарам упускаецца з-пад увагі ваярскі статус архангела Міхаіла. Чорная рыза ў хрысціянскім разуменні сімвалізуе сабой адзенне воіна Хрыстова, вопратку цнатлівага, немарнатраўнага і годнага жыцця ў імя служэння дабру.

Да недахопаў працы варта аднесці адсутнасць спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры пасля кожнай з глаў. Фразы і словы, якія цытуюцца аўтарам на польскай, нямецкай, лацінскай мовах, далёка не заўсёды маюць пераклад на беларускую.

Дадзены зборнік артыкулаў варта лічыць важным унёскам у працэс асвятлення праблемных момантаў з гісторыі дзяржаўнай і зямельнай гербавай сімволікі Беларусі часоў Полацкага княства і ВКЛ. Сваёй грунтоўнасцю і распрацаванасцю матэрыял, прапанаваны аўтарам, можа служыць значнай платформай для пазнейшага напісання фундаментальнага даследавання, прысвечанага згаданаму пытанню. Выданне будзе карысна ўсім, хто цікавіцца праблемамі беларускай геральдыкі і сфрагістыкі, а найперш гісторыкам і краязнаўцам.

*В. В. Урублеўскі*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 18.03.2013

# Рэзюмэ

**Антановіч Зінаіда Васільеўна,** кандыдат гістарычных навук, выкладчык кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

*«Прыватнае жыццё і грамадская дзейнасць ксяндза Вікенція Вейткі (па матэрыялах фонду НГАБ «Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя»)»*

У артыкуле на падставе архіўных матэрыялаў фонду НГАБ «Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя» разглядаецца жыццё і грамадская дзейнасць прадстаўніка рымска-каталіцкага духавенства Вікенція Вейткі, які, дасягнуўшы высокага становішча ў іерархіі царквы ў маладым узросце, пачаў злоўжываць алкаголем і быў выдалены ў манастыр. Тым не менш ён пераадолеў сваю схільнасць і развіў актыўную грамадскую дзейнасць у 1870–1880-я гады.

***Яе ж**. «Памяці Таццяны Анатольеўны Навіцкай»*

Прыводзяцца звесткі з біяграфіі і ўспаміны аб архівісце Таццяне Анатольеўне Навіцкай (1958–2013), якая працавала ў архіўнай галіне Беларусі з 1977 г., у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі з 2006 г.

**Гарбачова Вольга Васільеўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва гістарычнага факультэта БДУ.

*«Архіў Янушкевіча ў зборах Музея літаратуры імя Адама Міцкевіча ў Варшаве»*

У артыкуле даследуецца гісторыя фарміравання фонду «Архіў Янушкевіча» ў Варшаўскім музеі літаратуры, асновай для якога паслужылі матэрыялы ліставання паміж прадстаўнікамі сям'і Янушкевічаў-Ларышаў. Асаблівая ўвага аўтара звернута на лісты Яўстафія Янушкевіча, удзельніка паўстання 1830–1831 гг., да жонкі Яўгеніі Ларыш, якія апавядаюць аб жыцці і дзейнасці прадстаўнікоў польска-беларускай эміграцыі ў 1835–1870 гг. Адзін з іх з апісаннем падрыхтоўкі да шлюбу, датаваны 28 ліпеня 1851 г., публікуецца ў дадатку на польскай мове з перакладам на беларускую.

**Гоцін Андрэй Аляксандравіч,** галоўны спецыяліст Цэнтра прапаганды і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы «Мінскае гарадское ўпраўленне МНС».

*«Дзейнасць Мінскага вольнага таварыства пажарных ахвотнікаў у перыяд Першай сусветнай вайны»*

Артыкул прысвечаны дзейнасці Мінскага пажарнага таварыства ў пачатку Першай сусветнай вайны, якая зводзілася не толькі да тушэння пажараў (у тым ліку пасля нямецкіх авіяналётаў), але і да аказання дапамогі раненым вайскоўцам. У дадатку прыводзяцца інструкцыя начальніка санітарнай дружыны Мінскага пажарнага таварыства ад 20 верасня 1914 г., выдадзеная па пытанні пераносу раненых, а таксама фотаздымак Г. А. Міранскага, начальніка аднаго з атрадаў дружыны.

**Грунтоў Сяргей Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

*«Практыка перапахаванняў у Беларусі ў перыяд Расійскай імперыі (па матэрыялах НГАБ)»*

У артыкуле даследуецца праблема правядзення паўторных пахаванняў у Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Даецца характарыстыка крыніц з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі па дадзенай праблематыцы. Вылучаны асноўныя прычыны правядзення перапахаванняў. Адзначаная практыка разглядаецца ў кантэксце сацыяльнай і культурнай гісторыі Беларусі.

**Долатава Вольга Уладзіміраўна,** магістр гістарычных навук, вядучы архівіст аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі НГАБ.

*«Інтэлігенцыя ў сацыякультурным жыцці Беларусі ў гады трэцячэрвенскай палітычнай сістэмы (1907–1914 гг.) (па матэрыялах НГАБ)»*

Асобным этапам у фарміраванні інтэлігенцыі Беларусі як сацыяльнай групы сталі 1907–1914 гг. На падставе дакументаў з фондаў канцылярый мінскага і віцебскага губернатараў аўтарам прыводзяцца факты актыўнага ўдзелу беларускай, яўрэйскай, польскай, рускай інтэлігенцыі ў культурным жыцці краю. Паказаны ўплыў рэакцыйнай палітыкі самадзяржаўя на дзейнасць адукаваных пластоў насельніцтва паўночна-заходніх губерняў Расійскай імперыі.

**Жумар Сяргей Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы.

*«Фонды Национального архива Республики Беларусь: краткий справочник / сост. Г. Н. Лихтенштейн, Е. Р. Маньковская. — Минск: НББ, 2012. — 229 с.»*

Даецца навуковая ацэнка кароткага архівазнаўчага даведачнага выдання па фондах НАРБ, арыентаванага на будучую падрыхтоўку фундаментальна-

га даведніка па згаданым архіве. Аўтарам уносяцца прапановы па наданні даведніку больш лагічнай і гістарычна абгрунтаванай структуры, а таксама дадатковага зместавага напаўнення.

**Крапівін Васіль Сяргеевіч,** магістрант кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ імя М. Танка.

*«Падрыхтоўка да ўвядзення ў Мінскай губерні Палажэння ад 12 ліпеня 1889 г. аб участковых земскіх начальніках»*

На падставе дакументаў НГАБ разглядаюцца перадумовы, абставіны і працэс усталявання інстытута земскіх начальнікаў у Мінскай губерні ў канцы XIX – пачатку XX ст. Адзначаюцца захады, прадпрынятыя земскім аддзелам Міністэрства ўнутраных спраў, для паспяховага ўвядзення згаданай пасады на месцах.

**Крывіцкі Міхаіл Аляксандравіч,** вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Перадумовы масавых пераходаў з праваслаўя ў каталіцтва на тэрыторыі Беларусі пасля выдання ўказа аб верацярпімасці (1905–1914)»*

На падставе архіўных дакументаў з фондаў НГАБ, матэрыялаў перыядычнага друку пачатку XX ст., манаграфій айчынных і замежных даследчыкаў і іншых крыніц аўтар вылучае сукупнасць перадумоў масавых пераходаў праваслаўных жыхароў Беларусі ў каталіцтва пасля выдання 17 красавіка 1905 г. указа аб верацярпімасці. Аўтарам абагульняюцца ранейшыя назіранні даследчыкаў па дадзенай праблеме, робяцца ўласныя высновы. Так, у якасці перадумоў упершыню называюцца доўгая адсутнасць кантролю з боку ўрада за пераходамі з праваслаўя ў каталіцтва; больш высокі ўзровень адукацыі рымска-каталіцкага духавенства ў параўнанні з праваслаўным; унутраны крызіс у праваслаўнай царкве, які праяўляўся ў падзенні ўплыву духавенства на прыхаджан.

***Яго ж**. «Рапарты мінскага і дзвінскага паліцмайстраў аб наступствах налётаў нямецкай авіяцыі ў гады Першай сусветнай вайны»*

Публікуюцца рапарты мінскага і дзвінскага паліцмайстраў аб наступствах налётаў нямецкай авіяцыі на гарады Мінск (3 кастрычніка 1915 г., 21 чэрвеня 1916 г.) і Дзвінск (5 студзеня 1917 г.) у гады Першай сусветнай вайны, якія захоўваюцца ў фондах НГАБ. Аўтарам адзначаецца актуальнасць дадзенай тэмы для вывучэння штодзённай гісторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны.

***Яго ж**. Бендин, А. Ю. Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.) / А. Ю. Бендин. — Минск: БГУ, 2010. — 439 с.*

Рэцэнзуецца і анатуецца манаграфія дацэнта Інстытута тэалогіі пры БДУ А. Ю. Бендзіна, прысвечаная даследаванню эвалюцыі ідэі верацярпімасці і яе рэалізацыі ў палітыцы расійскіх улад на тэрыторыі беларускіх губерняў паміж паўстаннем 1863 г. і Першай сусветнай вайной 1914–1918 гг. У артыкуле падрабязна характарызуецца крыніцазнаўчая база даследавання, адзначаюцца асноўныя высновы аўтара, абгрунтоўваюцца моцныя і слабыя бакі працы.

**Лашкевіч Аляксандр Аляксандравіч,** кандыдат гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытных актаў НГАБ.

*«Ліквідацыя паліцыі і жандармерыі і стварэнне міліцыі ў Віцебскай губерні пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.»*

На падставе фонду НГАБ «Канцылярыя віцебскага губернскага камісара Часовага ўрада» аўтар прасачыў працэсы ліквідацыі на тэрыторыі Віцебскай губерні пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Асобнага корпуса жандараў і «перафарміравання» былой паліцыі ў народную міліцыю. Адзначаецца слабы прафесійны ўзровень створанай міліцыі, нявызначанасць функцый і структуры, непадрыхтаванасць яе супрацоўнікаў да выканання службовых абавязкаў.

**Лебедзева Валянціна Міхайлаўна,** старшы выкладчык кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

*«Новыя дакументы аб універсітэцкім перыядзе жыцця Мітрафана Доўнар-Запольскага»*

У артыкуле на аснове новых архіўных дакументаў раскрыты раней невядомыя эпізоды біяграфіі М. В. Доўнар-Запольскага перыяду яго студэнцтва ў Кіеўскім універсітэце. Паказаны абставіны, умовы і фактары прафесійнага фарміравання будучага вучонага.

**Лукашэвіч Андрэй Міхайлавіч,** кандадат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і найноўшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ.

*«Мазырскі ўмацаваны лагер: нерэалізаваная ідэя (1810–1812 гг.)»*

Артыкул прысвечаны праекту фартыфікацыйнага ўмацавання Мазыра ад узнікнення ідэі да спробы яе ўвасаблення ў рэальнасць. На падставе апублікаваных і неапублікаваных дакументаў з Ваенна-вучонага архіва Галоўнага ўпраўлення Генеральнага штаба адзначаецца, што Мазырскі ўмацаваны лагер павінен быў забяспечыць кантроль расійскіх войскаў над важнай стратэгічнай камунікацыяй — басейнам Прыпяці, аднак складанасць рэльефу мясцовасці, адсутнасць сродкаў і часу вымусілі расійскае камандаванне адмовіцца ад рэалізацыі сваёй задумы.

**Мажэйка Ганна Мікалаеўна,** магістр гістарычных навук, загадчык аддзела аўтаматызаваных архіўных тэхналогій НГАБ.

*«Справа Ларкі Крывасмока: прымхі і забабоны беларускага сялянства XIX ст.»*

Выкарыстоўваючы фальклорныя матэрыялы канца XIX – пачатку XX ст., аўтар даследуе справу з фонду НГАБ «Віцебскі совесны суд» аб з'яўленні ў 1845 г. у вёсцы Акуліна Лепельскага павета Віцебскай губерні «хадзячага» нябожчыка. Аналізуюцца народныя ўяўленні аб дадзенай з'яве, у якасці прыкладаў прыводзяцца аналагічныя выпадкі.

**Навасёлава Валерыя Ігараўна,** аспірант Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

*«“Кніга ведаў” — малавядомая крыніца па гістарычнай геаграфіі Усходняй Еўропы»*

У артыкуле аналізуецца малавядомая крыніца па гістарычнай геаграфіі Усходняй Еўропы — «Кніга ведаў». Даецца кароткі агляд чатырох копій трактата (R, N, S, Z) і яго выданняў. Паслядоўна разглядаюцца пытанні рэальнасці або кампілятыўнасці апавядання, аўтарства тэксту, датавання трактата, крыніц інфармацыі. Прыведзена геаграфічнае апісанне Усходняй Еўропы, згаданае ў трактаце, і зроблена выснова аб тым, што аналіз «Кнігі ведаў» неабходна разглядаць як магчымасць вырашэння гістарычных задач, звязаных з рэгіёнам Усходняй Еўропы.

**Некрашэвіч Пілiп Анатольевіч,** аспірант кафедры новай і найноўшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ.

*«Ваеннаслужачыя Асобнага Літоўскага корпуса: этнаканфесійны аспект (па матэрыялах НГАБ)»*

Артыкул заснаваны на дакументах фондаў НГАБ «Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя» і «Слуцкае духоўнае праўленне», заканадаўчых актах, матэрыялах навуковых даследаванняў і міжархіўных даведнікаў. Факт стварэння ў 1817 г. Асобнага Літоўскага корпуса (расфарміраваны ў 1831 г.), які камплектаваўся з салдат і афіцэраў заходніх губерняў, адзначаецца як важны крок на шляху атрымання аўтаноміі для тэрыторый былога ВКЛ. Таксама цікавай асаблівасцю дадзенай вайсковай адзінкі з'яўляецца прысутнасць у ёй святароў трох хрысціянскіх канфесій: праваслаўнай, уніяцкай і каталіцкай.

**Несцяровіч Юрый Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археаграфіі БелНДІДАС.

*«Канцэпцыя трансфармацыі дакумента ў гістарычную крыніцу і карэляцыя паняццяў гістарычнай крыніцы і гістарычнага дакумента»*

Аўтар пры ўсебаковым аналізе прымяняемай у навуковым дыскурсе «Канцэпцыі трасфармацыі дакумента ў ГК (гістарычную крыніцу)» прапаноўвае аптымізаваць дадзеную канцэпцыю праз сумяшчэнне і карэкціроўку яе з канцэпцыяй трасфармацыі ПДЗІ (прадукта дзейнасці з замацаванай інфармацыяй). У прыватнасці, адзначаецца, што ў працэсе працы з дакументам гісторыка, археографа, архівіста змяняецца не сам дакумент, а асаблівасць яго выкарыстання. У адпаведнасці з гэтым у эдыцыйнай археаграфіі аб'ект даследавання і адначасова базіснае паняцце — гістарычны дакумент, у архівазнаўстве — архіўны дакумент, у крыніцазанаўстве — гістарычная крыніца.

**Рындзін Сяргей Мікалаевіч,** аспірант кафедры новай і найноўшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ.

*«Мерапрыемствы грамадзянскіх улад беларускіх губерняў па высяленні замежных падданых у 1914–1915 гг.»*

На падставе справаводнай дакументацыі ўстаноў Расійскай імперыі з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі даследаваны адзін з асноўных накірункаў дзейнасці грамадзянскіх улад беларускіх губерняў у 1914–1915 гг., а менавіта высяленне падданых ваюючых з Расіяй дзяржаў у аддаленыя рэгіёны. Прыводзяцца хадатайствы аб невысяленні іх з месцаў жыхарства. Даследуецца і аналізуецца заканадаўства, якое рэгламентавала парадак дэпартацыі з заходніх губерняў. Асвятляюцца праблемы, звязаныя з транспартаваннем замежнікаў у месцы вызначанага жыхарства, а таксама даследуюцца дзеянні органаў улады ў дачыненні да славян, якія знаходзіліся ў падданстве Германіі і Аўстра-Венгрыі. Нададзена ўвага дзейнасці мясцовых улад, якая датычылася германскіх і аўстрыйскіх падданых, вызваленых ад высялення.

**Снапкоўскі Юрый Мікалаевіч,** галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Бароны Мелер-Закамельскія герба ўласнага: спроба пакаленнага роспісу»*

Упершыню друкуецца пакаленны роспіс вядомага тытулаванага дваранскага роду Віцебскай губерні — баронаў Мелер-Закамельскіх, якія ўвайшлі ў гісторыю як дынастыя знакамітых вайскоўцаў. Аб кожным прадстаўніку роду прыводзіцца максімальна разгорнутая біяграфічная даведка. Для складання пакаленнага роспісу было выкарыстана шырокае кола крыніц, уключаючы дакументы НГАБ, некропалі, гербоўнікі, месяцасловы, адрас-календары, памятныя кніжкі, а таксама розная літаратура. У прадмове да публікацыі адзначаны факталагічныя памылкі і недакладнасці ў наяўнай на сённяшні дзень літаратуры аб Мелер-Закамельскіх.

**Урублеўскі Вадзім Валер'евіч,** галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Генеалогія і гісторыя святарскага роду Струкоўскіх у канцы XVIII – пачатку XX ст. (па матэрыялах НГАБ)»*

У артыкуле на падставе кліравых ведамасцяў і судовых спраў канца XVIII – пачатку XX ст. з фондаў НГАБ асвятляецца гісторыя пяці пакаленняў роду Струкоўскіх, праваслаўных святароў Мінскай епархіі. Адзначаецца, што, даследуючы кліравыя ведамасці, можна высветліць абставіны і шляхі рассялення святарскіх родаў, назіраць асаблівасці іх службовай дзейнасці. Разгляд асобнай біяграфіі ці генеалогіі з дапамогай судовых матэрыялаў дазваляе ўбачыць не толькі святара, але грамадскага і царкоўнага дзеяча, выразніка людскіх настрояў, станоўчы або адмоўны прыклад для вернікаў. Падкрэсліваецца каштоўнасць кліравых ведамасцяў і судовых дакументаў як крыніц па генеалогіі.

***Яго ж***. *«Архівісты Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (частка IV, літары П–Я)»*

У артыкуле завяршаецца публікацыя біяграм службоўцаў канцылярыі Мінскага ДДС, якія, акрамя сваіх непасрэдных справаводных абавязкаў, ажыццяўлялі ўлік і забеспячэнне захаванасці дакументаў. Публікуюцца звесткі аб канцылярыстах, чые прозвішчы пачынаюцца на літары П — Я (19 асоб). Для складання біяграм выкарыстаны дакументы НГАБ, а менавіта фармулярныя спісы і вывадовыя справы з фонду Мінскага ДДС. У ліку іншых публікуецца біяграма Івана Міхайлавіча Чакатоўскага, рэчыцкага земскага спраўніка, які ў 1834 г. быў прадстаўлены да ўзнагароды за выратаванне ад пажару архіўных спраў Мінскага ДДС.

***Яго ж***. *«Шаланда, А. Сімвалы і гербы зямель Беларусі ў X–XVIII стст.: геральдычна-сфрагістычныя нарысы / А. Шаланда. — Мінск: Беларуская навука, 2012. — 182 с.»*

Разглядаецца зборнік геральдычна-сфрагістычных нарысаў па гісторыі сімвалаў і гербаў Беларусі ў X–XVIII стст., дзе на падставе звестак з летапіснай і мемуарнай літаратуры, рэчавых і пісьмовых дакументальных крыніц, навуковых даследаванняў беларускіх, польскіх, расійскіх, літоўскіх і ўкраінскіх даследчыкаў аўтарам сабраны і асэнсаваны багаты геральдычны і сфрагістычны матэрыял, неабходны для рэканструкцыі беларускай старадаўняй сімволікі. Адзначаюцца вартасці і недахопы працы.

**Чарнецкі Яўген Анатольевіч,** кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела інфармацыйна-краязнаўчай работы Белацаркоўскай гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, старшы навуковы супрацоўнік Белацаркоўскага краязнаўчага музея і Мемарыяльнага музея-сядзібы І. С. Казлоўскага ў Мар'янаўцы.

*«Да праблемы паходжання роду Фядкевічаў з Кіеўскага ваяводства (XVI–XVII стст.)»*

На падставе дакументаў Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны (Кіеў), дзяржаўных архіваў Жытомірскай і Кіеўскай абласцей, матэрыялаў Літоўскай метрыкі, гербоўнікаў А. Банецкага, Т. Гайля і С. Урускага вызначаецца праблема паходжання шляхецкага роду Фядкевічаў, прадстаўнікі якога напачатку XVII ст. перасяліліся ў Кіеўскае ваяводства з сяла Навасёлкі Менскага ваяводства. Адносна гэтага аўтарам прапаноўваюцца дзве версіі: 1) паходжанне з роду Гладкіх — асноўных землеўласнікаў у Навасёлках; 2) паходжанне з больш дробнага роду, які служыў Гладкім.

**Чарняўскі Фёдар Віктаравіч,** гісторык.

*«Матэрыялы да генеалогіі Ратамскіх»*

На падставе матэрыялаў Літоўскай метрыкі, Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі, Актаў Паўночна-Заходняй Русі, дакументаў з фондаў Галоўнага трыбунала ВКЛ, Менскіх гродскага і земскага судоў, Слонімскага гродскага суда, даведачнай і мемуарнай літаратуры ахарактарызаваны ўмовы і прыведзены факты з жыцця і дзейнасці ў пачатку XVI – першай трэці XVII ст. прадстаўнікоў чатырох пакаленняў шляхецкага роду Ратамскіх, уладальнікаў зямель у маёнтку Ратам'е Менскага павета.

**Чукіла Святлана Анатольеўна,** студэнтка VI курса завочнага аддзялення гістарычнага факультэта БДУ, рэферэнт Упраўлення інфармацыйных тэхналогій Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

*«Матэрыялы архіва Пустынскага Успенскага мужчынскага манастыра ў НГАБ»*

На падставе матэрыялаў фонду НГАБ «Пустынскі Успенскі мужчынскі манастыр» і дадатковай літаратуры даследуецца гісторыя архіва згаданай установы, праводзіцца падзел дакументаў фонду на пяць відавых груп: прыватна-прававыя, справаводныя, статыстычныя, эпісталярныя, картаграфічныя. Характарызуецца інфарматыўнасць крыніц.

**Шаланда Аляксей Іванавіч,** кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела спецыяльных гістарычных дысцыплін і інфармацыйна-аналітычнай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

*«Гербавыя пячаткі роду Быхаўцаў XVII–XVIII стст. (па матэрыялах НГАБ у г. Гродна)»*

У артыкуле публікуюцца выявы і прыводзяцца апісанні шасці гербавых пячатак, якімі карысталіся ў XVII–XVIII стст. асобныя прадстаўнікі роду Быхаўцаў. Акрамя саміх пячатак аўтарам змяшчаюцца звесткі аб жыццядзейнасці і сямейна-роднасных сувязях іх уладальнікаў. Даследаванне выканана, галоўным чынам, на падставе дакументаў з радавага архіва Быхаўцаў, які знаходзіцца на захаванні ў НГАБ у г. Гродна.

# Резюме

**Антонович Зинаида Васильевна,** кандидат исторических наук, преподаватель кафедры источниковедения исторического факультета БГУ.

*«Частная жизнь и общественная деятельность ксендза Викентия Вейтко (по материалам фонда НИАБ «Могилевская римско-католическая консистория»)»*

В статье на основании архивных материалов фонда НИАБ «Могилевская римско-католическая консистория» рассматривается жизнь и общественная деятельность представителя римско-католического духовенства Викентия Вейтко, который, достигнув высокого положения в иерархии церкви в молодом возрасте, начал злоупотреблять алкоголем и был удален в монастырь. Тем не менее он преодолел свою склонность и развил активную общественную деятельность в 1870–1880-е годы.

***Ее же***. *«Памяти Татьяны Анатольевны Новицкой»*

Приводятся сведения из биографии и воспоминания об архивисте Татьяне Анатольевне Новицкой (1958–2013), которая трудилась в архивной отрасли Беларуси с 1977 г., в Национальном историческом архиве Беларуси с 2006 г.

**Врублевский Вадим Валерьевич,** главный архивист отдела публикации документов НИАБ.

*«Генеалогия и история священнического рода Струковских в конце XVIII – начале XX в. (по материалам НИАБ)»*

В статье на основе клировых ведомостей и судебных дел конца XVIII – начала XX в. из фондов НИАБ освещается история пяти поколений рода Струковских, православных священников Минской епархии. Отмечается, что, изучая клировые ведомости, можно выяснить обстоятельства и пути расселения священнических родов, наблюдать особенности их служебной деятельности. Рассмотрение отдельной биографии или генеалогии с помощью судебных материалов позволяет увидеть не только священника, но общественного и церковного деятеля, выразителя людских настроений, положительный или отрицательный пример для верующих. Подчеркивается ценность клировых ведомостей и судебных документов как источников по генеалогии.

***Его же***. *«Архивисты Минского дворянского депутатского собрания (часть IV, буквы П–Я)»*

В статье продолжается публикация биограмм служащих канцелярии Минского ДДС, которые, кроме своих непосредственных делопроиз-

водственных обязанностей, осуществляли учет и обеспечение сохранности документов. Публикуются сведения о канцеляристах, чьи фамилии начинаются на буквы П–Я (19 человек). Для составления биограмм использованы документы НИАБ, а именно формулярные списки и выводовые дела из фонда Минского ДДС. В числе прочих публикуется биограмма Ивана Михайловича Чекотовского, речицкого земского исправника, который в 1834 г. был представлен к награждению за спасение от пожара архивных дел Минского ДДС.

***Его же***. *«Шаланда, А. Сімвалы і гербы зямель Беларусі ў X–XVIII стст.: геральдычна-сфрагістычныя нарысы / А. Шаланда. — Мінск: Беларуская навука, 2012. — 182 с. »*

Рассматривается сборник геральдико-сфрагистических очерков по истории символов и гербов Беларуси в X–XVIII вв., где на основании сведений из летописной и мемуарной литературы, вещественных и письменных документальных источников, научных исследований белорусских, польских, российских, литовских и украинских исследователей автором собран и осмыслен богатый геральдический и сфрагистический материал, необходимый для реконструкции белорусской стародавней символики. Отмечаются достоинства и недостатки работы.

**Горбачева Ольга Васильевна,** кандидат исторических наук, доцент кафедры этнологии, музеелогии и истории искусства исторического факультета БГУ.

*«Архив Янушкевича в сборах Музея литературы имени Адама Мицкевича в Варшаве»*

В статье исследуется история формирования фонда «Архив Янушкевича» в Варшавском музее литературы, основой для которого послужили материалы переписки между представителями семьи Янушкевичей-Ларишей. Особенное внимание автора обращено на письма Евстафия Янушкевича, участника восстания 1830–1831 гг., к жене Евгении Лариш, которые повествуют о жизни и деятельности представителей польско-белорусской эмиграции в 1835–1870 гг. Одно из писем с описанием подготовки к браку, датированное 28 июля 1851 г., публикуется в приложении на польском языке с переводом на белорусский.

**Готин Андрей Александрович,** главный специалист Центра пропаганды и социокультурной деятельности учреждения «Минское городское управление МЧС».

*«Деятельность Минского вольного общества пожарных охотников в период Первой мировой войны»*

Статья посвящена деятельности Минского пожарного общества в начале Первой мировой войны, которая сводилась не только к тушению пожаров (в том числе после немецких авианалетов), но и к оказанию помощи раненым

военным. В приложении приводятся инструкция начальника санитарной дружины Минского пожарного общества от 20 сентября 1914 г., выданная по вопросу переноса раненых, а также фотоснимок Г. А. Миранского, начальника одного из отрядов дружины.

**Грунтов Сергей Владимирович,** кандидат исторических наук, сотрудник отдела народоведения Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси.

*«Практика перезахоронений в Беларуси в период Российской империи (по материалам НИАБ)»*

В статье исследуется проблема проведения повторных погребений в Беларуси в XIX – начале XX в. Дается характеристика источников из фондов Национального исторического архива Беларуси по данной проблематике. Выделены основные причины проведения перезахоронений. Указанная практика рассматривается в контексте социальной и культурной истории Беларуси.

**Долотова Ольга Владимировна,** магистр исторических наук, ведущий архивист отдела научного использования документов и информации НИАБ.

*«Интеллигенция в социокультурной жизни Беларуси в годы третьеиюньской политической системы (1907–1914 гг.) (по материалам НИАБ)»*

Особым этапом в формировании интеллигенции Беларуси как социальной группы стали 1907–1914 гг. На основании документов из фондов канцелярий минского и витебского губернаторов автором приводятся факты активного участия белорусской, еврейской, польской, русской интеллигенции в культурной жизни края. Показано влияние реакционной политики самодержавия на деятельность образованных слоев населения северо-западных губерний Российской империи.

**Жумарь Сергей Владимирович,** кандидат исторических наук, заместитель директора Белорусского научно-исследовательского института документоведения и архивного дела.

*«Фонды Национального архива Республики Беларусь: краткий справочник / составители Г. Н. Лихтенштейн, Е. Р. Маньковская. — Минск: НББ, 2012. — 229 с.»*

Дается научная оценка краткого архивоведческого справочного издания по фондам НАРБ, ориентированного на будущую подготовку фундаментального путеводителя по указанному архиву. Автором вносятся предложения по наделению справочника более логичной и исторически обоснованной структурой, а также дополнительным содержательным наполнением.

**Крапивин Василий Сергеевич,** магистрант кафедры славянской истории и методологии исторической науки БГПУ им. М Танка.

*«Подготовка к введению в Минской губернии Положения от 12 июля 1889 г. об участковых земских начальниках»*

На основании документов НИАБ рассматриваются предпосылки, обстоятельства и процесс установления института земских начальников в Минской губернии в конце XIX – начале XX в. Отмечаются меры, предпринятые земским отделом Министерства внутренних дел, для успешного введения указанной должности на местах.

**Кривицкий Михаил Александрович,** ведущий научный сотрудник отдела публикации документов НИАБ.

*«Предпосылки массовых переходов из православия в католичество на территории Беларуси после издания указа о веротерпимости (1905–1914)»*

На основании архивных документов из фондов НИАБ, материалов периодической печати начала XX в., монографий отечественных и зарубежных исследователей и прочих источников автор выделяет совокупность предпосылок массовых переходов православных жителей Беларуси в католичество после издания 17 апреля 1905 г. указа о веротерпимости. Автором обобщаются прежние наблюдения исследователей по данной проблеме, делаются собственные выводы. Так, в качестве предпосылок впервые называются долгое отсутствие контроля со стороны правительства за переходами из православия в католичество; более высокий уровень образования римско-католического духовенства по сравнению с православным; внутренний кризис в православной церкви, который проявлялся в падении влияния духовенства на прихожан.

***Его же***, *«Рапорты минского и двинского полицмейстеров о последствиях налетов немецкой авиации в годы Первой мировой войны»*

Публикуются рапорты минского и двинского полицмейстеров о последствиях налетов немецкой авиации на города Минск (3 октября 1915 г., 21 июня 1916 г.) и Двинск (5 января 1917 г.) в годы Первой мировой войны, которые хранятся в фондах НИАБ. Автором отмечается актуальность данной темы для изучения истории повседневной истории Беларуси в годы Первой мировой войны.

***Его же***, *Бендин, А. Ю. Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.) / А. Ю. Бендин. — Минск: БГУ, 2010. — 439 с.*

Рецензируется и аннотируется монография доцента Института теологии при БГУ А. Ю. Бендина, посвященная исследованию эволюции идеи веротерпимости и ее реализации в политике российских властей на территории белорусских губерний между восстанием 1863 г. и Первой мировой войной

1914–1918 гг. В статье подробно характеризуется источниковедческая база исследования, отмечаются основные выводы автора, обосновываются сильные и слабые стороны работы.

**Лашкевич Александр Александрович,** кандидат исторических наук, ведущий научный сотрудник отдела древних актов НИАБ.

*«Ликвидация полиции и жандармерии и создание милиции в Витебской губернии после Февральской революции 1917 г.»*

На основании фонда НИАБ «Канцелярия витебского губернского комиссара Временного правительства» автор проследил процессы ликвидации на территории Витебской губернии после Февральской революции 1917 г. Отдельного корпуса жандармов и «переформирования» бывшей полиции в народную милицию. Отмечается слабый профессиональный уровень милиции, неопределенность функций и структуры, неподготовленность ее сотрудников к исполнению служебных обязанностей.

**Лебедева Валентина Михайловна,** старший преподаватель кафедры белорусской культуры и фольклористики Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины.

*«Новые документы об университетском периоде жизни Митрофана Довнар-Запольского»*

В статье на основе новых архивных документов раскрыты ранее не известные эпизоды биографии М. В. Довнар-Запольского периода его студенчества в Киевском университете. Показаны обстоятельства, условия и факторы профессионального формирования будущего ученого.

**Лукашевич Андрей Михайлович,** кандидат исторических наук, доцент кафедры новой и новейшей истории Беларуси исторического факультета БГУ.

*«Мозырский укрепленный лагерь: нереализованная идея (1810–1812 гг.)»*

Статья посвящена проекту фортификационного укрепления Мозыря от зарождения идеи до попытки ее воплощения в реальность. На основании опубликованных и неопубликованных документов из Военно-ученого архива Главного управления Генерального штаба отмечается, что Мозырский укрепленный лагерь должен был обеспечить контроль российских войск над важной стратегической коммуникацией — бассейном Припяти, однако сложность рельефа местности, отсутствие средств и времени вынудили российское командование отказаться от реализации своего замысла.

**Можейко Анна Николаевна,** магистр исторических наук, заведующий отделом автоматизированных архивных технологий НИАБ.

*«Дело Ларки Кровососа: суеверия и предрассудки белорусского крестьянства XIX в.»*

Используя фольклорные материалы конца XIX – начала XX в., автор исследует дело из фонда НИАБ «Витебский совестный суд» о появлении в 1845 г. в деревне Окулино Лепельского уезда Витебской губернии «ходячего» покойника. Анализируются народные представления о данном явлении, в качестве примеров приводятся аналогичные случаи.

**Некрашевич Филипп Анатольевич,** аспирант кафедры новой и новейшей истории Беларуси исторического факультета БГУ.

*«Военнослужащие Отдельного Литовского корпуса: этноконфессиональный аспект (по материалам НИАБ)»*

